# ВЯСКОВАЯ САМАЗАНЯТАСЦЬ НА ПРЫНЦЫПАХ УСТОЙЛІВАГА РАЗВІЦЦЯ



Дапаможнік вясковым гаспадарам і гаспадыням, іх дзецям і ўнукам



# Вясковая самазанятасць на прынцыпах устойлівага развіцця

## Дапаможнік вясковым гаспадарам і гаспадыням, іх дзецям і ўнукам

2024
Беларусь

# Аўтары:

Сівагракаў Алег, эксперт па ўстойлівым развіцці на мясцовым узроўні, кандыдат эканамічных навук, дацэнт (вёска Сасновая, Смалявіцкі раён),

Матрунчык Мікола, эксперт па пермакультуры, гаспадар уласнай вясковай экасяброўскай гаспадаркі «Экафанія» (вёска Караліна, Мінскі раён),

Кіслая Таццяна, выкладчык кафедры бізнесу і кіравання Інстытута прадпрымальніцкай дзейнасці (г. Мінск)

Нойман Наталля, эксперт па сацыяльным развіцці грамадства, магістр, дацэнтка (г. Зіген, Германія)

Агульная рэдакцыя: Алег Сівагракаў, к.э.н., дацэнт
Літаратурная і моўная рэдакцыя: Алеся Башарымава
Вёрстка: Алія Даўгун

**Распрацаваны ў межах**

**Школы-лабараторыі**

**«Вясковая самазанятасць на прынцыпах устойлівага развіцця» (адукацыйна-інфармацыйнага аўтарскага курсу**

**Алега Сівагракава, Міколы Матрунчыка і Таццяны Кіслай,**

**2023–2024 гг.)**

© Сівагракаў А.У., 2024
© Матрунчык М.А., 2024
© Кіслая Т. І., 2024

# Змест


**Уводзіны** (*Алег Сіваграка*ў) 3

**Частка I. Для сябе і для планеты Зямля** 6

§ 1. Гаспадаранне з улікам канцэпцыі ўстойлівага развіцця (*Алег Сіваграка*ў) 6
§ 2. Пачатак. Арыенціры і каштоўнасці. Самазанятасць на зямлі: ад ідэі да практыкі (*Мікола Матрунчык*) 13
§ 3. Ідэя і канцэпцыя сацыяльнай сельскай гаспадаркі і сацыяльны капітал вёскі ў нямецкай практыцы (*Наталля Нойман*) 23

**Частка II. Сядзіба — цэнтр сусвету** 32

§ 4. Вясковая сядзіба — частка прыродна-сацыяльна-эканамічнай мясцовай сістэмы (*Алег Сіваграка*ў) 32
§ 5. Правільнае праектаванне свайго падворка (*Мікола Матрунчык*) 38
§ 6. Ландшафтны дызайн (*Мікола Матрунчык*) 45

**Частка III. Экапрыязная сядзіба** 50

§ 7. Жывая глеба (*Мікола Матрунчык*) 50
§ 8. Жывёлагадоўля і яе сумяшчэнне з вырошчваннем раслін (*Мікола Матрунчык*) 54

**Частка IV. Перапрацоўка прадукцыі, уласныя кулінарныя вырабы. Рэалізацыя арганічнай прадукцыі** 58

§ 9. Арганічная ежа (*Мікола Матрунчык*) 58
§ 10. Вытворчасць прадуктаў харчавання (*Мікола Матрунчык*) 66

**Частка V. Кааперацыя на вёсцы** 74

§ 11. Кааперацыя на вёсцы (*Алег Сіваграка*ў) 74
§ 12. Прынцыпы салідарнай агравытворчасці ў Германіі як вядучага папулярнага руху ў развіцці ўстойлівай сельскай гаспадаркі (*Наталля Нойман*) 81

**Частка VI. Агратурызм, мясцовыя фэсты і святы** 89

§ 13. Агратурызм, мясцовыя фэсты, турыстычныя дэстынацыі і кластары, устойлівы турызм (*Алег Сіваграка*ў) 89
§ 14. Фестывальная практыка ў кантэксце культурных узаемаадносін паміж агравытворцамі, мясцовым насельніцтвам і спажыўцамі (*Наталля Нойман*) 99

**Частка VII. Стратэгічны і праектны падыходы ў развіцці гаспадаркі і мясцовай супольнасці** 107

§ 15. Асновы стратэгічнага падыходу да развіцця сядзібы і вёскі (*Алег Сіваграка*ў) 107
§ 16. Праектны падыход для персанальнага і грамадскага развіцця (*Алег Сіваграка*ў) 113
§ 17. Мясцовыя брэнды і іх карысць для вясковых гаспадароў і мясцовых супольнасцяў (*Алег Сіваграка*ў) 121

**Частка VIII. Эканоміка, менеджмент, маркетынг для самазанятых на вёсцы** 126

§ 18. Як выкарыстаць тэарэтычныя распрацоўкі на практыцы + асабісты профіль у Інстаграм (*Таццяна Кіслая*) 126
§ 19. Карысныя парады па менеджменце, маркетынгу, публічных выступах і вядзенні перамоў (*Таццяна Кіслая*) 133

**Заключэнне** 136
**Літаратура** 137
**Дадаткі** 138

# Уводзіны

Кніжку, што трымаеш ты[1] ў руках, паважаны чытач, не падобная да звычайных дапаможнікаў па гаспадарцы і ўлічвае тыя абставіны, што зараз пошук канкрэтных рэцэптаў, парад і, як кажуць сёння, лайфхакаў, кожны можа зрабіць самастойна праз Інтэрнэт, з улікам сваіх асабістых зацікаўленасцяў, пераваг на карысць тых ці іншых крыніц, аўтараў і экспертаў.

Мы рыхтавалі гэты дапаможнік з мэтай дапамагчы на першых кроках вясковага жыцця новым (і ўжо сталым) жыхарам стварыць, так бы мовіць, матрыцу прывабнага існавання ў сельскіх умовах. Мадэль жыцця на вёсцы, арыентаваную на адначасовае задавальненне асабістых патрэб, эканамічны плюс, узаемавыгаднае супрацоўніцтва з мясцовай грамадой, пазітыўны ўплыў на прыроднае асяроддзе. І ўрэшце — каб на працягу ўсёй гэтай дзейнасці адчувалася асалода ад жыцця на прынцыпах устойлівага развіцця! А гэта магчыма, бо мноства людзей па ўсім свеце на сваіх вясковых падворках, у экавёсках, ля пермакультурных гародчыкаў і ў масштабах вялікіх фермерскіх гаспадарак ужо жывуць так.

Адна з задач нашага дапаможніка — у тым, каб спрыяць рэалізацыі вашых, нашы чытачы, здольнасцяў, задум і мар. Каб гэтыя мары ажыццяўляліся.

Праз гэты дапаможнік мы хочам данесці ўсім зацікаўленым свае погляды, якія базуюцца на шматгадовых навуковых даследаваннях і працы ў міжнародных праектах, вывучэнні беларускага і замежнага вопыту ўстойлівага гаспадарання, доўгатэрміновага практычнага асабістага гаспадарання на зямлі, а таксама мноства семестраў выкладчыцкай дзейнасці ў ВНУ Беларусі і за яе межамі. Сумарны жыццёвы шлях аўтараў гэтага выдання — больш за 200 гадоў! Так што нам ёсць чым падзяліцца з табой, паважаны чытач.

Важны момант у канцэпцыі «Дапаможніка» — тое, што мы паспрабавалі сумясціць тут тэорыю і практыку вясковага гаспадарання. І ў гэтым нам спрыяла тое, што ў нашым аўтарскім калектыве якраз і сабраліся людзі розныя: і практык са шматгадовым досведам, і навуковец з вопытам праектнай дзейнасці, і выкладчыкі, і муніцыпальная супрацоўніца. Нам таксама дапамагалі многія іншыя людзі: хто парадай, хто асабістым прыкладам, хто — стварэннем умоў для працы. Мы хочам падзякаваць, па-першае, сваім сем'ям, што цярпліва ставіліся да нашага праекта, а таксама Ганне Звяртоўскай, Міхаілу Захаранку, Віталю Жуковічу, і ўсім удзельнікам нашых сустрэч-абмеркаванняў за іх падтрымку, парады, неабыякавасць і добразычлівасць.

---

[1] Зварот на «ты» – традыцыйны ў беларускай культуры і выкарыстоўваецца намі з павагай да вас, чытачоў.

Падчас чытання ты, паважаны чытач, звернеш увагу на тое, што параграфы ў кніжцы — не падобныя адзін да другога. Некаторыя з іх — аповед аб выніках і ўроках шматгадовай працы на зямлі, канкрэтнага гаспадарання. Другія часткі — навукова-папулярнае абагульненне праектнай і навуковай працы ў напрамку мясцовага і рэгіянальнага ўстойлівага развіцця. Іншыя — аўтарскае бачанне таго, як напрацоўкі ў сферы  маркетынгу і менеджменту могуць быць карысныя вясковым гаспадарам. Акрамя гэтага ты сустрэнеш занатоўкі пра нямецкі досвед сучаснага дробнага гаспадарання ў вясковай мясцовасці. Кожны аўтар і кожная аўтарка гэтага выдання дае свой матэрыял ва ўласнай адмысловай манеры, па-свойму будуе размову з чытачамі. Мы свядома не «выроўнівалі» тэкст, як кажуць, на адзін капыл, каб пакінуць адчуванне давернай таварыскай гутаркі, якая, на наш погляд, таксама ёсць часткай узаемнай дапамогі.

Некаторыя нашы тэзісы могуць падацца спачатку ўсім вядомымі фактамі, але ж паспрабуй уважлівей паглядзець на гэтыя моманты, абдумаць, а ці напоўніцу ты карыстаешся схаваным у іх патэнцыялам.

Так, каб добра трымацца на нагах у вясковым жыцці, трэба ўсвядоміць, што ты адначасова:

- Самастойны незалежны чалавек — уладар сваёй зямлі, гаспадар сваёй маёмасці і індывідуальных рэсурсаў, валадар мноства розных ведаў і навыкаў, якія можна і трэба выкарыстоўваць для самарэалізацыі і для росквіту гаспадаркі, сям'і, грамады;
- Родзіч, сваяк, сямейны чалавек, сябар, у якога ёсць родныя і блізкія людзі — сям'я, надзейныя сябры, аднадумцы, разам з якімі твой патэнцыял і магчымасці ўзрастаюць;
- Удзельнік мясцовай грамады, сусед па вуліцы, вёсцы або мястэчку, член садовага таварыства, жыхар шматкватэрнага дома ці асобнага свайго роднага краю-старонкі, калега па працы, студэнт ва ўніверсітэце, навучэнец у школе — і гэтае яднанне таксама можна і трэба разглядаць як узрастанне тваіх магчымасцяў, пашырэнне моцы;
- Жыхар сельсавета, раёна, вобласці, краіны — і ў гэтай якасці ты маеш шырокія правы і магчымасці, у тым ліку ўдзельнічаць у выбарах (выбіраць і быць выбраным у мясцовыя і нацыянальныя органы ўлады), удзельнічаць у прыняцці рашэнняў і кантролі за іх выкананнем;
- Чалавек на планеце Зямля — прадстаўнік усяго чалавецтва ў адносінах да ўсяго іншага жывога і нежывога: звяроў і птушак, насякомых і рыб, раслін і грыбоў, мікраарганізмаў і экасістэм, гор і лясоў, рэк і азёр, акіянаў і мораў, лугоў і ўзгоркаў, балот і клімату.

А яшчэ верагодна, што ты — член грамадскай арганізацыі ці ініцыятывы або толькі задумаўся аб тым, каб далучыцца да

такіх аб’яднанняў або створыць разам з паплечнікамі сваю незалежную структуру, некамерцыйную ўстанову, фонд.

Вось жа які ты шматгранны, наш чытач! І гэтая твая разнастайнасць якраз і стварае ўмовы для ўстойлівага развіцця, для задавальнення тваіх патрэб у гармоніі з прыродай, разам з мясцовай грамадой і ўсім чалавецтвам, і адначасова з думкай пра будучыя пакаленні людзей і будучае ўсяго нашага агульнага дома — планеты Зямля.

Так што — сардэчна запрашаем у наша сумеснае падарожжа ў гэтым напрамку! Мы ўпэўненыя, што яно зменіць тваё жыццё да лепшага.

Каб спрасціць укараненне нашых парад у тваю гаспадарку, у канцы кніжкі мы прыводзім чэк-ліст — праверачны пералік крокаў, якія дапамогуць прывесці цябе і тваю сядзібу да ўстойлівага развіцця.

І яшчэ: многія з радкоў гэтай кніжкі пісаліся побач з садам і гародам, паміж палівам і праполкай, перад мульчаваннем і пасля закладання кампосту. Таму гэты дапаможнік можна разглядаць і як проста кніжку з досведам нашай паўсядзённай працы, якую можна пачытаць у вольную часіну. Яна дапаможа і проста падтрымаць дух, бадзёрасць і імпэт. А момантамі — нагадаць пра тое, што не заўсёды ўсё атрымліваецца так, як хочацца. І што ўсе робяць памылкі, многія могуць апынуцца ў вельмі складаным і цяжкім становішчы. Але варта ўсміхнуцца, падняцца ды рушыць далей. Наперад да ўстойлівай будучыні!



# Частка I

# Для сябе і для планеты Зямля

## § 1. Гаспадаранне з улікам канцэпцыі ўстойлівага развіцця

*Для сябе і дзеля планеты Зямля: сяброўскае развіццё прыроды і грамадства.*

У кожнай прыватнай вясковай гаспадарцы ўважлівае вока абавязкова знойдзе такія моманты, рысы, асаблівасці, якія самым цесным чынам звязаныя з глабальнымі, агульначалавечымі, планетарнымі задачамі і праблемамі. Па-першае, вырошчванне прадукцыі. Хоць у невялікіх аб'ёмах, можа, толькі некалькі раслінак кропу, кусцік парэчак ці яблыня — а гэта ўжо ўнёсак у вырашэнне актуальнай праблемы чалавецтва — накарміць кожнага, пазбавіцца голаду. Па-другое, кожны гаспадар на сваёй зямлі хоча і дамагаецца, каб там было чыста, без шкоднай хіміі, бяспечна. Такім чынам мы бачым канкрэтны ўдзел у вырашэнні сусветнай праблемы забруджвання планеты. Таксама на кожнай зямельнай дзялцы мы ўбачым расліны, клумбы, садкі, зялёныя агароджы — а гэта ўнёсак у падтрымку прыроднага кругазвароту, біяразнастайнасці, што рупіць зараз мільёны людзей па ўсім свеце. І гэта толькі пачатак, бо амаль у кожнай рацыянальнай дзейнасці вясковых гаспадароў можна знайсці і многа іншых прыкладаў таго, што зараз называюць практыкамі ўстойлівага развіцця.

**Устойлівае развіццё (УР)** *(анг. sustainable development)* — гэта такое развіццё, пры якім задавальненне патрэб сённяшняга пакалення адбываецца без ушчамлення магчымасцяў будучых пакаленняў задавальняць свае патрэбы. Такая фармулёўка, якой карыстаецца ААН, у наш час найбольш распаўсюджаная. Разам з гэтым маецца вялікая колькасць іншых тлумачэнняў тэрміна УР. Так, Сусветны банк падкрэслівае, што ўстойлівае развіццё — гэта кіраванне агульным капіталам грамадства з мэтай збераження і прымнажэння чалавечых магчымасцяў. Часта сэнс УР вызначаецца праз неабходнасць гарманічнага развіцця прыроды (навакольнага асяроддзя), чалавека (сацыяльнай сферы) і вытворчасці (эканомікі). У некаторых выпадках акцэнт робіцца на неперавышэнне гранічна дапушчальнага ўзроўню антрапагеннага ўздзеяння на экасістэмы[2].

[2] Экасістэма — комплекс са згуртавання жывых арганізмаў і нежывых кампанентаў асяроддзя іх пражывання, звязаных паміж сабой абменам рэчыва і энергіі. Крыніца: https://be.wikipedia.org/wiki/%D0%AD%D0%BA%D0%B0%D1%81%D1%96%D1%81%D1%82%D1%8D%D0%BC%D0%B0.



Малюнак 1. Узаемаадносіны прыроды, грамадства і эканомікі

На малюнку 1 мы схематычна адлюстравалі прапорцыі-суадносіны прыроды, чалавека і эканомікі. З яго відаць, што ўсё, што робіцца чалавекам — робіцца ў прыродзе, таму і інтарэсы прыроды трэба мець за прыярытэт.

Важна памятаць, што тэматыка ўстойлівага развіцця выспела як рэакцыя на комплексныя праблемы, якія паўсталі перад чалавецтвам. Тут і хуткі рост насельніцтва планеты, і дэградацыя біялагічнай і культурнай разнастайнасці, і сацыяльныя дысбалансы ў багацці і правах чалавека, негатыўныя экалагічныя працэсы, забруджванне зямлі, вады і паветра, змены клімату. Каб выйсці пераможцам у барацьбе з глабальнымі выклікамі, трэба адначасова і глыбей вывучаць гэтыя з'явы, і авалодваць навыкамі супрацьстаяння ім. І разам з тым неадкладна дзейнічаць, бо ўжо сёння вядомыя многія неабходныя напрамкі, інструменты і механізмы для пераўтварэнняў да лепшага. Гэта — адначасова і важныя, і цікавыя, і складаныя, і ганаровыя задачы. Спрычыніцца да іх вырашэння — добры занятак для людзей усіх узростаў і занткаў. А ўжо што казаць пра вясковых гаспадароў! Тут ім, як кажуць — у добры шлях!

Засвойваць тэорыю ўстойлівага развіцця і ўводзіць яе інструменты і метады ў практычную дзейнасць вясковых гаспадароў — цікавая і творчая справа. Рабіць яе можна паступова, крок за крокам. Але важна быць паслядоўным і пастаянна суадносіць дзеянні з прынцыпамі ўстойлівага развіцця. Адным з важкіх эфектаў ад гэтага будзе і карысць для прыроды.

Прынцыпы ўстойлівага развіцця — ідэі, што задаюць кірунак, асноўныя правілы, стандарты, арыенціры, што трэба ўлічваць, якімі кіравацца, каб ваша сядзіба-гаспадарка[3] развівалася ўстойліва.

Пазнаёміцца з прынцыпамі ўстойлівага развіцця, зразумець іх, запомніць, і, што самае галоўнае, выкарыстоўваць у практыцы — адна з асноў адукацыі для ўстойлівага развіцця. Прычым тут можна сутыкнуц-

[3] Спадарыня Аляксандра, удзельніца нашых сустрэч па пытаннях вясковай самазанятасці узгадала тэрмін грунт, якім называлася сямейная спадчынная гаспадарка. Бачыцца перспектыщным распаўсюджванне гэтага тэрміна, бо чуецца ў ім якраз еднасць сям'і-роду гаспадароў і зямлі, што ім належыць спрадвеку.

ца з праблемай, бо ў розных крыніцах інфармацыі, кнігах, метадычных распрацоўках можна сустрэць дзясяткі, бадай, нават сотні прынцыпаў, якія аўтары прапануюць у якасці прынцыпаў устойлівага развіцця. Каб засцерагчы цябе на гэтай пуцявіне ад марных блуканняў і нават дэзарыентацыі, прапануем пачаць знаёмства з пяццю (як пальцаў на руцэ!) прынцыпамі. Іх мы выпрацавалі падчас многіх адукацыйных мерапрыемстваў у розных гарадах і раёнах Беларусі і за яе межамі, аналізу навуковых даследаванняў па гэтай тэме, а таксама за часы выкладчыцкай работы ва ўніверсітэтах. Вось гэтыя **прынцыпы:**

**1. Арыентацыя на вобраз пажаданай будучыні.** Важна, хоць бы ў агульных рысах, ведаць, уяўляць сабе тое становішча, да якога імкняцеся.

**2. Улік экалагічных абмежаванняў** (экалагічны імператыў). Тлумачэнне гэтага прынцыпу можна праілюстраваць на прыкладзе агульнага сходу, на якім сярод удзельнікаў няма нікога акрамя людзей: ні птушак, ні звяроў, ні дрэў, якія маглі б звярнуць увагу на патрэбы прыроды. Таму нам трэба падумаць за іх, зірнуць на сітуацыю і нашы планы «іх вачыма».

**3. Сістэмнасць і комплекснасць развіцця** (спалучэнне сацыяльных, эканамічных і прыродаахоўных мэт і міждысцыплінарнасць пры распрацоўцы планаў). Трэба дамагацца збалансаванасці гэтых мэт і іх вынікаў.

**4. Выкарыстанне мясцовых рэсурсаў і інавацый.** Такі прынцып дазваляе ўбачыць найбліжэйшы патэнцыял, пераадолець страх перад недахопам, напрыклад, фінансаў на першых этапах працы. Многія паспяховыя прыклады ўстойлівага развіцця грунтуюцца менавіта на мясцовых рэсурсах.

**5. Партнёрства, шырокі ўдзел.** Згуртаваны клін гусінай чарады — тут выдатны прыклад партнёрства і зладжанасці. Супольна — значыць хутчэй, бяспечней, больш эфектыўна і нават весялей! І важна нікога не забыць. «Калі хочаш ісці хутка — ідзі адзін; калі хочаш дайсці далёка — ідзіце разам», — абвяшчае вядомая прыказка.

**6. Прынцып разнастайнасці.** У разнастайнасці — моц! Гэтае сцвярджэнне справядлівае для ўсіх аспектаў жыцця планеты і чалавека. Біялагічная і культурная разнастайнасць — як мінімум. У тым ліку зберажэнне мовы нашай беларускай.

Гаспадаранне на прынцыпах УР — гэта якраз такі выпадак: сумеснае доўгатэрміновае падарожжа разнастайных удзельнікаў у кірунку ўстойлівага развіцця.

Спадзяёмся, што названыя прынцыпы ўстойлівага развіцця будуць пачаткам больш глыбокага і шырэйшага твайго знаёмства з гэтай тэмай, стануць каталізатарам тваёй цікаўнасці да яе.

Важна таксама, што прымяненне прынцыпаў устойлівага

развіцця ў вясковай гаспадарцы мае, з аднаго боку — доўгатэрміновы эфект (калі, напрыклад, ты пасадзіш дрэвы так, каб яны стрымлівалі вятры і давалі цень тым раслінам, якім гэта падабаецца). А з другога боку, заўсёды трэба пераасэнсоўваць сітуацыю зноў, з улікам новых абставін, сацыяльных, тэхналагічных і прыродных змен.

Кожны прынцып можа выглядаць і як дзеянне, мерапрыемства ці нават набор дзеянняў і мерапрыемстваў.

Так, у першым прынцыпе — **арыентацыі на вобраз жаданай будучыні** — мы ўбачым такія справы-заданні:

1.1. Абмяркуй са сваімі блізкімі, якой вы ўяўляеце жаданую візію (бачанне) сваёй вясковай сядзібы, дома, гаспадаркі, яе атачэння.

1.2. Зафіксуй тыя моманты бачання, па якіх дасягнуты кансэнсус.

1.3. Выкарыстоўвай гэтыя запісы падчас планавання канкрэтных мерапрыемстваў, спраў па гаспадарцы.

Напрыклад, калі вы запісалі, што хочаце арыентавацца на экалагічнасць вашага жытла і гаспадаркі, то ўлічвайце гэты момант падчас закупак будаўнічых матэрыялаў, угнаенняў для саду-гароду, прадметаў быту, адзення, інструментаў, цацак.

Па другім прынцыпе **(прынцыпе комплекснасці)** справы-заданні могуць выглядаць наступным чынам:

2.1. Прывучыся абдумваць крокі па развіцці вашай сядзібы як мінімум з пунктаў гледжання прыроды, сацыяльных аспектаў і эканомікі.

2.2. Калі пытанне няпростае, то можна скарыстацца простай таблічкай фіксацыі гэтых аспектаў (гл. Табліца 1), што дазволіць улічыць іх усе, а не толькі, напрыклад, фінансавыя затраты, якія могуць «навесці цень» на іншыя пазітыўныя ці негатыўныя моманты.

2.3. У якасці яшчэ адной «памочніцы» па рэалізацыі гэтага прынцыпу можа стаць дыяграма-павуцінка, у якую можна дадаць і некаторыя іншыя важныя для цябе і тваёй сям'і моманты, напрыклад, прыгажосць (эстэтычныя моманты), блізкасць да нейкага важнага для вас аб'екта (асабліва падчас пошуку вашай сядзібы мары) і іншыя. Добра, калі ваша дыяграма выглядае збалансавана ці перавагі адных аспектаў над іншымі нязначныя.




Малюнак 2. Ацэнка дасягнення некаторых параметраў-характарыстык вашай сядзібы-гаспадаркі

2.4. Запрасіце да абмеркавання вашага праекта людзей з іншай, чым у вас, спецыяльнасцю, адукацыяй, прафесіяй, досведам. Гэта дадасць новыя аргументы і ўрэшце палепшыць рашэнне.

**Прынцып экалагічнага імператыву** – гэта, так бы мовіць, дадатковы акцэнт на інтарэсах прыроды. Бо, як мы ўжо звярталі на гэта ўвагу, у нашым «мазгавым шт урме» па выбары найлепшых варыянтаў развіцця тваёй сядзібы і навакольнага асяроддзя бярэ ўдзел толькі чалавек, людзі, а астатнія нашыя суседзі па планеце моўчкі займаюцца ў гэты час сваімі справамі. Таму:

3.1. Уяві, што на нарадзе па планаванні твайго, напрыклад, саду-гароду, сядзелі б побач з табой яшчэ і заяц, вавёрка, верабей, а можа і нават мураш і крот. Якія аргументы ў сваю абарону маглі б яны прывесці? Пастаў сябе на іх месца і ўлічы важныя для іх жыцця моманты.

3.2. Прыглядайся да прыродных рашэнняў праблем, якія ўзнікаюць, глядзі на тыя з'явы, якіх табе хочацца пазбавіцца, збоку: а што разам з гэтым можа знікнуць карыснае? Памятай пры гэтым народную мудрасць: «У кожнай палкі два канцы», то бок, нешта дрэннае, а нешта і добрае.

3.3. Тлумач важнасць экапрыязнага падыходу знаёмым і суседзям, у мясцовым чаце і падчас выхавання малых, дэманструй добрыя вынікі супрацоўніцтва з прыродай, а яна сапраўды аддзячыць кожнаму за добрыя да сябе адносіны.

У адным з праектаў па ўстойлівым развіцці вясковых тэрыторый, пра які нам давялося пачуць у Польшчы, мясцовая грамада занепакоілася вялікай колькасцю мошак і камароў у іхняй вёсцы. Разважалі, што ж зрабіць з гэтай напасцю. Першыя прапановы былі ў напрамку выкарыстання хімічных прэпаратаў. Аднак задумаліся, што хімія будзе шкодная і для саміх жыхароў. І вось запрошаны эксперт-заолаг прапанаваў: «А далучыце вы да гэтай справы птушак. Пабудуйце птушыныя хаткі, а калі птушак будзе многа, яны з'ядуць камароў-мошак. Так і здарылася. Поспех быў вельмі заўважны. А бонусам сталі спевы птушак. Іншыя прыклады на гэтую тэму вы знойдзеце ў наступных раздзелах кніжкі.

**Прынцып выкарыстання мясцовых рэсурсаў і інавацый** рэалізуецца праз ідэі, парады і справы, звязаныя з патэнцыялам тэрыторыі, месца, найбліжэйшымі рэсурсамі, а таксама з аб'яднаннем гэтага патэнцыялу з магчымасцямі навуковага і тэхналагічнага прагрэсу. Для пачатку трэба проста зразумець, што рэсурсаў гэтых побач – процьма! Проста трэба заўважаць іх і ўмець імі карыстацца. Англійскі блогер, пісьменнік і актывіст руху па развіцці мясцовых супольнасцяў Роб Хопкінс сабраў у асобнай кніжцы гісторыі пазітыўных дзеянняў-перамен мясцовых супольнасцяў у кірунку ўстойлівага развіцця па ўсім свеце. Ва ўводзінах да гэтай публіка-

цыі ён напісаў: «Гэтыя гісторыі паказваюць, што супольнасці пачынаюць з таго месца, дзе яны ёсць: адзначаюць адметнасць свайго месца, яго мудрагелістасць, яго культуру і будуюць будучыню на гэтых падмурках».[4] Гэтае вельмі трапнае выказванне напоўніцу адносіцца і да асабістай вясковай сядзібы і яе атачэння. Больш падрабязна разгледзім гэтае пытанне ў частцы 2.1 гэтага дапаможніка.

Тут трэба заўсёды вучыцца ў іншых! Прыклады, паспяховыя гісторыі іншых людзей падштурхоўваюць да асабістых дзеянняў.

Кожная вясковая сядзіба — гэта яшчэ і своеасаблівая лабараторыя. У ёй даследуецца, выпрабоўваецца і рэалізуецца на практыцы мноства элементаў узаемаадносін паміж вамі і прыродай, а таксама паміж вамі як чалавечым калектывам і паміж прыроднымі комплексамі. Важна, што адначасова ідуць і ўнутраныя працэсы ў вашым адчуванні жыцця, яны таксама змяняюцца пад уплывам асяроддзя, новых ведаў і эмоцый. Так, менавіта ў сяброўстве з прыродай можна дасягнуць і ўнутранай, і сумеснай гармоніі.

**Прынцып партнёрства** — ім прасякнутыя ўсе часткі «Дапаможніка», а таксама аб гэтым часта і многа напісана ў розных кніжках, брашурах і рэкамендацыях па ўстойлівым развіцці на мясцовым узроўні. Галоўная новая ідэя тут: распаўсюдзіць такі падыход на адносіны не толькі з чалавекам, але і з іншымі элементамі прыроднага асяроддзя. Існуюць партнёрствы (экасістэмы) паміж раслінамі і жывёламі, дык давайце і мы пасябруем-стававарышуемся з імі. Ужо ёсць добры досвед такіх адносін паміж людзьмі і звярамі, птушкамі. Многа такога можна сустрэць у народных беларускіх казках і ў водгаласах старажытных вераванняў нашых продкаў. Але ж давайце дададзім у гэтае кола і рэптылій — жаб і рапух, і розных казурак, грыбы і нават шматлікае мікранасельніцтва глебы. Ты можаш спытаць: як зямля-глеба можа стаць партнёрам у справе гаспадарання? А вось нядаўна пачуты факт: менавіта зямля — найлепшы і танны метад назапашвання вады для твайго саду-гароду. Калі яна жывая (глядзіце аб гэтым у параграфе 7) і калі дзялка спланавана так, каб патрэбная колькасць вады заставалася там, а калі лішак — то сцякала, то ты вельмі хутка адчуеш даброты ад такога партнёрства праз эканомію сіл і сродкаў і лепшыя ўраджаі.

[4] З публікацыі How a movement of communities is coming together to reimagine and rebuild our world. 21 Stories of Transition. 2015. By Rob Hopkins. Page 13. (https://transitionnetwork.org/wp-content/uploads/2018/04/COP21_21_Stories_email_Eng.pdf) / Пераклад з ангельскай наш.

10 гадоў таму журналістка часопіса «Гаспадыня» Ала Жур напісала артыкул[5] паводле майго выступу на семінары і інтэрв'ю, дзе я расказаў пра сваё лецішча-дачу. Там, пэўна, упершыню я згадаў пра партнёрства і супрацоўніцтва з іншымі жывымі істотамі, акрамя чалавека. Прывяду тут невялікі кавалак той публікацыі:

«Галінкі пасля абрэзкі рэкамендуюць скласці кучкай за загараддзю, каб там маглі пажыць і зайчык, і вожык, і розныя дробныя звяркі. Усё гэта робіцца для зберажэння біялагічнай разнастайнасці, з чаго і складаюцца падыходы ўстойлівага развіцця.

— Але ж зайцы пагрызуць кару дачных дрэваў! — пярэчу я [Ала Жур. — А. С.].

— Калі ў іх будзе дастаткова зрэзаных галін, можа, яны не будуць чапаць сад.

— Атрымліваецца, з усімі трэба дамаўляцца, дзяліцца?

— Безумоўна. Тады і сам будзеш у выйгрышы. Напрыклад, у нас моцна баяцца кратоў на сваіх участках. Я дазваляю жыць невялікай іх колькасці. Дача ў нас размешчана на схіле ўзгорка. Падчас дажджоў праз кратовыя норы вада хутка сыходзіць. Калі кратоў робіцца больш, можна засунуць у нару тухлую рыбінку, і яны пакінуць гэтае месца, бо ахайныя.

Шмат у мяне ўсякіх жаб і рапух, якія з'ядаюць велізарную колькасць шкодных для сельскай гаспадаркі казурак. А ў далёкім кутку саду я паклаў вялікія камяні. За імі высаджваю тапінамбур. Ён, як вядома, прыцягвае мышэй. Хай яны лепш там жывуць, а не гарэзуюць на газоне».

Ёсць многа метадаў стварэння такіх «зялёных» партнёрстваў-таварystваў. Звяртайце ўвагу на жыццё прыроды вакол. Аднойчы, калі я усталёўваў лоўчыя паясы на дрэвах, бо хацеў зрабіць перашкоду мурашам пасяляць там тлю, то аднойчы заўважыў, што адзін з мурашоў цягнуў з дрэва нейкую мошку-казурку. Так ён, можа, выратаваў яблык ці лісцік. А аднойчы, калі збіраў каларадскіх жукоў на бульбе, убачыў, што на лісце сядзіць вялікі зялёны конік (скачок, як казалі ў нас на Быхаўшчыне), трымае «у руках» лічынку каларада і есць яе! А ў бубачках-экскрэментах рапух, якія трапіліся на замошчанай пліткай сцяжынцы ля сада, выпадкова ўгледзеў таксама спецыфічныя каларадскія крыльцы. Пра рапух дык увогуле народная мудрасць кажа: «Шануй рапуху ў садзе, а чалавека ў грамадзе». Тут, як кажуць, «ні адняць — ні прыбавіць».



[5] Дача для прекрасного будущего // Гаспадыня, № 11 (267), Алла Жур, ноябрь 2014 г. С. 10–12.

## § 2. Пачатак. Арыенціры і каштоўнасці. Самазанятасць на зямлі: ад ідэі да практыкі

*Якператварыць хобі ў бізнес; арганізацыя малога прадпрыемства на вёсцы: што трэба ўлічваць, на што арыентавацца; першыя крокі, партнёры, вынікі*

## ПАЧАТАК

У пэўны час, у пэўным узросце ты, шаноўны сябра, вырашыў ці вырашыла пераехаць на пражыванне ў сельскую мясцовасць.

І першым пытаннем будзе: як далёка ад буйных гарадоў табе захочацца шукаць сабе месца для здзяйснення сваёй мары.

Далей за сотню кіламетраў ад горада – і будзеш мець менш цывілізацыйных уплываў, больш цнатлівую прыроду, але ездзіць штодня на працу ў горад будзе накладна і па грашах, і па часе.

Калі знойдзеш для сябе вёску недалёка ад горада, будзе значна даражэй каштаваць дом, і будуць дзейнічаць іншыя абмежаванні...

Другая важная акалічнасць для выбару новага месца жыхарства – наяўнасць **інфраструктуры:** дзіцячага садка, школы для дзяцей, крам, магчымасці парамантаваць на месцы аўто, набыць неабходныя лекі, звярнуцца па медычную дапамогу і г. д.

Можна шукаць сабе месца ў населенай вёсцы, а можна на хутары, каб жыць больш засяроджана, без сацыяльнай мітусні, але кожны варыянт будзе мець як свае перавагі, так і недахопы. Кожны з вас, чытачоў, будзе падбіраць варыянт пад свае жаданні і магчымасці.

Але агульным пытаннем для ўсіх варыянтаў стане – як забяспечыць матэрыяльную стабільнасць і наяўнасць фінансаў для гаспадарання і пражывання на вёсцы?

Адразу пасля набыцця дзялкі альбо дамка ў сельскай мясцовасці паўстануць пытанні рэканструкцыі, кансервацыі наяўных забудоў.

Часам гэта больш затратна, чым пабудова новых. Да таго ж трэба адшукаць прыстойных спецыялістаў, якія зробяць дакладны аналіз пабудоў, і спецыялістаў-будаўнікоў па рэстаўрацыі і выкананні адпаведных пачатковых работ.

Можна, безумоўна, усе работы выконваць сваімі сіламі, і гэта будзе значна танней. Але не ўсе маюць адпаведныя навыкі для выканання нестандартных будаўнічых прац.

Сёння людзі не могуць жыць без самых неабходных выгод: эканамічнага, зручнага ацяплення, усесезоннага карыстання цёплай вадой, прыбіральні ў доме і г. д. А для таго, каб гэтыя выгоды з'явіліся ў новым жыцці, трэба знайсці інжынераў з адпаведнымі ведамі і практычным вопытам. Часам кожны з такіх спецыялістаў прапаноўвае сваё бачанне ўладкавання інжынерных рашэнняў.

Трэба будзе самім аналізаваць, навучыцца разбірацца, каб прыняць найлепшае для сябе рашэнне. На ўсё гэта спатрэбіцца і час, і сродкі.

Каб не выдаткаваць больш сродкаў на гэтым этапе пачатковага абжывання на сваёй зямлі, я прапанаваў бы са свайго вопыту такую пакрокавую стратэгію дзеянняў:

**1. Пераправерыць межы сваёй дзялкі**, якая перайшла да цябе разам з набытым вясковым домам. Паглядзець разам з землямернымі службамі, якая зямля мае якое прызначэнне: што ідзе для абслугоўвання дома, а якая частка зямлі дадзеная ў арэнду для агародніцтва (звычайна сяляне на ёй вырошчвалі бульбу для скаціны і лічылі, што гэтая зямля таксама іхняя ўласнасць...). Гэта будзе важна для размяшчэння вашых будучых забудоў — каб не сталася так, што ты збудуеш, напрыклад, куратнік, які адной часткаю будзе пачынацца на зямлі для абслугоўвання дома, а другой — для вядзення гародніцтва. Бо ў такім разе давядзецца бурыць сваю пабудову, таму што пры яе афармленні мясцовыя органы ўлады будуць настойваць на «чыстых» межах, без перашкод.

2. Абмераны план дзялянкі з размяшчэннем дома і іншых пабудоў трэба **раздрукаваць** для сваёй далейшай працы. Глядзі на яго і думай, дзе што ты размесціш. Дзе, напрыклад, будзе свідравіна для вады прабіта (калі яе ў цябе няма), дзе будуць пад'язныя шляхі, дзе будзеш складаць будаўнічыя матэрыялы, дзе выкапаеш септыкі (і якія яны ў цябе будуць), дзе якія дрэвы пасадзіш, каб не парушаць заканадаўчых нормаў. З гэтым планам можна раіцца са спецыялістамі-інжынерамі па водазабеспячэнні і каналізацыі, электрыкамі, газаўшчыкамі і ландшафтнымі дызайнерамі. Найбліжэйшыя некалькі гадоў не выпускай плана з рук, няхай ён будзе заўжды пры табе і ў тваёй свядомасці.

3. Пасля таго, як пазначыш на плане ўсе свае пажаданні, добра было б яго **ўзгадніць** у раённым аддзеле архітэктуры. Канечне, падчас ажыццяўлення запланаваных работ могуць узнікнуць адхіленні. Напрыклад, у пазначаным месцы не знайшлі ваду, і свідравіну для вады прыйшлося біць у іншым месцы. Але зрабіць папраўку ва ўзгодненым плане лягчэй, чым потым узгадняць пабудовы ў райвыканкаме без наяўнасці плана.

4. І самы прыемны апошні крок — **пачынаць** здзяйсняць сваю мару. Знайсці прафесійных, сумленных будаўнікоў, а самім разбіваць гарод, сад (лесасад), размяшчаць зону для дзяцей, жывёл, прыгатавання ежы і гэтак далей.

5. **Увесці** абноўлены дом і дадатковыя пабудовы **ў эксплуатацыю** па пэўных працэдурах і заканадаўчых правілах.

## АРЫЕНЦІРЫ І КАШТОЎНАСЦІ

Ажыццяўленне ўсяго пералічанага вышэй у значнай ступені залежыць ад тваіх мэт і каштоўнасцей. Вельмі істотным тут выступае **стаўленне да экалагічнасці**. Бо ў значнай ступені пераезд з горада ў вёску базуецца на жаданні выбраць для сябе больш экапрыязныя формы для жыцця сваёй сям'і.

Таму выбар матэрыялаў для будаўніцтва новага дома альбо рэнавацыі старога дома будзе вельмі залежаць ад экалагічных якасцяў. Высокія патрабаванні для экаматэрыялаў могуць павялічыць кошт усіх прац, але ў будучым забяспечыць камфортнае, здаровае пражыванне. Можна выбраць і варыянт самастойнай падрыхтоўкі будаўнічых матэрыялаў з экасыравіны, але тут важна выконваць усе тэхналагічныя нормы (самант, салома, экапанэлі і інш.)

Другой каштоўнасцю для мяне было тое, што я адразу хацеў, каб мае дзеці, унукі, сябры і знаёмыя маглі бачыць ужывую ўсю разнастайнасць дрэваў, кустоў і іншых раслін, якія растуць у нашых лясах. Бо для гарадскіх людзей вельмі цяжка назваць і адрозніць больш за дзясятак дрэваў. Калі ў вас будзе магчымасць стварыць свой міні-лесасад, то вы прадэманструеце, чым адрозніваецца вяз ад граба ці бук ад ясеня... Захоўваць такія веды ў грамадстве — надзвычай важна. Бо гэта звязана не толькі з біяразнастайнасцю, але і з разнастайнасцю як важным прынцыпам устойлівага развіцця.

Экалагічнаму выхаванню цяпер надаецца шмат увагі. Але непасрэднае жыццё сярод раслiннасці, свойскіх жывёл і дзікіх як нішто іншае дае ўбачыць глыбіню фіта- і біяцэнозаў — шматлікіх прыродных сувязяў і законаў. Таму жыццё на сваёй зямлі ў знітаванасці з прыродным асяроддзем дае падставы для экалагічнага натуральнага светаўспрымання.

Наступным важным прынцыпам для ўстойлівасці сям'і будзе тое, што з дзясятак і больш гадоў вы зможаце на зямлі быць у больш цесных сувязях розных пакаленняў адной сям'і: дзеці і бацькі, дзяды і ўнукі змогуць разам працаваць, больш глыбока адзін аднаго адчуваць, адзін другому дапамагаць і таленты свае раскрываць. Такі традыцыйны лад жыцця дапаможа на шмат гадоў наперад даць дзецям адчуванне сямейнага адзінства, прывязанасці не толькі да сваёй канкрэтнай зямлі вакол дома, але і любові да роднага краю наогул. Сямейная повязь — гэта адзін з моцных чыннікаў выхавання праўдзівага патрыятызму і любові да сваёй радзімы.

## САМАЗАНЯТАСЦЬ НА ЗЯМЛІ: АД ІДЭІ ДА ПРАКТЫКІ

*Як ператварыць хобі ў бізнес; арганізацыя малога прадпрыемства на вёсцы: што трэба ўлічваць, на што арыентавацца; першыя крокі, партнёры, вынікі.*

Для вырашэння ўсіх бягучых гаспадарчых пытанняў пры жыцці ў вёсцы трэба мець не толькі «вобраз жаданай будучыні», канкрэтны план дасягнення гэтай будучыні, але матэрыяльныя, сацыяльныя і чалавечыя рэсурсы.

Адным з такіх рэсурсаў можа быць сям'я, якая працуе штодня сама на сябе і не патрабуе ніякіх фінансаў. Так было ў нас першыя дзесяць гадоў, пакуль дзеці былі з намі побач і кожны дзень рабілі шмат працы.

Але каб рамантаваць старыя будынкі, набываць расліны, свойскіх жывёл і неабходнае абсталяванне, трэба мець фінансавыя сродкі.

Часта бывае, што першыя гады такія сродкі зарабляюцца ў іншым месцы і ўкладаюцца ў гаспадарку. Бывае, што чалавек можа працаваць дыстанцыйна, такім чынам зарабляць і ўкладаць у развіццё вясковай гаспадаркі. Але важна, пакуль маюцца такія знешнія ад зямлі заробкі, выбраць сабе форму той дзейнасці, якая будзе прыносіць прыбытак. І гэты прыбытак стане з цягам часу адзінай крыніцай паступлення фінансавых сродкаў.

На выбар такой дзейнасці могуць уплываць розныя фактары. Пералічым некаторыя з іх:

- **Адлегласць вёскі**, у якой вы пачалі жыць, ад буйных гарадоў. Рэалізаваць сваю прадукцыю побач з мегаполісам значна лягчэй і спатрэбіцца мінімальная лагістыка.
- **Інавацыйнасць.** Заўжды, напрыклад, развядзенне новых парод і гатункаў больш прыбытковае, чым вырошчванне знаёмых для ўсіх, шырока распаўсюджаных гатункаў.
- **Колькасць работнікаў,** якая неабходная для вядзення сваёй справы. Ці будуць у вас памочнікі, патрэбныя для належнай працы?
- Наяўнасць неабходнай **колькасці зямлі і кармавой базы** для жывёлагадоўлі альбо для пашырэння гадавальніка для раслін.
- **Любоў і асабістая зацікаўленасць** да той ці іншай справы.

Прааналізаваўшы гэтыя і іншыя фактары, зрабіўшы SWOT-аналіз з улікам усіх моцных і слабых бакоў, пагроз і магчымасцей, можна пераходзіць да распрацоўкі асабістага **бізнес-плана.**

Добра, калі табе будзе з кім параіцца пры складанні такога плана. Каб нехта сваім «незамыленым» вокам убачыў, прааналізаваў і ацаніў яго рэалістычнасць.

Важна ўлічыць пры планаванні кароткую, сярэднюю і доўгатэрміновую перспектыву.

Мне запомніўся прыклад, калі ў сярэдзіне 2000-х гадоў адзін гаспадар, прадаўшы сваю гарадскую кватэру, уклаў каля 50 тысяч даляраў у пабудову шэдаў для развядзення ў іх трусоў на мяса. У той час папулярнасць мяса трусоў была досыць высокая, многа прысутнічала ў СМІ рэкамендацый спецыялістаў-дыетолагаў каб ужываць менавіта трусяціну для па-

ляпшэння свайго здароўя. І такі бізнес быў вельмі прыбытковы. Мяса разыходзілася сярод сяброў, знаёмых, быў арганізаваны вываз яго ў Расію.

Але праз дзесяць гадоў усё рэзка памянялася. Бізнес вырас, а попыт зменшыўся. Вырасла канкурэнцыя, знізіўся кошт. Патрэбны былі новыя немалыя ўкладанні на набыццё халадзільных камер, невялікіх распрацовачных цэхаў... І гэта пры тым, што немалыя сродкі патрабаваліся на мадэрнізацыю памяшканняў. А продажы знізіліся... І апынуўся гаспадар пад пагрозай банкруцтва, нікога не знайшлося з ахвотных, каб набыць яго некалі паспяховы бізнес.

Вельмі важна для развіцця ўласнага прадпрымальніцтва на вёсцы — мець кааперацыю з падобнымі гаспадаркамі на лакальным узроўні.

**КААПЕРАЦЫЯ,** узаемакарыснае партнёрства дазволіць зрабіць сваю справу больш паспяховай. У першаю чаргу за кошт стварэння адзінага прадукту, які будзе складацца з разнастайных рэчаў.

Калі, напрыклад, ты будзеш рэалізоўваць свае прадукты птушкаводства — мяса курэй, гусей, індыкоў альбо іх яйкі, то спажыўцы хутчэй за ўсё папросяць у цябе і іншую прадукцыю: смятану, масла, малако, сыры, зеляніну, ягады і садавіну. І калі ў цябе не хапае часу і магчымасцей займацца каровамі, козамі, садам і агародам адначасова, то выручыць кааперацыя. Самае простае: камунікаваць на базе аднаго-двух сельсаветаў розным гаспадаркам. Адны гаспадары змогуць пакласці ў агульны кошык нешта сваё, другія — іншае і ў выніку будзе вельмі ёмкі кошык размаітай хатняй прадукцыі з адной мясцовасці. Спажывец будзе рады, і ўсе паасобныя гаспадаркі змогуць хутчэй рэалізаваць лішкі сваёй прадукцыі.

Так працуе ў нас ужо шмат гадоў, і мы зразумелі, што ад гэтага ў выйгрышы застаюцца ўсе — і гаспадары-вытворцы і спажыўцы-гараджане.

**Важна прадумаць і юрыдычную форму свайго гаспадарання.**

1. Можна напісаць заяву ў мясцовыя органы ўлады (сельсавет), каб выдзелілі вам дадатковы надзел для АПГ **(асабістай прысядзібнай гаспадаркі).** Стаць на ім самазанятым. Калі не пенсіянер, дык аформіць праз сайт ці мабільную праграму падатак на прафесійную дзейнасць, плаціць адлічэнні ў ФСАН і працаваць легальна на сябе самога.

2. Можна аформіць сваю гаспадарку як СФГ — **сялянскую фермерскую гаспадарку.** Стаць такім чынам паўнавартаснай юрыдычнай асобай — можна будзе ў такім выпадку заключаць дамовы з іншымі юрыдычнымі суб’ектамі гаспадарання, афармляць на працу наёмных людзей і г. д. Тут ужо будзе іншы падыход да справы. Прадаваць вырашчаную пра-

дукцыю можа праз гандлёвыя сеткі. Акрамя таго, можна разлічваць на падтрымку дзяржавы, ільготныя крэдыты і іншае.

3. Можна зарэгістравацца на вёсцы як **рамеснік**, вырабляць прадукцыю і плаціць падаткі на прафесійную дзейнасць.

4. Можна зарэгістраваць **аграсядзібу** і займацца турыстычнай і асветніцкай дзейнасцю на вёсцы на базе сваёй аграсядзібы.

5. Можна адкрыць міні-**прадпрыемства па паслугах** (рамонт, працы, звязаныя з пэўнымі паслугамі і іншае). Але на гэта трэба будзе браць дазвол і ўзгадняць з адпаведнымі дзяржаўнымі структурамі.

Усе пералічаныя формы дзейнасці на вёсцы маюць як свае станоўчыя бакі, так і складанасці. Выбіраць для сябе больш адпаведную форму можна не спяшаючыся: спачатку выбраць больш простае, потым, як справы будуць належным чынам наладжаны і прынясуць прыбытак, перайсці на больш адпаведную форму. Лепш не пачынаць, напрыклад, з афармлення СФГ, калі ў цябе не наладжаны збыт прадукцыі і ты не адчуваеш сябе майстрам і спецыялістам па сваёй выбранай тэме гаспадарання.

Хачу прывесці некалькі прыкладаў сярэдзіны 2000-х гадоў трох розных гаспадарак, якія размяшчаліся недалёка адна ад адной у адным і тым жа раёне.

Першая гаспадарка – вёска Чухны. Там гаспадарка Ігара Х. атрымала грантавую дапамогу на стварэнне арганік-фермы, пачала актыўна развівацца. Туды вазілі зацікаўленых пачаткоўцаў на азнаямленне новай для Беларусі практыкі гаспадарання з прымяненнем адмысловай тэхнікі для апрацоўкі зямлі.

Акрамя набыцця адпаведнай сельскагаспадарчай тэхнікі па вядзенні арганік-вытворчасці, былі закуплены саджанцы чорных парэчак, наладжана вермівытворчасць. Але адсутнасць належных памочнікаў, няўдалыя закупкі пасадачнага матэрыялу і іншыя акалічнасці не дазволілі гаспадарцы эфектыўна развівацца. Вялікія высілкі гаспадароў не акупляліся, пагоршылася здароўе, і ў выніку замест радасці быцця прыйшлося змагацца за сваё выжыванне...

Другі прыклад – вёска Наваспаск у тым жа раёне. Туды з горада на радзіму сваіх дзядоў вярнуўся з Мінска малады інжынер Міхась А., каб стаць фермерам на зямлі сваіх продкаў. Засвоіў сельскія неабходныя прафесіі, аформіў некалькі дзясяткаў гектар зямлі ў арэнду і прайшоў стажыроўкі ў розных еўрапейскіх краінах. Спадабалася яму ідэя вырошчвання курэй-бройлераў. Папрацаваў нават у гаспадароў гэтага бізнесу ў Польшчы разам з жонкаю, каб засвоіць усе нюансы гэтай справы. Атрымаў грант на набыццё курынага статку. Але прайшоў толькі

год, і яго бізнес на беларускай сядзібе скончыўся. Куры слаба прадаваліся, потым пачалі хварэць, набываць неабходныя лекі было дорага, памочнікаў не было — дзеці і жонка не падтрымалі. І перайшоў гаспадар на вырошчванне бычкоў і здачу дзяржаве малака па невялікім кошце, бо трэба было вяртаць крэдыты...

А іншы прыклад вясковага развіцця – вельмі паспяховы. Гэта вёска Камарова. Там гаспадары ішлі ад простага да складанага, далучылі спачатку чальцоў сваёй сям'і да спраў, потым пачалі пашыраць дзейнасць, уладкоўваючы на працу мясцовае насельніцтва, пашыралі формы прадпрымальніцтва за кошт вытворчасці прадуктаў харчавання — пякарня, сыраварня, адкрыццё магазіна, кавярні і іншае. У выніку ініцыятыва расла, мела шматзначны эфект для раёна, моладзь заставалася на вёсцы, не з'язджала ў горад, бо мела дзе прыкласці сваю працу.

Тры прыклады — тры розныя ступені паспяховасці. У першым і другім выпадку не былі зроблены належныя аналіз мясцовай спецыфікі, усе планы былі зробленыя з улікам толькі сваёй сям'і, якая ўрэшце і не падтрымала гаспадара, не з'ядналася. А ў трэцім выпадку пасля грунтоўнага аналізу мясцовых рэсурсаў была складзена жыццяздольная стратэгія мясцовага развіцця з улікам прыватнай ініцыятывы і падтрымкі сям'і.

Вось **галоўныя высновы** для дробнага сельскагаспадарчага прадпрымальніцтва, заснаваныя на маім уласным жыццёвым вопыце за апошнія дваццаць гадоў:

**1.** Усё звязанае з сельскай гаспадаркаю мае заўжды свой попыт, бо здаровыя прадукты харчавання заўжды запатрабаваныя ў насельніцтва. Таму гэты від дзейнасці пры належным падыходзе акупляецца і прыносіць прыбытак.

**2.** Разам з тым, рызыкі такога прадпрымальніцтва заўжды існуюць і залежаць ад шматлікіх фактараў: хваробы раслін і іх пладоў, хваробы свойскіх жывёл. Таму неабходна мець адпаведныя навыкі і вопыт, каб змагацца з гэтым.

**3.** Для поўнага цыклу — вырошчвання прадукцыі, яе перапрацоўкі і захавання — патрэбныя інвестыцыі. Бо калі толькі вырошчваць прадукцыю, яна будзе адносна таннаю і спатрэбіцца прымяніць іншыя тэхналогіі для большага аб'ёму.

**4.** Калі засяродзіцца на адной тэме — вырошчваць на міні-прамысловым узроўні монакультуру, то вельмі мала шанцаў будзе, каб атрымаць на яе арганічны сертыфікат. Бо раслінныя монакультуры і вялікая колькасць аднолькавых жывёл вельмі ўразлівыя да хвароб і шкодных насякомых. Галоўны сэнс хатняй прадукцыі — у яе арганічнасці, насычанасці мікра- і макраэлементамі. Таму і попыт, і кошт на такую прадукцыю значна вышэйшыя, чым на прамысловую, канвенцыйную.

**5.** Для паспяховага вырошчвання якаснай экапрадукцыі трэба шматгадовыя ўкладанні ў аздараўленне зямлі, якая засталася ў вашым уладанні, трэба прымяняць шмат гадоў метады пермакультуры альбо іншых арганік-тэхналогій («ноў ціл» — бязворыўнае земляробства, рэгенератыўнае гаспадаранне, сертыфікацыйнае, арганічнае, біядынамічнае і інш.). І толькі пасля гэтага вы атрымаеце якасны, дарагі прадукт.

**6.** Для паспяховасці трэба ісці малымі крокамі, нарошчваць свае веды і практычны вопыт па тэме, якую абралі ў сваёй гаспадарцы самай галоўнаю, разлічанай на прыбытковасць і хуткую рэалізацыю.

**7.** Не забывайся пра свой галоўны рэсурс — сям'ю. Трэба разам планаваць сваю дзейнасць, своечасова прывіць навыкі і любоў да сельскай працы сваім дзецям, своечасова дэлегаваць ім частку абавязкаў і адказнасці. Тады не застанешся сам-насам са сваёй гаспадаркай, дзеці вас падтрымаюць і пяроймуць тое, ува што ты ўкладаеш сваю душу і працу. Без пераемнасці цяжка будзе чакаць устойлівасці!

**8.** Камунікуй са сваімі аднадумцамі: гэта не заўжды плённа на пачатку дзейнасці атрымліваецца, бо кожны бачыць сваю справу па-свойму. Але паступова вакол цябе складзецца гурт рэлевантных сяброў-аднадумцаў, і вы зможаце нарошчваць свой патэнцыял за кошт падзялення функцый у супольнасці. У некага будзе лепш атрымлівацца з рэалізацыяй супольнага прадукту, нехта будзе лепш рэкламаваць ваш сумесны прадукт, хтосьці забяспечыць рамонт і дастаўку тэхнікі альбо знойдзе новых спажыўцоў для вашай прадукцыі.

**9.** Дыверсіфікуй тэмы свайго прадпрымальніцтва. Любая тэма занятасці перажывае розныя фазы прыбытковасці: калі ў цябе з'явіцца, напрыклад, спаржа, і мала хто яе вырошчвае яшчэ на продаж — ты зможаш хутка і прыбыткова яе рэалізаваць, а калі яе стане шмат на рынку, будзе цяжэй з рэалізацыяй. Трэба будзе навучыцца яе якасна нарыхтаваць і рэалізоўваць, напрыклад, у ферментаваным выглядзе. Пашырай гатункі сваёй выпечкі, сыроў і іншай згатаванай прадукцыі. Спажыўцы заўжды хочуць пакаштаваць нешта новае.

**10.** Не выключай магчымасці, што пасля твайго шматгадовага гаспадарання і набыцця ўнікальнага асабістага вопыту ты можаш стаць запатрабаваным экспертам для пачаткоўцаў. І нават зарабляць на гэтым. Да цябе могуць прыязджаць на гаспадарку для навучання тваім практыкам, ты зможаш арганізоўваць уласныя курсы па навучанні сваім тэхналогіям. І гэта можа стаць адной з крыніц твайго прыбытку.

**11.** Але не спыняйся толькі на ведах вакол сваёй гаспадаркі: шырокія інтарэсы па розных тэмах будуць спрыяць знаёмству і прыцягваць да цябе людзей з розных галін жыцця. Ты

зможаш ім прапаноўваць сваю прадукцыю, і яны будуць ахвотна яе набываць, даўяраючы табе як знаёмаму.

**12.** Рабі дні «адчыненых дзвярэй» на сваёй гаспадарцы, запрашай сяброў і знаёмых. Пабачыўшы тваю гаспадарку, наведвальнікі калі не самі стануць тваімі кліентамі, то змогуць парэкамендаваць цябе як сумленнага арганік-вытворцу хатняй прадукцыі. Тым самым колькасць пакупнікоў у цябе не будзе зніжацца, а толькі троху абнаўляцца.

**13.** Каб больш паспяхова засвойваць новыя падыходы ў сваёй дзейнасці на вёсцы, вывучай і цікаўся фермерскім вопытам іншых краін. Пры магчымасці прысутнічай на міжнародных спецыялізаваных канферэнцыях, далучайся да міждзяржаўных праграм па абмене вопытам. Безумоўна, не ўсе замежныя практыкі можна будзе прымяніць у сваёй гаспадарцы, але некаторыя элементы, адаптаваўшы іх да нашых умоў, дапамогуць табе зразумець трэнды і дадуць адчуванне перспектывы.

**14.** Аб'ядноўвайся з калегамі і аднадумцамі для прасоўвання ў краіне супольных інтарэсаў. Буйны бізнес мае свае асацыяцыі і саюзы для прасоўвання сваіх інтарэсаў на дзяржаўным заканадаўчым узроўні. А вось дробнае прадпрымальніцтва на вёсцы — раз'яднанае. Не склалася ў саюз дробных вытворцаў. А ў перспектыве гэта стане важным напрамкам дзейнасці кожнага актыўнага селяніна.

Мае асабістыя прыклады з назапашанага вопыту[6] вясковай самазанятасці:

### Як ператварыць хобі ў бізнес. Самазанятасць на вёсцы: першыя крокі, партнёры....

- **Наша хобі — гэта біясістэма, яе стварэнне і падтрыманне.** Мы захацелі паказаць на ўласным прыкладзе, як з зямлі — зрабіць глебу... і тым самым мець ва ўладанні прыбытковую экагаспадарку.
- *Наш вопыт — 20 гадоў пермакультурнага гаспадарання.*
- **Спажыўцы нашага прадукту:**
  - тыя, хто мае зямлю і хоча вырошчваць для сябе і на продаж уласную экапрадукцыю;
  - пермакультурныя дызайнеры;
  - сем'і, якім трэба біякрафтавая прадукцыя.
- **Вынікі (уздзеянне) нашага гаспадарання:**
  - створаны інструмент перадачы экакаштоўнасцяў;
  - паказаныя тэхналогіі эфектыўнага экагаспадарання;
  - сто чалавек атрымалі веды па экапрадукце і атрымалі да яго доступ.

---

[6] Пра нас у сецiве: http://www.ctv.by/v-mire-permakultury-vmeste-s-nikolaem-matrunchikom www.ctv.by/api-domiki-nikolaya-matrunchika-apiterapiya-bez-ukusov-i-boli; http://www.ctv.by/recepty-zdorovogo-pitaniya-perlovaya-kasha-po-receptu-nashih-predkov; http://www.ctv.by/recepty-zdorovogo-pitaniya-letniy-salat-iz-lebedy; https://web.facebook.com/mikola.matrunchyk

## Мае асноўныя КАШТОЎНАСЦІ

- вырошчванне і прыгатаванне «сумленнага» прадукту;
- стварэнне і падтрыманне біяразнастайнага і экалагічнага асяроддзя жыцця;
- засваенне і пашырэнне ведаў пра ўстойлівы экалад жыцця;
- культурныя і традыцыйныя каштоўнасці.

## Мае ІНАВАЦЫІ:

- паказваю, як праз уплыў на біёту зямлі дабівацца станоўчага ўздзеяння на мікрабіёту арганізма чалавека (шляхам вырошчвання і спажывання арганік-прадуктаў) ;
-

Гэта адбываецца, напрыклад, ад прыгатавання і ўжывання настояў на зёлках, якія растуць у нашым садзе. Стварэння ўласных “Эмак” – эфектыўных мікраарганізмаў (ЭМ-прэпаратаў), спрыянне верміактыўнасці ў агародзе і вырабу ўласнага біягумусу;

- метады спалучэння раслiннай і жывёльнай біёты на гаспадарцы;
- метады аднаўлення эка/этнагастранаміі (ферментаванне): ГАБА-метад (без доступу паветра), сушка, вэнджанне...

## Што азначае для мяне ПАРТНЁРСТВА:

На сённяшні дзень маю сталую сувязь з больш як 10 гаспадаркамі (хлеб з Ушачаў, сыры з Глыбоччыны, яйкі з блізкіх вёсак і г. д.).

- Гэта дазваляе абмеркаваць з сябрамі ідэю да яе рэалізацыі;
- стварае сінергійную (узаемавыгадную) мадэль прадпрымальніцтва для ўсіх удзельнікаў;
- дазваляе зрабіць больш разнастайным супольны прадукт.

## Што трэба для прыбытковасці (устойлівасці) АПГ (самазанятасці на вёсцы)

- Па магчымасці рэалізоўваць гатовую (прыгатаваную) прадукцыю. Закон № 851 ад 8.12.22 пра прафесійны падатак гэта дазваляе.
- Бясконца захапляцца і любіць сваю справу.
- Мець шырокае (разнастайнае) сацыяльнае кола сваіх спажыўцоў (у сацсетках і ўжывую).
- Мець як мага больш разнастайную прадукцыю для спажыўцоў.
- Мысліць праектна, вучыцца праектнаму кіраванню.

## § 3. Ідэя і канцэпцыя сацыяльнай сельскай гаспадаркі і сацыяльны капітал вёскі ў нямецкай практыцы.

*Віды і фарматы ўзаемаадносін паміж прадстаўнікамі агравытворчасці і насельніцтвам па захаванні і развіцці вясковай суполкі; сеткі супрацоўніцтва нямецкіх сацыяльных агравытворцаў*

### 1. Сацыяльная роля агравытворцаў

Агравытворчасць — гэта асноўная гаспадарчая дзейнасць чалавека. Яна зрабіла магчымым існаванне грамадства, заснаванага на падзеле працы, гарадоў і дзяржаў, і, такім чынам, з'яўляецца грунтам кожнай цывілізацыі. У той жа час сельская і лясная гаспадарка займаюць больш за 80% паверхні Германіі. Гэта няўхільна аказвае вырашальны ўплыў на навакольнае асяроддзе і прыроду, на глебу, жывёл, водныя рэсурсы і біяразнастайнасць.




Малюнак 3. Сельскія раёны Германіі згодна з тыпалогіяй Цюнэн. Цёмна-зялёныя тэрыторыі — вельмі вясковыя, светла-зялёныя — менш вясковыя, белыя — не вясковыя

### 2. Сельская гаспадарка і грамадства

У Германіі шмат якія фермы існуюць ужо некалькі пакаленняў і маюць глыбокія карані ў рэгіёне. Фермеры адчуваюць адказнасць за сваю вёску і робяць свой унёсак у жыццяздольнасць сельскіх раёнаў, выконваючы шырокі спектр абавязкаў, прыкладам, беручы ўдзел у дзейнасці прыходаў, асацыяцыяй і мясцовых прадпрыемстваў. Толькі нешматлікія, галоўным чынам даўно створаныя рамесныя прадпрыемствы дэманструюць такую ж ідэнтыфікацыю з рэгіёнам. Рамесныя і фермерскія прадпрыемствы часта займаюць заўважнае становішча ў вясковай грамадзе.

Пазначанае вышэй пачуццё адказнасці не абмяжоўваецца малой сельскай гаспадаркай: буйныя кампаніі, што валодаюць дастатковым капіталам, выконваюць свае абавязкі не толькі прапануючы маладым людзям у вёсках кар'ерныя перспектывы, але і спрыяючы пашырэнню лічбавай інфраструктуры і будаўніцтву дарог, бо яны ўсё больш увагі надаюць лічбавізацыі і ўкараненню тэхналагічных падыходаў у сельскай мясцовасці.

Парады сельскагаспадарчым прадпрыемствам:

- Актыўна браць удзел у сацыяльным і культурным жыцці рэгіёна
- Рэгулярна сустракацца з іншымі дзеячамі вясковай эканомікі, рамеснымі прадпрыемствамі і вытворцамі
- Зрабіць сетку сельскагаспадарчых вытворцаў для абмену вопытам, пытанняў і ўзаемадзеяння

Прыняцце на сябе адказнасці фермерамі мае даўнюю традыцыю ў Германіі. Гэта было яшчэ раз прадэманстравана падчас добраахвотнай дапамогі пры стыхійных бедствах, аказанай фермерамі ў пацярпелай ад наваднення даліне Ар.



Малюнак 4. Дапамога пры паводцы на рацэ Ар

***Інтэрв'ю радыё Паўднёвай Вестфаліі пасля наваднення на рацэ Ар***

*Чаму і як дапамагалі фермеры ахвярам наваднення?*

*«Прынамсі, яны такія ж пакутнікі», — кажа Герберт Нетэр, прэс-аташэ Асацыяцыі фермераў і вінаробаў Рэйнланд-Насау. Гэта звязана з тым, што шмат якія з іх самі пацярпелі ад засухі, паводак ці граду ў апошнія гады, а ў некаторых выпадках панеслі значныя неўраджаі і эканамічныя страты.*

*«Асацыяцыя фермераў і вінаробаў зямлі Рэйнланд-Насау стварыла, сярод іншага, платформу дапамогі, на якой фермеры могуць публікаваць заявы і прапановы. Але платформа адкрытая і для іншых грамадзян», — кажа прэс-аташэ Нетэр.*

*«Каля 30 адсоткаў дапамогі прыходзіць з-за меж зямлі, — кажа Нетэр. — Гэта вельмі шмат. Але шмат дапамагаюць і суседзі, і фермеры-калегі» Паводле Нетэра, паміж фермерамі існуе цесная сувязь.*

Фермеры маюць геаграфічную, культурную і эмацыйную сувязь з сельскімі раёнамі, што спрыяе іх адказнаму выкарыстанню прыродных і чалавечых рэсурсаў. Фермеры хочуць перадаць свае фермы наступнаму пакаленню, прынамсі, у такім жа добрым стане. Змены клімату і страта біяразнастайнасці прывялі да таго, што шмат якія фермы зрабілі свае працоўныя працэсы больш устойлівымі, каб абараняць экасістэмы. Энергетычны пераход, які прасоўваецца цягам некалькіх гадоў, быў бы немагчымы без сельскай гаспадаркі. Без яе не пашырыць выкарыстанне ўзнаўляльных крыніц энергіі. Мала таго, што на дахах шмат якіх гаспадарчых пабудоў ёсць сонечныя панэлі, дык яшчэ і актыўна здаюцца ў арэнду паркоўкі — пад ветраныя турбіны і сонечныя фермы. Шмат якія фермеры таксама спадзяюцца на біягазавыя ўстаноўкі, што працуюць на вадкім гнаі і выпрацоўваюць біяэнергію[7].

### 3. Сацыяльная адказнасць сельскай гаспадаркі: магчымасці і абмежаванні

Сельская гаспадарка, відаць, страчвае свой уплыў у якасці актыўнага творцы, які задае каштоўнасці ў харчовай сферы. Агракультурны сектар усё больш вызначаецца вонкавымі стандартамі, ідэалогіямі і эмоцыямі[8].

---

[7] Крыніца: Nr. 462 / November 2021 Analysen & Argumente Landwirtschaft und ländlicher Raum / André Algermißen Referent Klima, Landwirtschaft und Umwelt Konrad-Adenauer-Stiftung e. V. 2021, Berlin

[8] Balmann et al., 2017.

Камунікацыя сельскагаспадарчых і сельскіх канцэрнаў наўпрост са спажыўцамі адыходзіць на другі план і замяняецца тымі вобразамі фермерства, якія СМІ падаюць у сваіх матэрыялах. Па-за сельскагаспадарчым кантэкстам многія сельскія раёны, асабліва перыферыйныя, пакутуюць ад трох узаемазвязаных тэндэнцый:

— няўхільны спад несельскагаспадарчых прамысловых прадпрыемстваў і прадпрыемстваў сферы паслуг;

— масавае скарачэнне колькасці насельніцтва і змена структуры насельніцтва;

— заняпад дзяржаўных паслуг.

Маладыя, добра адукаваныя жыхары, асабліва жанчыны, пакідаюць перыферыйныя сельскія раёны, бо не бачаць там перспектыў. І што ў выніку? Сельскае насельніцтва няўхільна скарачаецца, на вёсцы непрапарцыйна вялікая доля пажылых жыхароў і мужчын. Шмат якія валасці страчваюць фінансавую ўстойлівасць, бо ў іх змяншаюцца падаткавыя паступленні. У выніку у іх няма нават сродкаў на сацыяльна значныя муніцыпальныя паслугі.

У той самы час зніжаецца колькасць прыватных паслуг у сельскіх мясцовасцях Германіі . Гэта відаць, прыкладам, па тым, што зачыняюцца прадуктовыя крамы і аддзяленні банкаў, а таксама медычныя кабінеты.

Прынцып супольнай сацыяльнай адказнасці мае даўнюю традыцыю ў Германіі. У сістэме «сацыяльнай рынкавай гаспадаркі» гэты аспект падкрэслены выразна Імкненне фермераў да ўстойлівага паляпшэння ўмоў жыцця, працы і навакольнага асяроддзя ў сельскай мясцовасці таксама не штосьці новае. Геаграфічная, культурная і эмацыйная сувязь з зямлёй падахвочвае фермераў адказна выкарыстоўваць прыродныя і чалавечыя рэсурсы.

Сельскагаспадарчыя сем'і актыўна ўдзельнічаюць у мясцовых асацыяцыях, выконваюць розныя заданні ў камітэтах мясцовага самакіравання. Гэта для нямецкіх фермераў натуральна. Апроч таго, буйныя фермерскія гаспадаркі маюць даўнюю традыцыю захавання і павелічэння колькасці працоўных месцаў і месцаў для навучання, а таксама падтрымкі інфраструктуры асацыяцый у рэгіёне.

У мінулым сельскагаспадарчыя ўгоддзі, асабліва ў прускай частцы Германіі, бралі на сябе заданні мясцовых грамад. У былой ГДР гэтае заданне выконвалі сацыялістычныя сельскагаспадарчыя вытворчыя каапératывы. У некаторых выпадках чаканні грамадства ў дачыненні да кампаній-наступнікаў працягваюць мець уплыў на іх і сёння.

З іншага боку, сельскім раёнам даводзіцца сутыкацца з праблемамі, не звязанымі наўпрост з сельскагаспадарчай вытворчасцю. Дэмаграфічныя змены, агульныя тэндэнцыі ў спажывецкіх паводзінах, макраэканамічнае развіццё, а таксама іншыя фактары, такія

як геаграфічныя і кліматычныя ўмовы, аказваюць істотны ўплыў на якасць жыцця ў сельскай мясцовасці і яе прывабнасць у якасці месца вядзення бізнесу. Звязаныя з гэтым праблемы, такія як недастатковая фізічная і сацыяльная інфраструктура, нястача працоўных месцаў ці спустыньванне ландшафту, закранаюць не толькі сельскагаспадарчыя, але і шырокія сацыяльныя інтарэсы і таму не могуць быць развязаны аднымі толькі фермерамі без падтрымкі. Таму патрэбна цеснае ўзаемадзеянне на муніцыпальным і раённым узроўнях з грамадствам, палітыкамі і сродкамі масавай інфармацыі.

***Прыклады сацыяльнай адказнасці***

**«Млечны шлях» у вёсцы Штайнхаген рэгіёна Бютцовер.**

Праект «Млечны шлях» запусцілі каля 10 гадоў назад адміністрацыя раёна Бютцовер і Асацыяцыя фермераў Бютцовера. Адзін з ініцыятараў і галоўная дзейная асоба праекта – Клаўс Грыпентрог. Ён кіруе асноўнай малочнай фермай плошчай каля 1 800 га на 3 000 галоў буйной рагатай скаціны, у тым ліку 1 500 малочных кароў. Ідэя праекта ў тым, каб з'яднаць сельскую гаспадарку і турызм, каб пазнаёміць людзей з сельскай мясцовасцю і атрымаць дадатковы прыбытак для ўсіх удзельнікаў. Праект заснаваны на разнаітым і прывабным ландшафце, сфармаваным рэкамі Варнау і Бёку, а таксама на землекарыстанні рэгіянальных ферм. Змешчаны паміж двума асноўнымі роварнымі маршрутамі ў Мекленбургу (Берлін-Капенгаген і Гамбург-Руген), Бютцовер прапануе мноства турыстычных актыўнасцяў. Да раёна далучана 11 муніцыпалітэтаў агульнай плошчай каля 38 000 га. Каля 73% гэтай плошчы займае сельская гаспадарка, у асноўным жывёлагадоўля. Малако – асноўны прадукт рэгіёна і яго вытворчасць – галоўны кампанент праекта “Млечны шлях”.

**Пазітыўныя фактары:**

**1. Нэтворкінг.** Найважнейшую ролю грае нэтворкінг усіх удзельнікаў і супольная рэалізацыя праектаў па «Млечным шляху», стварэнне працоўнай групы «Нэтворкінг», у якую ўваходзяць два фермеры з фермаў «Млечнага шляху», прадстаўнікі турыстычнага інфармацыйнага бюро горада Бютцау, Фёрдэрферайн, Асацыяцыі фермераў Бютцау і Асацыяцыі манастыроў Руна.

**2. Інфраструктура.** Праект «Суднаходнасць Варнау» у гарадах Бютцау і Шваан зрабіў Варнау прыдатным для турызму.

**3. Маркетынг.** Стварэнне і рэалізацыя маркетынгавай канцэпцыі з флаерамі, анлайн-прэзентацыяй, удзел у імпрэзах і выставах з супольным стэндам актывістаў праекта, усталёўка пяці інфармацыйных пунктаў у выглядзе малочных бітонаў. У гэтыя збудаванні можна заходзіць і атрымліваць інфармацыю пра мясціну, дзе ты зараз, пра мясцовую ферму і рэгіён: унутры бітонаў прайграюцца адпаведныя аўдыястужкі.

У чым выражалася ўстойлівасць праекта:

- дадатковы прыбытак ад экскурсій і начлегу;
- умацаванне вясковай грамады і пачуцця хаты праз супрацоўніцтва ў рамках праекта «Млечны шлях»;
- паляпшэнне іміджу сельскай гаспадаркі: стварэнне і падтрыманне мясцовых працоўных месцаў фермерамі, фінансавая падтрымка мясцовых спартыўных клубаў.

**Малочныя бітоны (пункты турыстычнай інфармацыі)**

Уздоўж «Млечнага шляху» паставілі 5 каляровых «малочных бітонаў». Калі ўвайсці ўсярэдзіну бітона, то можна пачуць інфармацыю пра «Млечны шлях», мясцовых фермераў і турыстычныя месцы.




Малюнак 5. Моўныя малочныя бітоны

**Дзіцячы сад на ферме Ліндэнбаўм[10]**

У вёсцы Брукмюль (раён Розенхайм, Баварыя) працуе Анэроз Этэнхубер — педагог з адукацыі, яна вырасла на звычайнай ферме з 60 малочнымі каровамі. Ужо ў час навучання ёй прыйшла ў галаву ідэя кіраваць фермерскім дзіцячым садком. Свякроў шмат гадоў кіравала дзіцячым гульнявым гуртам у хаце Этэнхубераў. У 2010 годзе стары хлеў для маладняку буйной рагатай скаціны быў перабудаваны, каб мець магчымасць працягваць там групу. Пасля нараджэння першага дзіцяці Анэроз Этэнхубер захацела вярнуцца да працы. Немалую ролю адыгралі і эканамічныя прычыны. Ад планавання да адкрыцця фермерскага дзіцячага садка прайшло каля 1,5 года. У верасні 2014 года пачаўся першы год дзіцячага садка з 18 дзецьмі. Фермерскі дзіцячы садок «Ліндэнбаўм» звязаны з фермай «Дэметра» сям'і Этэнхубер. Ферма апрацоўвае каля 27 гектараў паш і ўтрымлівае 27 дойных кароў з цялятамі.



Малюнак 6. Фермерскі дзіцячы сад «Ліндэнбаўм»

[10] Крыніца: DLG-Merkblatt 423 Veränderungen in ländlichen Räumen aktiv gestalten. DLG e.V. Fachzentrum Landwirtschaft Eschborner Landstraße 122, 60489 Frankfurt am Main. (www.bauernhofkindergarten-lindenbaum.de).

Дзіцячы садок на ферме аточаны сенажацямі і жывымі агароджамі. Ён месціцца ў заходнім раёне Розенхайм у вёсцы Нодэрвехс, у камуне Брукмюль. У Брукмюле ёсць яшчэ два аднагрупавыя садкі, адзін на дзве групы і чатыры садочкі на некалькі груп з інтэграванымі яслямі.

Навошта сям'і кіраваць фермерскім дзіцячым садам? Матывацыя ў тым, каб на ўласным прыкладзе навучыць дзяцей любові, адказнасці і ўдзячнасці да людзей, жывёл і раслін. Штодзённа дапамагаючы працаваць па гаспадарцы, дзеці вучацца даглядаць жывёлу і знаёмяцца з натуральным жыццёвым цыклам.

**Важныя фактары паспяховасці праекта з садком**

1. Навучанне і дзяржаўнае прызнанне навучальнай установы.

2. Унікальная гандлёвая перавага фермерскага дзіцячага садка: клопат пра экалогію, навучанне і выхаванне дзяцей у натуральным навучальным асяроддзі.

3. Планаванне праекта: своечасовае планаванне з архітэктарамі ў адпаведнасці з вымогамі (прыкладам, супрацьпажарная абарона).

4. Супрацоўніцтва з дзяржаўнымі органамі, такімі як раённая ўстанова па справах моладзі Верхняй Баварыі.

5. Уласная ініцыятыва і асабісты ўнёсак: тэлефанаванні ў органы ўлады, архітэктарам і ў мясцовыя кампаніі, заява на змену віду выкарыстання памяшкання, заява на атрыманне дазволу на эксплуатацыю памяшкання з актыўным асабістым удзелам.

6. Пазітыўная працоўная атмасфера: згуртаванасць у калектыве і пазітыўны настрой супрацоўнікаў спрыяе стварэнню працоўнай атмасферы, а таксама пазітыўнаму іміджу (дзякуючы гэтаму ўтварылася чарга на месцы ў дзіцячым садку).

7. Асацыяцыя падтрымкі садка для збору ахвяраванняў, створаная яе заснавальнікамі.

8. Фінансавае забеспячэнне за кошт прыбытку ад арэнды дзіцячага саду.

**Устойлівасць**. Паляпшэнне сацыяльнай інфраструктуры: муніцыпалітэт мае большую разнастайнасць арганізацый з рознымі канцэпцыямі і можа прапанаваць больш месцаў у дзіцячых садках.

## 4. Сацыяльная сельская гаспадарка

Сацыяльная сельская гаспадарка — гэта спалучэнне сельскагаспадарчай вытворчасці з сацыяльнай і выхаваўчай працай. Сельская гаспадарка, садоўніцтва і лясная гаспадарка, а таксама садоўніцтва і ландшафтны дызайн служаць для ўмацавання здароўя і эфектыўнай тэрапіі, рэсацыялізацыі, навучання людзей, якія не займаюцца сельскай гаспадаркай. Мэтавымі групамі сацыяльнай сельскай гаспадаркі ў Германіі з'яўляюцца людзі з разумовымі і псіхалагічнымі парушэннямі, наркаманы, зняволеныя, стомленыя шко-

лай маладыя людзі, мігранты, беспрацоўныя, якія доўга не знаходзяць працы, хворыя на дэменцыю, школьнікі, выхаванцы дзіцячых садкоў і актыўныя пажылыя людзі.

### *Зялёная сацыяльная праца*

Выкарыстанне навакольнага асяроддзя, прыроды, ландшафту і вытворчай дзейнасці на ферме ў якасці асяроддзя для сацыяльнай працы не з'яўляецца нечым новым. Альфонс Лімбрунэр, які выкладаў прадмет «Зялёная сацыяльная праца» ў Нюрнбергу, паказаў, як, апроч іншага, праца ў садзе ці з сельскагаспадарчымі жывёлінамі выкарыстоўвалася ў тэрапеўтычных мэтах.

Праца з жывёламі, раслінамі і зямлёй у розных штодзённых і гадавых рытмах дазваляе людзям, якія ў адваротным выпадку часта ўспрымаюць сябе толькі як атрымальнікаў паслуг, адчуваць, што яны таксама чагосьці могуць дасягнуць, даюць ім упэўненасць у сабе. Разнастайнасць заданняў і напрамкаў працы, а таксама праца цягам года ў рознае надвор'е могуць ствараць дадатковую вартасць для людзей, сельскай гаспадаркі, сельскіх раёнаў і прыроды. Сацыяльнае фермерства — гэта больш, чым «зялёны клопат» у сельскай гаспадарцы. У дадатак да медыцынскіх аспектаў тэрапіі «зялёнага асяроддзя», якія знаходзяцца на пярэднім плане канцэпцыі Green Care, асноўная ўвага надаецца сацыяльнай працы, якая прэтэндуе на значнасць і прадуктыўнасць.

Дагэтуль сацыяльная сельская гаспадарка ў Германіі характарызавалася фермерскімі гаспадаркамі, што спецыялізуюцца на пэўных мэтавых групах: «зялёныя зоны» майстэрняў для інвалідаў, а таксама школьныя фермы, аб'яднаныя ў Федэральную працоўную групу па навучальных фермах (BAGLoB). Ёсць таксама гаспадаркі, што спецыялізуюцца на лячэнні залежнасцяў, рэабілітацыі. На хвалі папулярызацыі інклюзіі ў сельскай гаспадарцы расце цікавасць да паслуг для людзей з асаблівымі патрэбамі.

Нягледзячы на неспрыяльныя фінансавыя ўмовы, шмат якія ініцыятывы ў вобласці сацыяльнай сельскай гаспадаркі былі створаны дзякуючы вялікай адданасці справе і энтузіязму. Усё гэта яркія прыклады шматфункцыянальнай сельскай гаспадаркі, якая спрыяе развіццю сельскіх раёнаў, ландшафтаў і рэгіянальных сетак.

У новых федэральных землях Германіі ініцыятывы па стварэнні сацыяльнай сельскай гаспадаркі ініцыююцца галоўным чынам сацыяльнымі ўстановамі і ініцыятывамі, якія ў працэсе «вынаходзяць» сельскую гаспадарку наноў. Аналагічная сітуацыя і ў краінах Усходняй Еўропы з постсацы-

ялістычнай буйнамаштабнай сельскай гаспадаркай.

У 2004 годзе была заснавана Еўрапейская працоўная група «Сельская гаспадарка для здароўя», якая паклала пачатак некалькім еўрапейскім праектам: COST Action Green Care in Agriculture, праекту SoFar (Сацыяльныя паслугі шматфункцыянальных фермаў) і некальскім праектам ЕС, скіраваным на ўтварэнне і падрыхтоўку кадраў у вобласці сацыяльнай сельскай гаспадаркі (DIANA, MAIE, INCLUFAR, PROFARM і GARDENISER pro). Міжнародны абмен на канферэнцыях па ўсёй Еўропе паказвае, што ўзровень развіцця сацыяльнага земляробства ў краінах Еўропы розны, а ў некаторых краінах Еўропы некаторыя напрамкі больш развітыя, чым у Германіі:

- У Нідэрландах пры падтрымцы палітыкаў і фермерскіх арганізацый дзейнічаюць сотні Zorgboerderijen (даглядавых фермаў), дзе сельскагаспадарчая дзейнасць служыць тэрапеўтычным мэтам. Праца дамоў састарэлых разглядаецца як медычная дапамога, якая дапамагае зменшыць сацыяльныя выдаткі на лячэнне.
- У Нарвегіі сельскагаспадарчая вытворчасць па цэнах сусветнага рынку магчымая толькі ў прасторава абмежаваных спрыяльных месцах. Таму палітыкі і ўрад прызналі патэнцыял сацыяльнай працы як важнай падтрымкі фермерскім гаспадаркам. Тут распрацавалі інавацыйныя праекты па інтэграцыі беспрацоўных, пацыентаў з дэменцыяй і ў адукацыйным сектары.
- У Італіі Agricoltura Sociale галоўным чынам падтрымліваецца сацыяльнымі кааператывамі, большасць з якіх працуюць у адпаведнасці з экалагічнымі прынцыпамі. Сацыяльны рух ініцыяваў аднаўленне працы закінутых ферм у раёнах з нізкай ураджайнасцю. У шмат якіх турмах ёсць уласныя сады і палеткі для рэабілітацыі зняволеных. У той жа час існуе асобны закон, які стымулюе развіццё сацыяльнай сельскай гаспадаркі, а таксама Нацыянальны сельскагаспадарчы форум, заснаваны ў 2011 годзе.
- У Швейцарыі і Аўстрыі розныя праекты спрыяюць заснаванню фермерскіх гаспадарак з прапановамі ў вобласці Green Care. Аспект сацыяльнай працы не заўсёды бывае на першым плане, а пераходы паміж тэрапеўтычнай, педагагічнай і турыстычнай дзейнасцю з'яўляюцца больш важнымі. Часта гэтыя фермеры не робяць акцэнту на арганічнае земляробства.




Малюнак 7. Колькасць сацыяльных фермераў у краінах Еўропы

Ініцыятыва DASoL была заснавана ў 2009 годзе Томасам ван Эльсенам і Альфонсам Лімбранэрам як форум па абмене інфармацыяй пра разнастайнасць сацыяльнай сельскай гаспадаркі і яе далейшае развіццё. Мэта ініцыятывы — падтрымаць развіццё сацыяльнай сельскай гаспадаркі з дапамогай сеткавага ўзаемадзеяння, даследаванняў, прафесійнай падрыхтоўкі, забеспячэння якасці і кансультавання.

У Германіі фундатар ініцыятывы — некамерцыйная асацыяцыя Petrarca (Еўрапейская акадэмія ландшафтнай культуры). У 2023 годзе дзеля пашырэння поля дзеяння, асабліва ў сферы кансалтынгу, вырашылі стварыць і ўжо амаль стварылі ўласную, таксама некамерцыйную асацыяцыю DASoL.

DASoL фінансуецца за кошт сяброўскіх унёскаў і ахвяраванняў. З гэтых сродкаў аплачваецца сайт www.soziale-landwirtschaft.de з інфармацыяй пра падзеі, справаздачамі, публікуецца інфармацыйны бюлетэнь, што рассылаецца па электроннай пошце.

Прафілактыка, інклюзія і паляпшэнне якасці жыцця з'яўляюцца аспектамі сацыяльнай сельскай гаспадаркі. Апроч таго, гэта стварае дададзеную вартасць для сельскіх раёнаў і прыроды. Сацыяльная інтэграцыя — гэта толькі частка больш шырокага паняцця экалагічнай інклюзіі. Тут ужо гаворка пра тое, што сацыяльная сельская гаспадарка не толькі стварае дададзеную вартасць для людзей і фермерскіх гаспадарак, але і мае за мэту развіццё і захаванне прыроды і культурнага ландшафту.

# Частка II

## Сядзіба — цэнтр сусвету

### § 4. Вясковая сядзіба — частка прыродна-сацыяльна-эканамічнай мясцовай сістэмы

Незалежна ад таго, дзе знаходзіцца ваша сядзіба, у яе ёсць прыроднае, сацыяльнае і эканамічнае атачэнне, тое, што знаходзіцца побач, людзі, што жывуць поруч. У любым выпадку гэтае асяроддзе ўплывае на развіццё ваша і вашай гаспадаркі. І сама ваша сядзіба-гаспадарка з'яўляецца часткай гэтай шырэйшай за яе і вельмі разнастайнай сістэмы. Таму зразумела, што добрыя адносіны да гэтага асяроддзя і гарманічнае суіснаванне з ім – адна з асноў квітнеючай сядзібы і атрымання асалоды ад жыцця ў ёй.

Абставіны могуць скласціся па-рознаму, і ваша дзялка зямлі і дом могуць апынуцца ў вашым жыцці па-рознаму. Адна справа, калі вы ўжо даўно жывяце тут, як кажуць, абжыліся, палюбілі гэты край, дзе вы адчуваеце сябе шчаслівым.

А можа, вы толькі шукаеце месца, дзе «прызямліцца», «прыдбаць свой кут», як пісаў калісьці Якуб Колас (хоць зараз ужо і не з мэтай «каб з панскіх выпутацца пут», але ж, пэўна, таксама з марамі аб лепшым). Выбар зямлі і дома ці толькі зямлі пад будаўніцтва – задача, вырашэнне якой залежыць ад многіх фактараў. І навакольнае асяроддзе і размяшчэнне будучай сядзібы – тыя з іх, якія ўплываюць на ваша рашэнне найбольш.

Вядома, што англічане – адны з найлепшых у свеце спецыялістаў па нерухомасці. І вось калі мы сустрэліся з адным з такіх дасведчаных экспертаў Англіі спадаром Франкам Хардзі[11], то на наша пытанне: «Якія галоўныя фактары вызначаюць, што трэба браць да ўвагі ў першую чаргу, калі купляеш зямлю і дом?» – ён адказаў: «Ёсць тры асноўныя фактары. Першы – размяшчэнне (location). Другі – размяшчэнне. І трэці – размяшчэнне».

У такім адказе многа рацыі. Адно з першых пытанняў, якое задаюць чалавеку пра яго сядзібу, дом: «А дзе ён знаходзіцца? А ці ёсць побач возера? Рака? Лес? Ці зручна туды дабірацца?» Адказы, якія часцей за ўсё мы чуем, апавядаюць таксама пра «цудоўныя краявіды», «унікальныя ландшафты», а таксама на блізкасць цікавых гістарычных аб'ектаў, старажытных гарадоў і мястэчак. Усе гэтыя моманты ствараюць значную частку каштоўнасці нашых сядзіб, хутароў, дамоў і дач.

Прыродны патэнцыял вашых ваколіц – першы складнік гэтай каштоўнасці. Чыстае паветра, цішыня, прыгожыя далягляды, спевы птушак, сады ў квецені, таямнічыя лясы, поўныя грыбоў і ягад, крышталь-

[11] Мы сустрэліся з Франкам Хардзі (Frank Hardy) у 2003 годзе ў Ноцінгеме, Вялікабрытанія. У той час ён быў прэзідэнтам ЕМРО – Асацыяцыі ўладальнікаў нерухомасці рэгіёна Іст Мідландс. Мы наладжвалі кантакты па тэме кіравання нерухомасцю, вучыліся, спрабавалі перанесці іх напрацоўкі ў Беларусь.

ныя воды рэк і азёр — менавіта гэта шукаем мы ў першую чаргу ў вясковым жыцці. Не заўсёды ўсе гэтыя прыродныя кампаненты ў роўнай ступені характэрныя для канкрэтнай сядзібы ці паселішча. Але амаль заўсёды нешта ёсць! І важна, каб гэтыя якасці вашай тэрыторыі, яе прыродны патэнцыял захоўваліся і нават паляпшаліся[12].

Аднойчы падчас нашай працы па ўстойлівым развіцці тэрыторый шэрагу беларускіх сельсаветаў мы размаўлялі з вясковым актывам пра рэсурсы для развіцця. «А як у вас з прыроднымі рэсурсамі?» — спыталіся мы. Нехта адказаў: «Прыродных рэсурсаў у нас няма». І гэта не быў жарт. Відавочна, што гэты чалавек меў на ўвазе адсутнасць карысных выкапняў прамысловага маштабу, спелага лесу для нарыхтоўкі драўніны. Але ж такі погляд адначасова сведчыць аб адсутнасці навыкаў (ці што гэтыя навыкі былі згубленыя) убачыць у любым (!) прыродным комплексе магчымасці для развіцця.

Не заўсёды лёгка заўважыць у прывычным прыродным асяроддзі элементы, якія могуць стаць асновай новага бізнесу, распрацоўкі праекта, грамадскага мерапрыемства, фэсту, агратурызму. Бывае, што мясцовым супольнасцям прапануюцца спецыяльныя трэнінгі на гэтую тэму. Але першыя крокі можна зрабіць і самастойна. Прыгледзьцеся да прыроды, якая вакол вас. Непрыкметная раней расліна можа стацца арыгінальным кампанентам гаючай гарбаты з зёлак. Маленькая птушка ці матылёк — зрабіцца цэнтральным момантам праекта па зберажэнні біяразнастайнасці, рэсурсы на які можа адшукаць у міжнародных грантадаўцаў. Прыгожы ландшафт можа прыбавіць турыстаў, стаць месцам правядзення мастацкіх пленэраў. Невялікі ручай ці сажалка могуць падказаць ідэю для развядзення рыбы і паслуг рыбаловам-аматарам...

Шырокі і ўважлівы погляд на прыроду як рэсурс для ўстойлівага развіцця вашай сядзібы і мясцовай супольнасці дазваляе ўцягнуць у абарот неабмежаваную колькасць разнастайных прыродных аб’ектаў і іх злучэнняў. Цудоўныя вынікі атрымліваюцца таксама ў аб’яднанні прыродных, гістарычных, культурных, сацыяльных элементаў вясковага жыцця.

У адной з вёсак Літвы мясцовая бібліятэкарка ўзялася за выратаванне старога дрэва на вясковай плошчы, якое збіраліся спілаваць. Яна пачала збіраць інфармацыю, паразмаўляла з пажылымі аднавяскоўцамі аб гісторыях, звязаных з гэтым дрэвам. Выявілася, што дрэва гэтае бачыла мноства гераічных, рамантычных і трагічных падзей, і нават само ўдзельнічала, уплывала на іх ход. На падставе сабраных дадзеных была распрацаваная праектная прапанова, якую падтрымалі міжнародныя донарскія арганізацыі. Атрыманыя сродкі пайшлі на ўладкаванне вясковай плошчы і на мерапрыемствы па згуртаванні супольнасці. А прыклад гэты падштурхнуў да новых ініцыятыў, дадаў імпэту актывістам мясцовага развіцця.

[12] На гэта, у прыватнасці, накіраваныя новыя падыходы да ўстойлівага гаспадарання на зямлі: арганічная сельская гаспадарка, захавальная сельская гаспадарка, устойлівае гаспадаранне, рэгенератыўная (аднаўленчая) гаспадарка, аграэкалогія (у якой спалучаецца аграномія і экалогія).

Культурна-гістарычнае атачэнне сядзібы, а часта і сама твая хата, фальварак, маёнтак — гэта наступны велізарны патэнцыял для самазанятасці, самарэалізацыі і развіцця свайго жыццёвага прытулку. Не ўсім пашанцавала працягваць гісторыю свайго роду праз спадчынную зямлю ці хату. Але многія могуць прасачыць сувязь сваіх мясцін з лёсам дзядоў і прадзедаў праз месцы, якія тыя маглі наведваць, праз агульную большую памерам тэрыторыю — край, дзе жылі нашыя прашчуры.

Глянуўшы на свае ваколіцы і нават крыху далей, можна заўважыць многа сведчанняў даўняй гісторыі вашага кутка Беларусі: паблізу можа знаходзіцца старажытнае гарадзішча ці нават курганы, твая ці суседняя вёска магла згадвацца ў летапісах і граматах Вялікага Княства Літоўскага, тут праходзілі гандлёвыя шляхі з варагаў у грэкі, побач маглі развівацца гаспадаркі і здзяйсняцца творчыя задумы вядомых гістарычных постацяў. Можа, недалёка вялі свае харугвы Касцюшка ці Каліноўскі? А можа, недзе паблізу стаяў лагер Напалеона ці шведаў на чале з Карлам XII? Верагодна, што зусім побач — радзіма знакамітага пісьменніка, паэта, мастака, навукоўца ці дзяржаўнага дзеяча? А раптам менавіта ў вашай мясцовасці захаваўся старажытны абрад ці дайшлі ад продкаў цікавыя кулінарныя рэцэпты?

Дзе б ні месцілася твая сядзіба: на Брэстчыне ці Віцебшчыне, Гарадзеншчыне ці Гомельшчыне, Магілёўшчыне ці Міншчыне — усюды непадалёк ты сустрэнеш старажытныя будынкі. Крэпасці і замкі, палацы і цэрквы, касцёлы і помнікі загінулым героям і знакамітым пісьменнікам і паэтам, унікальныя экспанаты ў мясцовых музеях — раскінутыя па ўсёй краіне і пры жаданні можна хутка дабрацца да іх.

Неяк у Нямеччыне мэр невялікага мястэчка з гонарам паказваў нам былыя будынкі чыгуначных складоў, што некаторы час былі ў заняпадзе, але потым былі адноўленыя мэрыяй па ініцыятыве мясцовых мастакоў. Адрамантаваныя памяшканні перадалі гэтым жа мастакам у арэнду пад майстэрні, мастацкія галерэі і жытло. Зараз гэты квартал — гонар гарадка, своеасаблівы культурны цэнтр, прыклад інавацыйнага пераўтварэння гарадскога асяроддзя — джэнтрыфікацыі. Чаму б не выступіць з падобнай ініцыятывай і звярнуцца ў мясцовую адміністрацыю і ў вашым мястэчку, вёсцы[13]?

Былыя гады хутка становяцца гісторыяй; цікавыя аповеды пра не такія ўжо даўнія падзеі, пра тое, як жылі тут папярэднія пакаленні, што елі-пілі, як працавалі і ладзілі фэсты і талокі, — усё гэта нярэдка

[13] Больш прыкладаў падобных праектаў глядзіце ў публікацыях: Сиваграков Алег, «Сельские сообщества: потенциал саморазвития. Аналитические материалы и наблюдения, сделанные в ходе реализации проекта «Расширение экономических возможностей в сельской Беларуси. – Минск, «Новая Евразия», 2017. – 95 с.; Сиваграков А. и Зуев Е. «Развитие предпринимательства в Республике Беларусь. Белая книга. – Минск, МОО «Экопартнёрство» и ОО «Женщины за возрождение Нарочанского края», 2020. – 128 с. (https://kuna-sdg.de/wp-content/uploads/2023/11/Entwicklung-des-Unternehmentums-in-laendlichen-Gebieten-von-Belarus.pdf).

ўспрымаецца моладдзю як добры прыгодніцкі экшн ці нават таямнічае фэнтэзі.

Трэба не згубіць увесь гэты гісторыка-культурны скарб, прыцягнуць яго да справы развіцця сядзібы і паселішча, пабудаваць на ім мясцовы брэнд, бізнес, занятак па душы.

**Чалавечы і сацыяльны капітал, патэнцыял мясцовай супольнасці:** як скарыстаць усё гэта для агульнай карысці.

Кожны з вашых суседзяў і аднавяскоўцаў — чалавек са сваімі ўнікальнымі вопытам і навыкамі, магчымасцямі і рэсурсамі. Сяброўства і таварыскасць у адносінах з імі ствараюць не толькі добры настрой і ўзмацняюць упэўненасць у добрай будучыні, але і адначасова павялічваюць твае веды і магчымасці.

У суседкі на поўнач мы купляем малако і тварог, а ў суседа на поўдзень — яйкі. З імі таксама цікава пагутарыць, даведацца пра навіны вёскі, абмяняцца рэцэптам засолкі сала ці хатняга віна. А адна суседка дала нам параду, як без хіміі апрацоўваць парэчкі і агрэст. «Увесну, калі толькі снег сыходзіць і прыгрэе сонца, трэба паспець, каб пупышкі не надта яшчэ абудзіліся, набраклі-павялічыліся. Яшчэ каб спалі. Набраць кіпеню ў лейку і паабліваць усе кусты. Для нашай мясцовасці адной такой апрацоўкі звычайна хапае». Так і робім. І задаволеныя.

Патэнцыял гурта, калектыву, аб’яднання — вельмі значны рэсурс для развіцця вашай сядзібы і паселішча. Згадай партнёрства як прынцып устойлівага развіцця (гл. параграф 1 гэтага дапаможніка).

Аб’яднанне некалькіх удзельнікаў для развіцця адной справы — праверанная, надзейная рэч. Ёсць многа прыкладаў такога супрацоўніцтва, талакі, кааператываў[14], кластараў. Напрыклад, у аргаэкатурызме такія схемы працы шырока распаўсюджаныя ў многіх краінах. Так, у адным з невялікіх гарадкоў Балгарыі ў горнай мясцовасці нам расказалі, што яны — група энтузіястаў — спачатку паспрабавалі развіваць вясковы турызм індывідуальна, не прыцягваючы суседзяў і толькі ў межах сваёй вёскі. Такая тактыка хутка паказала хібы: турыстам неўзабаве надакучвала вёска, і яны звычайна больш не вярталіся туды зноў і не раілі іншым ездзіць туды. Выйсце знайшлося ў аб’яднанні рэсурсаў і пашырэнні турысцкай прапановы. Сумесна з суседнімі абшчынамі распрацавалі туры выходнага дня і спецыялізаваныя маршруты, што значна павялічыла прывабнасць мясцовасці і прыток турыстаў. Так, невялікі муніцыпалітэт Ардзіна ў горным раёне Радопы прапануе не менш за восем варыянтаў, як могуць бавіць дзень турысты. Сярод прапаноў:

— арт-тур, падчас якога можна ўбачыць арганізаваную ў прыродным асяроддзі выставу нетрадыцыйнага жывапісу;

— прыгодніцкі тур, які ўключае фотасафары, пікнік у лесе, вандроўку да Д’ябальскага моста, сплаў на байдарках па горнай рэчцы;

— агратур, падчас якога ўдзельнікі наведаюць горную ферму, дзе дэманструецца вытворчасць малочных прадуктаў па старажытных тэхналогіях, а таксама ладзіцца дэгустацыя экалагічна чыстых мясцовых прадуктаў…

Абавязкова даведайся, ці ёсць на вашай тэрыторыі, у вёсцы, сельсавеце грамадскія некамерцыйныя арганізацыі і ініцыятывы. Гэта могуць быць зарэгістраваныя фонды і грамадскія арганізацыі, а таксама некамерцыйныя ўстановы і аб’яднанні. Мясцовыя ініцы-

[14] Падрабязней магчымасці вясковай кааперацыі мы разгледзім у параграфе 11.

ятывы могуць функцыянаваць у выглядзе гурткоў (звычайна яны трымаюцца на асобе-лідары), клубаў па інтарэсах (таксама большай часткай яны збіраюцца разам вакол аднаго-двух аматараў) пры доме культуры, бібліятэцы, музеі. Супрацоўніцтва з грамадскімі арганізацыямі і ініцыятывамі можа быць табе не толькі карысна, але і стаць важнай часткай тваёй самарэалізацыі. Пакуль што ў вясковай Беларусі не так многа такіх арганізацый, але яны ёсць, і варта звярнуць на іх увагу. Магчыма, табе дапамогуць па гэтым пытанні ў раённай адміністрацыі, а першасную інфармацыю можна пашукаць на сайце райвыканкама. Важныя плюсы зарэгістраваных недзяржаўных арганізацый:

- яны ўжо аб'ядналі некаторых людзей, і вам не трэба пачынаць з нуля,
- у іх ёсць (хоць нават невялікія) рэсурсы: памяшканне, офіснае абсталяванне, а таксама нябачныя, але вельмі карысныя даброты — сувязі, кантакты, досвед у правядзенні мерапрыемстваў,
- менавіта на іх часта арыентуюцца грантавыя конкурсы,
- у іх ёсць банкаўскі рахунак.

Далучы сюды і свой унёсак у выглядзе ведаў і інфармацыі, асабістых навыкаў (напрыклад, ты смачна гатуеш ежу ці ўмееш граць на музычных інструментах, ці можаш падзяліцца насеннем, парасткамі і чаранкамі...). У недзяржаўных арганізацыях заўсёды добра сустракаюць валанцёраў, і гэта можа быць цікавым для дзяцей і моладзі (паміж іншым, згадванне аб удзеле ў валанцёрскім руху ў сваім рэзюмэ — даволі распаўсюджаная практыка, такая дзейнасць — добры паказчык актыўнасці, неабыякавасці і імкнення да развіцця).

**Эканамічны патэнцыял тэрыторыі.** Цяжка забыцца пра яго, але ж бывае так, што і цяжка падступіцца: а як жа скарыстаць яго для паляпшэння асабістага дабрабыту? Для развіцця сваёй сядзібы? Дальнабачны гаспадар пастараецца больш даведацца пра сваіх бізнес-суседзяў — і пра сельскагаспадарчы комплекс, і пра прамысловыя прадпрыемствы, і пра дробныя фірмы і індывідуальных прадпрымальнікаў. Пазнаёміцца, усталюе кантакты. Магчыма, праз гэтыя кантакты ў будучым можна будзе нешта купіць танней (бо, як мінімум, зменшацца транспартныя выдаткі). Ці нават стаць пастаўшчыком нейкіх прадуктаў і паслуг. Можа, тут ёсць магчымасці карыстацца некаторымі элементамі інфраструктуры (напрыклад, складоў ці гаража). Далучыцца да арганізатараў і ўдзельнікаў мясцовых свят і фэстаў. Аб'яднацца разам у агратурыстычны кластар. А бывае, што мясцовы бізнес рэалізуе нерухомасць, і такая падзея супадае з тваімі планамі па развіцці гаспадаркі. Карыснае супрацоўніцтва з бізнесам можа адбыцца і па праектнай дзейнасці, таму што нярэдка згодна з умовамі грантавых конкурсаў ад цябе

могуць запатрабаваць свой частковы ўнёсак — грашыма ці ў выглядзе прадукцыі ці паслуг. Вось тут якраз і спатрэбіцца знаёмства з бізнесам, у якога на гэты конт большыя магчымасці. А ўвогуле магчымыя розныя шляхі ўзаемадзеяння з эканамічнымі суб'ектамі. Як кажуць мудрацы: "Грукайце ў дзверы, і вам адчыняць».

**З чаго ж пачаць** працу з мэтай паставіць мясцовы патэнцыял на службу развіцця сваёй сядзібы-гаспадаркі?

Першае: трэба вывучыць і зафіксаваць гэты патэнцыял. Гэта добрая агульная сямейная праца, дзе знойдзецца справа па душы і малым, і дарослым. Канкрэтныя крокі могуць быць наступныя:

- вандроўкі па ваколіцах (найбліжэйшыя мясціны лепш вывучаць праз пешыя паходы, крыху далейшыя — роварныя),
- размовы з суседзямі (памятайма беларускія прыказкі: «За запытанне не страціш ні абеду, ні снядання» і «Хто пытае, той многа знае»);
- сустрэчы з мясцовымі прадпрымальнікамі, супрацоўнікамі і дэпутатамі сельсавета, настаўнікамі тутэйшай школы, працаўнікамі сельскагаспадарчага прадпрыемства, гаспадарамі агратурыстычных сядзіб, прадстаўнікамі недзяржаўных некамерцыйных арганізацый і ініцыятыў, рэлігійных суполак;
- візіт у мясцовую бібліятэку (часта бывае, што ў бібліятэках праводзіцца краязнаўчая работа, складаюцца цікавыя альбомы-справаздачы);
- паездка ў музей (даведайся папярэдне, можа, краязнаўчы музей ёсць у школе або нават у недалёкіх вашых суседзяў ёсць прыватны музей, калекцыя ці амаль што батанічны сад, паспрабуй напрасіцца да іх таксама);
- складзіце з сям'ёй мапу вашай мясцовасці з цэнтрам — сваёй сядзібай (намалюйце на ёй суседні лес, пазначце ваша сакрэтнае грыбное месца, самае старое ці высокае дрэва, вялікі камень-валун, месца, дзе сустрэлі зайца ці рэдкую птушку, змясціце інфармацыю пра мясцовы бізнес, адзначце напрамкі да найбліжэйшых гістарычных будынкаў...);
- паспрабуйце намаляваць ці зрабіць з дапамогай камп'ютара паштоўку-візітоўку[15] вашай сядзібы з адметнымі яе момантамі-«перлінамі» і «разынкамі»;
- збярыцеся разам з суседзямі, запрасіце сяброў (добра, калі сярод іх будуць людзі рознай адукацыі і прафесіі — біёлагі і гісторыкі, настаўнікі і інжынеры, прадпрымальнікі і медыкі, мужчыны і жанчыны, моладзь і людзі сталага ўзросту) і правядзіце сумеснае абмеркаванне пытання аб патэнцыяле вашай тэрыторыі;

[15] Прыклады такіх паштовак, зробленых актывістамі з кожнага сельсавета і гарадоў Мёры і Дзісна, з Мёрскага раёна можна знайсці ў кніжцы: Стратегия устойчивого развития Миорского района на 2022–2035 годы. // Кузнецов И.В. и др. Под редакцией Сивагракова А. В. – Минск, «Колорград», 2022, 51 с. (https://disk.yandex.by/i/a8xAqAaRgiimzQ) ці (https://kuna-sdg.de/wp-content/uploads/2023/11/Sustainable-Development-Strategy-Miory-2022.pdf)

- цягам такой сустрэчы фіксуйце факты і ідэі (можна ў фармаце SWOT-аналізу[16]),

- складзі пералік магчымых праектаў ці нават праектных ідэй для іх распрацоўкі і рэалізацыі ў перспектыве.

Вось гэта будзе ўжо не проста добры пачатак, а каштоўны набытак-падмурак для справы ўстойлівага развіцця вашай сядзібы і вёскі!

Звяртай увагу на магчымасці спалучэння ў сваёй дзейнасці па выкарыстанні мясцовага патэнцыялу адначасова некалькіх тэматычных напрамкаў, розных ідэй і падыходаў.

«Зберагайце старыя сады, бо яны сталі часткай нашага культурна-прыроднага патэнцыялу», — звяртаюцца супрацоўнікі муніцыпалітэта Ноцінгемскай акругі да жыхароў у буклеце «100 цудоўных парад на будучыя 100 гадоў». Далей тлумачыцца, што старыя сады не толькі каштоўныя дзякуючы ўраджаям традыцыйных мясцовых яблык, але і праз сваю арыгінальную экасістэму, якая фармавалася стагоддзямі. Дуплы ў яблынях сталі домам для разнастайных птушак, кажаноў, насякомых. Пад дрэвамі знаходзяць сабе прытулак вожыкі, яшчаркі і іншыя нашы «малодшыя браты». У выніку кампаній па зберажэнні старых садоў у Заходняй Еўропе стварыліся нават спецыяльныя турыстычныя маршруты па старых садах. Праводзяць таксама спаборніцтвы: дзе расце самая старая яблыня.

Падчас пошуку шляхоў, як спрычыніць мясцовыя даброты да росквіту сваёй сядзібы, адначасова і працуй над сваім унёскам у агульную справу ўстойлівага развіцця тэрыторыі і мясцовай супольнасці. На працягу гэтай працы звяртай увагу на неабходнасць забеспячэння ва ўсіх гэтых момантах роўнасці, справядлівасці і разнастайнасці. Так сфармуецца і будзе мацавацца твая сядзіба і грамада, і ты разам са сваёй сям'ёю — у ёй!

## § 5. Правільнае праектаванне свайго падворка.

Як улічваць дзейнасць, якая будзе ажыццяўляцца; аналіз наяўнага планавання для яго ўдасканалення; экалагічная каналізацыя, адходы жыццядзейнасці (прыбіральні, кампост) на вясковых дзялках.

**ПРАЕКТАВАННЕ — гэта форма планавання.** Калі ў цябе з'явіўся дом у вёсцы і вакол дома маецца зямельны надзел, то табе абавязкова захочацца нешта там змяніць, прыбудаваць, перабудаваць пад свае патрэбы, мэты і мары.

**Планаванне — гэта частка прыроды чалавека.** Для выжывання чалавеку неабходна было доўгі час у сваёй эвалюцыі планаваць, як зрабіць запасы ежы, дзе жыць і г. д. Таму хочам мы альбо не хочам — свядомасць прымушае чалавека планаваць сваю будучыню. Але можна планаваць больш разважліва, выкарыстоўваючы спецыяльныя інструменты і прынцыпы для гэтага.

**Пытанні, якія будуць нас цікавіць:**

[16] Пра тэхніку і асаблівасці правядзення SWOT-аналіза глядзі ў параграфе 15.

- **Аналіз** стану пабудоў і яго ўдасканальванне.
- **Экападыходы** да жылля і жыццёвай прасторы – агульныя прынцыпы.
- Як зрабіць сваю гаспадарку максімальна **самадастатковай**.
- **Як экалагічна прыязна арганізаваць**
  - ацяпленне,
  - водазабеспячэнне,
  - каналізацыю.
- **Адходы жыццядзейнасці:**
  - прыбіральні;
  - кампаставанне.

**ПЕРАДУСІМ ТРЭБА БУДЗЕ ЗРАБІЦЬ АНАЛІЗ:**

Вывучаючы архітэктуру колішніх забудоў, пераконваешся, што размяшчэнне ды пабудова жыллёвага дома і гаспадарчых будынкаў **вялося з улікам эрганамічнасці**, зручнасці і функцыянальнасці. Але тыя зручнасці і планаванне ствараліся да **тагачаснага жыццёвага ладу**, дзе прадугледжвалася наяўнасць пэўнай колькасці свойскіх жывёлін і іх гадоўля. Альбо прафесійны занятак гаспадара. Новыя тэхналогіі і **сучасны лад жыцця** патрабуюць іншага падыходу да арганізацыі жыццёвай прасторы на прыватнай вясковай дзялцы.

**АЦЯПЛЕННЕ:**

- ПЯЧНОЕ
- ГАЗАВАЕ
- ЭЛЕКТРЫЧНАЕ
- СОНЕЧНАЕ.

Лепш мець камбінацыю розных відаў!

ПЯЧНОЕ АЦЯПЛЕННЕ:

- Дае «мяккае», лячэбнае цяпло
- Гатаванне смачнай, карыснай ежы
- Сушка, ферментаванне
- Попел – выдатнае ўгнаенне
- Па кошце – сярэдняе.



Пры выкарыстанні пячнога ацяплення можна вырашаць некалькі гаспадарчых задач адначасова. Напрыклад, печка-ляжанка, якая стаіць у нас у адной з гаспадарчых забудоў (яе здымак размешчаны ніжэй) адначасова вырашае некалькі важных гаспадарчых задач:

- Падтрымлівае неабходную тэмпературу для ўтрымання ў зімовы час перапёлак (каб яны несліся і ў іх было суха);
- Падтрымлівае тэмпературу для гадавання верміматачніка ў халодны час;
- Дапамагае гадаваць у ранні вясновы час куранят;
- Выдатна дапамагае для вырошчвання расады агародных культур у халодны час

Акрамя ўсіх гэтых карысных функцый, гэтая печка апальваецца рэшткамі дроў:



**ВАДА: САМАЕ ВАЖНАЕ**

- Трэба вельмі ўважліва і дасканала спланаваць забеспячэнне падводу і адводу вады на дзялцы.
- **ПАДВОД**: свідравіна і калодзеж.
  - **СВІДРАВІНА**: забяспечвае неабходны аб'ём карыстальнікаў (гігіена, паліў, піццё для свойскай жывёлы, мыйня для тэхнікі і прыборкі).
  - **КАЛОДЗЕЖ**: мае лепшыя біяхімічныя складнікі, таму можа быць (пасля правядзення аналізу) як пітная вада, для прыгатавання ежы, засолкі, ферментавання... (і забяспечвае вадой у адсутнасць электрычнасці).
  - **ДАЖДЖАВАЯ**: выдатная па складзе, бясплатная.
- **АДВОД**: тры розныя сістэмы, якія базуюцца на дыферэнцыяцыі «белай і шэрай» сцёкавай вады.

**З чаго складаецца сцёкавая вада:**

- **МІКРААРГАНІЗМЫ** (ПАТАГЕННЫЯ БАКТЭРЫІ, ВІРУСЫ, ЯЙКІ ГЛІСТОЎ)
- **БІЯРАЗЛАГАЛЬНЫЯ АРГАНІЧНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ**
- **ІНЭРТНЫЯ АРГАНІК-МАТЭРЫЯЛЫ** (ДЭТЭРГЕНТЫ, ПЕСТЫЦЫДЫ)
- **ПАЖЫЎНЫЯ РЭЧЫВЫ** (АЗОТ, ФОСФАР, АМІЯК)
- **МЕТАЛЫ** (Hg, Pb, Cd, Cr, Cu, Ni)
- **ІНШЫЯ ТАКСІЧНЫЯ АРГАНІК-МАТЭРЫЯЛЫ** (ФЕНОЛ)
- **ТЭМПЕРАТУРА** (ЦЯПЛО)
- **ПАХ І СМАК**
- **РАДЫЕАКТЫЎНАСЦЬ**.

**Спосабы адводу (каналізацыі) сцёкавых вод:**



**Самая экалагічная сістэма ачысткі:**



Такая сістэма ачысткі ўсталявана ў доме а/г Калодзішчы каля Мінску. Дом разлічаны на аднагачасовае пражыванне да 30 асоб. І асенізатарскую службу выклікаюць пры такой біясістэме ачысткі прыкладна раз на год.

## ГАЛОЎНЫЯ ВЫСНОВЫ ПА ВОДАЗАБЕСПЯЧЭННІ:

- Сістэмы падводу і адводу вады павінны быць у **гарманічным балансе:** правільна размяркоўвацца па якасці і прызначэнні.
- Неабходна выпрацаваць навыкі **эканомнага выкарыстання.**
- Распрацаваць мадэлі па максімальным **выкарыстанні сцёкавай і дажджавой вады.**
- Мець магчымасць карыстацца ўсімі неабходнымі выгодамі **пры адсутнасці электрычнасці.**
- Перыядычна **правяраць ваду** на біяхімічны склад прыточнай і адводнай вады.
- Скласці рэалістычны **бізнес-план** па падвядзенні і адводзе вады, зыходзячы з умоў пражывання.

## ПРЫБІРАЛЬНЯ

- У сярэднім чалавек там праводзіць за жыццё **1,5 гады.**
- На працягу дня **кожная асоба прадукуе** ад 1,5 да 3-х літраў урыны і каля 200 г фекалій. За год — прыкладна **73-80 кг** калу і **2 200 л** урыны.
- Гэтыя рэчывы метабалізму могуць быць выкарыстаны **як на карысць, так і на шкоду** чалавеку ці асяроддзю.
- У прыродзе **ўсё злучана з усім** і павінна некуды дзецца ці пераняміцца.
- Таму арганізаваць у**ласную сістэму каналізацыі** можна (і нават трэба), каб не нашкодзіць прыродзе, а дапамагчы ёй.
- Калі каналізацыя будзе зроблена ў канфлікце з прыродаю, яна будзе **помсціць хваробамі і эпідэміямі** (у гісторыі такое часта здаралася).
- Таму тут дзейнічаюць строгія **санэпідэміялагічныя нормы** і патрабаванні.

**Юрыдычная аспекты гаспадарання на вёсцы залежаць ад тваёй МЭТЫ:**



Памер участка, юрыдычная форма твайго пражывання і гаспадарання будуць уплываць на твае планы па пабудове неабходных памяшканняў і забудоў.

Калі ты майстар-кераміст і працуеш як рамеснік, то табе трэба памяшканні пад печы, майстэрні, дамок пад навучанне дзяцей, рэалізацыю прадукцыі і інш.

Менавіта такую сядзібу я бачыў у Бабруйскім раёне. Яе стварыла сям'я ганчара, які запрашаў да сябе на навучанне свайму рамяству ахвотных з розных краін свету. У іх быў нават спецыяльны дамок для такіх гасцей.

Зразумела, што гаспадарчыя забудовы для ўтрымання свойскай жывёлы ў іх адсутнічалі. Таксама як не будавалі яны памяшканні для нарыхтоўкі і перапрацоўкі гародніны.

Іншая справа, калі ў цябе гаспадарка для гадоўлі авечак, коз ці кароў.

Тут патрэбны будуць памяшканні для гатавання ім ежы, нарыхтоўкі кармоў і ўтрымання саміх жывёл.

І адпаведна для аграсядзібы будуць свае параметры, а для фермерскай гаспадаркі — свае.

З гэтымі сувязямі ўсё зразумела! Праблемы пачынаюцца, калі, напрыклад, твой галоўны занятак быў — прымаць гасцей на аграсядзібе, а потым гэтая дзейнасць прыпынілася і вы з сям'ёй завялі хатнюю птушку, іншых жывёл, і тэрыторыя напоўнілася пахамі жывёлагадоўлі, а тут пачалі зноў прыязджаць турысты...

Такую сітуацыю я сустракаў на Ушаччыне ў аграсядзібе Мікалая П. Гаспадару было вельмі цяжка сумясціць адну дзейнасць (жывёлагадоўчую) і другую (прыём турыстаў на аграсядзібе). Ад такога сумяшчэння былі нязручнасці як для жывёл, так і для гасцей аграсядзібы.

Выйсце было адно — перанесці ўсе забудовы, якія былі звязаны з жывёлагадоўляю, у іншае месца, але недалёка ад сваёй дзялкі. І калі такая незанятая зямля побач маецца, то можна прасіць мясцовыя органы ўлады для афармлення зямлі пад АПГ і працягваць сваю аграсядзібную дзейнасць.

Так што выснова тут такая: спрабуй знайсці для сваёй сядзібы такое месца, якое б дазваляла табе мець у будучым прастору для дыверсіфікацыі сваёй дзейнасці, каб была магчымасць пашырацца, калі спатрэбіцца. Таму людзям з нявызначанымі планамі дзейнасці, якія тым не менш плануюць развіваць свой дробны бізнес на вёсцы, варта прыглядзецца да дзялак, якія маюць побач свабодную зямлю. Крайнія ўчасткі — сама тое ў гэтым выпадку.

Няхай яны будуць і даражэй каштаваць.

Менавіта з таго, што наша дзялка крайняя на вёсцы, мы змаглі пашырыць свой надзел амаль удвая — пасадзіць уласны лесасад, які вельмі станоўча ўплывае на мікраклімат дзялкі.

Акрамя апісаных вышэй абставін па планаванні сваёй гаспадаркі, важна ўлічваць і шэраг іншых фактараў.

Першы з іх — як адпавядаць прынцыпам устойлівага развіцця.

Потым правесці заніраван-

не ўчастка: падзяліць яго на зоны, асобныя «пакоі» для адпачынку, для дзяцей, для сустрэч з сябрамі, гатавання ежы, стаянку для аўто і інш.

## Планы для ўладкавання сваёй сядзібы з улікам прынцыпаў УР

- Навакольная прастора вакол дома - гэта магчымасць для бясконцай **ТВОРЧАСЦІ.**
- Гэта **ДЭКАРАЦЫІ**, якія ствараюцца на доўгія гады.
- Трэба так сспланаваць высадкі і пабудовы, каб атрымліваць **НАТХНЕННЕ** для свайго асабістага жыцця.
- Галоўнае - вельмі рацыянальна падзяліць на **ЗОНЫ**: гаспадарчую, адпачынкавую, функцыянальную.



## Фунцыянальныя зоны

Пры выпрацоўцы планаў па высадцы раслін і размяшчэння пабудоў <u>важна звяртаць увагу</u> на:

- тое, якія **вятры** дамінуюць вакол сядзібы, ведаць, дзе самыя зацішныя зоны;
- **сонечныя** і зацніненыя бакі панадворка;
- уплыў на гаспадарку навакольных **дарог** пад'язных шляхоў;
- умела **размежавацца** з суседзямі і калгаснымі палеткамі, якія прымяняюць хімічныя сродкі.



Абагульняючы ўсё сказанае, можна яшчэ раз зафіксаваць адны з галоўных прынцыпаў занавання і планавання на сваім участку:

## Планы для ўладкавання сваёй сядзібы - галоўныя прынцыпы

- Неабходна вызначыцца і адказаць самому сабе на наступныя пытанні:
- Які будзе твой **асноўны занятак** - вырошчванне раслінаў, жывёлагадоўля, альбо кухарства ці выраб рэчаў?
- Якую **эрганоміку** і зручнасці для працы можна прымяніць?
- Як звязаць пабудовы і **адходы ад дзейнасці** з устойлівым развіццём?



## Планы для абустройства сваёй сядзібы - галоўныя прынцыпы II

- Трэба абавязкова планаваць **узаемаадносіны** з прыродаю - гэта трошкі іншае, чым ствараць уласны бізнес-план:
- прырода жыве сваім жыццём, і яе жаданні не заўжды могуць адпавядаць нашым чаканням;
- таму для ўстойлівасці вельмі важна — адчуваць прыроду, разумець яе і ўмець з ёю дамаўляцца;
- не ўсе адразу разумеюць, што прыродныя катаклізмы - гэта даннасць, якую не абмінеш, з ёй трэба вучыцца жыць...



**§ 6. Ландшафтны дызайн.** *Асновы ландшафтнага дызайну. Як зрабіць свой падворак прыгожым і функцыянальным. Падбор дэкаратыўных і садовых раслін. Лесасад як аснова дызайну дзялкі. Арганізацыя аптэкарскага гарода.*

Як мы ўжо пазначалі, пасля афармлення зямельнай дзялкі можна зрабіць рэвізію, што засталося ад папярэдніх уладальнікаў, і спраектаваць пасадкі раслін паводле свайго жадання і сваёй мары.

Можна заказаць дызайн для сядзібы ў прафесійных ландшафтных дызайнераў, а можна самастойна скласці канцэпцыю, зыходзячы з наступных фактараў:

- памер дзялкі,
- прызначэнне зямельнага ўчастка,
- баланс пладовых культур і дэкаратыўных,
- біяразнастайнасць,
- экалагічныя прынцыпы.

### ПАМЕР ДЗЯЛКІ

Калі ў тваім карыстанні будзе дзялка да 0,25 га – для абслугоўвання жыллёвага дома – і вакол будуць суседзі, то табе трэба будзе вырашаць, колькі зямлі застанецца пасля ўсіх пабудоў для агарода і саду. Пладовыя дрэвы ў цяперашні час садзяць нізкарослымі, каб зручней збіраць плады, але такія дрэвы не даюць ценю, што адбіваецца на агульным клімаце, патрабуе больш паліву і не дазволіць дасягнуць устойлівага біябалансу.

Калі памер дзялкі 0,5-1 га, то было б добра запланаваць і пасадзіць свой лесасад з рознымі лісцевымі, хвойнымі і пладовымі дрэвамі. Такі лесасад абароніць тваю сядзібу ад сцюдзёных вятроў, вельмі станоўча паўплывае на ажыўленне глебы, дазволіць дасягнуць станоўчага фітацэнозу.

У такім садзе можа пасяліцца шмат розных птушак, у іх будзе дастатковая кармавая база. Некаторыя куткі лесасаду будуць зарастаць кустоўем, што створыць неабходныя ўмовы для памнажэння карысных энтамафагаў і, адпаведна, дазволіць трымаць дзялку ў экабалансе, не выкарыстоўваючы шкодных інсектыцыдаў.

### ПРЫЗНАЧЭННЕ ЗЯМЕЛЬНАГА ЎЧАСТКА

Таксама істотны фактар, які трэба ўлічыць пры распрацоўцы дызайну.

Калі, напрыклад, да тваёй дзялкі для абслугоўвання дома прымыкае зямельны ўчастак, выдзелены табе ў арэнду для агародніцтва, то садзіць дрэвы на ім забаронена. Гэтую зямлю трэба будзе альбо выкупляць для ўласнага карыстання, альбо пераафармляць пад АПГ.

Таксама і выкарыстанне зямлі выдзеленай пад СФГ будзе весціся па ўзгадненні з органамі ўлады, і пад лесасад табе могуць не ўзгадніць яе выкарыстоўваць.

### БАЛАНС ПЛАДОВЫХ КУЛЬТУР І ДЭКАРАТЫЎНЫХ

Калі ў цябе маецца плошча для пасадкі розных дрэў: і пладовых, і дэкаратыўных – то старайся, каб былі і адны, і другія.

Бо кожная расліна – дрэвы, кусты, травы – карысная па-свойму.

Некаторыя прываблiваюць

пчол, іншыя выкарыстоўваюцца як лекавыя, прафілактычныя сродкі, а яшчэ яны даюць плады для птушак, кормяць іх у зімовы перыяд. Кустоўе глогу (баярышніка) вельмі пладаноснае, шматлікія плады яго падабаюцца птушкам, асабліва калі наступаюць халады. А, напрыклад, лістота манжурскага гарэха адпужвае на дзялцы грызуноў - мышэй і пацукоў. А калі растуць некалькі бярозак, то можна і сок свой мець вясною і венікі ў лазню зрабіць. А яшчэ некаторыя дрэвы лічацца азотафіксатарамі: вольхі і інш.

Калі ж ваша плошча не дазваляе такую багатую раслінную біяразнастайнасць у сябе пасадзіць, думайце над пасадкай кожнай расліны, улічваючы іх памеры праз гады і шкоду ад інвазіўных відаў.

## БІЯРАЗНАСТАЙНАСЦЬ

Гэта аснова і падстава для ўстойлівасці. Часам людзям, якія ўпершыню бачаць дзялкі, створаныя на прынцыпах пермакультурнага дызайну, здаецца, што перад імі проста недагледжаны гарод — шмат пустазелля, не вельмі чыстыя, праполатыя грады.

Але такі гарод якраз мае ўнутраную імуннасць, здольны супрацьстаяць шкоднікам і хваробам, паляпшае вільготны і структурны склад глебы.

Таму задача гаспадароў, якія імкнуцца зрабіць свой сад і гарод максімальна абароненымі ад пагрозы захворванняў, — трымацца прыродападабенства ў сваім дызайне. А гэта азначае — дапускаць максімальна разнастайныя расліны па відах і гатунках. Галоўнае, сачыце за тым, каб гэтыя віды не былі інвазіўнымі і не выцяснялі мясцовыя віды раслін. Да такіх, напрыклад, адносяцца абляпіха крушынападобная і ірга каласістая — іх саджаць нельга.

Імунітэт такога разнастайнага саду або гарода з гадамі гэта будзе перададзены глебе, на якой ты вырошчваеш сабе плады для здаровага харчавання.

## Ландшафтны пермакультурны дызайн — гэта дызайн цэласных сістэм

Мэта такога дызайну — надаць свайму саду і гароду прыродную доўгатэрміновую каштоўнасць. Бо тут важна ўлічваць не толькі расліны, якія ты пасадзіш, але таксама і

- жывёл, якіх ты гадуеш,
- грыбы (мікарызу), якім ты мусіш стварыць умовы для росту,
- глебу, якую мусіш кантраляваць, забяспечваючы належную структуру і вільгаць.

Твая мэта ў такім дызайне — стварыць перадусім прадукцыйную прастору, у якой ты жывеш не толькі на працягу ўсяго года, але і ў шматгадовай перспектыве.

Для таго, каб гэта працавала, табе трэба ведаць, як усе кампаненты (расліны-жывёлы-грыбы-глеба-вада) між сабою ўзаемадзейнічаюць.

У выніку пасля такога разумення на мікраўзроўні ў цябе атрымаецца злучыць у адно цэлае дом, у якім ты жывеш, фруктовыя сады і ўрадлівыя агароды, свойскую жывёлу, якую ты трымаеш, — вось сэнс пермакультурнага дызайну.

Калі ты запросіш да сябе проста ландшафтнага дызайнера, ён табе падкажа, дзе якія расліны

пасадзіць і як іх даглядаць, але не абавязкова ў цябе атрымаецца правільна дагледзець усе пасаджаныя дызайнерам расліны, і табе давядзецца зноў і зноў звяртацца па дапамогу да дызайнера пры няштатных сітуацыях — засухах, празмернай вільгаці альбо раптоўных хваробах раслін.

У выпадку ж з пермакультурным дызайнам – ты становішся інжынерам па стварэнні і доглядзе цэласнай сістэмы асяроддзя свайго доўгатэрміновага пражывання.

Канчатковаю мэтаю пермакультурнага дызайну з'яўляецца праектаванне і стварэнне прадукцыйнай экасістэмы, якая будзе шмат гадоў пастаўляць табе карысную прадукцыю для спажывання: ягады, плады, размаітую гародніну, мяса свойскай жывёлы, малочныя прадукты, яйкі і лекавыя расліны.

Каб гэтая мэта спраўдзілася і гаспадары маглі стварыць і падтрымліваць такую жывую экасістэму на сваім падворку, патрэбны адпаведныя ВЕДЫ. Атрыманню такіх ведаў спрыяюць адукацыйныя курсы, якія мы рэгулярна праводзім з запрашэннем адпаведных экспертаў і спецыялістаў. Больш за тое, мы дапамагаем кансультацыямі для распрацоўкі і падтрымкі такіх індывідуальных экасістэм, паказваючы на прыкладах паспяховыя і няўдалыя практыкі пермакультурнага дызайну. Пасля нашых курсаў слухачы паглыбляюцца ў новае для сябе бачанне вясковага пражывання, пачынаюць самастойна вывучаць мікрабіялогію глебы, закладаць эфектыўныя кампоснікі, заводзяць для сябе некаторыя віды свойскіх жывёл, выкарыстоўваюць для свайго харчавання значна больш карысных прадуктаў.

Пры такім падыходзе да дызайну «фуд-зонаю» на тваім участку выступаюць амаль усе кампаненты. Твае расліны ў большасці вырошчваюцца для спажывання тваёй жывёлай і для цябе — гэта перадусім прадуцэнты карыснай для чалавека ежы.

## Лесасад як аснова дызайну тваёй дзялкі

Лесасад — гэта важны элемент пермакультурнага дызайну. У яго аснову пакладзены прынцыпы, якія існуюць у прыродзе. Ён мае, напрыклад шмат'яруснасць, уласцівую прыродным ландшафтам: дрэў, кустоўя, траў, ліян. Лесасад выконвае адразу некалькі функцый на тваёй дзялцы.

Напрыклад, наш лесасад — гэта цудоўная прастора для выгулу нашых курэй, індыкоў і качак. Яны там адчуваюць сябе абароненымі ад драпежных птушак, ад пякучага летняга сонейка і праліўных дажджоў. Гэта выдатная абарона ад сіверу — паўночных халодных вятроў.

Адна з галоўных мэт лесасаду — натуральнае паляпшэнне якасці глебы, а таксама вырошчванне ягад, арэхаў і іншых пладоў. У нашым лесасадзе растуць агрэст, парэчкі, кізіл, фундук, вішні, маліны, ажыны, шаўкоўніцы і інш. Таксама шмат пладоў баярышніку-глогу прываблівае многіх птушак.

Тут засяляюцца карысныя для экасістэмы энтамафагнікі. Лесасад — гэта аснова для існавання мікарызы — грыбоў, якія паступова напаўняць сабою глебу ўсяго твайго зямельнага ўчастка.

Такім чынам, лесасады — гэта стваральнікі спрыяльных умоў для фіта , біяцэнозу на тваёй дзялцы. І чым большая біяразнастайнасць прысутнічае ў тваім лесасадзе, чым болей неінвазіўных відаў раслін і жывёл і ім перабывае, тым больш устойліваю будзе твая ўнутраная экасістэма прысядзібнай дзялянкі.

**Вось перавагі і каштоўнасці лесасаду як экалагічнага аб'екта:**

1. Паляпшэнне якасці паветра: лесасады паглынаюць вуглякіслы газ і іншыя шкодныя рэчывы і такім чынам робяць паветра вакол значна чысцейшым.

2. Абарона глебы: лесасад захоўвае паверхню зямлі ад шкодных уздзеянняў і спрыяе гуміфікацыі глебы, паляпшае яе структуру.

3. Кліматычная рэгуляцыя: лесасад дапамагае захоўваць баланс тэмператур і вільготнасці, спрыяе стварэнню адпаведнага для шматлікіх жывёл і раслін мікраклімату.

4. Выступае як выдатная буферная зона паміж тваёй дзялкаю і землямі аграпрамысловага комплексу.

5. Лесасады ствараюць на дзялцы цёплыя закуткі-пасткі, у якіх у мяне растуць многія цеплалюбныя расліны.

**Лесасад дапамагае стварыць больш спрыяльны мікраклімат.**

Напрыклад, лёгка заўважыць, што летам на санцапёку паветра каля лесапаласы больш прахалоднае, а зімой (асабліва ў канцы дня) больш цёплае, чым там, дзе дрэвы адсутнічаюць. Такім чынам, лесасады аказваюць вельмі адчувальны ўплыў на мікраклімат тваёй дзялкі.

Ты, шаноўны чытач, можаш самастойна эксперыментаваць адносна пасадак у сваім лесасадзе: можна спалучаць пасадкі тых дрэў і кустоў, якія табе падабаюцца ў залежнасці ад мэт і задач, якія ты сабе ставіш.

**Вось галоўныя, падставовыя прынцыпы для стварэння свайго асабістага лесасаду:**

**1. РАЗНАСТАЙНАСЦЬ:** лесасады павінны складацца з розных відаў раслін, таму што кожнае дрэва выконвае свае асобныя функцыі ў экасістэме. Разнастайнасць дапамагае стварэнню ўстойлівай і збалансаванай сістэмы.

2. Расліны ў лесасадзе павінны ствараць **СІМБІЯТЫЧНЫЯ СУВЯЗІ**, якія ўплываюць на рост і колькасць пладоў, аздараўляюць адна адну. Дрэвы, якія фіксуюць азот у глебе (вольха і інш.), узбагачаюць глебу азотам і іншымі важнымі элементамі, а іншыя дрэвы і кусты — прываблівалюць карысных насякомых... Кожная расліна лесасаду выконвае адну альбо некалькі важных функцый: абарону ад шкоднікаў, апору для ліян, зацяненне, абарону ад ветру...

**3. ЯРУСНАСЦЬ:** лесасад павінен мець розныя ўзроўні росту раслін — ад дрэў і кустоў да травяных і покрыўных. Гэта стварае шматслойную структуру, якая аптымізуе выкарыстанне прасторы і рэсурсаў.

**4. УСТОЙЛІВАСЦЬ:** лесасады павінны быць створаны такім чынам, каб быць устойлівымі да змен асяроддзя: засуха, захворванні і шкоднікі. Менавіта разнастайнасць і ўзаемадзеянне раслін дапамагае ім ствараць устойлівую экасістэму.

**5. НЕІНВАЗІЎНАСЦЬ:** расліны ў лесасадзе не павінны выцясняць нашы мясцовыя віды раслін. Абавязкова азнаёмся з пастановай Савета Міністраў ад 7 снежня 2016 года № 1002, абноўленым ЭкоНиП 17.01.06-001-2017, зацверджаным Мінпрыроды ад 18 ліпеня 2017 г. № 5-Т, а таксама кнігай «Растения-агрессоры: Инвазивные виды на территории Беларуси», 2017, Мінск.

Выкарыстоўваючы гэтыя базавыя прынцыпы, ты зможаш ствараць прадуктыўныя і эфектыўныя лесасады на сваёй дзялцы з раслін розных кліматычных зон.

**Арганізацыя аптэкарскага гарода.**

Аптэкарскі гарод пры тваім доме — гэта адзін з элементаў арганізацыі прыродападобнага дызайну.

Акрамя практычнага прымянення раслін для паляпшэння здароўя, такі гарод мае пазнавальнае і навучальнае значэнне.

Пасадзіўшы некалькі дзясяткаў адмысловых лекавых раслін, ты значна дапоўніш ландшафтную палітру.

Фітаспецыялісты сцвярджаюць, што ўсе расліны можна выкарыстоўваць для лячэбных мэт, толькі трэба ведаць калі, у які час года і сутак сабраць якія часткі расліны: карэньчыкі, кветкі або лісце.

Уздзеянне на арганізм чалавека прыродных раслінных кампанентаў значна больш натуральнае, чым біяхімічныя лекавыя сродкі. Асабліва на стадыі прафілактыкі і ўзмацнення адпорнасці арганізма на хваробы.

Мае рэкамендацыі ў гэтай частцы арганізацыі ландшафту тваёй дзялкі наступныя:

1. Вырошчвай і выкарыстоўвай напачатку расліны больш мяккага ўздзеяння на арганізм чалавека, чым спецыфічна лекавыя. Прымяняй такія расліны спачатку для сваёй сям'і, а потым прапануй сваім сябрам і знаёмым.

2. Абавязкова трэба ўлічваць для лекавых раслін умовы іх вырошчвання. Для адных трэба больш сонца, іншым, наадварот, — суцэльны цень. Адны могуць расці на глебах кіслых, іншыя — выключна на шчолачных. Ад гэтых умоў будуць залежыць іх лекавыя ўласцівасці.

Памятай, што расліны, якія ты выкарыстоўваеш для спецый і прыпраў — таксама лекавыя. Садзі іх больш у сваім гародзе. Да таго ж яны прываблiваюць на дзялку шмат карысных насякомых.

Аднойчы я наведаў сядзібу, дзе гаспадар каля дваццаці гадоў прысвяціў вывучэнню і вырошчванню на сваім участку жэнь-шэню. Гэта было ў раёне Мядзельшчыны. Палову сваёй дзялкі гаспадар адводзіў на вырошчванне гаючага кораня. Знайшоў падыход да яго і прыстасаваў да нашага клімату.

Але вырасціць корань — гэта палова справы. Важна было навучыцца яго апрацоўваць і прымяняць у залежнасці ад патрэб і неабходнасці.

І гаспадар гэта зрабіў — ён дакладна ведаў, якога ўзросту корань жэнь-шэню, як настаяць і для чаго прымяняць.

У яго было вельмі шмат кліентаў, якія заказвалі корань, ужывалі яго і паляпшалі сваё здароўе. Але пачынаў ён прымяненне са сваёй сям'і, і толькі праз гады пачаў прапаноўваць іншым людзям.

# Экапрыязная сядзіба

**§ 7. Жывая глеба.** *Што такое «жывая глеба»; удасканаленне глебы, тэхналогіі вермікультывавання, кампаставання, сідэрацыі і інш. Прымяненне ЭМ-прэпаратаў, як самому рабіць ЭМ-прэпараты. Мікарыза – аснова пладовай глебы.*

За шмат гадоў жыцця на вёсцы я зразумеў, што адна з галоўных мэт гаспадара – гэта несупынна (перманентна) **рабіць са сваёй зямлі глебу.**

Глеба – гэта жывы комплексны арганізм, яна не пастаянная, увесь час мяняецца. І наша задача – забяспечыць ёй доўгае актыўнае жыццё, не даць памерці. Калі я гляджу на зямлю, якая знаходзіцца побач з нашай гаспадаркаю і належыць аграпрамысловаму комплексу, то кідаецца ў вочы, што яна там як каменная: калі доўга няма летам дажджоў, то зямля тая ператвараецца ў цвёрдыя груды, а пасля дажджу не прапускае доўга праз сябе ваду.

**«Жывая глеба» для мяне – гэта:**

- Глеба, якая насычана ЖЫВЫМІ **мікраарганізмамі**, а не толькі хімічнымі кампанентамі; там мусяць быць бактэрыі, чарвякі, нематоды і іншыя жывёлы;
- Гэта глеба натуральных **сімбіятычных** сувязяў; то бок каранёвая сістэма раслін павінна сфармаваць асацыяцыю (шматлікія сувязі) з мікрабіётай глебы;
- Глеба, якая насычана **мікарызай** – нябачнай часткаю, гіфамі (грыбніцаю) грыбоў, якія мы любім збіраць і спажываць;
- Гэта – **імунная** глеба, яна можа дапамагчы тваім раслінам справіцца з шкоднымі выклікамі – хваробамі і нападамі насякомых;
- Гэта **ўрадлівая** глеба, якая можа даваць шматгадовыя ўраджаі за кошт уласных рэсурсаў;
- Гэта глеба, якая можа супрацьстаяць засухам і падтапленням, мае адпаведную для гэтага **структуру**.

Таму трэба засвоіць усе сродкі, пры дапамозе якіх можна ўплываць на стан глебы, сачыць, каб яна заставалася «жывою».




На здымку відаць, як лістота, якая ахутвала зямлю ў маім лесасадзе ўсю зіму, вельмі хутка стане прадуктам для спажывання бактэрыямі, грыбамі і іншымі жывымі істотамі для свайго размнажэння і росту. Працэс запуску «харчовага ланцужка» паскораць жывёлы (у маім выпадку – куры). І зямля на вачах пачне ажываць.

І калі ў цябе не застанецца ў садзе-гародзе раслінных ападаў пасля зімы, то чым будуць харчавацца мікраарганізмы? Як змогуць запусціцца складаныя біяхімічныя працэсы пераўтварэння рэчываў, неабходныя раслінам для здаровага існавання?

### Як ствараць «жывую глебу»

1. Забяспечыць механізм (сістэму) падкантрольнага перагнівання. *Гэта як бы ферментаванне ў працэсе браджэння, перагнівання...*
2. Дапамагаць station ўчымі біяфактарамі ўплываць на пераўтварэнне арганікі (якая так ці інакш увесь час пераўтвараецца) шляхам развядзення :
   - чарвей,
   - грыбоў,
   - кампаставання,
   - мульчавання.

### Вермівытворчасць:



Што важна для паспяховай вермівытворчасці:

- Набыць для пачатку прадуктыўных «каліфарнійцаў» - гэта від дажджавых чарвей Dendrobaena толькі больш прадуктыўных (могуць быць наступныя яго гатункі: «Белорусский пахарь», «Владимирский старатель» і інш.).
- Паступова перавесці на свой корм, які маецца менавіта ў цябе.
- Забяспечыць належную тэмпературу, вільгаць, паветра, самаачыстку.
- Забяспечыць умовы для іх бяспечнага памнажэння, бо яны прываблiваюць кратоў, пацукоў і інш.




### Важна ўлічваць пры грыбаводстве:

- Стварыць адпаведныя ўмовы: наяўнасць **вільготнага ценю.**
- Можна набываць грыбніцы ў надзейных вытворцаў альбо самому памнажаць грыбы спорамі.
- Закласці свой **біяразнастайны лясок**, дзе грыбам будзе магчыма ўваходзіць у адпаведныя сімбіятычныя сувязі з рознымі раслінамі.
- Пакідаць на дзялцы некаторыя рэшткі дрэваў, прынесеных з лесу, а лепш — нарыхтаваць сечку з галля і сцяблін.

**КАМПАСТАВАННЕ**:

- Гэта адна з найважнейшых частак гаспадарання, якая адказная за перапрацоўку арганічных адкідаў.
- Ад наяўнасці разумна запачаткаваных кампоснікаў залежыць, што атрымаецца ў выніку перапрацоўкі.
- Каб кампоснік працаваў правільна, патрэбна ўлічыць наступнае:
  1. аэробнасць (даступнасць паветра);
  2. вільготнасць – каб вада не застойвалася і не сыходзіла;
  3. разнастайнасць субстрату.

**Тыпы і віды кампоснікаў:**

- стацыянарныя двухадсекавыя;
- часова-сезонныя адкрытыя, са зменай месцазнаходжання;
- мясцовыя міні-ёмістасці, злучаны з функцыяй чарвятніка;
- «Грады Розуму» – пастаянныяградавыя арганік-зборнікі;
- Закрытыя шматградовыя, для спецыяльных жывёльных адкідаў.







**Некаторыя нашыя прыёмы пры кампаставанні:**

- Пажадана, каб была часам высокая тэмпература і шкодныя расліны разам з насеннем «перагарэлі» (скошаная трава).
- Перасыпаць кампост попелам (рабіць зашчалочванне).
- Прадумаць, што можа быць «і н к у л я н т а м».
- Перасцілаць слаі кардонам (натуральнымі анучамі).
- Дадаваць натуральныя ўгнаенні (курыны, трусіны).
- Ствараць арганічную арганіку з кухонных адкідаў.

**Карысць драўлянай шчапы (трусу) у кампосце:**

- Дае шмат гуміну – менш расце пустазелле і меней прарастае яго насенне.
- Трус – выдатны субстрат для памнажэння міцэлій грыбоў.
- Насычае кампост і зямлю паветрам – паветрапрадзімальнасць.
- Станоўча ўплывае на тэмпературны і вільготны рэжымы кампаставання.






**Самастойнае прыгатаванне ЭМ-прэпаратаў:**

- Сутнасць прыгатавання сродкаў на падставе эфектыўных мікраарганізмаў — гэта размнажэнне карыснай мікрабіёты, пра-, прэ- і сімбіётыкаў для сваёй глебы.
- Калі стварыць адпаведныя ўмовы (тэмпературныя, вільгацевыя, паветраныя і харчовыя), то такую біёту можна зрабіць вельмі насычанай і выкарыстоўваць па прызначэнні.
- У якасці субстрату трэба браць тую біёту, якая маецца на дзялцы, паступова мяняючы яе склад у патрэбным кірунку.

**СІДЭРАЦЫЯ** — гэта высяванне на грады зерня злакавых і іншых раслін перад асноўнаю пасадкаю гародніны. Добра ўплывае на структуру глебы, «пралечвае» яе, гэтая расліннасць становіцца пасля выдатнай мульчой.

- Я пераважна выкарыстоўваю зерневыя сумесі: крыжакветкавыя (гарчыца, рэдзька), фацэлія, авёс.
- Падсяваць сідэрат можна заўжды, увесь вегетацыйны сезон.
- Пасля таго, як сідэрат трохі падрастуць, іх лепш скасіць ручной касой альбо касілкай без бункера, каб скошаная маса засталася.
- Пасля пасеву пракочваю катком па насенні і паліваю дожджыкам.
- Добра працуе сідэрат у прыствольных кругах дрэў.




**МУЛЬЧАВАННЕ**. Галоўнае прызначэнне гэтага спосабу «ажывіць» твае грады — прыкрыццё зямлі арганічным ці тканым матэрыялам. Тады зямля не будзе награвацца, менш вільгаці будзе выпарвацца і тым самым будуць створаныя больш спрыяльныя ўмовы для жыццядзейнасці мікра-, макраарганізмаў. Мы выкарыстоўваем галоўным чынам салому і скошаную траву.




Жыццё глебы — гэта складаная сістэма, сімбіёз розных мікраарганізмаў, бактэрый і мікарызы (грыбоў). Калі мы перакопваем зямлю на сваёй дзялцы, мы моцна парушаем натуральныя працэсы, якія адбываюцца ў глебе.

## § 8. Жывёлагадоўля і яе сумяшчэнне з вырошчваннем раслін.

*Птушкагадоўля, трусагадоўля, асновы пчалярства, свінагадоўлі, гадоўлі коз, авечак, кароў... Кармавая база, калі хочам атрымаць экапрадукцыю. Утрыманне, памяшканні для гэтага. Хваробы. Размнажэнне. Рэалізацыя прадукцыі, рэнтабельнасьць. Жывёлы для аказання тэрапеўтычных паслуг насельніцтву, дэкаратыўная жывёлагадоўля, арганізацыя гадавальнікаў для жывёлы на вёсцы.*

Свойская жывёла — гэта неабходная частка арганічнай, прыродападобнай гаспадаркі. Яе наяўнасць не парушыць экабаланс вашай дзялкі пры адпаведнай колькасці.

Тэрыторыя ўчастка, якая маецца ў цябе ва ўладанні, будзе вызначаць, якіх жывёл варта развесці: абмежавацца, напрыклад, толькі курамі і трусамі, альбо развесці коз, кароў ці авечак.

Традыцыйны вясковы лад жыцця быў заўжды звязаны з утрыманнем свойскай жывёлы. І гэта было звязана не толькі з неабходнасцю атрымання базавых прадуктаў харчавання.

Жывёлы займалі вельмі важнае места ў кругабегу жывой біёты. Частка гародніны і раслін з гаспадаркі ішла на корм скаціне. Вырашчаная на прысядзібнай дзялцы бульба, буракі, садавіна і трава ішлі на корм жывёлам. Яны перапрацоўвалі гэты корм і выраблялі ўгнаенні, якія вярталіся зноў у глебу, толькі значна ў больш канцэнтраваным выглядзе. Глеба ажывала, і многія рэчывы ад угнаення ішлі ізноў на сілкаванне раслін. Такі быў кругабег карысных рэчываў у прыродзе. Прадукты раслінаводства давалі вельмі спажыўныя плады для харчавання чалавека, і жывёлы былі важным звяном у гэтым кругабегу.

Калі перасталі трымаць жывёл на вёсцы, зямля не атрымала важных рэчываў, прадукты абяднелі на мікраэлементы і чалавечы арганізм пазбавіўся тых важных элементаў, якія фармуюць устойлівую мікрабіёту. Таму развядзенне жывёл — гэта важны фактар для ўстойлівай пермакультурнай гаспадаркі.

Прыхільнікі біядымічнага вядзення гаспадаркі і вырошчвання прадуктаў харчавання па стандартах, напрыклад, «Demeter Biodynamic» (якія падтрымліваюцца больш як у 65 краінах свету), сцвярджаюць, што падкормка раслін кампостам — гэта тое ж самае, што чалавеку харчавацца выключна кансервамі. На іх думку, толькі свежае неферментаванае ўгнаенне ад жывёл мае неабходную колькасць актыўных элементаў, здольных запусціць у глебе харчовую піраміду.

На іх думку, менавіта тая дынаміка, якая зыходзіць ад жывых мікраарганізмаў неапрацаванага ўгнаення, ёсць асноваю і біяразнастанайнасці, і ўстойлівасці земляробства.

Мой вопыт утрымання сельскагаспадарчых жывёл пацвярджае гэтую думку. Сапраўды, зямля, па якой быў арганізаваны часовы выгул

курэй, гусей, іншай птушкі альбо авечак ці коз, зарастала хутка разнастайнай расліннасцю, станавілася больш урадлівай.

Але перад тым як заводзіць жывёл, трэба падрыхтавацца: вывучыць усе асаблівасці жыцця гадаванцаў, якіх вы збіраецеся разводзіць, падабраць пароду, забяспечыць кармавую базу, умовы ўтрымання, прафілактыку хвароб і іншае.

Калі ўсё абагульніць і каротка сфармуляваць адказы на пытанне:

**«Навошта разводзіць жывёл?»** — то атрымаем такія варыянты адказу:

- для біялагічнай раўнавагі на прысядзібнай гаспадарцы;
- для вытворчасці ўласнага біяўгнаення;
- для ўласнага (сямейнага) карыснага харчавання;
- для рэалізацыі жывёлагадоўчай прадукцыі і атрымання дадатковага прыбытку для сваёй сям'і;
- нямала ёсць такіх людзей, якія гадуюць жывёл «для душы», бо гэта мае пэўны тэрапеўтычны эфект для іх здароўя.

Абагульняючы свой шматгадовы досвед па развядзенні і ўтрыманні на ўласным падворку свойскай жывёлы, я прыйшоў да наступных высноў, якія варта ўлічыць для арганізацыі **пасяховай жывёлагадоўлі.**

- Перадусім спатрэбяцца першапачатковыя **ўкладанні** ў пабудову памяшканняў, набыцця мацярынскага статка, неабходнага рыштунку.
- Таксама важна атрымаць пачатковыя **веды** па гадаванні і лячэнні жывёл.
- Пажадана завязаць непасрэдныя **кантакты** з гадавальнікамі выбраных жывёл, у якіх можна будзе на першы час кансультавацца па розных праблемах гадоўлі.
- Трэба ўлічыць сваю **кармавую базу:** магчымасці самому вырошчваць ці набываць у іншым месцы кармы для сваёй жывёлы.
- Прадумай, як ты абароніш сваю жывёлу ад шматлікіх дзікіх жывёл. Лісы, драпежныя птушкі, тхары і іншыя дзікія жывёлы будуць імкнуцца здзяйсняць пастаянныя напады і прынясуць нямала шкоды, калі ты не прадумаеш, як ад іх абараніцца.
- Усе пералічаныя пункты важна было б абагульніць у адзіным **стратэгічным плане**, дзе будуць пазначаныя колькасць планаванага статка жывёл, выдаткі на яго ўтрыманне, чаканыя прыбыткі і іншае.

Ну і перадусім цябе павінна матываваць любоў і прывязанасць да сваіх гадаванцаў, бо давядзецца пераадольваць розныя выклікі і выпрабаванні падчас гэтай дзейнасці.

**Што ўплывае на ўстойлівасць хатняй жывёлагадоўлі:**

- Колькасць жывёл на зямельную плошчу (**экапаказчык**).
- Што выбрана за **эканамічны** прыбытак:
  - Сыравіна (напрыклад, мяса, яйкі, воўна і г. д.)
  - Вынік селекцыйнай працы (пародзістая птушка, трусы і г. д)
  - Перапрацаваны пра-

дукт (сыры, кілбасы, закаткі і г. д.)
- Удзел у тэматычных **супольнасцях** (кааперацыя).

**Некаторыя аспекты хатняй жывёлагадоўлі** (з асабістага вопыту):

- Найперш трэба вырашыць, што браць за аснову свайго статка – **пародзістых** альбо «хатніх» жывёл. Кожная парода мае ў нечым свае перавагі: альбо куры, напрыклад, адной пароды нясуць больш яек, чым астатнія, альбо яны больш мясныя і іншае. Але гадаваць пародзістых жывёл трэба асобна, таму памяшканняў трэба мець больш. Да таго ж, пародзістыя жывёлы больш уразлівыя да хвароб.
- Як толькі ты завядзеш першых гадаванцаў, у цябе ўзнікне **прывязанасць да дома** – жывёлы заўжды патрабуюць догляду: іх трэба рэгулярна карміць, даваць чыстую ваду, чысціць жыллё.
- Трэба адразу вызначыцца з **канчатковай мэтай** утрымання жывёл – гэта будзе занятак для ўласных патрэб сям'і альбо для рэалізацыі сярод спажыўцоў, для эканамічнай выгады.
- **Трэба звярнуць асаблівую ўвагу на абарону гадаванцаў** ад знешніх пагроз. У вёсках існуе шмат драпежнікаў, якія імкнуцца выкарыстаць вашую жыўнасць для харчавання. Гэта і лісы, і птушкі, і дзікія сабакі.
- Важна таксама ўлічваць **юрыдычныя аспекты** і рэгуляванне адносін з суседзямі.

Як ужо вышэй пазначалася, вельмі важна мець кантакты з тымі гаспадаркамі і спецыялістамі, якія шмат гадоў займаюцца жывёлагадоўляй. Бо асабліва ў пачатку пры набыцці першых сваіх гадаванцаў паўстае шмат пытанняў па іх утрыманні. Пракансультавацца пра перавагі той ці іншай пароды, якую прафілактыку прымяніць ад хвароб, як пралечваць, калі захварэюць, і шмат іншых пытанняў будзе хутчэй вырашацца, калі можна будзе звярнуцца да таго, хто шмат гадоў займаецца гадоўляй і мае вялікі досвед у гэтай справе.

Звычайна гаспадары аб'ядноўваюцца ў тэматычныя саюзы і ўзбагачаюць там адзін аднаго новымі ведамі і досведам. У Беларусі маецца некалькі інфармацыйных рэсурсаў, дзе можна пазнаёміцца, задаць пытанне і пракансультавацца па той ці іншай праблеме ў сферы жывёлагадоўлі. Вось некаторыя суполкі гадавальнікаў жывёлы, якія існуюць у Беларусі:

- БГАТ – беларускае грамадскае аб'яднанне трусаводаў з 2009 г; (чат іх аб'ядноўвае – каля 100 чалавек), на жаль аб'яднанне самаліквідавалася ў 2024 годзе, але чат працуе.
- Існуе некалькі аб'яднанняў пчаляроў, самае буйное з іх было – «Бортнік» – ліквідавана ў 2023 годзе.
- Шмат гадоў існуе супольнасць fermernew.by, дзе гаспадары дзяліліся сваім вопытам па развядзенні рознай свойскай жывёлы.

- Чаты: “Куронутые РБ” (каля 1300 удзельнікаў), “Приусадебное хозяйство” (каля 1600 удзельнікаў), “Ярмарка (с/х-я)” (каля 1500 удзельнікаў), “VёskaLife” (каля 1200 удзельнікаў).

Прывяду некалькі прыкладаў па ўтрыманні тых жывёл, якіх мы разводзім пастаянна: трусоў і курэй. Бо гэта абумоўлена тэрыторыяй нашай дзялкі, якая складае 0,5 га. Па ўтрыманні іншых жывёл (кароў, авечак, коз, коней) трэба шукаць парад у тых, хто займаецца гэтым шмат гадоў і мае свой унікальны практычны вопыт.




Можна выкарыстоўваць
- пастаянныя вулічныя клеткі,
- пераносныя загоны;
- спецыяльныя пабудовы — шэды.




**Плюсы і мінусы трусагадоўлі:**

Плюсы:
- Трусінае ўгнаенне не патрабуе ферментацыі, яго можна адразу прымяняць на градах па вырошчванні гародніны;
- Трусяціна – вельмі дыетычнае, карыснае мяса, асабліва для дзяцей і хворых людзей;
- Пры добра наладжаным вядзенні справы, трусагадоўля можа быць дастаткова рэнтабельнай;
- Адносна вялікі і часты прыплод.

Мінусы:
- Трусы вельмі ўразлівыя да хвароб (міксаматоз), таму трэба рабіць прышчэпкі, каб захаваць пагалоўе.
- Патрабуюцца ўкладанні ў пабудову надзейных клетак.
- Неабходна выдзяляць час на частую чыстку клетак.




**Карысць ад курагадоўлі:**
- заўжды запатрабавана прадукцыя (яйкі і мяса);
- добрае ўгнаенне, але трэба ферментаваць;
- вычышчаюць сад, гарод ад шкоднікаў;
- добрыя «газонакасілкі» на дзялцы.

# Перапрацоўка прадукцыі, уласныя кулінарныя вырабы. Рэалізацыя арганічнай прадукцыі

## § 9. Арганічная ежа.

*Аснова здароўя чалавека; чым адрозніваецца экаежа ад канвенцыйнай, нутрыцыялагічны аспект. Навошта нам вырошчваць сваю ежу, у чым яе карысць. Уласныя кулінарныя вырабы з вырашчанай садавіны, гародніны — тэхналогія прыгатавання. Віды хатніх перапрацовак гародніны, магчымасці рэалізацыі.*

Ужо амаль немагчыма сустрэць асобу, якая не згодзіцца з тым, што здароўе чалавека шчыльна звязана з харчаваннем. Але яшчэ ў сярэдзіне мінулага XX стагоддзя людзі ніяк не звязвалі гэтыя дзве рэчы — здароўе і якасць ежы. Думалі, што гэтыя паняцці знаходзяцца ў абсалютна розных плашчынях жыцця. Бо асноваю харчавання ў нас былі тады прадукты, што выраблялiся ў вясковым асяроддзі, якое пераважала на той час у краіне. І калі вяскоўцы амаль на 80% адсоткаў харчаваліся пераважна свойскімі прадуктамі, то гарадскія жыхары, мяркую, на 50% мелі магчымасць харчавацца ад прыдамовых вясковых сямейных гаспадарак і тых прадуктаў, якія атрымлівалі ад бацькоў з вёскі.

Але нават жывучы ў гарадах, людзі разводзілі для сябе (дзе было магчыма) свойскую жывёлу. У маім дзяцінстве ў 1960-я гады ў Мінску на вуліцы Жукоўскага амаль кожная сям'я трымала ў хлеўчуках альбо свінку, альбо курэй, альбо трусоў, альбо ўсё разам.

У XXI стагоддзі прапорцыі харчавання кардынальна памяніліся: максімум 20% складае ежа ўласнага вырошчвання і 80% — гэта прадукты, якія зроблены ў сельскіх гаспадарках канвенцыйнага характару вытворчасці — АПК (аграпрамысловых коплексах).

Услед за зменай такіх прапорцый у харчаванні навукоўцы пры вывучэнні прычын захворванняў высветлілі, што многія збоі ў арганізме чалавека былі звязаны з парушэннем абмену біяхімічных рэчываў. А ўраўнаважаны біяхімічны склад наўпрост залежыць ад харчавання.

З развіццём тэхналогій (асабліва ў біяхімічнай сферы) для транснацыянальных камерцыйных структур стаў відавочным выразны эканамічны эфект ад замены прыродных рэчываў, якія ўжываюцца пры харчаванні, на сінтэтычна-хімічныя. Замест таго, каб выкарыстоўваць шмат рэсурсаў на вырошчванне пэўнай гародніны альбо зёлак, дастаткова было скапіяваць хімічную формулу гатовага прадукту і шляхам сінтэзу малекул і ата-

маў стварыць штучнае рэчыва, якое на смак цалкам замяшчала прыродны прадукт. Так з'явіліся шматлікія Е-дадаткі, якія ўзмацнялі смак ежы, рабілі яе нават больш прывабнай для рэцэптараў чалавека, чым натуральныя прадукты.

Арганізм чалавека быў уведзены ў зман: тое, што раней спажывалася органамі стрававання для функцыянавання і развіцця на клеткавым узроўні арганізма чалавека, было падменена нібыта тым самым, але ў іншай «упакоўцы». Ад гэтай замены структура арганізма стала больш рыхлаю, неабароненай ад уздзеяння разбуральных патагенных фактараў.

Тое ж самае адбываецца і на ўзроўні мікрабіёму чалавека. Апошнія навуковыя вынікі даследаванняў мікрабіёму[17] паказалі, што мільярды бактэрый страўнікава-кішачнага тракту вызначаюць у значнай меры стан здароўя ўсяго арганізма.

Мікрабіём, які мы атрымліваем пры нараджэнні ад сваёй матулі, унікальны і жыве ў нас сваім уласным жыццём. Для сваёй актыўнасці, устойлівасці і ўраўнаважанасці ён патрабуе праз усё жыццё пэўных жывых арганізмаў — бактэрый, прасцейшых і ферментаў. Калі іх не пастулае ў арганізм разам з ежай — адбываецца паступова змена структуры мікрабіёму, што ў сваю чаргу вядзе да збояў у здароўі ўсяго арганізма: ад мозга да сэрца чалавека.

Не паглыбляючыся далей у тонкія рэчы ўладкавання біяхімічнай мікраструктуры чалавечага арганізма, пазначым толькі выразную сувязь прадуктаў харчавання і стану здароўя чалавека. Тым больш што чалавецтва знаходзіцца цяпер толькі на самым пачатку вывучэння такіх залежнасцяў, і кожны год навуковая супольнасць інфармуе пра рэвалюцыйныя адкрыцці ў гэтай галіне пазнання.

Зафіксуем толькі, што сувязь ежы і стану здароўя цяпер ніхто ў навуковым свеце і паўсядзённым жыцці не аспрэчвае. Іншая рэч, што ўплыў спосабу харчавання на здароўе не такі лінейны і праяўляецца не адразу, а паступова, вельмі павольна.

Калі, напрыклад, параўнаць арганізм чалавека з аўтамабілем, якому трэба заліваць бензін з актанавым лікам А-95, а гаспадар з нейкіх прычын карыстаецца А-92, то збой у працы аўто можна будзе адчуць толькі праз нейкі час. Спачатку пачне барахліць паліўная сістэма, потым іншыя вузлы, і машыну давядзецца сур'ёзна рамантаваць…

Так з арганізмам чалавека — нястачу многіх рэчываў альбо іх штучны сінтэтычны характар у маладым узросце арганізм можа замяніць уласнай вытворчасцю, але для гэтага будзе затрачана шмат унутра-

[17] Праект «Мікрабіём чалавека» (The Human Microbiome Project ) — гэта даследчыцкая ініцыятыва Нацыянальных інстытутаў аховы здароўя ЗША, якая мае на мэце лепш зразумець мікрафлору чалавека і яе значэнне для чалавечага здароўя і звязаных з ім праблем. Першая фаза запушчанага ў 2007 годзе праекта была сфакусавана на вызначэнні і характарыстыках мікрафлоры чалавека. Другая фаза, вядомая як інтэгратыўны праект «Мікрабіём чалавека», пачалася ў 2014 годзе з мэтай развіцця рэсурснай базы для характарыстыкі мікрабіёму і высвятлення ролі мікробаў у станах здароўя і хваробы чалавека.

ных рэсурсаў і некаторыя «вузлы» выйдуць раней са строю. Давядзецца іх альбо лячыць, альбо мяняць на новыя...

Пасля фіксацыі гэтай жыццяіснай сувязі прадуктаў харчавання і здароўя чалавека робіцца зразумелым і відавочным адказ на пытанне, навошта набываць сабе зямельную дзялку, распрацоўваць план яе рэвіталізацыі — аднаўляць глебу пры дапамозе арганічных тэхналогій і пачынаць вырошчваць хоць невялікую колькасць прадуктаў харчавання для асабістага ўжытку.

Гэтым самым ты зробіш укладанне не толькі ў паляпшэнне асабістага здароўя, але, перадусім, закладзеш аснову для здароўя сваіх нашчадкаў, дзяцей і ўнукаў. Доступ да здаровай, экалагічна чыстай ежы цяпер могуць мець пераважна заможныя сем'і. А мы сцвярджаем, што любы чалавек, перасяліўшыся жыць на сваю зямлю, можа так арганізаваць там сваё жыццё, што яму асабіста, яго сям'і, а, магчыма, сябрам ды знаёмым можна будзе забяспечыць заўсёдны доступ да арганічнай гародніны, садавіны, уласных мясных ці рыбных прадуктаў харчавання.

Таму мы і задумалі напісаць гэты дапаможнік, каб падштурхнуць цябе, шаноўны чытач, да вырашэння асабістай харчовай бяспекі — асновы здароўя тваёй сям'і без уліку таго, колькі грашовых сродкаў ты маеш. Засвоіўшы некаторыя экатэхналогіі, аб'яднаўшыся з такімі самымі энтузіястамі здаровага харчавання, разам вы створыце падмурак свайго ўстойлівага жыцця на шмат гадоў наперад.

Такім чынам, калі для нас стала нормаю лічыць, што арганічная ежа — аснова здароўя чалавека, то можна падсумаваць і зафіксаваць гэтую выснову наступнай формулаю:

- Давайце лічыць, што здароўе — гэта перадусім раўнавага, гармонія фізічнага і духоўна-псіхалагічнага (ментальнага) стану чалавека, і гэта ў значнай меры рэгулюецца на клеткавым узроўні харчаваннем.
- А харчаванне — гэта не толькі адна з форм узаемадзеяння чалавека з навакольным светам, але галоўны «пастаўшчык» элементаў для функцыянавання арганізма і кожнага з органаў чалавека.
- І варта тут пазначыць, што традыцыйная ежа на працягу тысячагоддзяў была «пастаўшчыком» натуральных рэчываў для арганізма чалавека. Пакуль апошнюю сотню гадоў не пачалі яе падменьваць у камерцыйных мэтах, што пачало кепска ўплываць на здароўе чалавека.

## Нутрыцыялагічны аспект ежы

- Як ужо пазначалася вышэй, навукоўцы цяпер даводзяць, што для паўнавартаснага харчавання важна ўлічваць не столькі склад БТВ (бялкі-тлушчы-вугляводы), а нутрыентную каштоўнасць (ферменты, мікра- і макраэлементы, вітаміны) ежы. Якраз тое, што ўтрым-

лівала ў сабе традыцыйная ежа, прыгатаваная адпаведным чынам.

- Людзі, як і жывёлы, адчувалі ў мінулым свой арганізм і ўжывалі тое, чаго бракавала, нетавала з неабходных нутрыентаў. Тое ж робяць усе жывёлы — каты і сабакі, напрыклад, шукаюць неабходную траву, каб праз яе папоўніць свой арганізм неабходнымі вітамінамі і мікраэлементамі.
- Сучасная ж культура харчавання больш скіравана праз настойлівую рэкламу на знешняе навязванне тых ці іншых прадуктаў харчавання і гатовых страў. А прыродная база карысных элементаў такіх страў часта вельмі малая.

### Ад чаго ж залежыць каштоўнасць ежы?

- Па-першае, **ад спосабаў яе вырошчвання:** таго, наколькі глеба была жывой, наколькі жывёлы харчаваліся арганічнай прадукцыяй. Менавіта склад мікрабіёты глебы становіцца асноваю і грунтам будучай здаровай ежы, якая ў сваю чаргу ўплывае непасрэдным чынам на мікрабіёту чалавечага арганізма, аздараўляе арганізм і падтрымлівае ў ім неабходны баланс рэчываў.
- Па-другое, вельмі важным з'яўляецца тое, якім **спосабам была прыгатавана ежа альбо падрыхтавана для доўгага захавання.** Бо кожны спосаб можа альбо ўзбагаціць ежу карыснымі рэчывамі, альбо знізіць яе нутрыентную каштоўнасць.
- (Напрыклад, хлеб на закваcцы можа захоўвацца больш за дзесяць дзён, не страчваючы сваіх якасцяў, і зусім не псуецца, а хлеб, зроблены на сінтэтычных дражджах, псуецца ўжо праз некалькі дзён пасля яго захоўвання).

Абагульняючы ўсё сказанае вышэй, можна пазначыць (зыходзячы з уласнага вопыту), што **карысць ад вырошчвання і прыгатавання свойскай ежы наступная:**

- Мы маем доступ да багатанутрыентнага харчавання і тым самым умацоўваем здароўе сваё і сваіх блізкіх.
- Захоўваем і развіваем традыцыйную народную культуру харчавання — аснову нацыянальнай тоеснасці.
- Можам падмацоўваць свой сямейны бюджэт, бо прыгатаваныя стравы каштуюць у разы даражэй, чым харчовая сыравіна.
- Становімся менш залежнымі ад маркетынгу і абароненымі ад біялагічных маніпуляцый гандлёвых фірм, якія рэалізуюць харчовую прадукцыю.

### Віды хатніх перапрацовак

- **Ферментацыя**/засолка/квашанне (капуста, яблыкі, агуркі, памідоры і інш.) Гэта адзін з самых старажытных спосабаў прыгатавання ежы, прыдатны да працяглага захавання. Прыгатаваныя такім чынам прадукты маюць яшчэ большую вартасць, чым у

свежым выглядзе, бо дапамагаюць арганізму чалавека папоўніцца вельмі важнымі мікраэлементамі.

- **Аўтаклавіраванне** (кансервы з гародніны, садавіны, мяса, рыбы; соусы, дадаткі). Адносна новы спосаб кансервацыі. Патрабуе спецыяльных прылад, якія дазваляюць дзякуючы вакуумаванню дасягаць тэмпературы апрацовак прадуктаў да 120 градусаў.

Пры аўтаклавіраванні цалкам знішчаюцца патагенныя бактэрыі.

Прыдатны сродак да доўгага захавання мясных і гароднінных нарыхтовак для доўгатэрміновага захавання ў хатніх умовах.

- **Сушка** (зёлкі, гародніна, прысмакі). Таксама вельмі старажытны спосаб нарыхтоўкі зёлак, садавіны, мясных вырабаў. Захоўваецца пры сушцы шмат карысных рэчываў. Можна сушыць на сонцы — экалагічны і вельмі эканамічны спосаб нарыхтоўкі. У спецыяльных апаратах — дэгідратарах можна выстаўляць на шмат гадзін пэўную тэмпературу і сушыць тую садавіну і гародніну, якаю цяжка высушыць належным чынам на сонцы.

Пра кожны з гэтых спосабаў нарыхтоўкі прадуктаў можна даведацца са шматлікіх інфармацыйных крыніц. Кожны мае свае перавагі і недахопы, і таму лепш выкарыстоўваць іх для сябе ў залежнасці ад тых прадуктаў, якія маюцца ў цябе.

Таксама залежыць, у якую пару года ты нарыхтоўваеш гэтыя прадукты.

Сыравяленыя каўбасы, напрыклад, лепш рабіць напрыканцы зімы, калі можна іх на паветры абветрыць, прагрэць на зімовым сонейку.

Варта для сябе засвоіць прыгатаванне напояў (квасы, сідры, камбуча, сокі, воцаты, «заправы пад жур») па старажытных рэцэптурах. Гэта будуць значна больш карысныя напоі, чым шматлікія сучасныя газаваныя, зробленыя на хімічных субстратах.

Калі нехта засвоіць для сабе выраб «малочкі» — сыроў, тварагоў — альбо зоймецца выпечкай хлеба і кандытарскіх экавырабаў, то гэта стане ўнікальным унёскам у здароўе сям'і і будзе запатрабаваным на рынку харчовых крафтавых вырабаў.

У апошнія гады ўсё больш запатрабаваным робіцца заказваць у вяскоўцаў вырабы кулінарыі — прыгатаваныя ў печы старажытныя народныя стравы. Тым больш, што закон дазваляе такую форму самазанятасці.

Асобна хочацца сказаць пра хатні выраб алеяў. Гэта карысныя прадукты са шматлікімі прыроднымі ўласцівасцямі. Але праз тое, што сыравіна для іх прыгатавання прывозіцца галоўным чынам з іншых краін, то няма ўпэўненасці ў яе экалагічным паходжанні.

**Рэнтабельнасць, магчымасць рэалізацыі**

- Згодна з пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Бе-

ларусь № 457 ад 28.06.2024 (Дадатак 2, п. н. 66, код 5629) дазваляецца афіцыйна рэалізоўваць кулінарную прадукцыю і вырабы хлебапячэння, калі ў вас АПГ альбо вы самазанятыя (пры ўмове аплаты падатку на прафесійную дзейнасць).

- Пасля шматгадовага доследу рэалізацыі вясковых прадуктаў харчавання нам стала зразумела, што цяжка самазанятаму адначасова вырабляць сыравіну і гатаваць кулінарныя вырабы для рэалізацыі. Спецыфіка догляду жывёлы, вырошчванне садавіны-гародніны патрабуе сваёй адмысловай інфраструктуры, памяшканняў, санітарыі і гігіены. І звычайна сыравіны патрабуецца ўсё роўна больш, чым можна яе вырасціць на адным падворку: яе трэба будзе набываць у іншых гаспадароў. Таму арыентацыя на выпечку і гатаванне паступова зойме ўвесь твой працоўны час. Але тым не менш ідэальны варыянт — калі ты рэшткі нерэалізаванай уласнай с/г прадукцыі перапрацоўваеш самастойна і рэалізуеш значна даражэй, чым зыходная сыравіна.
- Вельмі спрыяе паспяховай дзейнасці ў галіне вырабу ўласнай кулінарнай прадукцыі **КААПЕРАЦЫЯ**. Часта для разнастайнасці кошыка крафтавай сельскай прадукцыі патрабуюцца вельмі разнастайныя прадукты. Спажыўцы часта хочуць мець і разнастайныя сыры — зробленыя як з каровінага малака, так і з казінага, а каўбасы таксама пажадана мець не толькі са свініны, але з дадаткам ялавічыны і індычыны. Трымаць на адной гаспадарцы такую разнастайную жыўнасць вельмі складана. Таму кааперацыя, аб'яднанне з іншымі гаспадаркамі, якія трымаюць іншых жывёл, чым ты, альбо вырошчваюць тую садавіну/гародніну, якой у цябе мала альбо зусім няма, — вельмі важна і прыносіць свой эканамічны плён.
- Дзеля паспяховай рэалізацыі ўласнай прадукцыі самазанятаму вяскоўцу важна супрацоўнічаць не толькі з іншымі сельскімі міні-гаспадаркамі, але і з прадстаўнікамі іншых галін гастранамічнага прадпрымальніцтва: нутрыцыёлагамі, рэстаратарамі, аграсядзібамі. Бо, напрыклад, каб спажывец больш ахвотна набываў тваю ўнікальную прадукцыю, якая даражэйшая за падобную, што прадаецца ў супермаркеце, ён павінен усведамляць, чаму гэта так. І лепш, чым прафесійны спецыяліст па харчаванні (нутрыцыёлагаг) ніхто яму гэтага не растлумачыць.
- Таксама важна мець веды і валодаць прынцыпамі прымянення **маркетынгу**, умець сфармаваць цэны на сваю прадукцыю, правесці рэкламную кампанію

на сваіх старонках сацыяльных сетак і інш. Але пра гэта ты даведаешся больш поўна на іншых старонках нашага дапаможніка.

Зыходзячы з асабістага вопыту, я прыйшоў да высновы, што для паспяховага развіцця гастранамічнага прадпрымальніцтва і рэалізацыі ўласнай прадукцыі важна ўлічваць наступнае:

- З аднаго боку, у кожнага чалавека маецца ўнутраны рэгулятар патрэб у тых, ці іншых рэчывах, якія ўтрымліваюць тыя ці іншыя прадукты харчавання. То бок арганізм сам пасылае сігнал пра свае патрэбы, мы прыслухоўваемся і задавальняем гэтыя ўнутраныя жаданні, і арганізм нам «дзякуе» прыемным адчуваннем. Асабліва выразна гэты механізм дзейнічае ў цяжарных жанчын, арганізм якіх працуе на фармаванне плода.
- З другога боку, культура, грамадства, соцыум звонку навязвае нам пэўную культуру харчавання, і мы падпарадкоўваемся традыцыі, пачынаем любіць тое, што адпавядае (альбо не адпавядае!) нашаму «культурнаму коду». Бывае і вельмі шкодны ўплыў праз навязлівую рэкламу, якая прывучае людзей (асабліва падлеткаў) да модных, сацыяльна статусных страў і прадуктаў.

І тут важна зразумець, што харчовыя звычкі можна памяняць, а вось змены, якія ўплываюць на прыродныя патрэбы арганізма могуць прывесці да сур'ёзных збояў здароўя. Самы распаўсюджаны прыклад гэтага — абмежаванне ў спажыванні вітаміна С, што прыводзіць да цынгі. Практычна ў кожным захворванні можна прасачыць тое, што некаторыя неабходна-важныя кампаненты і рэчывы перасталі паступаць у патрэбнай колькасці ў арганізм чалавека.

Такім чынам, кожнаму спажыўцу трэба давесці, што на наш выбар ежы заўжды ўплываюць прынамсі два важныя фактары: культуралагічны і арганічны! Добра, калі яны дапаўняюць адзін другі. То бок спажывец разумее, што самая карысная для яго здароўя і самаадчування тая ежа, якую спажывалі яго продкі, якая расце побач з ім (мясцовая, лакальная), якую гатавалі і захоўвалі пэўным чынам на яго гістарычнай радзіме. Для такога разумення трэба займацца асветай, ладзіць гастра-, этнатуры, вывучаць і маштабаваць нацыянальную гастранамічную культуру.




Нарэшце, практыка вырошчвання раслін, жывёл і рэалізацыя прадукцыі ад гэтай дзейнасці прывяла мяне да высновы, што менавіта ежа ёсць тым фактарам, які можа аб'ядноў-

ваць вяскоўцаў, якія займаюцца міні-прадпрымальніцтвам на сваіх дзялках.

Па-першае, маюцца гаспадары, якія могуць і любяць проста вырошчваць гародніну ці жывёл. Галоўным чынам для сябе, а рэшту на рэалізацыю. Калі б у іх была магчымасць рэалізаваць па адпаведным кошце сваю прадукцыю, яны б павялічылі ў разы яе вытворчасць.

Калі некаторыя самазанятыя/АПГ возьмуцца перапрацоўваць гэтую прадукцыю ў большых маштабах, то выйграюць як тыя, хто яе вырошчвае, так і спажыўцы, бо яны змогуць мець для сябе лакальны карысны прадукт з доўгім часам захоўвання.

Напрыклад, нехта засеяў сваю зямлю лекавымі, духмянымі зёлкамі, сыравіну прадаў адразу гаспадарам, якія зробяць з сыравіны лекавыя чаі, алеі, прыправы, дадаткі да страў ці іншыя прадукты. А спажывец атрымае лакальныя зёлкавыя зборы, якія зможа ўжываць для падтрымкі свайго здароўя.

Калі да такога двухбаковага супрацоўніцтва далучацца спецыялісты па маркетынгу, то выніковы прадукт будзе рэалізоўвацца яшчэ больш паспяхова.

Безумоўна, усе гэтыя этапы прадукту (вырошчванне-апрацоўка-рэалізацыя) можа адбывацца ў межах адной сям'і, але росту і ўстойлівасці тут будзе значна менш, чым пры кааперацыі.

Пра гэта я думаў, калі наведваў фірму «Дары натуры» на Падляшшы. Раю пачытаць пра гэту фірму ў Інтэрнэце альбо наведаць яе, калі ў цябе будзе такая магчымасць: https://darynatury.pl. Менавіта спалучэнне працы розных людзей, якія стваралі там супольны экапрадукт, прывяло да таго, што гэтая фірма вельмі хутка заняла вядучую пазіцыю па вытворчасці зёлкавай прадукцыі не толькі ў Польшчы, а нават ува ўсёй Еўропе.



## § 10. Вытворчасць прадуктаў харчавання.

*Арганізацыйныя, фінансавыя і юрыдычныя аспекты дзейнасці, звязанай з вырабам кулінарнай прадукцыі і яе рэалізацыяй. Арганізацыя прыгатавання ежы на выезд — кейтэрынг, фудтрак. Спосабы прыгатавання — вельмі важны аспект гастранамічнага этнатурызму; абсталяванне.*

Гатаванне смачнай вясковай ежы, якая прыносіць карысць здароўю, можа стаць не толькі асабістай справай (бо ўсе людзі самі для сябе заўжды нешта гатуюць, каб сілкавацца), але і перарасці ў форму самазанятасці, альбо гастранамічнае міні-прадпрыемства.

Якую форму такой дзейнасці ты для сябе абярэш, залежыць ад твайго жадання і вонкавых умоў. Такімі формамі можа выступаць рэалізацыя гатаванай да ўжытку ежы — кулінарыя, або гатаванне для мерапрыемстваў, сяброўскіх сустрэч — кейтэрынг, або часовы фургон для вулічнай ежы — фудтрак.

Спосабы прыгатавання, традыцыйныя прылады (абсталяванне) — вельмі важны аспект такога гастранамічнага бізнесу, і мы пазнаёмімся з некаторымі з іх, пакажам тут, якімі прыладамі карыстаемся мы ў сваёй сям'і шмат гадоў.

### Кулінарныя вырабы і іх рэалізацыя

Ежа, прадуктовая хатняя прадукцыя, якая спажываецца не ў момант яе прыгатавання, а праз нейкі час — гэта для мяне і ёсць кулінарыя. Часам такую ежу трэба яшчэ будзе дагатаваць — разагрэць, дапячы, прыправіць. А часам пасля непрацяглага захавання яна можа спажывацца ў гатовым выглядзе. Такая прадукцыя становіцца апошнія гады ўсё больш запатрабаванай, попыт на яе ўзрастае.

Гэта абумоўлена ладам гарадскога жыцця, які не дазваляе людзям прысвячаць шмат часу на штодзённае гатаванне ежы. Таму з'яўляюцца фірмы, якія прапануюць харчовыя паслугі з дастаўкай гатовай ежы проста дадому. Літаральна пяць гадоў назад у Мінску было толькі некалькі фірм, якія дастаўлялі ежу ў любое вызначанае месца, а цяпер колькасць такіх міні-прадпрыемстваў узрасла ў дзясятак разоў. Звычайна такім сэрвісам карыстаюцца людзі, якія не маюць часу на штодзённае гатаванне, а таксама тыя, якім неабходна аздараўленчае харчаванне па стане здароўя, альбо тыя, хто жадае зменшыць сваю вагу за кошт харчавання на аснове экалагічных прадуктаў. Але гэта не танныя паслугі, і такія харчовыя праграмы не многія могуць сабе дазволіць.

Таксама папулярным становіцца для занятых людзей гатаванне сабе абедаў адразу на ўвесь тыдзень. Набываюцца харчовыя інгрэдыенты, замарожваюцца, і кожны дзень выкарыстоўваецца адметны набор паўфабрыкатаў для падагрэву і спажывання. Такія харчовыя наборы і ў нас заказваюць, мы гатуем іх і развозім раз-два на тыдзень. Гэта для спажыўцоў атрымліваецца

і значна танней, і дазваляе ім мець разнастайнае меню на ўвесь тыдзень.

А ў некаторыя шмадзетныя няпоўныя сем'і, матуля якіх праводзіць шмат часу на працы, мы дастаўляем вясковыя абеды, згатаваныя з уласных прадуктаў. Для ўсіх такая форма харчавання вельмі зручная — дзеці маюць паўнавартаснае свежае харчаванне са здаровых арганічных прадуктаў, вяскоўцы, якія гатуюць абеды — маюць легальную форму дадатковага заробку, а бацькі радыя, што іх дзеці ўжываюць не шкодныя салодкія хімічныя субстанцыі, а паўнавартасную ежу. Аплату такіх абедаў можна ажыццяўляць за кошт сацыяльнай салідарнасці — калі адны кліенты спачуваюць іншым і гатовы даплачваць, калі сродкаў тым сем'ям бракуе.

Рэалізацыя прыгатаванай кулінарнай (ферментаванай, сушанай) прадукцыі эканамічна больш выгадная і самаакупная, чым продаж сыравіны. Агуркі ў сезон іх росту могуць каштаваць каля 1 рубля за кілаграм, а той жа кілаграм агуркоў, заквашаны на зёлках са свайго гарода, можа прадавацца зімой за 15 рублёў, пры тым што кошт спецый і прыпраў таксама будзе каля рубля. Так што кошт прыгатаванай прадукцыі ўзрастае ў сярэднім ад 5 да 20 разоў у параўнанні з коштам сыравіны, з якой яна зроблена.

Іншая рэч, што ў цябе павінна быць тое кола спажыўцоў (пакупцоў) вашай прадукцыі, якое табе давярае і любіць смак згатаванай табою прадукцыі.

А для таго, каб твая кулінарная прадукцыя мела адметны смак і захоўвала карысныя рэчывы, добра мець у гаспадарцы ўнікальныя тэхналогіі прыгатавання: печ, вяндлярню, аўтаклаў, а таксама — умовы і кампаненты для ферментацыі (крынічная вада, шматлікія зёлкі).

Рэалізацыя кулінарнай прадукцыі паспяхова адбываецца на падставе **даверу спажыўцоў.** Як заслужыць такі давер — кожны вырашае сам. Мы, напрыклад, прымаем невялікія турыстычныя групы людзей, якіх цікавяць прынцыпы пермакультурнага гаспадарання, запрашаем знаёмыя сямейныя пары на дэгустацыю нашых страў, выязджаем на мерапрыемствы і там частуем сваімі стравамі, прыгатаванымі ў печы з мяса свойскай жывёлы. Таксама прываблiваюць пакупцоў публікацыі пра нашу прадукцыю ў сацыяльных сетках. Часта да нас звяртаюцца людзі па рэкамендацыі тых, хто ўжо набываў і каштаваў прадукты, якія мы дастаўляем.

Трэба ўлічыць, што склад спажыўцоў будзе з гадамі ў вас мяняцца, і гэта натуральна — нехта пераехаў жыць у іншае месца, у некаторых змяніліся сямейныя абставіны. За пяць-восем гадоў рэалізацыі ў нас перабывала каля некалькіх соцень кліентаў, але пастаянная група на месяц была заўжды каля 20-25 чалавек. Гэта менавіта тая колькасць спажыўцоў, якім мы перадаём прадукты з рук у рукі чатыры разы на месяц, якія нам давяраюць і якім смакуе наша ежа.

Каб ахапіць большую колькасць кліентаў, нам прыйшлося б пашырыць сваю гаспадарку альбо скааперавацца разам з некалькімі іншымі гаспадаркамі. Але як адно, так і другое не заўжды магчыма зрабіць, бо існуюць абставіны, якія гэтаму перашкаджаюць.

---

Хочацца цяпер тут прадэманстраваць некаторую кулінарную прадукцыю, якую мы самі гатуем і прапануем на заказ.

Рэалізоўваць індычынае мяса не бройлерных кросаў не заўжды атрымліваецца паспяхова. Бо індык, які гадаваўся каля года на зяляніне і іншай гародніне, не атрымаецца пры звычайным гатаванні такім мяккім, якім яго прадаюць у краме. Яго мяса мае вельмі карысны склад рэчываў, але выглядае і смакуе, як дзічына, – больш жорсткае. А вось пры запаволеным гатаванні (практычна пры гарачым ферментаванні) рулет з такога індыка набывае і адпаведную мяккасць, і прыемны смак.


Рулет са свойскага індыка, запечаны ў печы:

Таксама мы маем вяндлярню халоднага вэнджання. Гэта старажытны спосаб нарыхтоўкі прадуктаў, якім займаліся многія мае продкі ў нашай вёсцы. Гэта далікатная апрацоўка галоўным чынам мясных вырабаў халодным дымам ліставой драўніны і некаторых ядлоўцаў. Такая апрацоўка надае адметны смак і можа захоўвацца доўгі час, не псуючыся.


Халоднае вэнджанне:

Вельмі смачная і карысная страва – халадзец, згатаваны ў печы з мяса свойскай птушкі, ялавічыны і свініны. Шляхам доўгага тамлення ў печы ўсе рэчывы добра распарваюцца, с костак выдзяляецца шмат клейкавіны. Атрымліваецца вельмі карысны для арганізма прадукт.

Вельмі запатрабавана ў кліентаў такая прадукцыя, як сыравяленыя каўбасы па традыцыйным беларускім рэцэпце. Для такой прадукцыі важна мець мяса ад жывёл хатняй гадоўлі, спецыяльны набор прыпраў і некаторае спецыялізаванае абсталяванне: найперш каўбасны шпрыц і кутар для рубкі мяса на невялікія кавалачкі.

Трэба адзначыць, што такія каўбасныя вырабы неабходна рабіць, калі мяса не будзе перагравацца, звычайна гэта позняя восень, зіма і ранняя вясна.


Халоднае з печы, каўбасы (трэба мець кутар, шпрыц)

**Кейтэрынг — арганізацыя ежы на выезд**

Асабліва запатрабавана паслуга кейтэрынгу недалёка ад буйных гарадоў, бо там жыве мноства людзей, якія мусяць харчавацца не з уласнага агарода. Таму ў гарадах можна развозіць гатаваную ежу не толькі на сямейныя мерапрыемствы, але і ў офісы кампаній.

Пры такой форме міні-прадпрымальніцтва важна мець прафесіянала-кухара, які ўмее гатаваць па тэхналагічных картах (ТК) і выкарыстоўвае PC-праграмы для разліку прадуктаў і фармавання цэн на меню прыгатаваных вамі страў. Бо прыгатаваць вялікія аб'ёмы страў будзе цяжка без дапамогі прафесіяналаў.

Мы заўважылі, што арганізацыя такога харчавання пачынае быць запатрабаванай і ў аграгарадках, і ў вялікіх вёсках. Бо і там нярэдка адбываюцца сямейныя мерапрыемствы, дзе неабходна арганізаваць сумеснае харчаванне. Гэта і вяселлі, і памінкі, дні нараджэння і іншыя нагоды. І часта людзям больш выгадна замовіць такое харчаванне, бо ў саміх не маецца неабходных умоў альбо вопыту прыгатавання для вялікай колькасці людзей.

Таксама пры наяўнасці неабходнага абсталявання (марміты, невялікія мабільныя газавыя пліткі і інш.) можна выязджаць з гатовай ежай на мясцовыя святы і лакальныя мерапрыемствы альбо сумясціць з месцам арганізацыі вольнага часу вакол аб'ектаў, дзе збіраецца шмат людзей.

Выдатна можа спрацаваць кейтэрынг у супрацоўніцтве з аграсядзібамі. Турыстычныя групы альбо асобныя наведвальнікі аграсядзіб з ахвотаю набываюць гатовую прадукцыю, калі яна адметная, зробленая з мясцовых прадуктаў.

Для вядзення пастаяннага кейтэрынгу спатрэбіцца юрыдычная форма прадпрыемства.

**Фудтрак — сучасная форма харчавання для гараджан і ў месцах адпачынку.**




Фудтрак — гэта такая форма грамадскага харчавання, якая (пасля знаёмства з ёй больш глыбока) пакажа, што вяскоўцу будзе цяжка яе прымяніць для асабістага міні-бізнесу. Бо фудтрак — гэта сезонная форма харчавання (галоўным чынам у цёплую пару года). То бок тады, калі ў вяскоўца вялікая занятасць на сваёй дзялцы.

Спажыўцы такой вулічнай ежы не вельмі задумваюцца над экалагічным паходжаннем прадуктаў, бо іх больш прывабліваюць пахамі і карцінкаю ежы, чым яе зместам.

Калі ты нават вызначышся канцэптуальна, якая прадукцыя будзе рэалізоўвацца (не

толькі шаўрма), то для пакрыцця выдаткаў на арэнду месца стаянкі ў горадзе, аплаты электрычнасці табе давядзецца максімальна эканоміць пры набыцці інгрэдыентаў для свайго меню, каб бізнес атрымаўся прыбытковым.

У нас быў вопыт супрацоўніцтва з фудтракам «Шпаркія вілкі», у якім гатавалі і рэалізоўвалі ў Мінску і іншых абласцях Беларусі бульбяную «бабку», і фудтракам «Асецінскія пірагі», дзе з рознымі начынкамі прапаноўваліся бліны, прыгатаваныя па рэцэптах асецінскай кухні. І гэты вопыт паказаў, напрыклад, што нашы каўбаскі, зробленыя з мяса хатніх курэй, былі на працэнтаў 20 даражэйшыя за падобныя з магазіна, і таму гаспадары фудтрака адмовіліся набываць нашы, здаравейшыя, бо гэта падымала кошт іх гатовай прадукцыі.

Таксама важна ўсведамляць, што юрыдычныя нормы пры арганізацыі такога бізнесу мяняюцца, трэба пастаянна сачыць за іх зменамі.

Мне асабіста падабаецца, што ежа фудтрака знаёміць і набліжае да традыцыйнай кухні розных народаў. Як я казаў, напрыклад, смак асецінскіх бліноў (ч'іры) вельмі адметны, калі іх рабіць паводле традыцыйных рэцэптаў, і не заўжды атрымаецца іх пакаштаваць у Асеціі ці шукаць спецыяльную кавярню ў горадзе. А праходзячы побач, можна зацікавіцца і адкрыць для сябе новыя смакі.

Таксама такая форма продажу ежы вельмі цікавая для моладзі. Бо ім важна захаванне іх сацыяльнай «тусовачнай» атмасферы пры вулічных перакусах.

Не выключаю, што фудтракі могуць станавіцца паступова папулярнымі ў невялікіх беларускіх гарадах і мястэчках, дзе не стае дэмакратычных кропак харчавання. Таму, калі сям'я мае разнастайную ўласную прадукцыю са сваёй гаспадаркі і арганізуе фудтракавы пункт недалёка ад сваёй мясцовасці, можа разлічваць на эканамічную прыбытковасць.

Наведваючы раённыя беларускія гарады, я заўважаў, што мясцовая моладзь шукае месца для сустрэч каля кропак харчавання, якіх вельмі не стае. І тая гаспадарка, якая пачне вывучаць гэты рынак паслуг — вулічную ежу — а потым, распрацаваўшы бізнес-план, гатаваць і прадаваць папулярныя стравы, можа разлічваць на паспяховасць.

---

Цяпер хацелася б коратка распавесці пра тыя **прылады для гатавання ежы**, якія мы выкарыстоўваем у сябе шмат гадоў і якія даюць непаўторны смак пры гатаванні ежы як для сваёй сям'і, так і для сяброўскай сустрэчы невялікай групы гастратурыстаў. Гэтыя прылады яшчэ не так шырока можна сустрэць у побыце беларускай кухні, але я ўпэўнены, што іх варта ўводзіць у карыстанне, бо можна будзе атрымаць непаўторныя смакі ад тых звыклых нам прадуктаў, якія мы звычайна выкарыстоўваем у сваім харчаванні.

**Патэльня садж** — распаўсюджана пераважна на паўднёвым Каўказе, дазваляе

стварыць адметныя стравы на жывым агні, і потым за сталом гэтая ежа будзе заставацца доўгі час цёплай, аб'ядноўваючы вакол сябе ўсю сям'ю. На саджы можна смажыць мяса, гародніну, рыбу, разаграваць плоў і іншыя стравы, якія мы звычайна гатуем на патэльні.

Добра будзе, калі разам з патэльняй садж ты набудзеш для яе спецыяльную падстаўку. Тады будзе зручна яе размясціць на стале, бо яна мае паўкруглае дно і не можа ўстойліва знаходзіцца на стале пры выкарыстанні звычайнай падстаўкі для патэльні.

Садж:



Патэльня САДЖ:



**Афганскі казан** дзейнічае па прынцыпе скараваркі: на павольным агні страва гатуецца пад ціскам. Таму добра разварваецца, напрыклад, хатняя курыца, робіцца мяккаю, булён з яе атрымліваецца насычаным і

Афганскі казан:



карысным. Так што ўсе стравы, якія гатуюцца на костках і патрабуюць працяглага гатавання, лепш рабіць у гэтай прыладзе.

**Тандыр-печка** — гэта вулічны варыянт прыгатавання страў падобна, як у рускай печы. Асабліва зручна карыстацца тандырам у летні перыяд, калі печ у хаце не хочацца тапіць, каб заставаўся прыемны халадок, а ёсць патрэба прыгатаваць ежу на павольным пячным духу. Добра, калі маецца некалькі тандыраў — большага памеру, для гатавання на вялікую кампанію, і меншы, сямейны, для запякання для невялікай сям'і. Каб было зручна выкарыстоўваць тандыр для гатавання розных страў, варта набыць спецыяльныя прылады да яго. Яны дазволяць, напрыклад, запякаць гародніну і мяса на розных узроўнях, нават можна будзе выпякаць свае праснакі, калі набудзеце да яго спецыяльныя пячныя камяні.

Тандыр-печ:



Тандыр як замена печы:



Таксама прылада, якой мы часта карыстаемся для гатавання, гэта **тажын-патэльня.** Яна ў нас мае чыгунную аснову, якая

ставіцца на агонь, і керамічную, асаблівай формы, накрыўку. Разнастайныя стравы тушэння гародніны і мяса атрымліваюцца ў ім вельмі сакавітымі і смачнымі. Бо вільгаць ад прадуктаў падымаецца ўверх пад «дах» накрыўкі, ахалоджваецца і па сценках накрыўкі вяртаецца зноў на патэльню. Такім чынам адбываецца цыркуляцыя сокаў тых прадуктаў, якія ты гатуеш.

Тажын – усходняя (мараканская) кухня:



Але не толькі такія яшчэ рэдкія кухонныя аксесуары могуць рабіць ежу больш смачнаю, прывабнай і карыснай. Здавён у беларускіх вёсках шырока карысталіся для гатавання чыгуннымі саганамі. У вялікіх саганах гатавалі скаціне – варылі бульбу, заварвалі муку, а ў маленькіх саганках ставілі ў печ на дзень стравы, якія ўжывалі ўсёй сям'ёй на вячэру. Такія саганкі і цяпер варта мець на сваёй кухні. Лепш выбіраць такую мадэль, якая будзе ўнутры эмаліраваная, бо яе будзе лягчэй даглядаць. Ежа, прыгатаваная ў сагане – асабліва смакуе, калі яе гатаваць на вогнішчы.

Безумоўна, гэта далёка не поўны пералік усяго посуду і спосабаў гатавання, які маецца цяпер у наяўнасці на рынку. Я пералічыў толькі тое, чым мы самі карыстаемся шмат гадоў і не збіраемся адмаўляцца.

Чаму згаданы вышэй посуд падаецца мне карысным? Таму, што ён больш за ўсё падыходзіць для гатавання страў традыцыйнай кухні, захоўвае яе карысныя ўласцівасці. Няхай многае з гэтага посуду і не было ва ўжытку ў Беларусі яшчэ 10-15 гадоў таму, але яны былі традыцыйнымі на працягу тысячагоддзяў у іншых народаў Усходу і Азіі. І карыстацца саджам, тажынам альбо тандырам вельмі проста, экалагічна і карысна для здароўя. Да таго ж гэты посуд можа служыць шмат гадоў без патрэбы яго замяняць на нешта новае. Як гэта робіцца, напрыклад, пры набыцці сучасных патэльняў з тэфлонавым пакрыццём.

Беларускія саганы:



Беларускія саганы:



Калі абагульніць наш шматгадовы вопыт вясковай **самазанятасці ў гастранамічнай сферы**, то трэба пазначыць, наступнае:

- Яна мае вельмі выразны **сацыяльны і культурны сэнс**. Бо вяртае многім людзям пачуццё нацыянальнай тоеснасці: людзі пачынаюць вяртацца да традыцыйнай для нашага народу ежы,

узмацняецца каштоўнасць лакальнага, мясцовага прадукту. Я заўважаю, што маладзейшыя асобы пачынаюць распытваць сваіх бабуль пра старажытныя рэцэпты страў. Кнігі, тэлевізійныя перадачы пра нацыянальную кухню, на маю думку, набываюць усё большую папулярнасць і цікавасць для многіх нашых суайчыннікаў.

- **Гастранамічны этнатурызм** становіцца з кожным годам усё больш запатрабаваным відам унутранага і знешняга турызму. Бо традыцыйная кухня, як сведчыць наш вопыт, натхняе людзей, выклікае ў іх непаўторныя эмоцыі. І дзеля гэтых эмоцый людзі гатовы вяртацца і шчодра плаціць гаспадарам, якія з душой прыгатавалі ім адметную ежу. Ежу, якая не прынесла шкоды іх здароўю, а наадварот, паўплывала на змену харчовых звычак.
- Сапраўды, традыцыйная кухня можа паўплываць і нават змяніць **шкодныя звычкі ў харчаванні**. Бо звычайна арганізм адчувае і адгукаецца на здаровую, карысную ежу і праз некаторы час спажыўцоў проста цягне да натуральных прадуктаў і карыснай ежы. То бок вясковая гастранамія паступова пракладае шлях да здаровага, традыцыйнага харчавання. І гэта важна асабліва для дзяцей і моладзі, у якіх закладаецца аснова шматгадовага функцыянавання іх арганізма.
- І паўтараю тут каторы ўжо раз, што любыя формы кааперацыі і супрацоўніцтва – гэта шлях да паспяховасці гастранамічнага міні-бізнесу ў вёсцы. Але пра тое, як ладзіць плённае партнёрскае ўзаемадзеянне, больш падрабязна напісана ў наступнай частцы «Дапаможніка».

# Частка V

# Кааперацыя на вёсцы

## § 11. Кааперацыя на вёсцы, патэнцыял грамадскіх арганізацый і ініцыятыў, сацыяльныя прадпрыемствы.

У шырокім сэнсе пад кааперацыяй разумеюць сумесную працу для дасягнення адной (агульнай) мэты, а таксама дапамогу іншым у іх справе. Асноўны сінонім кааперацыі — супрацоўніцтва. Вельмі блізкае па змесце таксама — партнёрства.



Увесь наш дапаможнік насычаны гэтымі тэмамі, прыкладамі паспяховых гісторый кааперацыі і парадамі па яе развіцці.

Эфектыўнае супрацоўніцтва — гэта ключ да поспеху каманд і іх чальцоў.

«Не май 100 рублёў, а май 100 сяброў» — пацвярджае пазітыўныя эфекты сяброўства і партнёрства народная мудрасць.

Бізнес-кансультанты па ўсім свеце прапануюць паслугі фірмам па развіцці кааперацыі, каманднага духу, вучаць знаходзіць эфектыўныя шляхі да аб’яднання супрацоўнікаў, развіцця ў іх навыкаў узаемнай падтрымкі і сумесных дзеянняў, так званай «культуры кааперацыі».

Пра маштабы кааперацыі ў свеце сведчаць лічбы: толькі ў межах Міжнароднага кааператыўнага альянсу (International Cooperative Alliance — ICA), які існуе з 1895-га года, аб’яднаныя 305 кааператыўных арганізацый са 103 краін свету. Колькасць людзей-сяброў кааператываў у ICA ацэньваецца лікам 1 мільярд! І гэта толькі ў межах гэтай арганізацыі! А існуюць яшчэ іншыя аб’яднанні, а мноства кааператываў пакуль не аб’яднаныя ў асацыяцыі і саюзы.

Сэнс кааператываў, іх каштоўнасці і прынцыпы добра прапісаныя ў дакументах Міжнароднага кааператыўнага альянсу ICA, а на іх сайце ica.coop ёсць многа карыснай інфармацыі пра кааператыўны рух.

**Міжнародны кааператыўны альянс (International Cooperative Alliance — ICA)** з’яўляецца глабальным распарадчыкам Заявы аб кааператыўнай ідэнтычнасці — каштоўнасцях і прынцыпах кааператыўнага руху.

У 1995 годзе ICA прыняла перагледжаную Заяву аб ідэнтычнасці кааператыва, якая змяшчае азначэнне кааператыва, каштоўнасці кааператываў і сем прынцыпаў кааператыва, апісаных ніжэй.

**Вызначэнне кааператыва.** Кааператыў — гэта аўтаномнае добраахвотнае аб’яднанне асоб для задавальнення сваіх агульных эканамічных, сацыяльных і культурных патрэб і памкненняў праз прадпрыемства, якое знаходзіцца ў сумеснай уласнасці і кіруецца дэмакратычным шляхам.

**Кааператыўныя каштоўнасці.** Кааператывы заснаваныя на каштоўнасцях самадапамогі, самаадказнасці, дэмакратыі, роўнасці, справядлівасці і салідарнасці. У традыцыі сваіх заснавальнікаў члены кааператыва вераць у этычныя каштоўнасці сумленнасці, адкрытасці, сацыяльнай адказнасці і клопату пра іншых.

**Кааператыўныя прынцыпы.** Кааператыўныя прынцыпы — гэта кіруючыя прынцыпы, паводле якіх кааператывы рэалізуюць свае каштоўнасці на практыцы.

**1. Добраахвотнае і адкрытае сяброўства.** Кааператывы з'яўляюцца добраахвотнымі арганізацыямі, адкрытымі для ўсіх людзей, якія могуць карыстацца іх паслугамі і хочуць прыняць на сябе абавязкі членства, без дыскрымінацыі па прыкмеце полу, сацыяльнай, расавай, палітычнай або рэлігійнай прыналежнасці.

**2. Дэмакратычны членскі кантроль.** Кааператывы — гэта дэмакратычныя арганізацыі, якія кантралююцца сваімі членамі, якія актыўна ўдзельнічаюць у распрацоўцы іх палітыкі і прыняцці рашэнняў. Мужчыны і жанчыны, якія з'яўляюцца выбарнымі прадстаўнікамі, падсправаздачныя членам. У першасных кааператывах члены маюць роўныя правы голасу (адзін член, адзін голас), а кааператывы іншых узроўняў таксама арганізаваны дэмакратычна.

**3. Эканамічны ўдзел удзельнікаў.** Члены ўносяць роўныя ўклады ў капітал свайго кааператыва і дэмакратычна кантралююць яго. Прынамсі частка гэтага капіталу звычайна з'яўляецца агульнай уласнасцю кааператыва. Удзельнікі звычайна атрымліваюць абмежаваную кампенсацыю, калі такая маецца, на капітал, падпісаны ў якасці ўмовы членства. Члены размяркоўваюць лішкі для любой або ўсіх наступных мэт: развіццё свайго кааператыва, магчыма, шляхам стварэння рэзерваў, прынамсі частка якіх будзе непадзельнай; выплата членам прыбытку прапарцыянальна іх здзелкам з кааператывам; падтрымка іншых мерапрыемстваў, ухваленых членамі.

**4. Аўтаномія і незалежнасць.** Кааператывы — гэта аўтаномныя арганізацыі самадапамогі, якія кантралююцца іх членамі. Калі яны заключаюць пагадненні з іншымі арганізацыямі, у тым ліку з урадамі, або збіраюць капітал са знешніх крыніц, яны робяць гэта на ўмовах, якія забяспечваюць дэмакратычны кантроль з боку іх членаў і падтрымліваюць іх кааператыўную аўтаномію.

**5. Адукацыя, навучанне і інфармацыя.** Кааператывы забяспечваюць адукацыю і навучанне для сваіх членаў, выбарных прадстаўнікоў, кіраўнікоў і супрацоўнікаў, каб яны маглі ўносіць эфектыўны ўклад у развіццё сваіх кааператываў. Яны інфармуюць шырокую грамадскасць — асабліва моладзь і лідараў грамадскай думкі — аб характары і перавагах супрацоўніцтва.

**6. Кааперацыя паміж кааператывамі.** Кааператывы найбольш эфектыўна абслугоўваюць сваіх членаў і ўмацоўваюць кааператыўны рух, працуючы разам праз мясцовыя, нацыянальныя, рэгіянальныя і міжнародныя структуры.

**7. Клопат аб супольнасці.** Кааператывы працуюць на ўстойлівае развіццё сваіх суполак праз палітыку, зацверджаную іх членамі.

**Дапаможнік па прынцыпах кааператыва.** У 2016 годзе Камітэт па прынцыпах ICA выпусціў «Дапаможнік па прынцыпах кааператыва», у якім дадзены падрабязныя рэкамендацыі і парады па практычным прымяненні прынцыпаў у кааператыўных прадпрыемствах ва ўмовах 21-га стагоддзя.

*Крыніца: https://ica.coop/en/cooperatives/cooperative-identity. Пераклад на беларускую мову наш. — А. С.*

Якраз у гэтыя дні, калі наша каманда рыхтавала-распрацоўвала гэты «Дапаможнік», Генеральная Асамблея ААН прыняла рэзалюцыю, якая абвясціла 2025 год Міжнародным годам кааператываў. І гэта адбылося ўжо другі раз у гісторыі ААН: першы Міжнародны год кааператываў адбыўся ў 2012 годзе. Гэта яскравае сведчанне важнасці кааператыўнага руху на планеце дзеля лепшай будучыні.

Заклік «Кааператывы будуюць лепшы свет», абвешчаны[18] Міжнародным кааператыўным альянсам, стане ў 2025-м годзе тэмай Міжнароднага года кааператываў ААН. Гэты лозунг дэманструе працяглы глабальны ўплыў кааператываў ва ўсім свеце; ён паказвае, наколькі кааператыўная мадэль з'яўляецца важным рашэннем для пераадолення многіх глабальных праблем і працягвае адыгрываць важную ролю ў паскарэнні рэалізацыі Мэт устойлівага развіцця (МУР) да 2030 года.

Прэзідэнтка Міжнароднага кааператыўнага альянсу (ICA) Арыэль Гуарко адзначыла пры гэтым, што «кіруючыся клопатам аб усіх супольнасцях, кааператывы паспяхова прыстасаваліся да пераадолення новых выклікаў нашага часу і неаднаразова паказвалі на працягу гісторыі, што разам мы сапраўды будуем лепшы свет».

Цыт. паводле: https://ica.coop/en/newsroom/news/cooperatives-build-better-world-2025-international-year-cooperatives-theme

На тэрыторыі Беларусі кааператыўны рух прайшоў складаны шлях, на якім былі перыяды абмежаванняў і падтрымкі з боку дзяржавы, заняпаду і росквіту, індывідуальнага актывізму і адзяржаўлення.

Ёсць прыклады, як мы аднойчы сустрэлі ў Албаніі, калі нават назва «кааператыў» была да такой ступені дыскрэдытаваная ў сацыялістычны перыяд, што зараз сельскагаспадарчая кааперацыя развіваецца там пад іншымі назвамі — кансорцыумаў, асацыяцый.

Сучасная, новая[19] кааперацыя ў Беларусі, аб якой мы далей будзем весці гаворку, — гэта спажывецкія кааператывы, то бок некамерцыйныя арганізацыі, створаныя «знізу», праз добраахвотнае аб'яднанне сялян, гаспадароў прыватных падсобных гаспадарак, грамадзян з мэтай атрымання эканамічнай выгады ад такога аб'яднання. Зараз у Беларусі такіх арганізацый не надта многа, але мы раім прыгледзецца да такой формы развіцця бізнесу.

Паводле звестак Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь, на 01.10.2018 г. у краіне дзейнічала 42 спажывецкія сельскагаспадарчыя кааператывы, з якіх 17 агародніцкіх, 9 жывёлагадоўчых (з іх 5 пчалярскіх) і 5 па развіцці аграэкатурызму. На меркаванне даследчыкаў, гэта сведчыць аб недастатковай увазе з боку дзяржавы да сельскагаспадар-

[18] https://ica.coop/en/newsroom/news/cooperatives-build-better-world-2025-international-year-cooperatives-theme

[19] Гэты тэрмін я ўпершыню скарыстаў у брашуры «Сельские сообщества: потенциал саморазвития» (Мінск, «Новая Еўразія», 2017) для таго, каб адмежавацца ад існуючых раней, у тым ліку тых, што перайшлі ў спадчыну ад савецкай сістэмы калектыўных форм гаспадарання – калгасаў і спажыўкааперацыі, якія па сутнасці з'яўляліся дзяржаўнымі структурамі.

чай кааперацыі, аб адсутнасці дзяржаўнай падтрымкі і спецыяльнага заканадаўства.[20]

І хоць мноства варыянтаў супрацоўніцтва паміж вясковымі гаспадарамі можа быць арганізаванае без рэгістрацыі юрыдычнай асобы, але ж у некаторых выпадках стварэнне кааператыва можа быць добрай опцыяй. Так што калі ўзнікне неабходнасць у аб’яднанні рэсурсаў і высілкаў з іншымі вясковымі гаспадарамі, успомні і пра такі варыянт як спажывецкі кааператыў. Такая прававая форма, акрамя агульных эфектаў, якіх можна дасягнуць і праз іншыя віды сумеснай працы, мае статус некамерцыйнай арганізацыі. А гэта дазваляе ўдзельнічаць у конкурсах міжнародных праектаў на атрыманне грантаў, дзе, як правіла, дазваляецца ўдзельнічаць у першую чаргу некамерцыйным арганізацыям. Акрамя таго, спажывецкі кааператыў, як адзначаюць спецыялісты, — даволі простая форма гаспадарання, там не так складана справіцца з улікам і справаздачамі. Чаму не паспрабаваць?

Прыклады шэрагу спажывецкіх кааператываў, якія не так даўно ствараліся ў Беларусі ў сферах сельскай гаспадаркі і агратурызму, сведчыць, што часта прычынамі няўдач і далейшага заняпаду некаторых з іх былі чалавечыя адносіны. Слабы давер да калег, спадзевы на хуткі і лёгкі прыбытак, падазрэнні ў перавазе асабістага інтарэсу перад агульным разбуралі кааперацыю. Таму трэба вучыцца супрацоўніцтву, звяртаць увагу на тое, як працуюць паспяховыя кааператывы, з большым даверам адносіцца да калег, знаходзіць кампраміс. Гэта не такія лёгкія рэчы, асабіста для людзей сталага ўзросту. Але перамен да лепшага можна дасягнуць у любым выпадку. Трэба толькі брацца за справу.

**Недзяржаўныя некамерцыйныя арганізацыі** — добрая школа для таго, каб падвысіць узровень кааператыўнай культуры, навучыцца працаваць у партнёрстве. Адначасова такія аб’яднанні людзей — гэта частка рэсурсаў твайго краю, патэнцыялу для развіцця мясцовай супольнасці (аб гэтым мы пісалі ў §10).

Згодна з палажэннямі Грамадзянскага кодэкса ў Рэспубліцы Беларусь існуюць (могуць быць зарэгістраваныя і працаваць) наступныя арганізацыйна-прававыя формы некамерцыйных арганізацый, якія ўмоўна падзяляюцца на два асноўныя тыпы зыходзячы з крытэрыяў «аб’яднання на аснове членства» і «на аснове аб’яднання маёмасці»:

**— грамадскія і рэлігійныя арганізацыі (аб’яднанні)** — добраахвотныя аб’яднанні грамадзян, якія ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку аб’ядналіся на аснове агульнасці іх інтарэсаў для задавальнення духоўных або іншых нематэрыяльных патрэб;

[20] Цыт. паводле: Механизм эффективного функционирования потребительских сельскохозяйственных кооперативов малых форм хозяйствования на современном этапе / А. С. Сайганов и др. ; под общей редакцией А. С. Сайганова. – Минск, Институт системных исследований в АПК НАН Беларуси, 2021. – 99 с. С.

**— рэспубліканскія дзяржаўна-грамадскія аб'яднанні** — заснаваныя на членстве некамерцыйныя арганізацыі, мэтай дзейнасці якіх з'яўляецца выкананне ўскладзеных на іх дзяржаўна значных задач;

**— аб'яднанні юрыдычных асоб і (або) індывідуальных прадпрымальнікаў (асацыяцыі і саюзы)** — некамерцыйныя арганізацыі, створаныя па дагаворы паміж сабой камерцыйнымі арганізацыямі ў мэтах каардынацыі іх прадпрымальніцкай дзейнасці, а таксама прадстаўлення і абароны агульных маёмасных інтарэсаў, або аб'яднанні некамерцыйных арганізацый;

**— фонды** — некамерцыйныя арганізацыі, якія не маюць членства, заснаваныя грамадзянамі (грамадзянінам) і (або) юрыдычнымі асобамі (юрыдычнай асобай) на аснове добраахвотных маёмасных узносаў, якія маюць сацыяльныя, дабрачынныя, культурныя, адукацыйныя, тыя, якія садзейнічаюць развіццю фізкультуры і спорту, навуковыя або іншыя грамадска-карысныя мэты, пазначаныя ў статуце фонду;

**— установы** — арганізацыі, створаныя ўласнікам для ажыццяўлення кіраўнічых, сацыяльна-культурных або іншых функцый некамерцыйнага характару і якія фінансуюцца ім поўнасцю або часткова;

**— спажывецкі кааператыў** — добраахвотнае аб'яднанне грамадзян або грамадзян і юрыдычных асоб на аснове членства з мэтай задавальнення матэрыяльных (маёмасных) і іншых патрэбнасцей удзельнікаў, якое ажыццяўляецца шляхам аб'яднання яго членамі маёмасных паявых узносаў.

Аб спажывецкіх кааператывах мы пагаварылі напачатку гэтага параграфа, а тут яшчэ дадаткова пералічылі магчымасці тваёй самарэалізацыі з адначасовым развіццём тваім і твайго краю.

Канкрэтны выбар прававой формы некамерцыйнай арганізацыі, лепшай для цябе, раім рабіць пакрокава:

**1. Крок першы. Самастойна пазнаёміцца з асновамі заканадаўства.** Справа ж стварэння арганізацыі — сур'ёзнае рашэнне, якое пацягне за сабой неабходнасць выдаткоўваць час на яе, вучыцца. Вядома, ствараем мы арганізацыю, каб атрымаць новыя магчымасці і здабыткі, але ж разам з гэтым у тваё жыццё дададуцца і лішнія клопаты і адказнасць. Не трэба гэтага пужацца, а трэба падрыхтавацца. Знаёмства з заканадаўствам дапаможа табе прывыкнуць да тэрміналогіі, што важна ў зносінах з калегамі, партнёрамі і чыноўнікамі. Дасць магчымасць, так бы мовіць, агульнага погляду на твае гарызонты развіцця. І галоўнае — ты будзеш ведаць свае правы і вучыцца іх адстойваць.

**2. Крок другі. Параіцца-пракансультавацца з экспертамі, юрыстамі.** Гэта важна, таму што ў нашай краіне заканадаўства даволі часта мяняецца, і бывае складаным адсачыць гэта, а ў Інтэрнэце можна патрапіць на стары ней-

кі варыянт і змарнаваць час. Тым больш што можна знайсці магчымасці параіцца-пракансультавацца бясплатна. Напрыклад, табе адгукнуцца з цэнтраў падтрымкі прадпрымальніцтва і бізнес-інкубатараў. Табе могуць прапанаваць прыклады дакументаў для рэгістрацыі, параіць канкрэтныя лайфхакі на гэтым шляху. Грукай — і табе адчыняць дзверы!

**3. Крок трэці. Абмеркаваць гэта пытанне з паплечнікамі**, з якімі ты збіраешся разам ствараць арганізацыю. Сабрацца разам, вырашыць пытанні, канчаткова вызначыцца, размеркаваць ролі, прыкінуць — а што па выдатках — і вырашыць і гэтае пытанне.

**4. Крок чацвёрты: прыкінуць-спланаваць будучую дзейнасць** арганізацыі на пэўны перыяд (лепш — на працяглы). Калі ўжо ўвязвацца ў гэты бой, то трэба ставіць амбітныя мэты. Планаванне заўсёды дапамагае рэальна паглядзець на сітуацыю. А калі ты ведаеш магчымыя варыянты развіцця падзей — то ты падрыхтаваны, а гэта многае значыць!

**5. Крок пяты: рэгістраваць арганізацыю.**



Для многіх людзей стварэнне грамадскай арганізацыі ці далучэнне да ўжо дзейнай стала лёсавызначальнай падзеяй. Неаднойчы я чуў: «Маё жыццё змянілася, як я пазнаёміўся (пазнаёмілася) з грамадскімі арганізацыямі!» Так што раім смялей далучацца да гэтых магчымасцей.

---

**Сацыяльнае прадпрыемства** — адносна новая з’ява «на прадпрымальніцкай арэне», якая ўзнікла і пашырылася ў другой палове XX стагоддзя. У Беларусі пакуль што няма заканадаўчага замацавання такога статусу прадпрыемстваў, аднак, на наш погляд, гэта адбудзецца, і добра, калі ты, паважаны чытач, будзеш падрыхтаваны па гэтым пытанні і нават, можа, паспрыяеш прыняццю адпаведнага заканадаўства. Навошта? Справа ў тым, што гэта дадатковая магчымасць не толькі самарэалізавацца там, дзе ты жывеш, але і спрычыніцца да місіі паляпшэння жыцця ўсёй вашай грамады.

Сацыяльнае прадпрыемства — гэта прыватнае незалежнае прадпрыемства, якое аказвае паслугі або вырабляе прадукцыю з асноўнай мэтай, накіраванай на паляпшэнне дабрабыту мясцовай супольнасці, вырашэнне мясцовых праблем (у большай ступені, чым на атрыманне прыбытку).

Сацыяльнае прадпрымальніцтва з’яўляецца адным з адказаў на сучасныя глабальныя і лакальныя праблемы, якія стаяць перад чалавецтвам і канкрэтнымі мясцовымі супольна-

сцямі. Для ўмоў Беларусі, на наш погляд, менавіта ў вясковай мясцовасці патэнцыял сацыяльнага прадпрымальніцтва можа праявіцца напоўніцу.

Па ўсім свеце сацыяльныя прадпрыемствы працуюць у розных кірунках, займаюцца шырокім спектрам відаў дзейнасці, сярод якіх наступныя:

— сацыяльныя паслугі (у тым ліку догляд дзяцей, падтрымка сем'яў);

— жыллёва-камунальныя паслугі (у тым ліку ўтрыманне сацыяльнага жытла);

— экалагічная дзейнасць;

— адукацыя;

— крэдытаванне;

— ахова здароўя;

— гандаль і паслугі (рамонт, мясцовы транспарт, справядлівы гандаль, вясковая крама);

— сфера адпачынку (гатэлі, рэстараны, агратурыстычныя сядзібы).

Сярод канкрэтных прыкладаў сацыяльных прадпрыемстваў — фірмы, якія займаюцца арганізацыяй выстаў і фэстаў, сацыяльныя кавярні (у якіх бяздомныя людзі атрымліваюць бясплатную ежу), масажны салон (у якім працуюць людзі са слабым зрокам). Гэта таксама і вясковы дом (village cottage) у Вялікабрытаніі, у якім праводзяцца разнастайныя мерапрыемствы, пачынаючы ад кірмашоў у нядзелі да заняткаў спартыўных секцый і канцэртаў. Успамінаюцца таксама тэлекатэджы ў Венгрыі і Сербіі, дзе мясцовыя жыхары маюць магчымасць працаваць і праводзіць вольны час з дапамогай Інтэрнэту. А яшчэ сюды можна дадаць і курсы замежнай мовы ў Цэнтры развіцця мясцовай супольнасці, і адноўленую вясковую лазню ў літоўскай вёсцы, і выданне вулічнай ці вясковай газеты.

Па арганізацыйна-прававой форме і асаблівасцях функцыянавання сацыяльныя прадпрыемствы вельмі разнастайныя: тут і кааператывы, і грамадскія арганізацыі, і фонды, і асацыяцыі, і малыя прадпрыемствы, і дабрачынныя структуры, і валанцёрскія арганізацыі.

У Беларусі таксама ўжо зараз амаль кожны вясковы прадпрымальнік, які аказвае паслугі ці вырабляе прадукцыю, гаспадар вясковай сядзібы, які рэалізуе частку сваёй прадукцыі, маюць рысы сацыяльнага прадпрымальніка. Бо большасць з іх (з вас!) арыентаваныя на задавальненне патрэб мясцовай вясковай супольнасці, і адначасова яны (вы!) робяць унёсак у вырашэнне праблем занятасці і самазабеспячэння.

Такая дзейнасць павінна падтрымлівацца дзяржавай і мясцовымі адміністрацыямі. На наш погляд, у Беларусі павінна быць прынятае спецыяльнае заканадаўства аб сацыяльных прадпрыемствах, у якім трэба зацвердзіць адчувальныя льготы і стымулы для сацыяльнага прадпрымальніцтва ў вясковай мясцовасці і ў гарадах з насельніцтвам да 30 тысяч жыхароў.

Інфармацыя аб распрацоўцы ў Беларусі праекта закона аб сацыяльным прадпрымальніцтве ўжо з'яўлялася ў сродках масавай інфармацыі і на

сайтах міністэрстваў.[21] Аднак дасюль такі закон не прыняты. Таму пакуль што нельга аказаць аб падтрымцы з боку дзяржавы, прывілеях і падатковых ільготах для прадпрыемстваў, якія займаюцца сацыяльнай дзейнасцю на карысць насельніцтва. А ў той жа час многія эканамічна развітыя краіны свету дэманструюць актыўную пазіцыю ў гэтым пытанні, прымаюць адпаведныя законы і ажыццяўляюць розныя формы такой падтрымкі[22]. Дзякуючы такой актыўнай дапамозе з боку дзяржавы сацыяльныя прадпрыемствы працягваюць сваё дынамічнае развіццё ў многіх краінах свету. У нас жа мы можам набліжаць такі прагрэс праз прапановы, агучваючы гэтыя ідэі на канферэнцыях і ў інтэрв'ю.



Так праз удзел у кааперацыі і грамадскіх арганізацыях, а ў перспектыве – сацыяльных прадпрыемствах, вясковыя гаспадары могуць палепшыць вынікі і павысіць эфектыўнасць сваёй працы. На карысць сабе і мясцовай супольнасці.

## § 12. Прынцыпы салідарнай агравытворчасці ў Германіі як вядучага папулярнага руху ў развіцці ўстойлівай сельскай гаспадаркі.

*Прыклады і знаёмства з працай сеткі рэгіянальных груп салідарных фермераў Германіі. «Вёска будучага»: вызначэнне тыпаў вясковага развіцця па даследаванням Інстытута будучыні ў Берліне (Zukunftsinstitut).*

**Ежа страчвае сваю цану і, такім чынам, ізноў знаходзіць сваю каштоўнасць. (Вольфганг Штрэнц, гаспадар двара Бушбург, Германія)**

### 1. Салідарная агравытворчасць як канцэпцыя будучага

Улічваючы, што ў сусветнай эканоміцы існуе «глабальны супермаркет», паўстае пытанне, якім чынам падтрымаць сельскую разнастайную гаспадар-




Малюнак 20. Салідарная агравытворчасць у Германіі[23]

[21] Крыніца: https://www.mpt.gov.by/ru/trade-union-news/v-belarusi-razrabatyvaetsya-proekt-zakona-o-socialnom-predprinimatelstve

[22] Так, у Італіі ў 1991 годзе быў прыняты закон «Аб сацыяльных кааператывах». У Бельгіі ў 1995 годзе з'явілася заканадаўства аб «кампаніях з сацыяльнай мэтай». У Францыі ў 2001 годзе ўзаконеныя «кааператыўныя грамадствы калектыўнага інтарэсу». У Партугаліі прыняты закон аб «кааператывах сацыяльнай салідарнасці»; у Ірландыі – праграма сацыяльнай эканомікі; у Фінляндыі – Акт аб сацыяльных прадпрыемствах.

[23] Крыніца: https://www.shz.de/

ку, якая вырабляе здаровую, свежую ежу і таксама клапоціцца пра прыродны і культурны ландшафт? Адказам на гэтае пытанне можа быць салідарная сельская гаспадарка. Дзякуючы ёй прадукты харчавання больш не прадаюцца на рынку, а ўліваюцца ва ўласны празрысты эканамічны цыкл, які арганізуецца і фінансуецца спажыўцамі.

Канцэпт салідарнай сельскай гаспадаркі прасоўвае і падтрымлівае ідэі біяразнастайнасці ў аграворчасці, забяспечвае рэгіянальныя прадукты і дае людзям новыя адукацыйныя і эксперыментальныя магчымасці. У людзей, якія працуюць у сельскай гаспадарцы, звычайна ёсць выбар: эксплуатаваць прыроду ці сябе. Іх існаванне залежыць ад субсідый і нацыянальных рынкавых ці сусветных рынкавых цэн. На абодва гэтыя фактары яны не маюць ніякага ўплыву, і тыя часта змушаюць іх ісці насуперак уласным перакананням у адносінах да эксплуатацыі глебы і клопату пра жывёл. Ці нават цалкам пайсці з сельскай гаспадаркі.

Салідарная сельская гаспадарка — гэта інавацыйная стратэгія дынамічнай і адказнай сельскай гаспадаркі, якая адначасова забяспечвае існаванне людзей, што там працуюць, і робіць істотны ўнёсак ва ўстойлівае развіццё.

**Канцэпт: Фінансуецца ўся сельская гаспадарка, а не асобныя прадукты харчавання**

Канцэптам салідарнай агравытворчасці з’яўляецца зліццё сельскагаспадарчых прадпрыемстваў з групай прыватных хатніх гаспадарак. Вытворцы і спажыўцы ўтвараюць эканамічную супольнасць, адаптаваную да патрэб людзей, ахову навакольнага асяроддзя, прыроды і жывёл.

На падставе меркаваных гадавых выдаткаў на сельскагаспадарчую вытворчасць аднаго фермера ці іх групы група спажыўцоў абавязваецца штогод выплачваць гэтым фермерам авансам пэўную суму грошай (звычайна штомесячна) і атрымліваць за гэта набор свежых прадуктаў. Салідарныя фермеры могуць карыстацца спецыяльнымі камп’ютарнымі праграмамі для падліку штомесячных узносаў спажыўцоў. Такім чынам фермеры не турбуюцца аб сродках для існавання і метадаў рэалізацыі прадуктаў.

Гэта дазваляе вытворцу прысвяціць сябе добрай сельскагаспадарчай практыцы, захоўваць урадлівасць глебы і весці сельскую гаспадарку ў адпаведнасці з патрэбамі, незалежна ад рынкавых абмежаванняў.

Наўзамен тыя, хто купляе тавары, атрымліваюць увесь ураджай, а таксама прадукты далейшай перапрацоўкі, такія як хлеб, сыр і г. д. Асабістая сувязь робіць узаемную адказнасць яснай. Спажыўцы бачаць, як іх выбар прадуктаў харчавання не толькі фармуе культурнае асяроддзе, але і ўплывае на сацыяльнае суіснаванне, ахову прыроды і біялагічную разнастайнасць, тым самым забяспечваючы ўстой-

лівую сельскую гаспадарку.

Таму вельмі важна, каб спажыўцы гарантавалі закуп прадукцыі і загадзя фінансавалі збор ураджаю ці ўсё, што трэба для яго вытворчасці. Кожны ўдзельнік салідарнай гаспадаркі падзяляе злучаную з гэтым адказнасць, рызыкі, выдаткі і ўраджай.

У салідарнай сельскай гаспадарцы ўсе ўдзельнікі могуць мець выгаду з гэтых адносін.

**Спажыўцы:**

- атрымліваюць добрую якасць: свежыя, сезонныя мясцовыя прадукты;
- ведаюць, дзе і як вырошчваюцца і выпрацоўваюцца прадукты харчавання, хто гэтым займаецца і якой цаной гэта адбываецца;
- спрыяюць рэгіянальнай устойлівасці: ствараюць эканамічныя структуры, якія падтрымліваюць біядынамічную мясцовую сельскую гаспадарку;
- маюць магчымасць атрымаць веды пра вытворчасць прадуктаў харчавання, а таксама пра догляд зямельнага надзелу.

**Вытворцы:**

- атрымліваюць магчымасць стабільнага планавання працы і падтрымкі з боку супольнасці;
- падзяляюць рызыку, якая спадарожнічае сельскагаспадарчай вытворчасці (прыкладам, дрэнны ўраджай праз пагодныя ўмовы);
- атрымліваюць гарантаваны прыбытак і, такім чынам, магчымасць прысвяціць сябе здаровай сельскай гаспадарцы;
- атрымліваюць дадатковыя магчымасці для сваёй працы: прыкладам, ужыванне перадавой сельскагаспадарчай практыкі, што не заўсёды магчыма ва ўмовах рынкавых абмежаванняў; эксперыментальныя формы апрацоўкі і павышэнне ўрадлівасці глебы;
- атрымліваюць большае задавальненне ад сваёй працы, таму што ведаюць, для каго гатуюць ежу;
- атрымліваюць больш магчымасцяў фарміравання штодзённага працоўнага жыцця і структуры працы, якія дазваляюць мець больш вольнага часу і водпуск.

**Суполка салідарнай гаспадаркі:**

- абарона ад змен на рынку;
- перапрацоўка прадуктаў, якія па рынкавых стандартах звычайна трапляюць у смецце. Салідарная гаспадарка павялічвае дасведчанасць спажыўцоў;
- падтрымка біяразнастайнасці (прыкладам, рэдкая гародніна, пароды жывёлы, якія знікаюць).

**Рэгіён:**

- можа стаць месцам з больш высокай якасцю жыцця дзякуючы разнастайнасці ў сельскай гаспадарцы;
- ідэі для далейшых праектаў дзякуючы арганізацыі сустрэч удзельнікаў суполак (прыкладам, усталяванне пунктаў абмену навыкамі, мясцовых фермерскіх кафэ і г. д.);
- павышэнне эканамічнага стымулу для інвестыцый у рэгіёне.

**Прынцыпы салідарнай гаспадаркі:**

- **Грамадскае фінансаванне сельскай гаспадаркі і падзел ураджаю**, якія ўключае наступныя працэсы:

1. Спажывецкая супольнасць пакрывае ўсе выдаткі вытворцаў сельскай гаспадаркі на працягу вызначанага перыяду часу. У выніку асобны прадукт страчвае сваю цану, а рызыка вытворчасці падзяляецца паміж спажыўцамі і вытворцамі. Мэтай салідарнай гаспадаркі з'яўляецца стварэнне доўгатэрміновых адносін паміж вытворцамі і спажыўцамі.

2. Фінансавы бюджэт салідарнай сельскай гаспадаркі разлічаны на пакрыццё выдаткаў, а не на максімізацыю прыбытку.

3. Выраблены прадукты размяркоўваюцца паміж усімі спажыўцамі.

- **Прамыя дачыненні і ўцягненне спажыўцоў.**

Вытворцы і спажыўцы ўтвараюць эканамічную супольнасць, што робіць іх незалежнымі ад трэціх гандлёвых партнёраў. Прамыя сувязі паміж вытворцамі і спажыўцамі, а таксама спажыўцамі міжсобку робяцца магчымымі з дапамогай супольных дзеянняў, імпрэз і прасторы для сустрэч. Гэта падтрымлівае струмень інфармацыі і забяспечвае актыўны абмен думкамі. Спажыўцы таксама могуць браць удзел у вытворчым і арганізацыйным працэсе.

- **Празрыстасць гадавога бюджэту і метадаў гаспадаркі.**

Усе выдаткі сельскагаспадарчай вытворчасці, у прыватнасці стаўкі заработнай платы, выдаткі на інвестыцыі і рэзервы, робяцца празрыстымі для спажывецкай супольнасці. Калі аграі вытворца толькі часткова дзейнічае салідарна, гэта трэба будзе паведаміць спажыўцам. Гэта таксама тычыцца метадаў сельскагаспадарчай вытворчасці і выкарыстання прыродных рэсурсаў.

- **Устойлівая сельскагаспадарчая практыка.**

Сельская гаспадарка актыўна спрыяе захаванню біялагічнай разнастайнасці, стварэнню гумусу і абароне глебы і вады. Ні генетычна мадыфікаванае насенне, ні генетычна мадыфікаваныя кармы не выкарыстоўваюцца салідарнымі гаспадаркамі. Вытворчасць і перапрацоўка прадуктаў харчавання галоўным чынам з'яўляюцца рэгіянальнымі.

- **Сацыяльная абарона вытворцаў і добрыя ўмовы працы.**

Метад салідарнай гаспадаркі гарантуе фінансавую і сацыяльную абарону вытворцаў. Гэта ўключае, у прыватнасці, выплату дадатковай ўзнагароды ў залежнасці ад патрэб і пенсійнае забеспячэнне. Выконваюцца нормы працоўнага заканадаўства і аховы працы.

- **Павага паміж удзельнікамі.**

Гэты тып супрацоўніцтва стварае грунт для паважлівых адносін паміж удзельнікамі. Праца вытворцаў ацэньваецца як каштоўнасць для грамадства, а іх досвед у сельскагаспадарчай вытворчасці складае

грунт для біяразнастайнай і ўстойлівай сельскай гаспадаркі.

**Прыклад салідарнай кааперацыі[24].**

Кампанія Solidarity Agriculture Bonn/Rhein-Sieg e.V. займаецца вырошчваннем шырокага спектра гародніны з 2013 года, а з 2020 года зарэгістравана як асацыяцыя ў перадгор'ях рэгіёна Бонаб, які вызначаецца выдатнымі глебамі і добрай транспартнай інфраструктурай паміж Бонам і Кёльнам. Асацыяцыя мае сертыфікат Bioland. Вырошчваюцца амаль 240 гатункаў гародніны на плошчы 2 га і ў трох цяпліцах (550 м). Апроч таго, каля 1 га адведзена пад сідэраты.

Мэта асацыяцыі — эфектыўна ўкараняць рэгенерацыйную сельскую гаспадарку, працаваць з улікам клімату і ствараць аграэкасістэму з высокай біяразнастайнасцю. Каманда з шасці раўнапраўных супрацоўнікаў арганізавана як калектыў, у якім кожны бярэ на сябе пэўныя абавязкі і важныя рашэнні прымаюцца разам. Вытворцы рэгулярна атрымліваюць падтрымку ад спажыўцоў у зборы ўраджаю, а часам і ў іншых справах.

Вытворцы працуюць экалагічна і сертыфікаваныя згодна з нормамі сертыфікацыі Bioland. Сертыфікат Bioland вызначае прадукты харчавання, якія былі выраблены і правераны ў адпаведнасці з заканадаўствам ЕС пра арганічную сельскую гаспадарку. Гэтыя агульнаеўрапейскія прававыя нормы гарантуюць адзіныя стандарты арганічнага земляробства. Асацыяцыя Solidarity Agriculture Bonn/Rhein-Sieg e.V. імкнецца вырошчваць расліны рэгенерацыйным шляхам, усё часцей выкарыстоўваючы элементы пермакультуры.

240 удзельнікаў асацыяцыі (спажыўцы і вытворцы) знаходзяцца ў беспераппынным дыялогу праз прамыя кантакты і шматлікія мерапрыемствы. Спажыўцы актыўна бяруць удзел у селькагаспадарчай працы і дапамагаюць вытворцам.




Малюнак 21. Сезонныя прапановы кампаніі Solidarity Agriculture Bonn/Rhein-Sieg e.V

**«Вёска будучыні»: вызначэнне тыпаў вясковага развіцця паводле даследаванняў Інстытута будучыні ў Берліне (Zukunftsinstitut)**

Што такое Істытут будучыні. Інстытут будучыні ў Берліне, што ўзначальваецца Стэфанам Цьюсам і Гары Гатэрэрам, абвяшчае новае вымярэнне тэндэнцый і будучых даследаванняў. Гэтае новае сучаснае даследаванне будучыні ўяўляе сабою эмпірычна абгрунтаваную міждысцыплінарную вобласць даследаванняў, заснаваную на зборы і аналізе дадзеных. На падставе ўлас-

24 Крыніца: http://www.solawi-bonn.de/

ных добра абгрунтаваных метадаў, Інстытут будучыні расшыфроўвае доўгатэрміновыя тэндэнцыі і даследуе будучыя распрацоўкі. Грунтуючыся на гэтым, выводзяцца пэўныя, мэтанакіраваныя рэкамендацыі для кампаній.

### «Вёска будучыні». Тыпізацыя

Да XX стагоддзя сельскае жыццё было не ладам жыцця, а эканамічнай формай. У вёсцы жыццё і праца — то бок земляробства — былі цесна пераплецены. Прыродная ідылія і запаволенне былі другараднымі. Што мела значэнне, то гэта кароткія адлегласці да лесу і палёў. Але хуткія змены ў сельскагаспадарчым сектары радыкальна змянілі сельскае жыццё. Хоць у 1900 годзе ў сельскай гаспадарцы ўсё яшчэ было занята амаль 40 адсоткаў працоўнай сілы, сёння ў Германіі ў цэлым гэта лічба складае меней за 2 адсоткі. Вёска развіваецца і пераўтвараецца ў месца для адпачынку, працы і каапераціі. Інстытут будучыні вызначае 6 тыпаў вёскі, якія маюць ужо сёння вялікую ролю для вясковай перспектывы.

### Тып 1: Вёска даўншыфтынгу

Вёска Герсвальдэ месціцца паміж Прэнцлау і Тэмплінам, куды лёгка дабрацца з Берліна. У апошнія гады гэта месца стала ўпадабаным сярод аматараў вясковай эстэтыкі і натуральнай рамантыкі. Першакласнае месца для даўншыфтынгу, да якога лёгка даехаць на машыне з вялікага горада, але пры гэтым яно радыкальна кантрастуе з гарадскім жыццём. Тут усё ідзе спакайней, павольней. Сюды можа прыйсці кожны, хто шукае сапраўднага запаволення. Маляўнічы сад, што плаўна пераходзіць у казачны лес, з'яўляецца галоўнай выбітнасцю месца.

Герсвальдэ — заканадаўца моды, узорны прыклад хуткага і кароткачасовага пераходу ад гарадскога спосабу жыцця да вясковага. Такія вёскі могуць выглядаць як малюнкі з кніжкі, але гэта не значыць, што на іх прайшла мода і такі тып адпачынку састарэў. Яны касмапалітычныя і нават крыху фешэнебельныя, нават калі жыхары і не хочуць гэтага прызнаваць.

### Тып 2: Творчы цэнтр

Тут сустракаюцца індывідуалісты з вельмі асаблівымі ўяўленнямі пра тое, як яны хочуць рэалізаваць сябе. Воля, якую прапануе ім вёска, з'яўляецца вырашальным фактарам прыцягнення для стомленых ад горада творчых працаўнікоў, якія сапраўды могуць займацца сваёй прафесіяй — ці сваім пакліканнем — дзе хочаш. Нядзіва, што творчыя цэнтры фармуюцца не на самай далёкай перыферыі, а хутчэй паблізу буйных гарадоў. Характарыстыкамі гэтага творчага ладу жыцця і стылю працы з'яўляюцца ўмовы жыцця, якія ад пачатку ўлічваюць каворкінг і прызначаны для супольнага жыцця і працы з фрылансерамі і працаўнікамі праектаў. Уся вёска як творчы цэнтр з'яўляецца сеткавым рэсурсам.

Шмат якія з гэтых сетак нават ствараюць асобныя формы каапераціі для працы, прыкладам, кааператыў Freiraumkooperative з Араніенбурга, які займаецца ініцыяван-

нем кааператыўных жыллёвых праектаў у Брандэнбургу і Берліне. Ён набыў будынак на вёсцы, які ў часы ГДР выкарыстоўваўся як жыллё для людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Але сёння тыя людзі жывуць у сучасных новых дамах, і будынак пуставаў. Кааператыў пераехаў разам з 22 дарослымі і дзесяццю дзецьмі і маладымі людзьмі пасля таго, як яны разам рамантавалі будынак цягам трох гадоў. Яны працягваюць працаваць разам і далей: «Мы разумеем працу як адданасць ідэі, заробак і прадпрымальніцтва. У нас ёсць сацыяльныя, экалагічныя, палітычныя і творчыя ідэі. Для іх мы знайшлі годнае месца, якое стала эксперыментальнай лабараторыяй для нашага эканамічнага росту, заснаванай на салідарнай эканоміцы, арыентаванай на агульную карысць».

### Тып 3: Муніцыпалітэт пачатковага ўзроўню

Сённяшнія дабрадзеі – гэта не ўцекачы ад цывілізацыі, не пустэльнікі, а інаватары: яны супрацьстаяць несправядлівасці, непажаданым для грамадства падзеям і будучым праблемам, закасваючы рукавы і рэалізуючы дальнабачныя контрпрапановы. Перавага візіянераў: іх шмат – і яны ўжо не проста тагасветныя хіпі, а выхадцы з самых розных сацыяльных ніш. Гэта супольнасць з высокімі маральнымі стандартамі. Палітычны ўдзел і базавая дэмакратыя складаюць грунт іх ладу жыцця, роўна як і прынцып самазабеспячэння ўсім неабходным для жыцця. Побач з Крэсбергам у раёне Швебіш-Халь заснавалі пасёлак 160 чалавек – сталых, моладзі і дзяцей. Яны жывуць у невялікім мястэчку з трэйлераў і юртаў, які на 95 адсоткаў забяспечвае сам сябе за кошт арганічнай сельскай гаспадаркі. Для іх утапічнае грамадства – не абстрактны ідэал, а жывая рэальнасць.

### Тып 4: Арганічны аазіс

Не кожны павінны быць самадастатковым – менавіта таму некалькі ізаляваных і невялікіх арганічных ферм у Федэрацыйнай Рэспубліцы пераўтварыліся ў цэнтры з памерам у цэлую вёску. Гэта арганічныя аазісы, у якіх задавальняецца попыт на здаровую, устойліва вырашчаную і сабраную сельскагаспадарчую прадукцыю, які пастаянна расце. Самыя строгія стандарты з'яўляюцца прынцыпам іх вытворчасці. Гэтыя фермы выпрабляюць прадукты з сертыфікатам Demeter, якія сёння сталі незаменнай часткай добра ўкамплектаваных паліц супермаркетаў. Імя Demeter азначае асабліва цэльную і бескампрамісную сельскую гаспадарку: увесь бізнес павінен кіравацца ўстойліва, ад поля да хлява.

Забеспячэнне гарадскіх тэрыторый прадуктамі таксама з'яўляецца адной з асноўных задач арганічных аазісаў. Прыкладам, недалёка ад Франкфурта-на-Майне ў вясковай грамадзе Дотэнфельдэрхоф працуе больш за 100 чалавек. Сыр, хлеб, хлебабулачныя вырабы: у фермерскай краме пададзены шырокі асартымент экалагічна чыстых прадуктаў

уласнай вытворчасці. Дотэнфельдэрхоф, званы Доці, таксама з'яўляецца рэгіянальным цэнтрам жыцця, навучання і даследаванняў. Вытворчасць, перапрацоўка і продаж прадуктаў харчавання тут дагэтуль успрымаюцца як сапраўднае рамяство, якому навучаюць у дзяржаўнай сельскагаспадарчай школе.

### Тып 5: Вёска здароўя

Прыток маладых творчых людзей і сем'яў змяняе розныя рэгіёны сельскай мясцовасці па-рознаму. Маладыя людзі не прыязджаюць паўсюль у такой вялікай колькасці, каб змяніць у адваротны бок ці хаця б памякчыць дэмаграфічную тэндэнцыю да старэння. Але гэта не павінна быць праблемай, таму што ўчорашнія пажылыя людзі сёння з'яўляюцца тымі, якія прагнуць прыгод і з'яўляюцца актыўнымі ўдзельнікамі сучаснасці. Добрая прафілактычная і аздараўленчая інфраструктура з'яўляецца перадумовай такога актыўнага ладу жыцця. Вось чаму ўсё больш і больш вёсак сістэматычнаператвараюцца ў невялікія цэнтры здароўя — вёскі здароўя, якія паслядоўна арыентаваны на забеспячэнне жыццёвага камфорту пажылога насельніцтва.

Вёска Хогеві у Нідэрландах паказала, што гэта магчыма. Яна з'яўляецца першай у свеце вёскай людзей з дэменцыяй. Тут створана адмыслова распрацаванае асяроддзе для людзей з кагнітыўнымі парушэннямі. Гэта вёска стала прыкладам: такія селішчы будуюцца па ўсёй Германіі з 2014 года. Не кожную вёску можна разглядаць як функцыянальную вёску здароўя. Некаторыя мястэчкі здароўя спраектаваны як «разумныя вёскі», у якіх здароўе і дабрабыт жыхароў лічбава рэгіструюцца і потым аналізуюцца медыкамі. Адным з прыкладаў з'яўляецца праект DIGI-ORT (для «Лічбавай вёскі здароўя Верхні Родахталь», акруга Кронах) Інстытута інтэгральных схем Фраўнгофера.

### Тып 6: Энергетычная вёска

Цэльныя канцэпцыі з'яўляюцца стандартам будучыні не толькі калі гаворка ідзе пра здароўе, але і калі гаворка ідзе пра ўстойлівае энергазабеспячэнне: «Што было для нас важна, дык гэта цэльны падыход, які, з аднаго боку, раскрывае мясцовы патэнцыял вытворчасці і спажывання і, з іншага боку, дазваляе мясцоваму насельніцтву атрымаць эканамічную выгаду ад удзелу ў праектах», — кажа Бертольд Меер, былы мэр энергетычнай біявёскі Болевік у зямлі Мекленбург. Сонечныя фермы па ўсёй краіне ўжо даўно фармуюць выяву сельскіх ландшафтаў — прыкладам, у Менгсбергу ў Гесене ёсць 3000 квадратных метраў сонечных калектараў — і тэма цяпла таксама ўсё часцей стаіць у цэнтры ўвагі. У энергетычных вёсках, такіх як Болевік, цяпло з'яўляецца пабочным прадуктам мясцовых ферм і падводзіцца ў хатнія гаспадаркі праз сучасны кацельны цэнтр. Бертольд Меер рэзюмуе: «Для нас мясцовая цеплавая сетка на базе біяэнергетыкі стала крокам да незалежнасці, што ў той жа час павялічвае дададзеную вартасць жыцця ў рэгіёне».

# Частка VI

# Агратурызм, мясцовыя фэсты і святы

## § 13. Агратурызм, мясцовыя фэсты, турыстычныя дэстынацыі і кластары, устойлівы турызм

Калі ты, паважаны вясковы гаспадар ці гаспадыня, паглядзеўшы на назву гэтага параграфа, падумаеш, што гэта не для цябе, што ты не збіраешся прымаць на сваёй гаспадарцы турыстаў — не спяшайся з канчатковым рашэннем. Мы чулі шмат падобных заяў, але ж урэшце многія з тых, хто не збіраўся гэта рабіць, усё ж прымалі рашэнне аб неабходнасці хоць часткова заняцца гэтай справай.

Адно з першых маіх знаёмстваў з агратурызмам было ў Польшчы, куды мы ў пачатку 2000-ных ездзілі з мэтай вывучэння польскага досведу аграэкатурызму. Запомнілася знаёмства з паняй Зосяй з вёскі Белавежа, што ля польскага краю Белавежскай пушчы, якая спачатку таксама не хацела і слухаць пра тое, каб прымаць турыстаў.

З гісторыі пані Зосі. «Калі б хто раней мне сказаў, што я прымаць турыстаў буду — то ніколі б не паверыла, бо зусім мы не хацелі гэтым займацца і не планавалі». Яны з мужам якраз будавалі новую хату на ўскрайку пушчы, каб весці, так бы мовіць, традыцыйную гаспадарку. «І аднойчы сусед да нас прыйшоў і просіць: вазьміце на пастой пару чалавек на тыдзень. Яны фатографы — вам дакучаць не будуць, як з раніцы сыдуць у лес, дык толькі позна будуць вяртацца». «Не-не», — спачатку адмаўлялі мы. Тым больш, што хата была яшчэ не дабудаваная, умовы для гасцей не самыя добрыя. Але ж сусед настойваў і прасіў: «Я б сам прыняў, але ў мяне ўжо месца няма, а для гэтых ну ніякіх асабіста добрых умоў не трэба — людзі без асаблівых прэтэнзій». «Ну мы і пагадзіліся, – расказвала далей пані Зося. — Але ўсё ж самі перайшлі ў недабудаваны пакой, а гасцям далі лепшы. Пабылі яны, то й праўда, што клопату асаблівага не было. А з'ехалі — глядзім: грошы немаленькія нам пакінулі. А нам якраз трэба было на скканчэнне будаўніцтва. Ну і тады ўжо мы на гэта па-іншаму глядзець пачалі. Суседу сказалі: «Давай, прапаноўвай у наступны раз — будзем сяліць. Ну і справа пайшла». На той момант, калі мы пазнаёміліся з паняй Зосяй, у яе ўжо была «раскручаная» агратурыстычная сядзіба: пакоі для турыстаў у доме, рэкламныя візітоўкі, пастаянныя кліенты. А яшчэ гаспадары паўдзельнічалі ў адным праекце па падтрымцы аргатурызму, дзе ім можна было атрымаць да 20 тысяч еўра ў тым выпадку, калі такую ж самую суму яны самі выдаткуюць на праект. У выніку яны пабудавалі асобны гасцявы дом і ўжо тэма агратурызму стала адной з галоўных і прыбытковых у іх дзейнасці.

Па-рознаму ідуць справы ў тых, хто займаецца агратурызмам. Як і ў любым бізнесе, тут ёсць і лідары, і аўтсайдары, ёсць вельмі паспяховыя, а нека-

торыя спынілі такую дзейнасць. Агулам, паводле інфармацыі з афіцыйнага сайта Рэспублікі Беларусь[25], зараз у краіне 2900 аграturыстычных сядзіб. Яны вельмі разнастайныя — ад традыцыйных беларускіх хатак у лясных гушчарах, да амаль што многазоркавых гатэляў побач з вялікімі гарадамі. На ўвесь свет славяць Беларусь гасціннасць гаспадароў аграturыстычных сядзіб, смачныя народныя стравы і напоі, мясцовы фальклор і гісторыка-культурныя «перліны», прыгажосць прыроды: лясоў і лугоў, рэк і азёр. Сапраўдным скарбамі беларускай зямлі з'яўляюцца народныя абрады, танцы, гульні, рамёствы, мясцовыя святы. Гэта проста невычэрпныя багацці. І, як кажуць, грэх гэтым не скарыстацца. У тым ліку праз занятак аграturызмам.

Індывідуальны прадпрымальнік Іван Мацюк развівае аграturыстычную сядзібу «Паланэз» у вёсцы Залессе, звязанай з лёсам кампазітара Міхала Клеафаса Агінскага. Спадар Мацюк пераехаў туды з Маладзечна. "Прыехалі ў вясковую мясцовасць і падумалі: чым бы заняцца?». І адказ прыйшоў вельмі хутка, таму што з яго слоў: «Сама мясцовасць прапанавала нам магчымасці».

Такія магчымасці ёсць паўсюль, бо тыя, хто едуць адпачываць у вёску, у першую чаргу шукаюць цішыню, свежае паветра, хочуць пабыць сам-насам з прыродай, паесці простую ежу, адпачыць. А гэта ўсё ёсць у кожнай вёсцы. Тым больш, калі ў вас яшчэ ёсць прысядзібная гаспадарка, сезонная (арганічная, без хіміі!) садавіна-гародніна, свае ці суседскія малако, тварог, яйкі, мёд. Турысты з задавальненнем п'юць гарбату з зёлак, сабраных на мясцовых лугах. Яны дадаткова заплацяць вам за экскурсію на мясцовае балота ці за цікавае «ціхае паляванне» — паход у грыбы. А магчымыя яшчэ майстар-класы па выпечцы хлеба, гатаванні традыцыйных страў і напояў, па розных рамёствах.

Гэтыя прыклады — толькі маленькая макаўка вялізэзнага айсбергу магчымасцей для аграturызму і іншых відаў бізнесу ў вясковай Беларусі. Іншыя прыклады цікавых і нават брэндавых беларускіх прадуктаў і паслуг многа яшчэ дзе раскіданыя па гэтым «Дапаможніку». Чытай уважліва!

Зараз у многіх краінах свету трэндам становіцца адукацыйны вясковы турызм. Гэта калі турысты едуць у вёску не толькі адпачыць, а ў першую чаргу павучыцца новай справе, прайсці курсы, пераняць навыкі новага рамяства. Многія аграturыстычныя сядзібы прапануюць правядзенне семінараў і ўрокаў па ахове прыроды, экалогіі, біяразнастайнасці, правах жывёл, абсталёўваюць экалагічныя «зялёныя» сцяжынкі, хатнія этнаграфічныя музеі, арганізуюць курсы па арганічнай сельскай гаспадарцы і пермакультуры.

[25] Крыніца: https://www.belarus.by/ru/travel/agritourism-in-belarus

Міхаіл Захаранка з жонкай Людмілай на сваёй аграэкатурыстычнай сядзібе «Экалэнд», што ў вёсцы Новы Двор пад Мінскам, аб'ядноўвае арганічнае земляробства, выраб гарбаты з гаючых зёлак, вырошчванне слімакоў і трусоў, заалагічны гатэль, занятак кавальскім рамяством з экалагічнай адукацыяй школьнікаў. «Спачатку мы прымалі на начлег гасцей, праводзілі розныя мерапрыемствы — банкеты, вяселлі, юбілеі, карпаратывы, — успамінае Міхаіл. - Але гэты від дзейнасці не прыносіў нам вялікай радасці і не даваў магчымасці раскрыць свой патэнцыял. Таму мы сталі актыўна вывучаць тэму экалогіі, а потым адкрылі свой інтэрактыўны экалагічны цэнтр. Сёння гэта асноўны кірунак дзейнасці нашай аграсядзібы». Школьныя групы ахвотна прыязджаюць да іх, праходзяць праз навучальны лабірынт-музей з казачнымі героямі, каштуюць гарбату, удзельнічаюць у экалагічных конкурсах і падсілкоўваюцца пазітывам. «Мы не вучым, — кажа Міхаіл, — а гаворым аб каштоўнасцях, узаемаадносінах чалавека з навакольным светам. Гэта добры дыялог аб важных для чалавецтва рэчах, аб тым, як уладкаваная планета і што яе неабходна берагчы».

Нярэдка менавіта агратурыстычныя сядзібы становяцца піянерамі экалагічнага земляробства ці яны ўзнікаюць там, дзе людзі ўжо здаўна звярталі ўвагу на здаровую ежу і стараліся абыходзіцца без шкоднай хіміі ў сваім садзе-гародзе, жылі ў ладзе з глебай і яе насельнікамі. Сягоння турысты ў большасці аддаюць перавагу не проста смачнаму харчаванню, а выбіраюць ежу натуральную, якасную і карысную, і гэты чыннік становіцца ўсё больш важкім пры прыняцці рашэння аб месце адпачынку. Кемлівыя гаспадары агратурыстычных сядзіб рэагуюць на гэты трэнд і выбіраюць экалагічнае земляробства. Яны адмаўляюцца ад падыходу «ўраджай любой цаной» і арыентуюцца на канкрэтны попыт кліентаў, якія выбіраюць хатнюю ежу з прадуктаў з вясковай сядзібы.

Калі нашы аргументы дасюль не надта пераканалі вас, паважаны вясковы гаспадар ці гаспадыня, што варта заняцца вясковым турызмам, то наступны прыклад можа ўсё ж падштурхнуць вас да новага пачыну.

У Англіі мы завіталі на мясцовую ферму, дзе асноўным бізнесам было вырошчванне бычкоў. Але наш новы знаёмы фермер расказаў, што ён не абмяжоўваецца гэтым заняткам. Да Калядаў у гаспадарцы вырошчваюць індыкоў пад заказ для мясцовых жыхароў. Есць і свой гарод, зеляніну з якога рэалізуюць праз тутэйшую вясковую краму-кааператыў. Заўважылі мы на тэрыторыі фермы і невялічкую хатку, пабудаваную ў традыцыйным стылі з дахам з трыснягу. «А гэты домік мы час ад часу здаём турыстам», — расказаў гаспадар. — Дадатковы даход не пашкодзіць». І дадаў: «І яшчэ тут недалёка ладзім сумесны фэст, на які прыязджае многа аматараў, і для іх мы выдзелілі пляцоўку, дзе госці могуць паставіць намёты і пераначаваць. Вядома, не бясплатна».

Так агратурызм можа быць не толькі дадатковым заняткам вясковых гаспадароў, але ж і заўважным унёскам у агульны бюджэт сядзібы.

У Беларусі заканадаўства абмяжоўвае пералік паслуг, якія суб'екты аграэкатурызму могуць аказваць аграэкатурыстам.

У адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 4 кастрычніка 2022 г. № 351 «Аб развіцці аграэкатурызму» суб'екты аграэкатурызму могуць аказваць аграэкатурыстам наступныя паслугі:

— азнаямленне з прыроднымі, сельскагаспадарчымі і архітэктурнымі аб'ектамі, нацыянальнымі традыцыямі адпаведнай мясцовасці;

— арэнда жылых пакояў у аграэкасядзібе для пражывання;

— забеспячэнне харчаваннем з выкарыстаннем сельскагаспадарчай прадукцыі, выробленай і (або) перапрацаванай на зямельных участках, выдзеленых суб'ектам аграэкатурызму;

— правядзенне прэзентацый, юбілеяў, банкетаў;

— аказанне паслуг лазняў, саўнаў і душавых;

— правядзенне майстар-класаў;

— катанне на жывёлах, за выключэннем дзікіх, і конным транспарце;

— транспартнае абслугоўванне;

— правядзенне спартыўна-масавых, фізкультурна-аздараўленчых і культурных мерапрыемстваў;

— арэнда інвентару для спорту і адпачынку.

Ну і, вядома, перад прыняццем рашэння аб тым, каб заняцца аказаннем паслуг у аграэкатурызме, трэба зрабіць фінансавыя падлікі. Вынік будзе залежаць ад рашэння райвыканкама, пакінуць суб'екту агратурызму старую сістэму выплаты падатку — адну базавую велічыню (БВ) у месяц (з 1 студзеня 2024 года — 40 рублёў) за кожную аграэкасядзібу ці давядзецца перайсці на прафдаход у памеры 10 % ад даходу з улікам узносу ў ФСАН — Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва.

Важна, што згодна з заканадаўствам «гасцявыя домікі» не ўключаюцца ў жыллёвы фонд, то бок аплату за святло, ваду і іншыя цэнтралізаваныя паслугі табе прыйдзецца рабіць па тарыфах для нежылых памяшканняў.

Тым, хто вырашыў заняцца агратурызмам, трэба прайсці і арганізацыйна-рэгістрацыйны этап. Каб лічыцца суб'ектам аграэкатурызму, уладальніку сядзібы важна выконваць пэўныя ўмовы: мець жылы дом у вёсцы ці ў малым горадзе (з насельніцтвам да 20 тысяч чалавек) з не больш як 10 пакоямі і зямельным участкам, асабістую падсобную гаспадарку або выбраляць і перапрацоўваць на тэрыторыі аграсядзібы сельскагаспадарчую прадукцыю, а таксама мець магчымасць знаёміць турыстаў з прыродай мясцовасці, архітэктурнымі аб'ектамі, нацыянальнымі традыцыямі. Таксама трэба атрымаць дазвол у райвыканкаме. Звычайна трэба звярнуцца ў службу «аднаго акна» з пісьмовай заявай. Разам з пісьмовай заявай фізічныя асобы і сельскагаспадарчыя арганізацыі даюць у пісьмовай форме згоду ўласніка (уласнікаў) жылога дома на выкарыстанне жылога дома для ажыццяўлення дзейнасці па аказанні паслуг у сферы аграэкатурызму. Спецыялісты службы «адно акно» самастойна запытаюць у вас дакументы і (або) звесткі, неабходныя

для ажыццяўлення адміністрацыйнай працэдуры. Потым у аграсядзібу будзе выязджаць камісія райвыканкама, якая будзе выдаваць заключэнне аб магчымасці адкрыцця аграсядзібы. Рашэнне аб дазволе на адкрыццё аграсядзібы або адмове ў адкрыцці прымаецца на працягу 30 каляндарных дзён з дня падачы заявы. Заяўнік інфармуецца шляхам накіравання копіі рашэння на працягу 5 працоўных дзён з дня прыняцця рашэння. У прынцыпе магчыма без вялікіх страт часу прайсці гэтую працэдуру і паспрабаваць сябе ў ролі гаспадара агратурыстычнай сядзібы. Поспехаў табе на гэтым шляху!

**Мясцовыя фэсты і святы** ўжо згадваліся сярод магчымых актыўнасцяў у межах аграэкатурызму. Патэнцыял у гэтай сферы значны, і многія вясковыя гаспадары могуць адчуць пазітыўныя эканамічныя эфекты ад яе праз продаж сваёй прадукцыі ці аказанне паслуг падчас фэстаў (успамінаецца, як на адным з фэстаў «Спораўскія сенакосы» мясцовы жыхар уладкаваў міні-майстэрню з шыльдай «Клёпаю касу» і да яго стаяла чарга ахвочых). Недарма ў гады Вялікага Княства Літоўскага адным з самых адчувальных вялікакняскіх прывілеяў для горада быў дазвол на дадатковы кірмаш. Сёння мясцовыя святы і фэсты таксама застаюцца распаўсюджанымі і эфектыўнымі інструментамі развіцця мясцовых тэрыторый па ўсім свеце. Калі такія падзеі адбываюцца ў вашай вёсцы ці мястэчку — смела далучайцеся, прапануйце свае прадукты і сэрвіс. Выгада будзе!

Калі ж пакуль такіх свят ці фэстаў у тваёй мясцовасці няма, ці яны можа некалі былі, але, як кажуць, сышлі ў нябыт, то варта падумаць над тым, каб аднавіць ці пачаць развіваць іх у сваім краі. Справу гэтую раім распачынаць са сваімі знаёмымі-аднадумцамі, суседзямі, мясцовым актывам. Заўсёды знойдуцца цікаўныя да гэтага, і вы разам здолееце дамагчыся поспеху.

На тэму аб вясковых фэстах, кірмашах і святах напісана многа, так што пашукайце-пачытайце, што кажуць эксперты і практыкі.



Наш практычны досвед і вынікі навуковых даследаванняў па гэтай тэме мы згрупавалі ў «25 рэцэптаў для мясцовых фэстаў»[26], якія могуць дапамагчы табе ў гэтай справе.

[26] Падрабязней гэтыя рэцэпты растлумачаныя ў выданні: Сивограков О., Зуев Е. Развитие предпринимательства в сельской местности в Республике Беларусь. Белая книга. – Минск, Экопартнерство, 2020. – 128 с. (https://kuna-sdg.de/wp-content/uploads/2023/11/Entwicklung-des-Unternehmentums-in-laendlichen-Gebieten-von-Belarus.pdf; https://dazzzen.wixsite.com/myzen/zen). Там таксама ты знойдзеш прыклады фестывальнай практыкі ў Беларусі і іншых краінах.

**25 рэцэптаў для мясцовых фэстаў**

**1. Не бойцеся пачынаць, не ўскладняйце.** Рэкамендацыі Нікола Свон (Nicola Swan), эксперта па ўстойлівым развіцці з Вялікабрытаніі, дырэктара Міжнароднай сельскай сеткі (International Rural Network), удзельнікам руху за ўстойлівае развіццё ў Беларусі: «Не бойцеся пачынаць арганізацыю фестываляў у вашай вёсцы, пасёлку, горадзе. Пачаць можна з вельмі простых дзеянняў. Так, збяруцца некалькі чалавек са сваімі сабакамі на паркавым лужку, задумаюць спаборніцтвы, арганізуюць пікнік, і тут жа выставяць таблічку «Першы міжнародны фестываль вясковых сабак у вёсцы Загор'е» (назва вёскі – умоўная). Тут жа будзе аб'яўлена дата правядзення наступнага фестывалю ў наступным годзе. А там, глядзіш – ужо і гледачоў, і ўдзельнікаў больш, і перасоўны кіёск з ахаладжальнымі напоямі падцягнуўся, і прадпрымальнікі прывезлі на продаж вырабы па «сабачай тэме».

**2. Не спрашчайце: пачынайце рыхтавацца загадзя.** Памятайце: «Удача любіць таго, хто падрыхтаваўся», таму загадзя збярыцеся разам, абмяркуйце і зафіксуйце (складайце пратакол) вашыя рашэнні, складзіце план падрыхтоўкі фестывалю. Гэта потым дапаможа вам. Тут можа таксама спатрэбіцца правядзенне SWOT-аналізу, каб выявіць моцныя і слабыя бакі, магчымасці і пагрозы ў сувязі з правядзеннем свята.

**3. Падыходзьце да фестывалю як да праекта.** Прыкіньце рэсурсныя магчымасці, замацуйце адказных за пункты плана, усталюйце канкрэтныя тэрміны выканання мерапрыемстваў.

**4. Выбірайце арыгінальную тэму.** Задача стаць заўважнымі на «фестывальнай карце» Беларусі павінна стаяць з самых першых крокаў вашага новага праекта. Арыентуйцеся на ўжо наяўных лідараў, якія "замацавалі" за сабой такія яркія вобразы, каларытныя беларускія словы. Гаворка пра такія практычна ўжо брэнды, як "прысмакі" (Моталь), "кола дзён" (Камарова), "бард-рыбалка" (Быхаў), "Завіруха" (фестываль гонак на сабачых запрэжках у Валожынскім раёне).

**5. Звязвайце назву з назвай мясцовасці, гістарычнымі падзеямі.** Так, на Зэльвеншчыне працягваюць традыцыі «Ганненскага кірмашу», у Залессі фестываль-кірмаш «Залессе запрашае сяброў» адразу зразумела куды, «Глушанскі хутарок» таксама абазначае сваё месцазнаходжанне.

**6. Думайце аб брэндынгу.** Аснова любога брэнду – гэта ўражанне. Успамін, які павязе з сабой турыст. Напамін пра гады росквіту вёскі для пажылога мясцовага жыхара. Арыгінальныя фотаздымкі для фотааматара і прафесіянала. «Пацяжэлы» гаманец для прадпрымальніка. «На Ганненскім кірмашы» ў Зэльве заўсёды нечаму здзівішся і адкрыеш для сябе нешта новае», – прыкладна так павінен думаць госць гэтага фестывалю. «Чакаю не дачакаюся наступных «Мотальскіх прысмакаў» – вось дзе сапраўды самабытнае і смачнае свята!» Такія ўражанні вельмі дапамагаюць

«раскрутцы» фестываляў. Арганізатары, пытайце гасцей пра іх уражанні і ўлічвайце іх ідэі пры арганізацыі наступных свят.

**7. Максімальна прыцягвайце насельніцтва і ўлады.**

**8. Запрашайце віп-персон.**

**9. Аддавайце максімальна «на водкуп» асабістай і калектыўнай творчасці ўдзельнікаў.** Самыя цікавыя ідэі нараджаюцца ўнутры мясцовай супольнасці. Дайце магчымасць людзям праявіць свае таленты, рэалізаваць творчы патэнцыял.

**10. Усталёўвайце пастаянную дату фестывалю.** У гэтым выпадку з'яўляецца вялікая магчымасць «прывязаць» патэнцыйнага ўдзельніка да мерапрыемства, загадзя ўключыўшы гэтую падзею ў жыццёвы каляндар чалавека.

**11. Вывучайце «канкурэнтаў»:** ці не супадае час, тэма, фарматы, «разыначкі».

Вывучыце каляндар вядомых фестываляў, звярніце ўвагу на найбліжэйшыя (па адлегласці і даце) да вашага, і, калі ёсць рызыкі «ўцечкі» кліентаў, унясіце карэктывы.

**12. Прадумайце варыянты правядзення свята на выпадак дрэннага надвор'я.** Збудаванне тэнтаў над сцэнамі, рэзервовыя пляцоўкі пад дахам для канцэртаў і танцаў, шатры і палаткі могуць саслужыць добрую службу ў выпадку непагадзі.

**13. Запрашайце суседзяў** (суседнія сельсаветы, раёны, прадпрыемствы, установы культуры). Гэта можа істотна ўзбагаціць ваша свята, пашырыць спектр паслуг і тавараў, што рэалізуюцца, унесці новыя ноткі ў афармленне элементаў фестывалю.

**14. Не перабярыце з афіцыйнай часткай.** Свята або фестываль — гэта ўсё-ткі больш свабоднае баўленне часу, чым сядзенне гадзінамі перад афіцыйнымі аратарамі.

15. Больш уключайце дзеянняў у фестывалі і святы, рабіце іх інтэрактыўнымі. Цудоўна, калі майстар сам на вачах у людзей выпрабляе і прадае свой тавар. А яшчэ лепш — калі залучае ў працэс наведвальнікаў, турыстаў.

**16. Дайце пляцоўку моладзі, вылучыце месца для дзяцей.**

**17. Выкарыстоўвайце патэнцыял грамадскіх саветаў і некамерцыйных арганізацый, прыцягвайце бізнес.** Наяўныя ў вашай мясцовасці некамерцыйныя арганізацыі, а таксама грамадскія саветы па ўстойлівым развіцці, па развіцці турызму і прадпрымальніцтва — вельмі важныя суарганізатары фестываляў. Калі ж такіх пакуль няма — падумайце аб іх стварэнні.

18. Выкарыстоўвайце валанцёраў. Гэта тычыцца як уласнай (мясцовай) моладзі — школьнікаў ці студэнтаў на канікулах, так і знешніх — з розных беларускіх і замежных валанцёрскіх арганізацый. Часта такія арганізацыі шукаюць цікавыя магчымасці для прыкладання сваёй працы і крэатыўнасці. Шукайце іх праз Інтэрнэт, даведвайцеся ў калег, звяртайцеся ў буйныя грамадскія арганізацыі і — запрашайце.

**19. Не забудзьцеся запрасіць выхадцаў з вашай мясцовасці.**

**20. Вучыцеся: чытайце, удзельнічайце, прыцягвайце экспертаў, райцеся з "бывалымі".**

**21. Укараняйце прынцыпы ўстойлівага развіцця і элементы "зялёнай эканомікі".** Арганізатары «ўстойлівых» фэстаў рэкамендуюць паступова, але настойліва ўкараняць устойлівыя практыкі ў фестывальную справу: «Вазьміцеся спачатку за нешта адно. Напрыклад, смецце. І прапрацуйце гэтае пытанне вельмі старанна, так, каб усе зразумелі сур'ёзнасць вашых намераў. Тады справа пойдзе і з іншымі пачынаннямі».

**22. Фіксуйце гісторыю вашых фестываляў.** Захоўвайце фотаматэрыялы аб фестывалях, экспанаты, якія (хто ведае?), можа быць, зоймуць свае месца ў музеях. І гэта таксама будзе працаваць на прывабнасць вашай мясцовасці.

**23. Рэкламуйце фестываль праз Інтэрнэт.** Нават калі здаецца, што спачатку гэта не трэба. Насамрэч большасць вашых патэнцыйных кліентаў шукаюць такую інфармацыю менавіта праз Інтэрнэт.

**24. Не адчайвайцеся, калі поспех прыходзіць не адразу.** Няўдача — таксама каштоўны вопыт. А ў кітайскай мове, кажуць, іерогліф «праблема» адначасова азначае і «магчымасць». Так што з новымі сіламі — да перамог!

**25. Максімальна камерцыялізуйце ваш фестываль** (працуйце над атрыманнем прыбытку). Пры гэтым сітуацыя становіцца яшчэ больш стабільнай у выпадку, калі пры арганізацыі фестывалю яго адразу пачынаюць разглядаць і як бізнес (разам з сацыяльнымі і экалагічнымі эфектамі).

Спадзяёмся, што дзякуючы гэтым рэцэптам, ты «зварыш» добры «святочны суп»! Смачна есці-святкаваць!

Магчымая стратэгічная перспектыва развіцця аграэкатурызму, мясцовых фэстаў і лакальных прадуктаў і паслуг — стварэнне-«раскрутка» турыстычнай дэстынацыі. Спачатку ў маштабах сваёй вобласці, потым — у нацыянальным маштабе, а далей — глядзіш, і ў міжнародным.




**Турыстычная дэстынацыя** — гэта месца, тэрыторыя, дзе прапануецца комплекс арыентаваных на турыстаў прадуктаў, паслуг, цікавостак, славутасцяў, якія забяспечваюць турыстычныя ўражанні для асобных людзей і груп, што падарожнічаюць удалечыні ад свайго дома ці паселішча. З другога боку — гэта горад, мястэчка, вёска, ці іншая тэрыторыя, якая ў значнай ступені залежыць ад даходаў ад турызму, бо прадаюцца як месцы для наведвання турыстамі.

Твая агратурыстычная ініцыятыва ці сумесна арганізаваны мясцовы фэст могуць стаць пачаткам, пунктам крышталізацыі, вакол якіх потым можа ўзнікнуць заўважная на мапе Беларусі турыстычная дэстынацыя. Мроя можа стаць рэальнасцю.

Стварэнне кластара агратурызму — адзін з найбольш перспектыўных напрамкаў развіцця гэтай дзейнасці; ён добра зарэкамендаваў сябе ў многіх краінах свету.

**Турыстычны кластар** — гэта група вылучаных турыстычных аб'ектаў на абмежаванай геаграфічнай тэрыторыі з сацыяльнай і арганізацыйнай згуртаванасцю, сувязямі паміж вытворчымі ланцужкамі і мясцовым патэнцыялам, а таксама з агульным сеткавым кіраваннем, якія забяспечваюць іх вышэйшую канкурэнтаздольнасць.



Першыя крокі па стварэнні агратурыстычнага кластара ў тваёй мясцовасці — гэта знаёмства з іншымі гаспадарамі агратурыстычных сядзіб, іншымі бізнесамі і арганізацыямі, якія размешчаны недалёка і могуць стаць звёнамі эфектыўнага ланцужка-маршруту для турыстаў. Гэтым можна заняцца ўжо на першым этапе развіцця сваёй «агратурыстыкі», як называюць гэту з'яву ў Польшчы.

Пазнаёмся з прыкладамі турыстычных кластараў з Інтэрнэту, звярні ўвагу на распрацоўкі нашага земляка Анатоля Касьяненкі — навукоўца і выкладчыка, які адным з першых у Беларусі не толькі даследаваў гэтую тэму, але і актыўна садзейнічаў яе развіццю праз мясцовыя і міжнародныя праекты.

Ужо згаданы раней Міхась Захаранка з агратурыстычнай сядзібы «Экалэнд» таксама ўбачыў у кластары прывабныя рысы. Каб прыцягнуць больш кліентаў-наведвальнікаў, ён разам з калегамі распрацаваў экалагічны турыстычна-экскурсійны маршрут, вакол якога яны пачалі стварэнне кластара, развіццё ўзаемадзеяння з гаспадарамі іншых сядзіб. Праца па стварэнні кластара вывела аднадумцаў на вывучэнне гістарычнай спадчыны іх мясцовасці, усталяваліся кантакты з супрацоўнікамі Геаграфічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Калі ты вырашыш сур'ёзна займацца аграэкатурызмам (хоць не абавязкова і ў значных маштабах), то раім звярнуць увагу на ўстойлівы турызм.

**Устойлівы турызм** — адзін з даволі новых тэрмінаў і сацыяльна-прыродна-эканамічных з'яў. Ён узнік у канцы 80-х гадоў XX стагоддзя як рэакцыя навукоўцаў і практыкаў на справаздачу Сусветнай камісіі ААН па навакольным асяроддзі і развіцці «Наша агульная будучыня», таксама вядомую як «Справаздача Брунтланд», бо яе ўзначальвала Гру Хар-

лем Брунтланд, былы прэм’ер-міністр Нарвегіі. Дзякуючы гэтай справаздачы паняцце «ўстойлівае развіццё» ўмацавалася ў міжнародным сацыяльна-палітычным парадку дня.

Згодна з Сусветнай турысцкай арганізацыяй (World Tourism Organization), **устойлівы турызм** — гэта «турызм, які ў поўнай меры ўлічвае яго цяперашнія і будучыя эканамічныя, сацыяльныя і экалагічныя наступствы, задавальняючы патрэбы наведвальнікаў, прамысловасці, навакольнага асяроддзя і прымаючых суполак».

У некаторых крыніцах ты зможаш сустрэць выкарыстанне гэтага тэрміна як сіноніма «зялёнага турызму», аднак гэта ўсё ж розныя тэрміны.

Сёння ўстойлівы турызм знаходзіцца ў цэнтры ўвагі як навуковых колаў, так і практыкі.

Аднойчы мы ўдзельнічалі ў праекце па стварэнні турыстычнага кластара па тэматыцы гісторыі Вялікага Княства Літоўскага і абагулілі прынцыпы ўстойлівага турызму ў невялікую таблічку (глядзі ніжэй).

**Прынцыпы ўстойлівага турызму**

1. Працуем разам, развіваем давер, надзейнасць, кааперацыю, міждысцыплінарныя сувязі, самакіраванне, актывізм, прагу да неадкладных дзеянняў.
2. Дамагаемся працаваць як збалансаваная прыродна-сацыяльна-эканамічная сістэма, у якой увага надаецца ўсім яе кампанентам і ўдзельнікам.
3. Захоўваем прыроду і спрыяем яе развіццю, падтрымліваем біяразнастайнасць.
4. Зберагаем гісторыка-культурную спадчыну, мясцовую сацыяльна-культурную разнастайнасць.
5. Рацыянальна выкарыстоўваем рэсурсы (энергію, ваду, прадукты, рэчы, фінансавыя рэсурсы, час).
6. Арыентуемся на экапрыязную вытворчасць, арганічную прадукцыю, цыркулярную эканоміку, пермакультуру, устойлівае спажыванне і ўстойлівую мабільнасць, кліматычную нейтральнасць.
7. Умацоўваем лакальнасць — грунтуемся на мясцовым патэнцыяле, развіваем мясцовыя брэнды, уцягваем супольнасць, садзейнічаем яе росквіту.
8. Вучымся на працягу ўсяго жыцця, удзельнічаем у адукацыйна-інфармацыйных мерапрыемствах, асвойваем досвед іншых, дзелімся сваім, укараняем інавацыі.
9. Камбінуем малыя справы са стратэгічным падыходам, арыентуемся на візію, выкарыстоўваем індыкатары, ажыццяўляем маніторынг вынікаў.
10. Забяспечваем інклюзіўнасць нашых паслуг, даступнасць іх для людзей з інваліднасцю і асаблівымі патрэбамі.
11. Надаём увагу моладзі: уцягваем моладзь у працу, прапануем асаблівыя турыстычныя прадукты і паслугі маладым людзям і дзецям.
12. Арыентуемся на ўнёсак у справу рэалізацыі Мэт устойлівага развіцця ААН.

З гэтымі прынцыпамі, як з компасам, які паказвае дарогу, можна будзе ісці ў патрэбным кірунку — да ўстойлівага развіцця сваёй сядзібы-гаспадаркі і мясцовай супольнасці.

## § 14. Фестывальная практыка ў кантэксце культурных узаемаадносін паміж агравытворцамі, мясцовым насельніцтвам і спажыўцамі

*«Свята падворку» як папулярны інструмент прасоўвання брэнду нямецкіх фермераў. «Фестываль насення» і іншыя культурна-сацыяльныя метады стварэння асабістай супольнасці агравытворцаў*

### 1. Вясковыя фэсты: асаблівасці і папулярныя падставы для правядзення

Вясковы фэст — гэта свята, арганізаванае жыхарамі вёскі для аднавяскоўцаў. Звычайна гэта рэгулярная падзея, што прываблівае размаітай праграмай па выходных, у шмат якіх выпадках суботах і нядзелях, часам нават з вечару пятніцы. Такі фэст таксама прываблівае наведнікаў з іншых вёсак і гарадоў.

Вясковы фэст звычайна працягваецца ўвесь дзень. Ёсць ежа і напоі, а таксама розныя мастацкія і культурныя мерапрыемствы. Не застаюцца без увагі праграмныя пункты і для наступнага пакалення.

Ёсць шмат прычын для правядзення вясковага свята. Тыповыя прыклады для Германіі:

- розныя юбілеі;
- фэсты, прысвечаныя порам года (прыкладам, Свята вясны, Дзень дзякавання і г. д.);
- адкрыццё новых арганізацый, кааператываў;
- фэсты з традыцыйным ці гістарычным мінулым;
- броварныя фэсты з нагоды разлівання піва;
- розныя святы;
- адкрыццё сезона палявання.

*Урывак з канцэпцыі вясковага свята вёскі Путцбрун у паўднёвай Германіі:*

**Ці патрэбна нам вясковае свята?**

Калі б вы задалі гэтае пытанне жыхарам Путцбруна, можна было б чакаць, што вы атрымаеце самыя размаітыя адказы і каментары.

Але калі справа даходзіць да галоўнага пытання пра тое, ці патрэбен Путцбруну вясковы фэст, большасць жыхароў далі бы станоўчы адказ.

Вядома, нельга сцвярджаць, што ў Путцбруне няма культурных і сацыяльных цэнтраў і падзей. Але гэтыя падзеі звычайна звязаны з пэўнай мэтай альбо для пэўнай групы насельніцтва.

У Путцбруне ў наш час няма свята, якое б прыцягвала ўсіх жыхароў маладых ці старых, актыўных ці не, новых жыхароў ці тых, што жывуць тут усё жыццё.

Гэта супольнае свята, арганізаванае жыхарамі Путцбруна для жыхароў Путцбруна.

Наша будучае вясковае свята не павінна быць копіяй падобных фэстаў суседніх грамад.

Але гэта і не павінна быць проста «павялічаная версія» таго, што ўжо выстаялася і добра вядома ў Путцбруне.

Наша будучае вясковае свята не з’яўляецца:
- камерцыйнай імпрэзай;
- гістарычным фэстам;
- вечарынай з нагоды інаўгурацыі;
- садовай вечарынай;

- святам падворка;
- рэлігійным святам;
- клубнай вечарынкай;
- гастранамічнай імпрэзай.

Мы рэалізуем тыя ідэі і пажаданні, якія мы, путцбрунеры, хочам і можам рэалізаваць.

Такім чынам, наша вясковае свята павінна:

- стаць «святам радасці» для ўсёй вёскі;
- святам, на якім жыхары сябе добра адчуваюць;
- святам гульняў і весялосці;
- даваць усім роўныя магчымасці для ўтульнай сустрэчы;
- узмацняць нашу вясковую ідэнтычнасць;
- дапамагаць заводзіць новыя кантакты;
- уключаць як мага больш жыхароў, усе ўстановы і асацыяцыі;
- быць распрацаваным, падтрыманым і рэалізаваным усёй грамадой.

Гэта свята, скіраванае на ўзмацненне пачуцця еднасці і супольнасці ў жыхароў Путцбрунера.

Парады для арганізацыі фестываляў

Спачатку павінен быць сфармаваны арганізацыйны камітэт, які рэгулярна сустракаецца за некалькі месяцаў да фэсту і збірае ідэі ды займаецца фінансаваннем.

Камітэт павінен складацца з некалькіх невялікіх груп. Прыкладам, адна група займаецца фінансамі, іншая арганізуе атракцыёны, трэцяя група прыдумляе дэвіз і арганізуе рэкламныя імпрэзы. Паколькі сельскае свята наўрад ці можна арганізаваць без валанцёраў, у аргкамітэце таксама павінна быць група, якая можа прывабіць іншых жыхароў для дапамогі.

*Урывак з канцэпцыі вясковага свята вёскі Путцбрун у паўднёвай Германіі:*

**Аргкамітэт**

Працоўная група па стварэнні канцэпцыі дае наступныя рэкамендацыі па падрыхтоўкі:

- Праца павінна быць размеркавана на «некалькі плячэй», то бок напрамкаў.
- Павінны быць створаны тэматычныя кірункі (лагістыка, фінансы, харчаванне, рэклама і г. д.).
- Тэматычныя вобласці павінны каардынавацца некалькімі адказнымі людзьмі.
- Рашэнні павінны быць прыняты і рэалізаваны.
- Патрэбна праводзіць рэгулярныя сустрэчы.
- Чым меншая тэматычная група, тым лягчэйшае і хутчэйшае каардынаванне.

Аднак пры фармаванні аргкамітэта паўстае праблема:

«Як клубы, групы і асобныя грамадзяне, якія не ўдзельнічаюць, будуць уключаны ў падрыхтоўку фэсту?»

Адказ:

Паводле дадзеных першага апытання, давайце пагаворым пра наступныя клубы і групы:

- Хор
- Клуб устойлівага развіцця
- Дом састарэлых
- Клуб хлопчыкаў
- Клуб нямецкай аўчаркі
- Пачатковая школа
- Дзіцячыя садкі
- Цэрквы
- Дачнае садовае таварыства
- Тэнісны клуб
- Клуб «Тайм-аўт»
- Клуб народнага танцу

Аргкамітэт павінен выглядаць наступным чынам:

- Прадстаўнік адміністрацыі: 1
- Прадстаўнік працоўнай групы вясковага фэсту: 4
- Прадстаўнікі клубаў і індывідуальных грамадзян: 4

Усяго 9 чалавек. Такі камітэт не павінен быць большым.

Арганізацыя фінансаў павінна пачынацца загадзя, каб можна было зрабіць адпаведныя разлікі. Вясковыя фэсты часта фінансуюцца за кошт агульных узносаў жыхароў у касу фэсту.

Часам можна знайсці і іншых буйных муніцыпальных ці прыватных донараў. Камітэт таксама можа падлічыць прыбыткі ад продажу кавы і піражных, а таксама прыбыткі ад кніжных і блышыных рынкаў.

У залежнасці ад фінансавых магчымасцяў плануецца:

- выступ артыстаў;
- жывая музыка;
- іншыя атракцыёны, напрыклад дзіцячыя.

***Каб захаваць характар вясковага свята і не ператварыць фэст у кірмаш, трэба запрашаць усе вясковыя арганізацыі і ініцыятывы, напрыклад, мясцовы хор, добраахвотную пажарную дапамогу ці спартыўныя клубы.***

**Планаванне праекта**

Наступным крокам павінна стаць распрацоўка плана. З аднаго боку, важна знайсці добры час для свята. Таксама патрабуе ўдакладнення пытанне пра тое, калі і дзе павінны адбыцца запланаваныя атракцыёны. Важныя таксама пытанні пра тое, якой адметнасцю павінна адкрыцца вясковае свята і чым яно павінна скончыцца. Прыкладам, ёсць магчымасць пачаць святочны сезон парадам ці царкоўнай службай, а скончыць яго феерверкам.

Адным з найважнейшых момантаў вясковага свята з'яўляюцца гастранамічныя прапановы. Зазвычай гэта простыя стравы, якія прапануюць у розных закусачных ці, прыкладам, фудтраках.

Санітарныя памяшканні і небяспека таксама з'яўляюцца абавязковай часткай арганізацыі. Звычайна яны бываюць у выглядзе туалетных прычэпаў. Карыстацца туалетамі таксама можна ў вясковых клубах ці спартыўных залах, у залежнасці ад таго, дзе праводзіцца фэст — вядома, патрэбна ўзгадніць гэта з адпаведнымі ўладальнікамі памяшканняў.

Небяспека таксама грае важную ролю на грамадскіх мерапрыемствах. Што да вясковых свят, то гэта насамперш нанятыя супрацоўнікі службаў бяспекі, якія, прыкладам, сочаць за тым, каб запасныя выха-

ды заставаліся вольнымі і г. д. Акрамя тыповых супрацоўнікаў бяспекі абавязкова запрашаецца хуткая дапамога.

Роля валанцёраў у вясковых фэстах вельмі значная. Яны могуць дапамагаць арганізатарам:

- гатаваць і прадаваць ежу;
- дапамагаць на стойцы з напоямі;
- прапаноўваць транспартныя паслугі;
- падарыць неграшовыя прызы для латарэі;
- арганізаваць блышыны рынак.

## Фэст вёскі і вясковая культура

Вясковая культура – што гэта?

У большасці грамадзян Германіі, пэўна што, спрадвечна культура асацыюецца з мастацтвам. Успамінаюцца складаныя культурныя імпрэзы, якія мы праводзім у гарадах. Гэта тэатры, канцэрты, выставы, бібліятэкі, а таксама кабарэ. Культура (лат. «colere» = клапаціцца, культываваць) часта разумеецца як прапанова вольнага часу, якой можна і трэба карыстацца.

Калі мы думаем пра культуру вёскі, мы схільныя думаць пра такія тэрміны, як культурны ландшафт, сялянскія традыцыі і святы ці будаўнічую культуру. Тут мы больш злучаем культуру з вынікамі штодзённай працы. Гэта падводзіць нас да істотнага адрознення, якое падкрэслівае тое, што адрознівае вясковую культуру ад гарадской: вясковая культура з'яўляецца хутчэй выразам актыўнага праектавання жыццёвага асяроддзя. Гэта актыўны лад жыцця вяскоўцаў у такіх сферах, як праца, адпачынак і грамадскае жыццё, ці карацей: ВЯСКОВАЯ КУЛЬТУРА – гэта актыўная культура, створаная жыхарамі вёскі, у адрозненне ад прапанаванай, пасіўнай культуры горада. Такім чынам, свята вёскі з'яўляецца адным з самых важных кампанентаў вясковай культуры.

## «Свята падворка» як папулярны інструмент прасоўвання брэнду нямецкіх фермераў.

*Інтэрв'ю з прафесарам Ахімам Шпілер – прафесарам кафедры «Маркетынг прадуктаў харчавання і сельскагаспадарчай прадукцыі» Гётынгенскага ўніверсітэта і старшынёй навукова-кансультацыйнай рады Федэральнага міністэрства харчавання і сельскай гаспадаркі па пытаннях сельскагаспадарчай палітыкі, харчавання і аховы здароўя.*

У інтэрв'ю agrarheute.com прафесар, доктар Ахім Шпілер з Гётынгенскага ўніверсітэта тлумачыць, якія перавагі маюць **«святы падворкаў»**, наколькі высокія выдаткі на аднаго ахопленага чалавека, чаго нельга выпускаць з увагі пры планаванні і якіх памылак трэба пазбягаць.

*Фермерскія святы патрабуюць шмат часу і грошай. Чаму агравытворцам па-ранейшаму не варта ўхіляцца ад гэтых высілкаў?*

Прыцягненне кліентаў і асабліва лаяльнасць кліентаў шмат у чым заснаваны на эмоцыях. Цяперашні фінанса-

вы крызіс яшчэ раз паказаў, што пастаянныя кліенты вельмі важныя і іх адпадае значна менш. Для правядзення фермерскага фэсту патрабуюцца вялікія высілкі, і, вядома, кожны фермер павінны разумець, ці зможа ён з гэтым справіцца. Але, у канчатковым выніку, важнае тое, наколькі высокі кошт аднаго ахопленага мэтавага чалавека. На мове рэкламы: гаворка ідзе пра так званую цану за тысячу кантактаў. Колькі еўра мне давядзецца выдаткаваць, каб ахапіць 1000 чалавек. І ў гэтым дачыненні святы падворкаў часта паказваюць добрыя вынікі ў параўнанні з традыцыйнай рэкламай.

*Бізнес-аналіз: ці можна ўявіць перавагі ў лічбах?*

Некалькі гадоў таму мы правялі даследаванне на гэтую тэму. У той час у чыстым выглядзе, г. зн. пасля заліку прыбыткаў ад фермерскіх свят, сярэднія выдаткі на разгледжаныя фермерскія святы складалі 2 еўра на аднаго ўдзельніка. Калі ўлічыць, што гэта вельмі якасная рэклама, таму што яна глыбокая і эмацыйная, то гэта добра. Дарэчы, паколькі даследаванне праходзіла добрых 10 гадоў назад, сёння выдаткі, пэўна, бліжэй да 3 еўра на чалавека.

*Чаго не варта выпускаць з увагі на фермерскім фэсце, калі гаворка ідзе пра прыцягненне кліентаў?*

Цэнтральнае месца павінны займаць уласныя прадукты і дэгустацыі. Надзіманыя замкі для дзяцей – гэта добра, але гаворка ідзе пра тое, каб перацягнуць патэнцыйных кліентаў у сваёй прадукцыі. Магчыма, варта наняць добрага кухара. І мець кантакты з іншымі адмыслоўцамі па маркетынгу.

*Чаго абавязкова варта пазбягаць?*

Юрыдычных памылак. Прыкладам, адмовы ў рэгістрацыі ў органах улады ці недастатковай колькасці месцаў паркоўкі.

*Як фермер можа ацаніць поспех ці правал фермерскага фэсту?*

Каб ацэньваць канкрэтна, а не на эмоцыях, раім паспрабаваць прыблізную праверку поспеху. Самае важнае: колькі ўдзельнікаў было на свяце? Поспех вылічваецца сумай выдаткаў за выняткам прыбытку ад прададзенай прадукцыі. Не трэба пры гэтаым забываць і ўласную працу, якая з'яўляецца кампанентам сумы выдаткаў[27].

**«Фестываль насення»**

**Юрыдычны кантэкст гандлю насеннем у Германіі.**

На гандаль з насеннем у Германіі распаўсюджваюцца асаблівыя правілы. Паводле Закона пра гандаль насеннем, продаж насення забаронены. Гэта тычыцца і саджанцаў. У выніку – гандаль насеннем манапалізаваны і знаходзіцца пад кантролем невялікай колькасці кампаній. Яны таксама дыктуюць, якія гатункі раслін выходзяць у гандаль. Такім чынам змяншаецца колькасць гатункаў раслін і зніжаецца біяразнастайнасць садоў. Як адказ на манаполію насення ў Германіі

[27] Крыніца: інтэрв'ю https://www.agrarheute.com/

ўзніклі шматлікія ініцыятывы ў розных грамадскіх месцах.

**Ідэя сеткі «Насенне» пры тэатры ў нямецкім горадзе Одэраўе[28].**

«Дзяліцеся насеннем і раслінамі, мяняйцеся досведам, захоўвайце разнастайнасць!

Абмен насеннем у пачатку вясны ўжо даўно стаў традыцыяй гэтага тэатра. Асноўная ідэя: глабалізаваныя карпарацыі выкарыстоўваюць сваё манапольнае становішча для ператварэння прыроднай разнастайнасці ў культываваную спрошчанасць. Старыя, надзейныя, адаптаваныя да мясцовых умоў мясцовыя гатункі замяняюцца глабальна распрацаванымі, галоўным чынам гібрыднымі гатункамі. Толькі жывы абмен можа супрацьстаяць гэтаму працэсу. Давайце абмяняемся насеннем, падзелімся ведамі!

Уцэ Бехальт з саду насення і пермакультуры Альт-Разенталь, якая таксама праектуе і падтрымлівае наш тэатральны сад, каротка прадставіць тэму з дапамогай графічнай прэзентацыі і натхніць вас некаторымі практычнымі парадамі, як пачаць працаваць з насеннем ва ўласным садзе.

Пасля абмену насеннем, а 16:00 мы пакажам фільмы ў рамках Брандэнбургскага экакінатуру з дыскусіяй з гледачамі».

**Сустрэча па абмене насеннем. Прапанова ад бібліятэкі**




**Шпрэндлінген-Генсінген і грамадскага саду горада Гензінген[29].**

«У сувязі з індустрыялізацыяй сельскай гаспадаркі селекцыя раслін і вытворчасць насення зараз знаходзяцца ў руках некалькіх буйных прамысловых кампаній, і тры найбуйнейшыя з іх — хімічныя.

Таму забеспячэнне харчаваннем прамыслова развітых краін цяпер шмат у чым залежыць ад гэтых буйных карпарацый. Апроч таго, праз індустрыялізаваную сельскую гаспадарку страчваецца разнастайнасць сельскагаспадарчых культур, а значыць і біяразнастайнасць жывых арганізмаў.

Як працуе наш абмен насеннем?

Зацікаўленыя садоўнікі-аматары зараз могуць атрымаць 1-2 мяхі з насеннем. У насеннай скрыначцы ўтрымліваецца насенне раслін, траў і гароднiны. Гэта ўстойлівыя, старыя і незвычайныя гатункі. Насенне сеюць, а потым збіраюць. Часткі з вырашчаных раслін даюць

---

[28] Крыніца: https://alte-gemuesesorten-erhalten.de/tauschboerse-fuer-saatgut-und-pflanzen.

[29] Крыніца: https://www.bibliothek-sprendlingen-gensingen.de.

паспець, каб пад канец садовага сезона можна было сабраць насенне. Частку насення гаспадар пакідае сабе, каб ізноў вырасціць расліны ў наступным сезоне. Астатняе насенне вяртаецца ў насенную скрыню. Гэта стварае базавы запас насення на наступны год.

Адпаведную літаратуру па садоўніцтве можна ўзяць у бібліятэцы.

Таксама запланаваны інфармацыйныя семінары з экспертам па садоўніцтве па такіх тэмах, як расліны, садоўніцтва, навакольнае асяроддзе і г. д. Мэта акцыі – выклікаць у людзей большую цікавасць да біяразнастайнасці з дапамогай насення, вырашчанага ў хатніх умовах. Гаворка таксама ідзе пра тое, каб захапіць грамадства садоўніцтвам і прафесійным абмене ведамі. Мы вельмі задаволены супольнай кампаніяй бібліятэкі Шпрэндлінген-Генсінген і грамадскага саду і вынікамі сумеснай працы».

### Фестываль насення Дзюсельдорфа і лічбавы рынак вытворца[30].

«На фэсце насення ў Дзюсельдорфе ўсё круціцца вакол разнастайнасці, экалогіі і абароны навакольнага асяроддзя. Мы хочам даць прыватным садоўнікам доступ да дармовага насення і ведаў пра вырошчванне і захаванне рэдкіх і старых гатункаў. Прапанаванае насенне не абаронена правамі інтэлектуальнай уласнасці і можа быць размножана надалей без страты сваіх уласцівасцяў. З дапамогай фэсту насення мы імкнёмся да большай разнастайнасці тут і ва ўсім свеце.

На нашай «Лічбавай гандлёвай пляцоўцы» вы знойдзеце вялікі выбар насення старой гародніны і садовых рэдкасцяў, якія нашы ўдзельнікі прапануюць кожны год на Дзюсельдорфскім фэсце насення.

Вы можаце перайсці на асобныя старонкі ўдзельнікаў і там даведацца пра неверагодную разнастайнасць культываваных раслін. Яны дапамогуць вам спланаваць ураджай на наступны год. Кожным заказам вы падтрымліваеце працу вытворцаў насення і, такім чынам, захаванне разнастайнасці сельскагаспадарчых культур».

### Прыклады вытворцаў з лічбавага рынка:

### Кіёск гародніны




«Мы ўжо некалькі гадоў з задавальненнем бяром удзел у фэсце насення ў Дзюсельдорфе, таму нам таксама падабаецца быць часткай лічбавага рынку. Нашы пляцоўкі ў апошнія гады добра наведваюцца, што нас вельмі цешыць. Мы абменьваемся думкамі, знаёмімся. Штонядзелю мы публікуем на YouTube новае садовае

[30] Крыніца: https://saatgut-festival.de/.

відэа. У нашым блогу, апроч іншага, ёсць крама насення. У нашым разуменні насенне павінна быць арганічным, экалагічным».

## Фіялетавыя памідоры Мелані Грабнер



«Я, Мелані Грабнер, вырошчваю рэдкія, устойлівыя насенныя таматы з 1999 года. Ад пачатку сваёй працы я хацела аб'яднаць людзей і расліны. Я была на Дзюсельдорфскім фэсце насення з лекцыямі, сваім насеннем і фотавыставай, прысвечанай 200-м з лішкам гатункаў таматаў. Усё найлепшае для вас».

## Экалагічны падворак Хаас



«Наш невялікі падворак Bioland ідылічна размясціўся ў Таўбертале. У нашым асартыменце ёсць насенне больш за 400 гатункаў памідораў, каля 100 гатункаў перцу і чылі, мноства адмысловых траў, ружы без каранёў і адмысловыя гаршковыя расліны. Ужо некалькі гадоў мы прадаём наш асартымент на рынках па ўсёй Германіі, а на фэстах насення мы сустракаем асабліва поўную любові да раслін аўдыторыю, якую вельмі шануем».

# Частка VII

# Стратэгічны і праектны падыходы ў развіцці гаспадаркі і мясцовай супольнасці

## § 15. Асновы стратэгічнага падыходу для развіцця сядзібы і вёскі

Раней лёс не надта песціў беларускага гаспадара-вяскоўца магчымасцямі доўгатэрміновага, стратэгічнага развіцця. Самастойнасць сялян пасля скасавання прыгоннага права ў 1861 годзе нязначна змяніла яго долю. «Ад прыгону асланілі і зноў пад пана пасадзілі», — сведчыць аб гэтым прыказка з тых часоў. Толькі-толькі патроху падрастаў дабрабыт сялян, а тут глядзіш — рэвалюцыя, а з 1929-га — раскулачванне, якое вынішчала не толькі найбольш эфектыўных гаспадароў, а і ўвогуле зводзіла са свету працавітасць, давер і адказнасць. Адначасова камандна-адміністратыўным ціскам дзяржава вырашала за сялян, як ім жыць: аднаасобныя дворышчы і хутары прымусова перасялялі ў большыя вёскі, аб'яўлялі маленькія вёскі неперспектыўнымі і пазбаўлялі падтрымкі. Нават пашпарты сельскае насельніцтва пачало атрымліваць толькі з 1974 (!) года. Якая там стратэгія?! Патрэба выжыць вучыла: «Паміраць збірайся — а жыта сей». Надоўга не заглядалі.

Але ж ва ўсе часы на кавалках сваёй прыватнай, а то і арандаванай зямлі, на дачах, дамагаліся нашыя продкі нават у кароткія перыяды дабралецця выдатных вынікаў, у тым ліку дзякуючы і «ўбудаванай» у вясковы ген накіраванасці на перспектыву. На развіццё. Такая народная стратэгія: «Працуй пільна — і тут будзе Вільня».



Існуе шмат розных азначэнняў паняцця стратэгія. Найбольш распаўсюджанае з іх абвяшчае:

Стратэгія (грэч. Strategia = stratos (войска) + ago (вяду)) — найбольш агульны план дзеянняў, звычайна — доўгатэрміновы, які базуецца на прагнозах; выбар ключавых кірункаў развіцця, якія інтэгруюць галоўныя мэты, палітыку і дзеянні ў збалансаваны працэс.

Навошта ж патрэбная стратэгія вясковым гаспадарам? Можа быць, нічым не горшыя вынікі могуць быць дасягнутыя і без стратэгіі? Што ж, бывала і такое. Аднак, як вобразна выказаўся старажытнарымскі мысляр Сенека: «Караблю, які не ведае, у якую гавань ён плыве, няма спадарожнага ветру». І гэта — толькі адзін з шэрагу негатыўных момантаў адсутнасці стратэгіі.



Малюнак 20.

Мы рэкамендуем, як гэта пазначана ўжо ў назве «Дапаможніка», абапірацца ў сваёй дзейнасці на прынцыпы ўстойлівага развіцця (глядзі аб гэтым ў спецыяльным параграфе). Гэта напоўніцу адносіцца і да стратэгіі ажыццяўлення тваёй справы. Таму тут мы і будзем весці гаворку менавіта аб стратэгіі ўстойлівага развіцця.

Для разумення сутнасці стратэгіі ўстойлівага развіцця тваёй сядзібы-гаспадаркі важна падзяляць два складнікі яе зместу.

Па-першае, стратэгія ўстойлівага развіцця — гэта дакумент, доўгатэрміновы план дзеянняў, накіраваных на дасягненне ўстойлівасці развіцця тваёй гаспадаркі (у шырокім сэнсе), тэрыторыі, а таксама мясцовай супольнасці.

Па-другое, гэта працэс, які суправаджае рэалізацыю дадзенага плана, сукупнасць дзеянняў усіх удзельнікаў увасаблення ў жыццё агульных задум па развіцці на прынцыпах устойлівага развіцця. Лепш за ўсё, калі гэтыя два паняцці «сыходзяцца» разам. Гэта значыць, калі існуе (або распрацоўваецца) стратэгія як план (тэкст) і адначасова актыўна ажыццяўляюцца мерапрыемствы, якія прасоўваюць цябе і мясцовую супольнасць у кірунку рэалізацыі стратэгіі. «Важна, каб стратэгія мясцовага развіцця была не толькі дакументам, але ў першую чаргу працэсам», — адзначаюць тэарэтыкі і практыкі руху за ўстойлівае развіццё.

«Працаваць на аснове стратэгіі», — вучаць нас калегі з Заходняй Еўропы, з якімі мы размаўлялі ў час навучальных паездак па тэматыцы мясцовага развіцця.

Асноўнымі задачамі планаў і стратэгій з'яўляюцца наступныя:

- вызначэнне (фіксацыя) маршруту руху развіцця гаспадаркі,
- вызначэнне патрэбы ў рэсурсах і напрамкаў іх выкарыстання,
- пошук рэсурсаў, у тым ліку знешніх інвестыцый,
- тэставанне/мадэляванне ідэй па развіццю гаспадаркі.

Галоўным плёнам распрацоўкі і рэалізацыі тваёй стратэгіі ўстойлівага развіцця з'яўля-

ецца павышэнне якасці вашага жыцця. Дзякуючы чаму гэта дасягаецца? У чым плюсы планавання і распрацоўкі стратэгіі? Як мінімум, распрацоўка і рэалізацыя планаў і стратэгій:

- будуць спрыяць глыбейшаму разуменню працэсаў развіцця тваёй гаспадаркі;
- дапамогуць выбудаваць і зафіксаваць «дарожную мапу» для руху да мэт;
- дазволяць сачыць за развіццём падзей і рэагаваць;
- будуць садзейнічаць прадухіленню некаторых праблем і больш эфектыўнаму рэагаванню на іх узнікненне;
- зберагуць (і знойдуць дадатковыя!) рэсурсы і час;
- падтрымаюць у справе эфектыўнага задзейнічання ўнікальнага патэнцыялу.

З нашай практыкі і з аналізу тэорыі распрацоўкі і рэалізацыі планаў і стратэгій рэкамендуем прытрымлівацца наступных прынцыпаў:

- рабіць толькі тое, што працуе на мэту;
- абавязкова занатаваць план і стратэгію («Напісанае пяром — не высечаш тапаром!»);
- памятаць, што гэта — працэс, а не толькі твае занатоўкі на паперы;
- улічваць пастаянныя змены;
- улік і разлікі пераконваюць (не толькі радню і сяброў, а нават самога сябе);
- гэта планаванне, а не бухгалтарскі ўлік;
- базавацца на асаблівасцях і канкурэнтных перавагах;
- калі плануеш камерцыялізаваць свой прадукт або паслугі, то трэба арыентавацца і на спажыўца/кліента.

Калі вырашыш паспрабаваць распрацаваць стратэгію развіцця сваёй сядзібы-гаспадаркі на прынцыпах устойлівага развіцця, то раім паслядоўна рухацца па наступным алгарытме:




Малюнак 21. Алгарытм распрацоўкі стратэгіі

Тэрмін, на які ты збіраешся распрацаваць стратэгію, павінны быць даволі працяглым: хоць бы гадоў на 7-10, а лепш і на 15.

Вобраз (візію) жаданай будучыні можна зафіксаваць у выглядзе пераліку важных для цябе момантаў, характарыстык, якіх ты хочаш дасягнуць. Нават простыя словы, занатаваныя на аркушы паперы, накшталт «многа зеляніны, высокія дрэвы, кветкі», «свае арганічныя, чыстыя прадукты», «рэгулярныя шпацыры па найбліжэйшым лесе», «сяброўскія сустрэчы», «рэалізацыя часткі прадукцыі», «размаўляць тут будзем на беларускай мове», «таварыства-партнёрства з усім жывым прыродным асяроддзем»,

«адраджэнне і ўкараненне традыцыйных мясцовых і родавых традыцый...» могуць адыграць ролю своеасаблівых каталізатараў і магнітаў, якія будуць прыцягваць да цябе ўсе гэтыя даброты жыцця. Прыцягваць проста праз напамін, увагу да гэтых складнікаў развіцця.

Збору інфармацыі можа асабліва і не спатрэбіцца, бо ты добра ведаеш сваю сядзібу-гаспадарку, і ў прынцыпе можна пераходзіць да этапу SWOT-аналізу. Аднак, калі ты ўдзельнічаеш у распрацоўцы калектыўнай мясцовай стратэгіі ўстойлівага развіцця для сваёй вёскі, сельсавета, раёна, то збор інфармацыі і яго папярэдні аналіз трэба правесці. І чым больш разнастайнай інфармацыі назбіраеш — тым лепш. Каб пра нешта не забыцца, раім скарыстацца падказкай «PESTEL+HI», які мы дапрацавалі і выкарыстоўвалі на працягу многіх стратэгічных прац у розных мясцовасцях. Гэтая абрэвіятура напамінае, што трэба паглядзець на сітуацыю з розных бакоў і не прапусціць:

- P (political) — палітычных аспектаў
- E (economic) — эканамічных
- S (social) — сацыяльных
- T (technological) — тэхналагічных
- E (environmental) — экалагічных
- L (legal) — прававых

+

- H (historical) — гістарычных
- I (innovations) — інавацыйных.

Пра сутнасць і методыку правядзення SWOT-аналізу напісана вялікая колькасць дапаможнікаў і рэкамендацый[31]. Працэдура ў тым, каб запоўніць такую табліцу:

| | |
|---|---|
| Моцныя бакі | Слабыя бакі |
| Магчымасці | Пагрозы |

Малюнак 22. Табліца для SWOT-аналізу.

Важна, каб падчас правядзення SWOT-аналізу пастарацца ўлічыць пералічаныя ніжэй моманты.

1. Трэба зафіксаваць тэму аналізу, напрыклад, «Стратэгія ўстойлівага развіцця нашай сядзібы-гаспадаркі» і прытрымлівацца выбранай тэмы;
2. Гэты інструмент аналізу не мае на ўвазе абмяркаваць пазначаныя аспекты развіцця, а толькі занатаваць, зафіксаваць іх. Таму, без абмеркавання проста запісвай тое, што прапанавалі ўдзельнікі;
3. Пачынай збор меркаванняў і ідэй з «моцных бакоў», таму што гэта дадасць пазітыву і аптымізму;
4. Арыентуйся на тое, што калі мы гаворым пра моцныя і слабыя бакі, то галоўным чынам маем на ўвазе ўнутраныя характарыстыкі

[31] Больш падрабязна аб правядзенні SWOT-аналізу можна прачытаць у дапаможніку: А. Сиваграков. «Сельское развитие: Традиции + Инновации + Стратегия = Устойчивость». Методическое пособие по разработке стратегии устойчивого развития сельской территории. – Минск, 2017 г. – http://eurasia.by/blog/publications/selskoe-razvitie-traditsii-innovatsii-strategiya-ustoychivost/

з'явы, а калі збіраем інфармацыю пра магчымасці і пагрозы, то стараемся ўлічваць знешнія фактары;
5. Пастарайся, каб да ўдзелу ў гэтай справе далучылася як мага больш розных людзей. Калі такіх магчымасцяў няма — то рабі гэта асабіста, а потым, калі будзе нагода, далучы іншых;
6. Пастарайся «выцягнуць» з сябе і з іншых удзельнікаў абмеркавання максімальную колькасць інфармацыі. Практыка паказвае, што падчас калектыўнага брэйн-шторму звычайна набіраецца каля 20 запісаў аб моцных баках аналізаванай з'явы.

Пасля таго, як папрацуеш над бачаннем і складзеш SWOT-аналіз, мэтазгодна вызначыць некалькі прыярытэтных кірункаў развіцця ў рамках стратэгіі. Вядомая народная мудрасць: «хто зашмат жадае — нічога не мае». Тое ж адносіцца і да стратэгіі, дзе пастаўлена мноства мэт і няма фіксацыі галоўных «кірункаў удару». Выпрацоўка прыярытэтаў дазваляе засяродзіць рэсурсы і дзеянні на самых важных, самых неадкладных, перспектыўных і эфектыўных кірунках працы. Нават проста ўспрыманне стратэгіі становіцца значна канкрэтнейшым, калі ў ёй выдзелена невялікая колькасць магістральных кірункаў дзеянняў.

У выпадку калектыўнай працы па вызначэнні прыярытэтаў у стратэгіі адным з эфектыўных і даволі аператыўных метадаў з'яўляецца наступны:

1. Адразу пасля правядзення SWOT-аналізу ўдзельнікі абмеркавання атрымліваюць заданне адзначыць тлустымі кропкамі тыя палажэнні (з моцных, слабых бакоў, магчымасцяў, або пагроз), якія яны лічаць самымі важнымі. Кожнаму даецца магчымасць паставіць не больш за пяць такіх кропак.
2. Палажэнні, якія атрымалі найбольшую колькасць «галасоў», запісваюцца асобна, удакладняюцца ў працэсе дыскусіі і замацоўваюцца ў якасці прыярытэтаў.

Далей, услед за апісаннем бачання і выпрацоўкі прыярытэтаў, ідзе пастаноўка мэт і задач, а таксама фіксацыя адпаведных індыкатараў. Гэта неабходна для канкрэтызацыі бачання і прыярытэтаў, надання ім дакладных вымерных параметраў. Адсюль выцякаюць шырока вядомыя патрабаванні SMART да фармулёвак мэт і індыкатараў. Сістэма крытэрыяў SMART азначае, што мэты і індыкатары павінны быць: **канкрэтныя** (выразна і адназначна вызначаныя), **вымерныя** (зафіксаваныя колькасныя або якасныя (прагрэс/рэгрэс) паказальнікі), **дасягальныя** (не занадта амбіцыйныя, але і не вельмі блізкія, дасягальныя з дапамогай наяўных рэсурсаў і ў рамках бягучай палітычнай сітуацыі), **рэлевантныя** (якія маюць дачыненне да канкрэтных сітуацый, груп людзей, тэрыторый або іншых аб'ектаў планавання; пры гэтым актуальныя

і не супярэчныя іншым мэтам і прыярытэтам), **абмежаваныя ў часе** (з зададзенымі тэрмінамі дасягнення[32].

Адной са складанасцяў, якія чакаюць цябе персанальна ці тваю каманду на шляху «перамен да ўстойлівасці», з’яўляецца адхіленне ад абранага стратэгічнага курсу. Часта цяжка выстаяць перад магчымасцю заняцца праектам, які, як кажуць, «лезе ў рукі», ці для рэалізацыі якога лягчэй атрымаць фінансы, але які адводзіць (нават і часова) ад прыярытэтных задач. Такія выпадкі ўсё роўна будуць, аднак трэба імкнуцца вытрымліваць стратэгічныя арыенціры.

Канкрэтныя мерапрыемствы ў рамках стратэгій павінны быць звязаныя з зафіксаванымі доўгатэрміновымі індыкатарамі; індыкатары, у сваю чаргу, павінны адлюстроўваць прыярытэты (мэты); прыярытэты павінны выцякаць з вынікаў аналізу і арыентавацца на вобраз жаданай будучыні.

Такую схему (магчыма, напоўненую канкрэтным зместам, які адлюстроўвае твае ўмовы) мэтазгодна мець на відавоку: можна ўклеіць яе ў твой «Стратэгічны нататнік», дзе робіш запісы аб развіцці сваёй сядзібы-гаспадаркі. Ці, напрыклад, падчас працы на ўзроўні вёскі ці раёна вывешваць як плакат на сустрэчах актыву, сходах жыхароў.

Напамін пра неабходнасць забеспячэння такой узаемасувязі будзе дысцыплінаваць, накіроўваць дыскусіі ў патрэбнае рэчышча і ў выніку павышаць эфектыўнасць працы.

Сучасныя падыходы да планавання і распрацоўкі стратэгій арыентуюцца на ўлік:

- «зялёнай» эканомікі,
- цыркулярнай эканомікі,
- эканомікі сумеснага спажывання.

Мы раім дадаткова «пакапацца» ў Інтэрнэце, пашукаць парады і ідэі, якія можна скарыстаць у сваёй гаспадарцы.




Малюнак 23. Звязанасць элементаў стратэгіі

[32] У публікацыі «Дапаможнік па распрацоўцы стратэгій устойлівага развіцця вясковых тэрыторый». // Сівагракаў А. У., Лямперт А. Я. Пад рэдакцыяй Сівагракава А. У. – Мінск, «Колорград», 2022, 47 с. (https://disk.yandex.by/d/iMR8KHNxr3Ou5Q ці https://kuna-sdg.de/wp-content/uploads/2023/11/Handbook-Sustainability.pdf) можна знайсці прыклады працы з мэтамі і індыкатарамі стратэгіі ўстойлівага развіцця.

## § 16. Праектны падыход для персанальнага і грамадскага развіцця

Калі мы чуем слова «праект» без кантэксту, то невядома, аб чым ідзе гаворка. Іншая справа, напрыклад, «праект дома» — гэта набор дакументацыі, патрэбнай для будаўніцтва хаты і рэгістрацыі пабудовы. Тым, хто піша розныя тэксты, артыкулы, будзе зразумела, што калі ўверсе старонкі, звычайна справа, напісана «Праект» (па-англійску Draft) — то гэта маецца на ўвазе першы варыянт тэксту, яго чарнавік, не завершаная праца. У бытавым будзённым жыцці мы можам сустрэцца з вітаннем накшталт: «Здароў! Як справы? Якім праектам зараз займаешся?» І тут гаворка можа ісці проста аб тым, што зараз чалавек робіць, над чым працуе, чаго дамагаецца. Але найбольш шырока зараз тэрмін «праект» выкарыстоўваецца ў менеджменце, эканоміцы і сацыяльна-эканамічных працэсах. У гэтых выпадках у тэрміна таксама ёсць шмат «адценняў», але асноўны яго сэнс наступны:

Праект (анг. — project) — комплекс мерапрыемстваў, дзеянняў, якія рэалізуюцца для дасягнення нейкай канкрэтнай мэты. Праект звычайна мае адзінае кіраўніцтва, зафіксаваныя (абмежаваныя) рэсурсы на яго выкананне, вызначаныя тэрміны і план рэалізацыі. Як правіла, у адрозненне ад звычайнай штодзённай працы праект характарызуецца інавацыйнасцю.

Вось менавіта пра гэтыя праекты мы і пагаворым.

У кожных вясковых гаспадароў дзейнасць па развіцці сядзібы, падтрыманні дома, утрыманні хатняй жывёлы, наглядзе за садам-гародам уключае многа праектаў. Хоць у большасці выпадкаў самі гаспадары пра гэта і не задумваюцца. Вырашылі стварыць кампосную скрыню? Завесці курэй? Укараніць новую экзатычную расліну? Аднавіць вытворчасць сідру па старых рэцэптах? Усё гэта — вашыя персанальныя праекты.

Вырашаеш з суседзямі, як падрамантаваць дарогу? Дамагаешся, каб аўтобус ці маршрутка праходзілі праз тваю вёску? Абмяркоўваеш у мясцовым чаце дэталі сумеснай працы па добраўпарадкаванні скверыка? Гэта ўжо — праекты мясцовай супольнасці.

А калі ўжо з’явіліся ідэі ініцыяваць ці далучыцца да распрацоўкі раённай стратэгіі ўстойлівага развіцця ці пашукаць рэсурсы на вырашэнне мясцовых праблем праз грантавыя конкурсы, а можа, завесці знаёмства-сяброўства-кааперацыю з калегамі-аматарамі пермакультуры з іншых краін — то гэта могуць быць ужо праекты раённыя, нацыянальныя і міжнародныя. І многія жыхары беларускіх вёсак і мястэчак ужо даўно і паспяхова працуюць у гэтых рэчышчах. Так што тут ты — не першы і не самотны, ёсць у каго павучыцца, з кім разам працаваць.

У параграфе 4 мы прыводзілі ўжо прыклады некаторых

праектаў, ёсць яны і ў іншых частках гэтага «Дапаможніка».

Калі абагульніць шырокі праектны досвед, то можна ўбачыць, што кожны праект звычайна праходзіць праз наступныя стадыі:

1. Пачатак → 2. Планаванне → 3. Выкананне → 4. Завяршэнне → 5. Ацэнка

Схема 2. Стадыі праектнай працы

Напачатку трэба вызначыцца з тым, які вынік, «прадукт» ты чакаеш ад праекта, хто акрамя цябе будзе ў ім удзельнічаць, якія рэсурсы і час ты збіраешся на яго выдаткаваць... Для таго, каб звесці ўсю гэтую інфармацыю разам, каб яе лепш было аналізаваць, абмяркоўваць і дапрацоўваць, мы рэкамендуем фармат ***«Адна старонка»*** (па-англійску — one-pager).




Малюнак 40. Адна старонка (кароткая інфармацыя пра праект)

*Адна старонка* дапаможа таксама табе ў стасунках з тымі, хто можа падтрымаць твой праект (бізнес, мясцовая адміністрацыя, грантадаўцы). Так, калі спатрэбіцца, ты можаш хутка даслаць ім загадзя падрыхтаваныя прапановы па электроннай пошце ці перадаць падчас асабістай сустрэчы. Гэта можа стаць лёсавызначальным момантам!

Галоўнымі выканаўцамі тваіх праектаў будзеш ты сам ці сама, паважаны гаспадар ці гаспадыня сядзібы. Ты таксама будзеш галоўным інвестарам, фінансістам і донарам сваіх праектаў. Аднак твае сілы і магчымасці не бясконцыя, заўсёды існуюць абмежаванні, якія не даюць рэалізаваць напоўніцу ўсе задумкі. Таму трэба арыентавацца і на знешнія рэсурсы. Зазірнуць, як кажуць, «за край сваёй талеркі». І ёсць верагоднасць, што ты дасі рады ў справе прыцягнення вонкавых магчымасцей для ажыццяўлення сваіх праектаў мары. Хутчэй за ўсё, табе могуць дапамагчы твае родзічы. Свае, крэўныя ў першую чаргу могуць прыйсці на дапамогу, стаць эфектыўнай камандай па ажыццяўленні тваіх праектаў. Звычайна з гэтага пачынаецца. Адначасова сюды хутка далучаюцца сябры. Не саромейся запрасіць іх да сябе і прапанаваць супрацоўніцтва, сумесны праект. Потым твой позірк распаўсюджваецца на больш шырокае кола людзей — суседзяў, аднавяскоўцаў. Далей — на розных знаёмых па ўсёй краіне і нават

за межамі. Чарговае павелічэнне маштабу пошукаў рэсурсаў выведзе цябе на бізнес, грамадскія арганізацыі, мясцовую адміністрацыю. Ну і неўзабаве — ты ўжо на міжнароднай арэне[33]. Тут ужо, хутчэй за ўсё, ты будзеш дзейнічаць супольна з сябрамі-аднадумцамі-калегамі, часцей праз грамадскую некамерцыйную арганізацыю.

Пошук дадатковых сродкаў на рэалізацыю праекта — спецыяльная сфера праектнай дзейнасці. На мове спецыялістаў — фандрэйзінг (анг. — fundraising), што наўпрост перакладаецца як «пошук фондаў». Па гэтай тэме ў Інтэрнэце ёсць многа рэсурсаў, інфармацыі, парад.

З нашай уласнай практыкі пошуку дадатковых рэсурсаў на праекты мы выбралі некалькі момантаў, якія павінны спрыяць таму, каб твая праектная прапанова была паспяховай. Вось яны — **6 рычагоў для паспяховай праектнай прапановы.**

**1. Рыхтавацца загадзя.** Трэба стварыць «урадлівую глебу» для будучага «ўраджаю» рэсурсаў ці «накапаць чарвякоў» для выніковай «рыбалкі». Часта можна пачуць, што донарскія арганізацыі, якія размяркоўваюць сродкі на падтрымку праектаў, дамагаюцца «даваць не рыбу, а вуду». То бок, падтрымаць заяўнікаў так, каб яны не проста ў гэты момант задаволілі сваю патрэбу («з'елі рыбу»). А каб стварыць умовы, якія на працягу доўгага часу будуць спрыяць таму, каб саіскальнік дапамогі не меў патрэбы ў дадатковай падтрымцы, мог сам задавальняць свае патрэбы. Такім чынам, донары таксама чакаюць ад заяўнікаў знакаў таго, што менавіта ім трэба дапамагчы, і з гэтага будзе найлепшы вынік. Калі працягваць аналогію з рыбалкай, то сучасныя донары хутчэй дадуць вуду тым, хто ўжо накапаў чарвякоў, разведаў рыбныя месцы і паспрабаваў лавіць, змайстраваўшы сваю вуду з арэшыны. У праектнай працы, напрыклад, па развіцці мясцовай тэрыторыі гэта можа быць вывучэнне сітуацыі, папярэдняе абмеркаванне з іншымі жыхарамі напрамкаў дзеянняў, правядзенне валанцёрскіх самастойных мерапрыемстваў. Такім хочацца дапамагчы, і дапамога прыходзіць.



[33] Мне часта задаюць пытанне: а навошта міжнародным структурам, ці замежным дзяржавам падтрымліваць нейкую дзейнасць, напрыклад, па сацыяльным, ці ўстойлівым развіцці, альбо па прыродаахоўным тэмам? Адказ мой такі: бо яны падтрымліваюць пазітыўныя напрамкі развіцця, хочуць паляпшэння сацыяльна-эканамічнага становішча ўсіх краін і мясцовасцяў. Гэта як кожны з нас дапамагае суседу, калі той мае патрэбу. А па пытанням устойлівага развіцця і зберажэння прыроды – то сэнс тут такі: калі знікне ў нашых лясах, ці балотах нейкая жывая істота, птушка, ці кветка, то яна знікне для ўсіх жыхароў планеты. І вось тыя, хто мае магчымасць, дапамагаюць, каб такога не адбылося.

**2. Арыентавацца на патрабаванні** конкурсу грантаў, донара. Станоўчым момантам тут стане максімальны ўлік усіх ўмоў і працэдур. Нават мова тваёй заяўкі добра калі будзе ўключаць большасць тэрмінаў, якія выкарысталі ў абвестцы і правілах грантавай праграмы. Хоць і занадта перабраць у гэтым — не найлепшы варыянт. Добра, калі будзе баланс фармальнага падыходу і тваёй персанальнай размовы, з якой цябе ўбачаць як жывога чалавека са сваімі асаблівасцямі і патрэбамі.

**3. Зразумеласць ідэі і якасць тэксту.** Ёсць такая рэкамендацыя: «Займіце месца чытача». Што гэта значыць? Уяві, што той, хто атрымае ад цябе заяўку, зусім не ведае асаблівасцей тваёй сітуацыі, не ведае пра тваю папярэднюю дзейнасць, слаба ўяўляе, што зменіцца ў выніку прапановы. Таму давай больш канкрэтыкі, апісвай сітуацыю і свае прапановы простымі словамі і сказамі, якія ў выніку нельга будзе вытлумачыць неяк па-іншаму. Часта (асабліва ў выпадку міжнароднага конкурсу) твой тэкст будзе яшчэ перакладацца на англійскую мову, а гэта таксама можа паўплываць на сэнс. Не выкарыстоўвай скарачэнняў і слэнгу. Калі неабходна, можна нават праілюстраваць асобныя моманты фотаздымкамі.

**4. Пераконваць (аргументамі і не толькі).** Проста напісаць, што твой будучы праект вельмі актуальны, недастаткова. Трэба прывесці аргументы на карысць такой думкі. Добра, калі гэтыя аргументы будуць падмацаваныя лічбамі, спасылкамі на сур'ёзныя крыніцы інфармацыі. Гэта зробіць тваю заяўку заўважнай сярод многіх іншых.

**5. Рыхтавацца прэзентаваць + дамагацца сустрэчы.** «Поспех любіць падрыхтаваных», — кажа мудрае выслоўе. І сапраўды, слабая падрыхтоўка да прэзентацыі свайго праекта можа сапсаваць шматдзённую працу. Добра, калі ёсць магчымасць скантактавацца-сустрэцца з тымі, хто больш ведае пра канкрэтны праектны конкурс, ці нават з тымі, хто яго арганізуе. Бывае, што гэта немагчыма, а бывае, наадварот, донары ідуць насустрач. Падтрымка праекта можа прыйсці з розных бакоў, але ж хутчэй тады, калі ты будзеш грукацца ў гэтыя дзверы.

Шукай аднадумцаў, тых, хто падзяляе твае каштоўнасці, тых, каго хвалююць падобныя праблемы. Супрацоўніца адной сацыяльнай недзяржаўнай арганізацыі расказвала: «Мы ніяк не маглі вырашыць шэраг праблем па праекце па працы з людзьмі з аўтызмам. А потым у сацыяльным міністэрстве, у якое мы звярталіся, з'явіўся чалавек, у якога быў унук з аўтызмам. І справа пайшла, усё закруцілася...»

Звярні ўвагу на эфектыўнасць такога падыходу, як апавяданне гісторый (storytelling — англ.). Заўсёды цікавы выпадак з твайго жыцця, з жыцця тваёй вёскі, прыгода, рэдкі факт — гэта тое, што прываблівае слухачоў, будуе пачуццё датычнасці, эмпатыю. А ў выніку — пазітыўныя

адносіны да тваёй прапановы. Нездарма ў праграмы ўніверсітэтаў і курсаў па менеджменце сацыяльнай працы, развіцці гарадоў надзяляюць увагу навыкам апавядання гісторый. Адна з асноўных парад па гэтай тэме: трэніруйся!

**6. Вытрымлівай дэдлайны** (deadline (англ.) — крайні тэрмін). Не рабі заяўку ў самы апошні момант, пакінь рэзервовы час. Бо могуць адбыцца проста тэхнічныя перашкоды: прападзе свет, сапсуецца тэхніка. Нейкая экстраная справа можа раптам адцягнуць тваю ўвагу. Можна проста пра нешта забыцца або не так зразумець.




Падчас планавання праекта (ці то проста для сябе, ці ў адпаведнасці з патрабаваннямі грантавага конкурсу) трэба адначасова працаваць над змястоўнай часткай праектнага дакумента і над бюджэтам. Могуць быць і іншыя элементы, якіх патрабуюць умовы конкурсу, і іх таксама трэба трымаць пад наглядам, узгадняць усе складнікі праектнай заяўкі паміж сабой.

Мэту праекта трэба сфармуляваць максімальна канкрэтна.

Змест праекта добра калі будзе раскладзены па асноўных яго задачах (такіх задач не павінна быць многа).

Вынік праекта таксама павінны быць зафіксаваны ў максімальна канкрэтным (пажадана — з лічбамі) выглядзе. Недарма ў праектнай практыцы шырока выкарыстоўваецца тэрмін «прадукт праекта», то бок тое, што, як кажуць, «можна памацаць» (хоць гэта і не заўсёды магчыма).

Патрэбныя рэсурсы ў адной старонцы даюцца адзінай сумарнай лічбай, а падрабязна іх трэба занатаваць у бюджэце, пажадана з дэталёвым падзелам па радках выдаткаў.

Час дзеяння праекта вызначаецца ў днях, месяцах ці гадах. Калі магчыма, то лепш пазначыць таксама магчымую дату пачатку праекта.

Калі хапае месца, то разам з пералікам удзельнікаў добра дадаць інфармацыю пра іх кваліфікацыю і досвед у вырашэнні падобных задач.

Кантактныя дадзеныя павінныя ўключаць як мінімум нумар тэлефона і адрас электроннай пошты.

Бывае складана змясціць усё сказанае ў адну старонку. У такім выпадку пакідай самае галоўнае. Можна крыху зменшыць памер літар (але ж не менш чым да 11-га).

Для «пачаткоўцаў» — тых, хто ўпершыню бярэцца распрацаваць праектную прапанову, знайсці вонкавыя рэсурсы на яе рэалізацыю і паспяхова ажыццявіць задуманае, раім

**пачынаць з невялікага праекта.**

Мой сябар Эдуард Вайцяховіч[34], які многа займаўся праектнай дзейнасцю ў вёсцы Камарова, што на Мядзельшчыне, так расказваў пра першы праект іх арганізацыі ў вёсцы: «Першы наш праект быў усяго на 500 даляраў. Мы яго зрабілі, каб пачаць навядзенне парадку ў нашым вясковым старажытным парку. Грошы пайшлі на цішоткі для валанцёраў і на абед удзельнікаў працы ў парку. І вынікі гэтага праекта адразу заўважылі ўсе. Жыхары ўбачылі, што на добрыя справы можна знайсці сродкі. Што актыўная пазіцыя дае добрыя вынікі. Што так крок за крокам мы зможам значна палепшыць наша жыццё у вёсцы».

Гэты прыклад выклікае аналогію з адносінамі з банкам, калі важна спачатку напрацаваць «банкаўскую гісторыю» (то бок узяць невялікі крэдыт і ў час па ім разлічыцца, потым — наступны, большы, і так далей...). А потым гэтая «банкаўская гісторыя» будзе працаваць на цябе. Так і ў Камарова пасля некалькіх невялікіх, а пазней — сярэдніх па памерах праектаў мясцовая каманда выйшла на шматтысячныя (у далярах) праекты, якія працавалі дзеля лепшай будучыні жыхароў вёскі.

**Калектыўныя праекты звычайна больш эфектыўныя, чым індывідуальныя:** гэта дэманструе практыка. Таму трэба ўважліва прыглядацца да такіх магчымасцяў, якія б вывелі цябе на гэты ўзровень. Прапаноўвай супрацоўніцтва аднавяскоўцам, раскажы ім пра магчымасці сумеснай праектнай дзейнасці. Пачні з нечага невялікага і нескладанага. Не без прычыны ж гавораць: «Малы праект — добры праект». А потым ужо перад табой адчыняцца новыя магчымасці, у тым ліку праз стварэнне мясцовай некамерцыйнай недзяржаўнай арганізацыі.

Неаднаразова я сутыкаўся з жаданнем людзей, партнёраў па праектах яшчэ больш пашырыць праект, дадаць у яго больш актыўнасцяў, часам вельмі прывабных. Але ж тут ёсць і іншы бок. Бо «распаўзанне» праекта, яго павелічэнне за межы ці то рэсурсных магчымасцяў, ці то бяспечнай сферы, ці добра вядомай тэрыторыі амаль заўсёды стварае дадатковыя рызыкі. На мой погляд, лепш добра выканаць канкрэтны невялікі праект, добра скіраваны акурат на тыя моманты, якія найбольш важныя. А паралельна можна рыхтавацца да працягу праекта, да падачы новай заяўкі, пошукаў новых рэсурсаў, да новых спраў.

Блізка да гэтых высноў ляжыць такая слушная думка, што амаль у любой справе, у тым ліку ў праектнай дзейнасці **не існуе** варыянта развіцця падзей, пры якім адначасова атрымліваеш добрую **якасць + хуткае выкананне + танна.** Трэба мець на ўвазе, што заўсёды адзін са складнікаў будзе не вельмі задавальняць, і з гэтым трэба прымірыцца, шукаць баланс паміж гэтымі характарыстыкамі.

---

[34] Дадатковую інфармацыю пра дзейнасць Эдуарда Вайцяховіча, а таксама пра праекты па ўстойлівым развіцці тэрыторый глядзі ў выданні: Сивограков Олег. Местная повестка-21 как инструмент устойчивого развития территорий. – Программа развития ООН в Республике Беларусь / Альтиора – Живые краски, 2009. 128 с. С. 98 – 101.

Увогуле, пазітыўныя эфекты ад праектнага падыходу ў вырашэнні задач выяўляюцца ў тым, што праекты:

- дадаюць рэсурсы (прычым гэта не абавязкова фінансы, а часта матэрыяльныя рэчы – транспарт ці інструменты, ежа ці пляцоўка для сустрэчы; гэта могуць быць таксама каштоўныя нематэрыяльныя рэсурсы – веды і навыкі, кантакты і сувязі);

Аднойчы на паседжанні Мінскага абласнога савета па развіцці аграэкатурызму, недзе ля 2015 года, адбылася падзея, якая добра ілюструе гэты тэзіс. Нехта з удзельнікаў сустрэчы прапанаваў праводзіць выязныя нарады на агратурыстычных сядзібах Міншчыны. Адразу ўзнікла пытанне: адкуль можна было б узяць фінансы на такія паездкі. Здавалася, што нічога не атрымаецца. Але ж раптам прадстаўніца абласнога камітэта па спорце і турызме ўспомніла: «У нас жа ў камітэце ёсць аўтобус, але паліва лімітавана, нам не выдзяляць». На што прадстаўніца нямецкай праграмы падтрымкі Беларусі прапанавала: «За паліва можам заплаціць мы». А адзін з гаспадароў агратурыстычнай сядзібы адразу паабяцаў: «Калі да першага прыедзеце да мяне – то я пачастую вас абедам!» Так адбылася дамова аб супрацоўніцтве, дзякуючы якой ажыццявіўся цікавы і важны праект.

- павышаюць эфектыўнасць працы (бо канцэнтруюць вымаганні на прыярытэтных дзеяннях, прадухіляюць марнатраўства, выкарыстоўваюць досвед іншых і магчымасці калектыўных дзеянняў);
- стымулююць інавацыі (ужо раней адзначана, што па сваёй сутнасці праекты накіраваныя на інавацыі; аўтары праектаў ведаюць, што донарскія арганізацыі будуць звяртаць увагу на гэтыя моманты падчас ацэнкі заявак, і таму імкнуцца да інавацый: так канкурэнцыя падштурхоўвае прагрэс);

Тут успамінаецца трапны выраз Уладзіміра Караткевіча: «Рабі нечаканае, рабі, як не бывае, рабі, як не робіць ніхто – і тады пераможаш». Гэтае выказванне напоўніцу тычыцца праектнай працы.

- дазваляюць паспрабаваць, праэксперыментаваць, зрабіць нейкую справу спачатку ў невялікіх памерах і ў выніку – пазбавіцца вялікіх страт, якія маглі б быць у выпадку маштабнай дзейнасці;
- спрыяюць пошуку іншых шляхоў развіцця, прадуктаў і паслуг, задзейнічанню разнастайных рэсурсаў і падыходаў, дыверсіфікацыі вытворчасці, зніжэнню рызыкі («не насіць яйкі ў адным кошыку»).



Тэма нашага дапаможніка – гаспадаранне на прынцыпах устойлівага развіцця. Таму і праекты твае, а таксама праекты па развіцці мясцовай супольнасці і ў прынцыпе ўсе праекты, у якіх ты ўдзельнічаеш, мы рэкамендуем ажыццяўляць такім чынам, каб гэта спрыяла ўстойліваму развіццю.

На падставе нашага досведу ўдзелу ў праектах мы сфармулявалі **«5 крокаў да праекта на прынцыпах УР»:**

1. Глядзець на ўсе элементы праекта, усе працэсы ў межах праекта «праз прызму» канцэпцыі УР, яе прынцыпаў (глядзі § 1). І дамагацца, каб мерапрыемствы, якія плануюцца, а таксама дзеянні ў межах праекта адпавядалі гэтым прынцыпам.
2. Улічваць лакальныя ўмовы, слухаць мясцовых людзей, уцягваць іх у працу, давяраць ім самастойна выконваць праектныя задачы.
3. Забяспечыць баланс тэорыі і практыкі. Вывучай, даследуй з'явы, якія цябе цікавяць, якімі ты займаешся, і выкарыстоўвай іх на практыцы.

Знакаміты нямецкі філосаф Імануіл Кант яшчэ ў 1793 годзе напісаў невялікі артыкул з назвай «Пра распаўсюджанае выказванне «У тэорыі гэта можа быць правільна, але на практыцы непрыдатна». У ім ён абгрунтаваў тэзіс аб тым, што без тэорыі ніякай (зараз бы сказалі – эфектыўнай) практыкі быць не можа. Вось табе і варыянт тлумачэння нямецкіх эканамічных поспехаў. А выраз «Няма нічога больш практычнага, чым добрая тэорыя» з часоў Канта лічылі думкай многіх знакамітых людзей, найбольш часта, хутчэй за ўсё, Альберта Эйнштэйна.

- Вучыцца ў лідараў. Ёсць многа людзей, якія займаюцца падобнымі справамі, як і ты. Частка з іх дасягнула вельмі добрых вынікаў, большасць вынайшлі і выкарыстоўваюць свае, як зараз кажуць, лайфхакі для вядзення гаспадаркі. Выкарыстоўвай іх досвед, пазнаёмцеся, пасябруйце і супрацоўнічайце. Многія будуць радыя дапамагчы табе.
- Дадавай у праектную справу гумар, святкаванні, незвычайныя падыходы. Мяняй метады і напрамкі працы. Калі дзейнічаць, як раней, можна чакаць таго ж самага выніку.

Узгадваецца анекдот: «Нарада ў калгасе. Старшыня выступае са справаздачай. «У пазатым годзе мы пасадзілі 100 гектар збожжа. Усё з'еў даўганосік. У тым годзе мы пасадзілі 200 гектар збожжа – усё з'еў даўганосік. У гэтым годзе бы пасадзім 300 гектар. Няхай ён падавіцца».

Напрыканцы яшчэ аб адным магчымым эфекце праектнай дзейнасці. Менавіта ўдзел у праектах, у распрацоўцы праектных прапаноў, фандрэйзінгу, выкананні праектаў дадае веды, развівае новыя навыкі, пашырае персанальныя і прафесійныя кантакты. А ў выніку ты па сутнасці вучышся новай прафесіі – праектнаму менеджменту. І гэта стварае новыя перспектывы. Дзякуючы гэта-

му можна разлічваць на працаўладкаванне, напрыклад, у недзяржаўным некамерцыйным сектары. Можа, пакуль у Беларусі гэты сектар не такі ўжо развіты, але эканамічна багатыя краіны Заходняй Еўропы дэманструюць заўважныя трэнды ў гэтым напрамку: у некаторых з іх 10-15% занятых працуюць менавіта ў недзяржаўным некамерцыйным сектары. А далей — ізноў адкрываюцца новыя гарызонты. Зараз ёсць тэндэнцыя (упершыню яе я заўважыў у Нямеччыне) — стварэнне кансалтынгавых бізнес-арганізацый праз працяг праектнай дзейнасці. Так што маленькі праект можа сур'ёзна змяніць тваё жыццё да лепшага. Поспехаў табе на гэтым шляху!

## § 17. Мясцовыя брэнды і іх карысць для вясковых гаспадароў і мясцовых супольнасцей

Калісьці брэндам называлі апазнавальны знак, кляймо, якое выпальвалі гарачым жалезам на жывёле, злачынцах або рабах. Але паступова брэндам пачалі называць назву, дызайн, сімвал ці іншыя характарыстыкі прадуктаў ці паслуг, па якіх іх адрозніваюць ад падобных вырабаў іншых вытворцаў. Часта можна пачуць: «Гэта вядомы брэнд!», «За гэты брэнд трэба будзе даражэй заплаціць», «Я давяраю гэтаму брэнду».

Брэнд — гэта назва, тэрмін, дызайн, сімвал або любая іншая асаблівасць, якая адрознівае тавар або паслугу аднаго прадаўца ад тавараў або паслуг іншых прадаўцоў.



Малюнак 41. Вядомыя брэнды

Дзякуючы «раскручанаму» брэнду прадукты і паслугі атрымліваюць прывабную рэкламу, дамагаюцца павялічваць рынкі збыту, аб'ёмы вытворчасці і адначасова «прывязваць» кліентаў. То бок пазітыўны брэнд — выгадная рэч, і мае сэнс заняцца брэндынгам.

Брэндынг — працэс стварэння брэнду, ідэнтычнасці кампаніі, тэрыторыі, прадукту, паслугі і тваёй сядзібы-гаспадаркі.

На розных узроўнях: паміж краінамі і рэгіёнамі, гарадамі і турыстычнымі дэстынацыямі — існуе вялікая канкурэнцыя брэндаў. Час ад часу чуваць нават аб судовых працэсах на гэтую тэму. Аналагічна і на мясцовым узроўні: жыхары ведаюць, у якіх вытворцаў лепшая якасць прадукцыі, хто больш надзейны, дзе суадносіны «цана — якасць» найбольш прывабныя.

Важныя якасці брэнду:

- вядомасць,
- арыгінальнасць,
- значэнне (каштоўнасць),
- зручнасць,

- эмацыйнае злучэнне.

Эфекты брэнду:

- ён прываблівае пакупнікоў, кліентаў, інвестараў, турыстаў;
- ім можна ганарыцца;
- гэта — дух, настрой твой і супольнасці;
- пачуццё еднасці, калі гэта калектыўны брэнд;
- ён стварае мясцовы сацыяльны капітал.

Брэнд працуе, калі:

- уласнікі брэнду, жыхары апавядаюць гісторыі;
- ён інтэгруе прыродныя, сацыяльныя, эканамічныя аспекты жыцця;
- спачатку мы працуем на брэнд, а потым ён — на нас.

Прыродны ўнёсак у беларускі брэндынг — гэта нашы лясы і балоты, рэкі і азёры, палі і лугі, звяры і птушкі, рыбы і насякомыя, грыбы і ягады…

За шматгадовую гісторыю назапашана тутака мноства сацыяльных брэндаў, сярод якіх — нашы традыцыі і святы, падзеі і знакамітыя людзі, стравы і напоі…

Купальская **папараць-кветка** — яскравы, арыгінальны і, на мой погляд, першы і галоўны беларускі брэнд, які дайшоў да нас з глыбіні вякоў і які праз добрую «раскрутку» мог бы, і я спадзяюся, будзе прыносіць краіне немалыя дывідэнты і ўмацоўваць беларускую нацыю.

Малюнак 42. На Купальскую ноч



Ёсць вялікі брэндавы патэнцыял і на ўзроўні гарадоў, мястэчак, вёсак. Прыклад — гістарычныя гербы беларускіх гарадоў. Іх выявы можна выкарыстоўваць, каб натхніцца падчас распрацоўкі брэнду сваіх прадуктаў і паслуг, калі жывеш у адпаведным раёне ці вобласці.




Малюнак 43. Прыклады брэндаў — гербаў беларускіх гарадоў

Мясцовыя і персанальныя брэнды — моцныя рычагі для развіцця гаспадарак і тэрыторый.

Цюльпанавыя фэсты ў Нідэрландах, Робін Гуд у Ноцінгеме, швейцарскія шакалад і гадзіннікі, французскія каньяк і шампанскае, Вялікая кітайская сцяна, Гранд-Каньён у ЗША… А што далёка хадзіць: балота Ельня, Блакітныя азёры, Белавежская пушча, бабруйскі зефір, мясціны нараджэння Касцюшкі і Шагала… Тут можна працягваць бясконца. Аднак у гэтым пераліку пакуль што мала лакальных брэндаў невялікіх вытворцаў з вёсак і мястэчак Беларусі. Хоць пачатак ужо ёсць.




Людміла Дунец з Ушачаў расказала, як яна шукала-выбірала брэндавую назву сваму хатняму хлебу і ўвогуле сваму хлебнаму захапленню-бізнесу. Яшчэ да таго, як яна пачала пячы хлеб, з дзяцінства, яна цікавілася паэзіяй, складала вершы, была замілаваная паэзіяй слыннага паэта Беларусі, сына ушацкай зямлі Рыгора Барадуліна. І вось, калі ўжо пачала меркаваць-прыкідваць, якое найменне даць сваёй хлебнай справе, хатняй пякарні, у памяці ўсплыла назва верша Барадуліна «Жыта жыцця». «Гэта было як азарэнне!» — успаміналa Людміла. Так і вырашыла. І так і ідзе ўжо далей з гэтым запамінальным, каларытным, ужо вядомым у Беларусі брэндам. І аб'ядноўвае ў сваёй справе паэзію і стварэнне хлеба: гэта таксама частка яе брэнду. У вольны час яна выбірае з кніг Рыгора Барадуліна вершы, раздрукоўвае і ўкладае ў фірмовыя папяровыя торбачкі з хлебам на продаж. «Некаторыя пасля атрымання такога падарунка нават адшукваюць і перачытваюць паэтычныя зборнікі, — узгадвае Людміла і дадае: — Беларуская мова і роднае слова — хлеб для душы». Марыць Людміла пра сваю арт-прастору і пра фэсты паэзіі на Ушаччыне. І мы верым — усё атрымаецца!

У беларускіх вёсках і мястэчках ёсць значны патэнцыял для стварэння і раскруткі брэндаў. Як гэта зрабілі, напрыклад, у Моталі з вясельным караваем, на Лепельшчыне — са святам «жаніцьба Цярэшкі» і з шэрагам іншых прадуктаў, свят і рамёстваў (прабачце, каго тут не згадалі).

У Спораўскім сельсавеце, што ў Бярозаўскім раёне, расказалі (на жаль, не пачаставалі пакуль! :) пра ўнікальную мясцовую страву: у печы на дровах падсцілаецца салома і запякаецца рыба. Казалі, што так не робяць у іншых месцах, што майстэрству такому ўжо некалькі стагоддзяў, і называюць гэтую страву «спораўскія семачкі». У 2019-м годзе традыцыі такога прыгатавання рыбы дадзены статус рэспубліканскай гісторыка-культурнай каштоўнасці.




Гэты рэцэпт і страва маглі б ператварыцца ў лакальны брэнд, які б прыносіў мясцовым жыхарам (і не толькі!) даход і славу. Думаецца тут пра тэматычны фэст, майстар-класы, выданне кулінарных кніг, рыбацкае спаборніцтва і выраб сувеніраў. Справы гэтыя чакаюць актыўных людзей і падтрымкі ад дзяржавы і бізнесу.

*Матэрыял падрыхтаваны з дапамогай Віталя Жуковіча з вёскі Спорава.*

Добры досвед брэндынгу тэрыторыі маецца ў Мёрскам раёне. Гэтая праца адбывалася ў межах міжнароднага праекта «Разам для грамады і прыроды:

узмацненне працэсу развіцця ў Мёрскім раёне праз партнёрства мясцовай улады і грамадзянскай супольнасці» (2019-2022 гг, менеджар праекта Алег Сівагракаў) з фінансавай падтрымкай Еўрапейскага саюза. Там была рэалізаваная брэндынгавая кампанія «Жураўлі і журавіны Мёрскага краю», у тым ліку распрацаваны брэнд раёна і прасторавы дызайн, выдадзены брэндбук. Усё гэта адбывалася ў супрацоўніцтве мясцовых жыхароў, адміністрацыі раёна і спецыялістаў па брэндынгу. Зараз, калі прыязджаеш у гэты край, заўважаеш асаблівыя элементы добраўпарадкавання, аздаблення сцен дамоў, малыя скульптурныя групы, брэндавыя колеры і вывы. Разам з прыродным багаццем гэтыя моманты ствараюць запамінальныя і ўнікальныя краявіды, прываблiваюць турыстаў. А ў мясцовых жыхароў — фармуюць пазітыўнае аптымістычнае ўспрыняцце свайго краю. Акрамя гэтага ўжо ёсць прыклады выкарыстання брэндавага стылю ў афармленні сваіх прадуктаў мясцовымі вытворцамі.















Адным з вынікаў згаданага праекта стала распрацоўка брэндавых паштовак-візітовак усіх сельсаветаў раёна і гарадоў Мёры і Дзісна. Ніжэй – прыклад такой паштоўкі ад Павяцкага сельсавета, на тэрыторыі якога знаходзіцца знакаміты вадаспад на рацэ Вята.




Некалі ідэю такіх паштовак я падгледзеў у вандроўцы па Злучаных Штатах. Там кожны штат мае такія паштоўкі з пазначэннем дрэва штата, кветкі штата, птушкі штата, асноўных турыстычных аб'ектаў. Нашы творчыя людзі дадавалі ў паштоўкі сваіх сельсаветаў традыцыйныя стравы, партрэты знакамітых людзей, чыё жыццё і дзейнасць былі звязаныя з гэтымі мясцінамі. Атрымалася проста цудоўна! Хочацца, каб у гэтай сацыяльнай інавацыі быў працяг і каб з кожнага раёна (а можа і сельсавета ці нават вёскі) Беларусі можна было даслаць менавіта мясцовую паштоўку. А магчыма ж, што нават некаторыя мясцовыя сядзібы-гаспадаркі маглі б зрабіць такія паштоўкі з брэндавымі выявамі сваіх прадуктаў, ландшафтаў, дызайнам сада, гістарычнымі элементамі. Хто паспрабуе гэта зрабіць першым? Калі што — звяртайся, паспрабуем дапамагчы, не адразу рэсурсамі, але ж карысная парадай.

# Эканоміка, менеджмент, маркетынг для самазанятых на вёсцы

## § 18. Як выкарыстаць тэарэтычныя распрацоўкі на практыцы + асабісты профіль у Інстаграм

Распрацоўка і ўкараненне разнастайных мадэляў самазанятасці на вёсцы дасць магчымасць навучыць моладзь, сталых вяскоўцаў, патэнцыйных новых сельскіх жыхароў умению жыць і эфектыўна працаваць на вёсцы; паказаць перавагу сельскагаспадарчага экабізнесу ў сучасных умовах; дапамагчы зарыентавацца ў далейшым жыццёвым шляху, выявіць і развіць здольнасці, якія яны змаглі б рэалізаваць ва ўмовах рынкавай эканомікі.

Акрамя таго, з'явіцца магчымасць вырашаць экалагічныя праблемы, спалучаныя з вядзеннем сельскай гаспадаркі, а таксама прыцягнуць сельскіх жыхароў да гэтай праблематыкі і сумеснымі намаганнямі знайсці спосаб рэалізацыі ўстойлівага развіцця вёскі.

У гэтай частцы «Дапаможніка» мы разгледзім, як выкарыстаць тэарэтычныя распрацоўкі ў галіне эканомікі, менеджменту і маркетынгу на практыцы. Калі мы вядзём размову аб самазанятасці на вёсцы, пытанні эканамічнай эфектыўнасці выходзяць на першы план, таму і пры стварэнні ўласнай справы будзем улічваць асноўныя прынцыпы пералічаных вышэй навук.

### ПЛАНАВАННЕ ЎЛАСНАЙ СПРАВЫ

Планаванне ўласнай справы прапануем пачаць з распрацоўкі комплексу маркетынгу (від дзейнасці, які дапамагае выяўляць патрэбы патэнцыйных пакупнікоў і эфектыўна іх задавальняць). Асноўнымі элементамі комплексу маркетынгу (4P) з'яўляюцца:

Product – тавар (прадукт);
Price – кошт;
Place – рынак;
Promotion – прасоўванне.

Разгледзім гэтыя элементы больш падрабязна.

ТАВАР – пад таварам у маркетынгу разумеем усё, што можа быць прапанавана пакупніку для задавальнення яго патрэб: і тавар як матэрыяльны аб'ект, і паслугу, і інфармацыю.

Пры прыняцці рашэння аб тым, які від дзейнасці можа стаць асновай тваёй самазанятасці, могуць быць выкарыстаны розныя мадэлі:

1. **продаж прадукту ці паслугі**, напрыклад, гандаль садавінай, гароднінай, арганічнай ежай ці здача ў арэнду хатак у вёсцы;
2. **прафесійныя веды як крыніца даходаў**, напрыклад, ты добры спецыяліст па пермакультурным пады-

ходзе і зарабляеш на правядзенні майстар-класаў, продажы ў сацыяльных сетках гайдаў (дапаможнікаў) па пермакультарнай гаспадарцы, прафесійным кансультаванні з выездам да гаспадароў і інш.

3. **Лад жыцця (life style)**, які ты прапагандуеш, можа зрабіцца тваёй крыніцай даходаў. Больш падрабязна аб гэтым будзем гаварыць далей.

Могуць выкарыстоўвацца і іншыя мадэлі, а таксама спалучэнне некалькіх з іх.

РЫНАК — пад рынкам у маркетынгу разглядаецца аднастайная па канкрэтным крытэрыі група спажыўцоў. Паспрабуй «намаляваць» партрэт патэнцыйнага спажыўца, адкажы на пытанні: хто ён паводле полу, узросту, якія яго інтарэсы і звычкі, болевыя пункты, узровень даходу, геаграфічнае размяшчэнне (можна скарыстаць шаблон у дадатку 2.) Гэта дапаможа на наступным этапе пры вызначэнні каналаў прасоўвання прадукту і цэнаўтварэнні.

Таксама трэба вызначыцца з тым, праз якія каналы збыту будзе ажыццяўляцца продаж, таму што выдаткі на збыт, як сведчыць практыка, могуць дасягаць да 40% агульнага ўзроўню выдаткаў вытворцы.

На практыцы, у залежнасці ад колькасці пасрэднікаў, вылучаюць некалькі відаў каналаў збыту (глядзі малюнак):




Малюнак. Каналы збыту прадукту

У практыцы самазанятых часцей за ўсё выкарыстоўваюцца нулявы і аднаўзроўневы каналы збыту. Вельмі эфектыўнымі з'яўляюцца разнастайныя формы кааперацыі з іншымі вытворцамі, а таксама кароткія ланцужкі пастаўкі прадукту. У табліцы ахарактарызаваны асноўныя віды кароткіх ланцужкоў пастаўкі сельскагаспадарчай прадукцыі.

Табліца. – Характарыстыка асноўных відаў кароткіх ланцужкоў паставак сельскагаспадарчай прадукцыі

| Від кароткага ланцужка паставак/ Геаграфія тэрміна | Характарыстыка | Асаблівасці | Прынцып/мэта |
|---|---|---|---|
| **Фермерскія рынкі** Вялікабрытанія, ЗША, Кітай («мокрыя рынкі»), Еўрапейскі Саюз («Ад фермы да стала»), Рэспубліка Беларусь і краіны СНД («харчовыя рынкі») | Месцы рознічнага гандлю з удзелам фермераў, якія прадаюць прадукты харчавання спажыўцам | Фермерскія рынкі могуць быць крытымі і адкрытымі (як правіла, маюць сезонны характар). Звычайна складаюцца з кіёскаў, сталоў і стэндаў, дзе фермеры прадаюць сваю прадукцыю, жывых жывёл і расліны, а таксама гатовыя прадукты і напоі | Здаровае харчаванне, захаванне мясцовых гатункаў раслін, падтрыманне невялікіх «устойлівых» ферм (гаспадарак)/ Задавальняюць спажывецкі попыт на больш свежыя прадукты (праводзяць менш часу ў дарозе) і з вялікай разнастайнасцю асартыменту |
| **Салідарная сельская гаспадарка** (Solidarische Landwirtschaft) Аўстрыя, Германія **Сельская гаспадарка, якая падтрымліваецца супольнасцю** (мадэль CSA) ЗША, Канада **Схема скрынкі** (скрынкавыя рашэнні) Вялікабрытанія | Сетка або асацыяцыя людзей, якія ўзялі на сябе абавязацельства падтрымліваць адну або больш мясцовых ферм і падзяляюць рызыкі і выгады ад сумеснай вытворчасці прадуктаў харчавання. Спажывец можа падпісацца на ўраджай ці пэўнай фермы, ці групы ферм. | Засяроджаны на вытворчасці высакаякасных прадуктаў харчавання для мясцовай супольнасці, часта з выкарыстаннем метадаў арганічнага або біядынамічнага земляробства і структуры падзелу рызык і маркетынгу. Група спажыўцоў гатова прафінансаваць бюджэт на ўвесь сезон, каб атрымліваць якасныя прадукты. | Празрыстасць, клопат аб навакольным асяроддзі, прамыя сувязі паміж вытворцамі і спажыўцамі/ абмен па справядлівых цэнах. |

| Від кароткага ланцужка паставак/ Геаграфія тэрміна | Характарыстыка | Асаблівасці | Прынцып/мэта |
|---|---|---|---|
| **Групы салідарнай (этычнай) закупкі** (Gruppi di Acquisto Solidale (GAS)) Італія | Сеткі, створаныя па ініцыятыве італьянскіх спажыўцоў, якія звязваюцца з фермерамі для арганізацыі альтэрнатыўных сістэм харчовых паставак | Ствараюцца спажыўцамі, якія супрацоўнічаюць, каб купляць прадукты харчавання і іншыя тавары непасрэдна ў вытворцаў або буйных рознічных гандляроў па кошце, справядлівым для абодвух бакоў | Людзі і навакольнае асяроддзе важнейшыя за прыбытак/ Звесці да мінімуму ўздзеянне транспарту на навакольнае асяроддзе / Абарона правоў жанчын, дзяцей, карэнных народаў праз выбар мясцовых прадуктаў |
| Асацыяцыі па падтрыманні сельскай гаспадаркі | Грамадскія ініцыятывы, якія падтрымліваюць фермераў і арганічную сельскую гаспадарку шляхам прамых сувязяў паміж фермерамі і спажыўцамі | | |

КОШТ – на этапе ідэі, не маючы поўнага ўяўлення аб тым, як будзе ў выніку выглядаць новы прадукт, складана ўявіць канчатковы кошт тавару і вызначыць маржынальнасць продажу. Але ад цябе ніхто і не чакае 100% дакладнасці. Няхай гэта будзе грубы разлік, але для таго, каб яго зрабіць, выканай некалькі вельмі карысных крокаў:

- ацані попыт на тавар і сфармулюй свае чаканні па ўзроўні продажу;
- правядзі канкурэнтны аналіз і вызначы прыкладную цану, па якой твой тавар будзе на фоне канкурэнтных тавараў выглядаць канкурэнтаздольным;
- задумайся над тым, колькі б табе хацелася зарабляць з продажу прадукту за месяц, і ў выніку сфарміруй арыенцір па фінальным кошце прадукту.

Адным з найбольш распаўсюджаных метадаў цэнаўтварэння, арыентаваных на выдаткі вытворчасці, з'яўляецца затратны метад. Сутнасць яго заключаецца ў тым, што да разлічанага сабекошту адзінкі прадукцыі дадаецца зададзены памер прыбытку, а таксама падаткі і непадатковыя плацяжы, якія непасрэдна павялічваюць кошт.

**К = С + П + Пд**

К– кошт
С – сабекошт
П – прыбытак
Пд – падаткі

Два іншыя падыходы арыентуюць на ўлік цэн канкурэнтаў і ўнікальных якасцей прадукта. Калі тавар аналагічны таварам асноўнага канкурэнта, то прызначаецца цана, блізкая да цаны тавару гэтага канкурэнта. На малюнку адлюстравана канцэптуальная мадэль прызначэння цаны.

| Занадта нізкая цана | Магчымая цана | | | Занадта высокая цана |
|---|---|---|---|---|
| Атрыманне прыбытку пры такой цане немагчыма | Сабекошт прадукцыі | Цэны канкурэнтаў і тавараў-заменнікаў | Унікальныя якасці прадукту | Фарміраванне попыту пры такой цане немагчыма |

Малюнак 44. Мадэль вызначэння цэн

Мінімальна магчымая цана вызначаецца сабекоштам прадукцыі, максімальны — наяўнасцю нейкіх унікальных яе якасцяў. Цэны тавараў канкурэнтаў і тавараў-заменнікаў даюць сярэдні ўзровень, якога вытворца можа прытрымлівацца пры прызначэнні цаны.

## ПРАСОЎВАННЕ ЎЛАСНАГА ПРАДУКТУ

Для прасоўвання ўласнага прадукту могуць быць выкарыстаны разнастайныя інструменты маркетынгу: асабісты продаж, рэклама, стымуляванне збыту.

Калі аб'ёмы вырабу невялікія, дзейсным інструментам будзе асабісты продаж, які прадугледжвае непасрэдны кантакт прадаўца (вытворцы) і спажыўца. Але калі нам патрэбна ахапіць вялікую аўдыторыю, гэты інструмент робіцца неэфектыўным.

Адным з дзейсных сродкаў прасоўвання з'яўляюцца сацыяльныя сеткі. Даследаванні сведчаць, што найбольш папулярнымі сацыяльнымі сеткамі ў Беларусі ў 2023 годзе былі:

- TikTok — 5,63 млн. карыстальнікаў
- Instagram — 3,9 млн. карыстальнікаў
- LinkedIn — 880 тыс. карыстальнікаў
- Facebook — 701,7 тыс. карыстальнікаў
- X (Twitter) — 220,3 тыс. карыстальнікаў

Больш падрабязную статыстыку па аўдыторыі сацыяльных сетак можна паглядзець па спасылцы: https://datareportal.com/reports/digital-2024-belarus

Разгледзім асаблівасці стварэння і прасоўвання свайго профілю ў адной з найбольш папулярных у Беларусі сацыяльных сетках — Instagram.

## ЭТАПЫ СТВАРЭННЯ АСАБІСТАГА ПРОФІЛЮ Ў ІНСТРАГРАМ

### 1. Аватар

- *для кампаній: лагатып ці фота прадукцыі*
- *для прасоўвання асабістага брэнду: партрэтнае фота добрай якасці*

### 2. Лагін (Імя карыстальніка)

- *выкарыстоўвай назву кампаніі або ключавыя словы*

*сваёй дзейнасці (для асабістага брэнду тое ж самае);*
- *не перагружай лагін: ён павінен быць кароткім і інфарматыўным;*
- *па магчымасці пазбягай кропак і падкрэсліванняў, а калі не атрымліваецца, выкарыстоўвай іх па мінімуме;*
- *бывае так, што лагін, які ты хочаш выкарыстаць, ужо заняты, крэатыўна падыходзь да стварэння іншага лагіну.*

**3. Імя**

- *пазнач сутнасць праекта, ключавыя словы, якія адлюстроўваюць тваю дзейнасць, заклік да дзеяння;*
- *калі трэба, пазнач горад (напрыклад, ты робіш дастаўку сваіх вырабаў толькі па Мінску);*
- *улічвай, што імя ранжыруецца ў пошуку;*
- *максімальны аб'ём імя 30 знакаў;*
- *не абавязкова пісаць назву кампаніі ў імені акаўнта, калі назва ўжо ёсць у лагіне і апісанні. Лепш выкарыстоўваць гэтыя 30 сімвалаў, каб пазначыць ключавыя словы, па якіх падпісчыкі могуць прыйсці з пошуку.*

**4. Апісанне акаўнта (Раздзел «Пра сябе»)**

- *гэта прэзентацыя тваёй кампаніі ці цябе як спецыяліста;*
- *коратка апішы, чым займаешся і чым можаш быць карысны («без вады»);*
- *для візуальнага падзелу тэзісаў можаш выкарыстоўваць эмодзі, але іх не павінна быць шмат;*
- *максімальны аб'ём 150 знакаў;*
- *у апісанні могуць таксама змяшчацца анонсы мерапрыемстваў, адрас, кантакты, спасылкі на твае іншыя рэсурсы (сайт, тэлеграм-канал і інш.)*

**5. Highlights (Раздзел «Актуальнае»)**

Highlights (хайлайты, вечныя сторыз) — гэта архівы Stories. Каб захаваць матэрыял у Highlights, трэба спачатку апублікаваць яго ў сваіх Stories. Highlights можна выкарыстоўваць для асобных рубрык (водгукі, катэгорыі тавараў, карысныя матэрыялы і г. д.)

- *Stories у Highlights можна захоўваць толькі ў храналагічным парадку, таму загадзя прадумай парадак загрузкі.*

**6. Бізнес-акаўнт**

Бізнес-акаўнт у Instagram дае дадатковыя магчымасці:

- *пад імем будзе адлюстроўвацца катэгорыя кампаніі;*
- *з'явіцца пашыраная статыстыка акаўнта;*
- *з'явіцца магчымасць уключыць кнопкі спосабаў сувязі і адрасы кампаніі;*
- *дадатковыя магчымасці пры запуску рэкламы;*
- *каб падключыць бізнес-рахунак, у цябе павінна быць старонка і ў Facebook. Стварыць яе можна па спасылцы:* https://www.facebook.com/pages/creation

**7. Рэвізія акаўнта**

Калі наладзіш і аформіш акаўнт, паспрабуй абстрагавацца і паглядзець на яго поглядам выпадковага карыстальніка — ці ўсё табе зразумела з апісання, назваў, спасылак. Захацелася б табе самому ці самой

скарыстацца прапановай ці падпісацца на акаўнт? Пакажы акаўнт сваім сябрам, знаёмым. Чэк-ліст для стварэння профілю ў Instagram у дадатку 3.

На другім этапе для больш дэтальнага апісання ўсіх працэсаў тваёй справы прапануем скарыстацца **бізнес-мадэллю Астэрвальдэра** (Business Model Canvas), з дапамогай якой можна ўлічыць і абагульніць розныя напрамкі сваёй дзейнасці. Шаблон бізнес-мадэлі глядзі ў дадатку 4.

Шаблон бізнес-мадэлі Lean business canvas складаецца з дзевяці элементаў. Гэта спрошчаная версія шаблону бізнес-мадэлі, распрацаванага Івам Пінье і Алексам Астэрвальдэрам.

Працу з Lean business canvas пачынаем з раздзелу «Праблемы». Праблемы — гэта менавіта тыя кліенцкія задачы, якія ты будзеш вырашаць.

Другім этапам ты разглядаеш сегменты кліентаў на якіх арыентавана твая справа. Падрабязна віды сегментаў спажыўцоў мы разглядалі вышэй.

Трэці крок: паглядзі ў цэнтр, і ўбачыш унікальную каштоўнасную прапанову. Менавіта на гэтым этапе табе трэба сфармуляваць, у чым на самай справе заключаецца твая каштоўнасць. Ніжэй у цябе будзе так званая агульная канцэпцыя (high-level concept). Тут табе трэба будзе дакладна вызначыць, хто ты такі або такая. Скажам, ты будзеш ладзіць фестываль, але які менавіта фестываль? Ты можаш падумаць пра тое, як растлумачыць яго простымі словамі, каб людзі адразу ж разумелі, што гэта за прадукт, якую каштоўнасць ты ім прапануеш.

Затым табе трэба прапанаваць план, рашэнне (для гэтага ёсць спецыяльны раздзел) і вызначыць каналы. Канал — гэта тое, якім чынам ты даносіш сваю ўнікальную прапанову да спажывецкіх сегментаў.

Затым вызначаюцца патокі даходаў: як ты можаш зарабляць, якая мадэль цэнаўтварэння. Як ты генеруеш прыбытак? Гэта можна рабіць па-рознаму (глядзі вышэй).

Наступны крок — структура выдаткаў. У колькі табе абыдзецца стварэнне і дастаўка гэтай каштоўнасці?

Аналізуючы ўсё гэта, ты зразумееш, якія твае ключавыя крытэрыі (метрыкі). Крытэрыі для ацэнкі, напрыклад, дастаўкі тваёй каштоўнасці, тваіх даходаў або тваіх укладанняў, таму што ты хочаш мінімізаваць укладанні і павялічыць даходы. Таксама табе трэба пераканацца, што ты ведаеш, як вымераць ступень задаволенасці кліентаў. Якія крытэрыі ацэнкі тваёй каштоўнаснай прапановы?

І заключны аспект — канкурэнтная перавага. У бізнес-мадэлі павінна быць нешта, што тваім канкурэнтам нялёгка паўтарыць. Гэта азначае, што ў цябе заключаны дагавор аб выключных правах продажу з аўтарам альбо ў цябе ёсць гандлёвая марка і г. д.

Праца з гэтым шаблонам дазволіць табе ўсвядоміць агульную канцэпцыю сваёй справы, каб пасля распрацаваць больш дасканалую мадэль, з лічбамі, мэтамі і тэрмінамі іх дасягнення.

## § 19. Карысныя парады па менеджменце, маркетынгу, публічных выступах і вядзенні перамоў

**10 сакрэтаў паспяховага менеджменту** для агратурызму і арганічнай вытворчасці

Не існуе чароўнай пігулкі, дзякуючы якой твая справа зробіцца паспяховай, шлях кожнага гаспадара — гэта шэраг спроб і памылак, поспехаў і няўдач, але прытрымліванне пэўных прынцыпаў дзейнасці з большай імавернасцю прывядзе цябе да поспеху:

1. Вызначы свае мэты і стратэгіі.

«Пачынаючы, уяўляй канчатковую мэту» (Стывен Р. Кові «Сем навыкаў высокаэфектыўных людзей»). Маючы дакладную мэту сваёй дзейнасці і канкрэтныя яе паказчыкі, мы робім сваю мару рэалізаванай ідэяй.

2. Распрацуй план дзеянняў і прытрымлівайся яго.
3. Для распрацоўкі сістэмы мэт можна скарыстацца SMART-мадэллю.
4. Будзь гнуткім і гатовым да змен.
5. Наладзь эфектыўную камунікацыю ўнутры сваёй каманды.
6. Навучайся ўвесь час сам ці сама і навучай членаў сваёй каманды, заахвочвай іх развіццё.
7. Сачы за фінансамі і кантралюй выдаткі — зрабіць гэта можна і праз гатовыя шаблоны, але самы просты спосаб – вядзенне ўліку праз звычайныя табліцы ў Excel.
8. Аналізуй вынікі сваёй працы і параўновай іх з паказчыкамі рэзультатыўнасці, якія вынachаны ў тваёй бізнес-мадэлі, карэктуй стратэгію пры неабходнасці.
9. Імкніся да высокай якасці прадукцыі або паслуг.
10. Паважай сваіх кліентаў і партнёраў.
11. Развівай сваю справу ў адпаведнасці з этычнымі прынцыпамі і клапаціся аб навакольным асяроддзі.

---

**9 прыёмаў сучаснага маркетынгу** на службе вясковай гаспадаркі

Самазаняты на вёсцы можа выкарыстоўваць разнастайныя інструменты для прасоўвання ўласнай прадукцыі ці паслуг. Вось некаторыя з іх.

1. Інтэрнэт-маркетынг: стварэнне міні-сайта ці старонкі ў сацыяльных сетках. Выкарыстанне сацыяльных сетак, такіх як Instagram, Facebook, TikTok і іншых для публікацыі фатаграфій прадуктаў, гісторый аб ферме, рэцэптаў і водгукаў ад кліентаў і г. д.

Існуюць платформы, якія дазваляюць зрабіць міні-сайт, не маючы навыкаў праграмавання (no-code платформы), напрыклад: Softr, Glide, Coda, Airtable і іншыя.

Калі ў цябе няма часу ці жадання засвойваць самастойна гэтыя інструменты, можна скарыстацца гатовымі рашэннямі па даступным кошце, напрыклад https://grabtreecomp.softr.app/.

2. Рэклама ў **мясцовых** чатах, групах у сацыяльных сетках у Viber, Telegram: размяшчэнне там аб'яў аб продажы арганічных прадуктаў харчавання, мерапрыемствах і інш.
3. Удзел у кірмашах, выставах, фестывалях: гэта выдатны спосаб прыцягнуць новых кліентаў і прадэманстраваць якасць сваіх прадуктаў, знайсці кантакты для будучай каапераці. Удзел у мясцовых мерапрыемствах і фермерскіх рынках дапаможа зрабіць брэнд больш вядомым і завесці сувязі з патэнцыйнымі кліентамі.
4. Сарафаннае радыё: выкарыстанне рэкамендацый ад задаволеных кліентаў для прыцягнення новых пакупнікоў.
5. Брэндынг: распрацоўка ўнікальнага лагатыпа і ўпакоўкі для сваіх прадуктаў, каб вылучыцца сярод канкурэнтаў.
6. Прасоўванне праз блогі і сацыяльныя сеткі: супрацоўніцтва з блогерамі і інфлюэнсерамі, якія спецыялізуюцца на здаровым харчаванні і ладзе жыцця, прытрымліваюцца прынцыпаў устойлівага развіцця (напрыклад, no-waste і інш.).

Інфлюэнс-маркетынг – гэта доўгатэрміновыя і дружалюбныя кантакты з блогерамі, лідарамі меркаванняў. Галоўная мэта такіх адносін - цёплы і блізкі кантакт з аўдыторыяй. Блогеры дапамагаюць павысіць пазнавальнасць брэнду, прадукту.

7. Удзел у конкурсах і акцыях: правядзенне ў сацыяльных сетках акцый і конкурсаў для прыцягнення ўвагі да сваіх прадуктаў.
8. Адукацыйныя мерапрыемствы для наяўных і патэнцыйных кліентаў: правядзенне семінараў, сустрэч па правільным харчаванні і вырошчванні арганічных прадуктаў, вырошчванні і перапрацоўцы ўласнай прадукцыі.
9. Развіццё лаяльнасці кліентаў: зніжкі і бонусы пастаянным пакупнікам.

**(У дадатку 6 ты таксама знойдзеш 20 ключавых сцвярджэнняў, якія датычацца маркетынгу)**

---

### 12 каштоўных навыкаў публічных выступаў і вядзення перамоў

Навык публічных выступаў можа спатрэбіцца самазанятаму чалавеку ў такіх сітуацыях як:

- прэзентацыя свайго прадукту або паслугі на канферэнцыі, выставе, фестывалі або семінары;
- правядзенне трэнінгаў, майстар-класаў, творчых сустрэч або навучальных курсаў;
- вядзенне ўласнага блога ці канала на YouTube, дзе патрабуецца ўменне прыцягваць і ўтрымліваць увагу гледачоў;
- удзел у перамовах з патэнцыйнымі кліентамі ці партнёрамі;
- удзел у конкурсах і спабор-

ніцтвах, дзе патрабуецца ўменне выступаць перад вялікай аўдыторыяй (стартап-мерапрыемствы);
- навык публічных выступаў можа таксама дапамагчы павысіць сваю рэпутацыю ў прафесійным асяроддзі.

Асноўныя **навыкі**, якія дапамогуць палепшыць свае публічныя выступленні і вядзенне перамоў, пералічаны ніжэй.

1. Уменне прыцягваць увагу аўдыторыі.
2. Здольнасць усталёўваць кантакт з аўдыторыяй.
3. Уменне структураваць інфармацыю.
4. Навык выкарыстання жэстаў і мімікі для ўзмацнення эфекту гаворкі.
5. Уменне працаваць з голасам: тэмбр, гучнасць, інтанацыя.
6. Веданне асноўных правіл этыкету пры зносінах з людзьмі.
7. Уменне слухаць і чуць суразмоўцу.
8. Навык пераканання і аргументацыі.
9. Уменне знаходзіць кампрамісы і дамаўляцца.
10. Навык вядзення дыскусіі і вырашэння канфліктаў.
11. Уменне кіраваць сваімі эмоцыямі і кантраляваць стрэс.
12. Веданне асноў псіхалогіі зносін.

Каб развіць навык публічных выступаў, неабходна прытрымлівацца некалькіх **правіл:**

1. Практыка. Чым больш выступаеш перад аўдыторыяй, тым лепшым робіцца твой навык.
2. Падрыхтоўка. Добрая падрыхтоўка да выступлення дапаможа табе адчуваць сябе больш упэўнена і лепш арыентавацца ў матэрыяле.
3. Кантакт з аўдыторыяй. Паспрабуй наладзіць кантакт з аўдыторыяй, задавай пытанні, адказвай на іх, каб стварыць атмасферу зносін.
4. Яснасць і прастата. Гавары ясна і проста, пазбягай складаных тэрмінаў і доўгіх сказаў.
5. Эмоцыі. Дадай эмоцый у свой выступ, каб прыцягнуць увагу аўдыторыі.
6. Жэсты і міміка. Выкарыстоўвай жэсты і міміку для ўзмацнення эфекту ад свайго выступу.
7. Упэўненасць. Будзь упэўнены ў сабе і сваіх ведах, гэта дапаможа табе перамагчы стрэс і хваляванне перад выступам.
8. Рэпетыцыя. Прагані свой выступ некалькі разоў перад люстэркам або перад сябрамі, каб палепшыць свае навыкі.
9. Зваротная сувязь. Пасля выступу запытай зваротную сувязь у аўдыторыі ці калег, каб даведацца, што можна палепшыць у будучыні.

Прытрымліваючыся гэтых правіл, ты зможаш развіць свой навык публічных выступаў і стаць больш упэўненым аратарам.

# Заключэнне

Ну што ж, паважаны чытач. Калі ты даў ці дала рады дачытаць «Дапаможнік» да канца, то мы цешымся гэтым і ўспрымаем тваю настойлівасць як добры падмурак для выкарыстання сабраных тут ідэй, рэкамендацый, думак для развіцця сваёй сядзібы-гаспадаркі.

Спадзяёмся, што чытанне было не надта нудным, хоць мы і не абяцалі захапляльных прыгод і таямнічых дэтэктываў. Гэтыя прыгоды і дэтэктывы (так!) чакаюць цябе ў практычнай працы на сваёй зямлі, на падворку, у супольнасці з іншымі мясцовымі жыхарамі.

Мы раім выкарыстоўваць гэты «Дапаможнік» як і нататнік, пачаўшы з запаўнення «Чэк-ліста гаспадара ўстойлівай вясковай сядзібы». Занатоўвай таксама цікавыя моманты з свайго гаспадарання, каб потым падзяліцца з іншымі. Мы будзем і далей працаваць над «Дапаможнікам», дапаўняць і паляпшаць яго. І можа, і твае занатоўкі знойдуць у ім месца.

Мы ўпэўненыя, што на дарозе вясковага гаспадарання цябе чакае многа адкрыццяў і азарэнняў. А таксама — сяброўства, таварыства і любові.

Шлях гаспадарання на зямлі дасюль прайшлі ўжо мільярды нашых агульных суседзяў па планеце Зямля. І пройдзе яшчэ многа. Аднак у кожнага з іх гэты шлях быў асаблівы, напоўнены рознымі колерамі жыцця і разнастайнымі падзеямі. Тое ж будзе і з табой, паважаны калега, мы спадзяёмся, што ўжо можам так цябе называць. Усё будзе добра! Як казаў нехта мудры: «А калі не добра, тады гэта яшчэ не канец».

Нам бы вельмі хацелася, каб і надалей наша знаёмства падтрымлівалася, сувязі паміж прыхільнікамі ўстойлівага гаспадарання мацаваліся і пашыраліся. Для гэтага мы ў якасці першага кроку змясцілі гэты дапаможнік на сайце https://kuna-sdg.de/. Прыходзь туды, чытай, знаходзь кантакты і пішы нам, дзяліся сваімі думкамі, досведам, дасягненнямі і сумневамі. Будзем разам разбірацца ў гэтым. А разам — здолеем!

Поспехаў і здароўя!

# Літаратура


1. Алег Сівагракаў, “100 крокаў да ўстойлівага развіцця нашага мястэчка: Нататкі для эксперта, актывіста мясцовай супольнасці, дэпутата, мэра…” / – Мінск : Бінера, 2019.
2. Сіваграказ А.У., Ляmперт А.Я., “Дапаможнік па распрацоўцы стратэгій устойлівага развіцця вясковых тэрыторый”. // Пад рэдакцыяй Сівагракава А.У. – Мінск, “Колорград”, 2022, 47 с. (https://disk.yandex.by/d/iMR8KHNxr3Ou5Q).
3. Майкл Поллан, «Философия еды: правда о питании», Москва: Астрель, 2013.
4. Майкл Поллан, «Дилемма Всеядного. Шокирующее исследование рациона современного человека», Москва: Эксмо, 2017.
5. Анна Павловская, «Человек есть то, что он ест. Пищевые системы мира», Москва: «ЛомоносовЪ», 2022.
6. Александр Остервальдер, Ив Пинье, «Построение бизнес-моделей. Настольная книга стратега и новатора». – М.: Альпина, 2022.
7. Вадим Зеланд, «Кухня предков. Пища силы», СПб.: ИГ «Весь», 2023.
8. Ганно Харизиус, Рихард Фрибе, «Союз на всю жизнь. Почему бактерии наши друзья», Москва: Эксмо 2019.
9. Ицхак Адизес, «Развитие лидеров. Как понять свой стиль управления и эффективно общаться с носителями иных стилей». – М.: Альпина, 2022.
10. Сандор Элликс Кац, «Живая ферментация», Минск: Попурри, 2020.
11. Сивагракoв А. и Зуев Е. «Развитие предпринимательства в Республике Беларусь. Белая книга. – Минск, МОО «Экопартнёрство» и ОО «Женщины за возрождение Нарочанского края», 2020. – 128 с. (https://kuna-sdg.de/wp-content/uploads/2023/11/Entwicklung-des-Unternehmentums-in-laendlichen-Gebieten-von-Belarus.pdf).
12. Сиваграков Алег, «Сельские сообщества: потенциал саморазвития. Аналитические материалы и наблюдения, сделанные в ходе реализации проекта «Расширение экономических возможностей в сельской Беларуси». – Минск, «Новая Евразия», 2017.
13. Стивен Р.Кови, «Семь навыков высокоэффективных людей. Мощные инструменты развития личности». – М.: Альпина, 2019.
14. Стратегия устойчивого развития Миорского района на 2022 – 2035 годы. // Кузнецов И.В. и др. Под редакцией Сиваграковa А.В. – Минск, “Колорград”, 2022.
15. Kellermann, Kim (2020): Die Zukunft der Landwirtschaft. Wiesbaden: Springer Fachmedien Wiesbaden GmbH.
16. Wydler, Hans (2021): Mehr als Landwirtschaft. Soziale Dienstleistungen in landwirtschaftlichen Betrieben. Bern: Haupt Verlag AG.
17. Heintz, Veikko (2019): Solidarische Landwirtschaft - Betriebsgründung, Rechtsformen und Organisationsstrukturen. Hamm: ABL Verlag.
18. Wild, Stephanie (2012): Sich die Ernte teilen ...: Einführung in die Solidarische Landwirtschaft. Heimsheim: Joy Edition, Buchverlag and more.
19. Otterpohl, Ralf (2023): Das Neue Dorf: Vielfalt leben, lokal produzieren, mit Natur und Nachbarn kooperieren. Berlin: Ebupli.
20. Renker, Clemens (2018): Das neue Dorf. Gestalten, um zu überleben - vier Handlungsfelder zum Erhalt dörflicher Gemeinden. Wiesbaden: Springer Fachmedien Wiesbaden GmbH.

# Дадатак 1

## Чэк-ліст для вясковага жыцця і гаспадарання на прынцыпах устойлівага развіцця

| | Справа, крок, дзеянне, мерапрыемства | Узровень дасягнення, ступень прагрэсу | | | Заўвагі, нататкі, удакладненні[35] |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Нізкі | Сярэдні | Высокі | |
| 1. | Знаёмства з канцэпцыяй устойлівага развіцця | | | | |
| 2. | Пастаянны працяг адукацыі для ўстойлівага развіцця | | | | |
| 3. | Распрацоўка вобразу жаданай будучыні тваёй сядзібы | | | | |
| 4. | Узгадненне вобразу жаданай будучыні тваёй гаспадаркі з блізкімі, сям'ёй | | | | |
| 5. | Правядзенне аналізу тваёй гаспадаркі і яе асяроддзя | | | | |
| 6. | У тым ліку правядзенне SWOT-аналізу | | | | |
| 7. | Комплекснасць аналізу. Як у ім улічаны наступныя аспекты развіцця: | | | | |
| | 7.1. Прыродныя, экалагічныя | | | | |
| | 7.2. Сацыяльныя | | | | |
| | 7.3. Эканамічныя | | | | |
| 8. | Выбар (распрацоўка) прыярытэтных напрамкаў развіцця тваёй гаспадаркі | | | | |
| 9. | Падчас планавання і будаўніцтва дома і гаспадарчых пабудоў улічваліся патрабаванні УР, у тым ліку: | | | | |
| | 9.1. Улік вятроў, сонечнага святла, звычайнага надвор'я, змянення клімату, навакольнага асяроддзя | | | | |
| | 9.2. Улік неабходнасці зберажэння глебы | | | | |
| | 9.3. Улік неабходнасці зберажэння каштоўных прыродных і культурна-гістарычных аб'ектаў | | | | |

[35] У гэтых графах можна, напрыклад, пазначыць, што дадзены пункт не тычыцца вашага выпадку.

| | Справа, крок, дзеянне, мерапрыемства | Узровень дасягнення, ступень праграсу | | | Заўвагі, нататкі, удакладненні[35] |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Нізкі | Сярэдні | Высокі | |
| 9. | 9.4. Улік традыцыйнага для твайго населенага пункта, мясцовасці стылю будынкаў, традыцыйных матэрыялаў, колераў | | | | |
| 10. | Падчас ландшафтнага і гаспадарчага планавання ўлічваліся патрабаванні УР | | | | |
| 11. | Адносіны з суседзямі, аднавяскоўцамі | | | | |
| 12. | Абмен досведам (устойлівага) гаспадарання з суседзямі | | | | |
| 13. | Удзел у агульных мерапрыемствах разам з суседзямі, аднавяскоўцамі, у межах раёна | | | | |
| 14. | Падчас агульных мерапрыемстваў разам з суседзямі, аднавяскоўцамі, у межах раёна вырашаюцца пытанні ўстойлівага развіцця адпаведных тэрыторый | | | | |
| 15. | Агульныя мерапрыемствы разам з суседзямі, аднавяскоўцамі, у межах раёна праводзяцца з улікам прынцыпаў УР | | | | |
| 16. | Распрацоўка стратэгіі ўстойлівага развіцця тваёй гаспадаркі | | | | |
| 17. | У стратэгіі зафіксаваныя доўгатэрміновыя прыярытэты | | | | |
| 18. | У стратэгіі зафіксаваныя індыкатары, якія плануецца дасягнуць | | | | |
| 19. | Распрацаваны і рэалізуецца гадавы план для ажыццяўлення стратэгіі | | | | |
| 20. | У тваёй вёсцы, мястэчку, раёне распрацаваная мясцовая стратэгія ўстойлівага развіцця | | | | |
| 21. | Ты і твая сям'я ўдзельнічаеце ў распрацоўцы і рэалізацыі мясцовай стратэгіі УР | | | | |
| 22. | Ці адрозніваеш ты гаспадаранне па прынцыпах<br>а) пермакультуры;<br>б) арганікі;<br>в) біядынамікі;<br>г) экалагічнасці? | | | | |
| 23. | Табе вядома, як самастойна прааналізаваць біяхімічны склад глебы на тваёй дзялцы. | | | | |

| | Справа, крок, дзеянне, мерапрыемства | Узровень дасягнення, ступень прагрэсу | | | Заўвагі, нататкі, удакладненні[35] |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Нізкі | Сярэдні | Высокі | |
| 24. | Ты ўсведамляеш, наколькі важна мець «жывую глебу» і што такое мікрабіёта глебы. | | | | |
| 25. | Ты ўжо вызначыўся ці вызначылася, якую свойскую жывёлу і з якой мэтай будзеш сабе заводзіць. | | | | |
| 26. | Табе вядома, наколькі важна мець на дзялцы біяразнастайнасць, і як ты будзеш у сябе яе павялічваць, пазбягаючы вырошчвання інвазіўных і патэнцыйна інвазіўных відаў. | | | | |
| 27. | Ты ўсведамляеш карысць ад энтамафагаў і ведаеш, якімі сродкамі ты іх прывабіш на сваю дзялку. | | | | |
| 28. | Табе знаёмыя тэхналогіі кампаставання, ты ведаеш, як правільна зрабіць эфектыўны кампоснік. | | | | |
| 29. | Ты ўсведамляеш ролю і значэнне мікарызы для сваёй глебы. | | | | |
| 30. | Ты ведаеш умовы развядзення каліфарнійскіх чарвей і карысць ад біягумусу. | | | | |
| 31. | Табе знаёмыя спосабы павышэння нутрыентнай каштоўнасці садавіны і гароднiны. | | | | |
| 32. | Наколькі ты валодаеш тэхналогіямі ферментацыі хатніх прадуктаў харчавання? | | | | |
| 33. | Ці прасочваеш ты сувязь карыснасці ежы ад спосабаў яе прыгатавання? | | | | |
| 34. | Наколькі арыентуешся ў юрыдычных правілах рэалізацыі ўласнай харчовай прадукцыі? | | | | |
| 35. | Наколькі глыбока разумееш хібы грамадскага харчавання на падставе канвенцыйнага прадукту? | | | | |
| 36. | Якія перавагі, на тваю думку, дае вясковая каапераця вакол супольнага прадукту? | | | | |
| 37. | Ці змянілася ў цябе стаўленне да арганізацыі ўласнага прадпрымальніцтва на вёсцы пасля нашага курсу? | | | | |
| 38. | Ці маюцца ў цябе думкі, якім павінен быць наступны курс для развіцця тваёй дзейнасці на вёсцы? | | | | |

# Дадатак 2

## Шаблон профілю спажыўца

| | |
|---|---|
| Пол | |
| Узрост | |
| Сямейнае становішча (дзеці) | |
| Месца жыхарства | |
| Сфера дзейнасці | |
| Пасада | |
| Узровень даходу | |
| Мэты і асноўныя каштоўнасці | |
| Страхі (фобіі) | |
| Патрэбы (жаданні) | |
| Крыніцы інфармацыі, якімі карыстаецца | |

# Дадатак 3

## Чэк-ліст стварэння асабістага профілю ў Інстраграм

| Што зрабіць | Адзнака аб выкананні |
|---|---|
| **Вызначыцца з мэтай стварэння і бізнес-мадэллю** | |
| **Зрабіць аналіз профіляў канкурэнтаў** | |
| **Вызначыцца з мэтавай аўдыторыяй** | |
| **Афарміць профіль:** | |
| • аватар | |
| • лагін | |
| • імя | |
| • апісанне профілю | |
| • актуальнае (highlights) | |
| • рэвізія профілю | |
| • стварэнне кантэнт-плана | |
| • падрыхтоўка кантэнту | |
| **Выкарыстаць бясплатныя метады прасоўвання профілю:** | |
| • Reels | |
| • Рэпосты і каментары | |
| • Хэштэгі | |
| • Супрацоўніцтва | |
| • Трафік з іншых платформ (зрабіць спасылку ў іншых сацсетках) | |
| **Аналіз эфектыўнасці профілю (прырост мэтавай аўдыторыі)** | |
| **Стварэнне бізнес-акаунта** | |
| **Наладка рэкламнага кабінета** | |

# Дадатак 4

## Шаблон бізнес-мадэлі

<table>
<tr><td rowspan="2">Праблемы</td><td>Рашэнні</td><td rowspan="2">Каштоўнастная прапанова</td><td>Канкурэнтныя перавагі</td><td rowspan="2">Сегменты спажыўцоў</td></tr>
<tr><td>Ключавыя метрыкі (паказчыкі эфектыўнасці)</td><td>Каналы пастаўкі</td></tr>
<tr><td colspan="3">Структура выдаткаў</td><td colspan="2">Крыніцы даходаў</td></tr>
</table>

# Дадатак 5

## Шаблон кантэнт-плана для сацыяльных сетак (на месяц)

| Дата публікацыі | Від сацыяльнай сеткі | Від публікацыі | Тэма, змест публікацыі | Адзнака аб выкананні |
|---|---|---|---|---|
| ... | | | | |
| 22.04.2024 | Instagram, TikTok | Гісторыя, пост | Дзень Зямлі | выканана |
| ... | | Апытанне | | |
| ... | | Конкурс | | |
| ... | | | | |
| | | | | |

# 20 ключавых сцвярджэнняў, якія датычацца маркетынгу

**1. Маркетынг ляжыць у аснове ўсяго.** Маркетынг з'яўляецца цэнтральным аспектам пры вызначэнні місіі і стратэгіі дзейнасці самазанятага, а таксама залогам яго поспеху ў цэлым. Ён вызначае, якую пазіцыю на рынку вы займаеце адносна сваіх канкурэнтаў і патэнцыйных кліентаў.

2. Маючы дакладнае **стратэгічнае бачанне** (візію) сваёй дзейнасці, будзе прасцей вызначыць свае перспектывы на будучыню. Стратэгічнае бачанне па сутнасці — гэта «мары пра будучыню, карцінка, апісаная словамі, якая б натхняла людзей, і пры гэтым была не проста прыгожай марай, але і цалкам рэальнай для ажыццяўлення ідэяй».

**3. Поспех.** Быць паспяховым хоча любы чалавек і любая арганізацыя. Але слова «поспех» можна вызначаць па-рознаму, таму вельмі важна, каб вы вызначылі для сябе, што для вас азначае поспех.

**4. Што такое «маркетынг»?** Розныя людзі разумеюць пад гэтым словам зусім розныя паняцці. Часта яго выкарыстоўваюць, калі кажуць пра метады прасоўвання і продажу. На самай справе, тэрмін «маркетынг» таксама ўключае ў сябе паняцце «маркетынгавай стратэгіі» і «даследавання рынку».

**5. Аддзел маркетынгу.** На многіх прадпрыемствах «аддзел маркетынгу» — гэта аддзел, які займаецца рэкламай і прасоўваннем прадукцыі. Калі разглядаць маркетынг са стратэгічнага пункту гледжання, то да «аддзела маркетынгу» будзе адносіцца і ўладальнік, і вышэйшае кіраўніцтва або савет дырэктараў.

**6. Стратэгічны маркетынг у параўнанні з аператыўным маркетынгам.** Стратэгічны маркетынг разглядае «агульную карціну» пры выбары пэўнай катэгорыі прадукцыі і канцэнтрацыі выключна на тых рынках, якія мы для сябе вызначылі. Затым у гульню ўступае аператыўны маркетынг (або маркетынгавыя камунікацыі), які адказвае за фармуляванне пэўных пасланняў для канкрэтных рынкаў.

**7. Маркетынгавая стратэгія.** Маркетынгавая стратэгія — гэта ўнікальная формула кожнай арганізацыі, якая выводзіцца зыходзячы з разумення свайго місіі, свайго месца на больш шырокім рынку адносна канкурэнтаў, а таксама старанна выбраных рынкаў.

**8. Выбар рынкаў.** Стратэгічны маркетынг прадугледжвае дбайны выбар рынкаў, яго сегментаў і ніш. Таксама ён мае на ўвазе прыняцце рашэння датычна таго, на якіх рынках не варта працаваць.

**9. Даследаванне рынку.** Іншымі словамі — уменне

прыслухоўвацца да меркавання спажыўца. Ініцыятывы па даследаванні рынку — гэта не абавязкова складаныя і дарагія мерапрыемствы. Мы можам прыдумаць простыя і незатратныя спосабы таго, як нам лепш зразумець сваіх кліентаў. Па сутнасці, даследаванне рынку ў большай ступені мае на ўвазе фарміраванне пэўнага падыходу ў працы, чым выкарыстанне нейкіх методык; усведамленне таго, што мы не можам ведаць абсалютна ўсё, і што карысныя ідэі і меркаванні нам могуць падказаць нашы дарагія кліенты.

**10. Канкурэнтная перавага.** Трэба дакладна ўсведамляць, што рынак — гэта асяроддзе, дзе пануе высокая канкурэнцыя. Адны канкурэнты пераўзыходзяць нас па пэўнай прадукцыі або паслугах ці ж абслугоўваюць вузкаспецыялізаваныя сегменты рынку. Мы можам прыняць рашэнне стаць іх прамымі канкурэнтамі. Ці ж, разважаючы са стратэгічнага пункту гледжання, абысці іх, сканцэнтраваўшы сваю ўвагу на тым, у чым мы іх можам перасягнуць. Замест пытання: «Што мы можам рабіць лепш за ўсё?» мы павінны задаць сабе такое пытанне: «Што мы можам рабіць лепш, чым нашы канкурэнты?» Гэта дапаможа нам вызначыць свае канкурэнтныя перавагі і выкарыстоўваць іх. А далей нам трэба проста сканцэнтраваць свае намаганні на тым, што ў нас атрымліваецца рабіць лепш, чым у нашых канкурэнтаў.

**11. Тры «М» у маркетынгу.** Гэта просты, але вельмі эфектыўны інструмент маркетынгавай камунікацыі. Па-першае, для кожнага віду прадукцыі або паслуг неабходна вызначыць свой мэтавы рынак або, калі магчыма, некалькі розных рынкаў. Гэта першая «М» — Market (Рынак). Па-другое, для кожнага рынку трэба сфармуляваць пасланне. Калі для аднаго віду прадукцыі былі вызначаны некалькі рынкаў, то для кожнага з гэтых рынкаў можа спатрэбіцца сваё асобнае пасланне. І, вядома ж, у такіх пасланнях неабходна зрабіць акцэнт на спажывецкія перавагі. Гэта другая «М» — Message (Пасланне). Трэцяя «М» — Medium (Спосаб данясення паслання). Гэта сродак, які дапаможа нам данесці кожнае пасланне свайму рынку. Каб данесці пэўнае пасланне да пэўнага рынку, неабходна выбраць найлепшы спосаб яго данясення. Каб выбраць самы прыдатны спосаб данясення паслання, неабходна засяродзіцца на кліентуры рынку.

**12. Мадэль трох «М» у маркетынгу трэба выкарыстоўваць у правільным парадку.** Market (Рынак), Message (Пасланне) і Medium (Сродак данясення паслання). Няправільны парадак выкарыстання трох «М» — адна з найбольш распаўсюджаных памылак і прычын няўдач у маркетынгавай камунікацыі.

**13. Розныя пасланні для розных катэгорый спажыўцоў.** Нават у адным і тым жа прадукце розныя спажыўцы могуць цаніць абсалютна розныя характарыстыкі. Таму адносна аднаго і таго ж прадукту маг-

чыма, спатрэбіцца сфармуляваць розныя пасланні.

**14. Найлепшы сродак для камунікацыі.** Той, які з'яўляецца самым прыдатным з пункту гледжання спажыўца, якому адрасавана пасланне, і ў залежнасці ад самога паслання. Не варта выбіраць сродак для камунікацыі, кіруючыся выключна сваімі асабістымі перавагамі.

**15. Сацсеткі.** Facebook, Instagram і іншыя сацыяльныя платформы могуць стаць вельмі эфектыўнымі інструментамі для маркетынгавай камунікацыі. Але толькі ў тым выпадку, калі яны сапраўды з лагічнага пункту гледжання з'яўляюцца найлепшым спосабам данясення канкрэтных пасланняў да канкрэтных рынкаў, у адпаведнасці з прынцыпам, закладзеным у мадэлі трох «М» у маркетынгу.

**16. Міжнародны маркетынг** павінен улічваць асаблівасці розных культур і звычаі, а таксама моўныя асаблівасці. Каб пазбегнуць няўдачы праз «няведанне» свайго спажыўца ў іншых краінах, звярніцеся па параду да мясцовых партнёраў.

**17. Нішавы (вузкаспецыялізаваны) маркетынг** будзе больш дарэчны і эфектыўны, чым масавы маркетынг для невялікіх арганізацый ці самазанятых. Лепш вызначыць для сябе невялікі рынак і дамінаваць на ім, чым спрабаваць прадаваць на шматлікіх рынках. Як зараз кажуць: «Больш няма масавага рынку, а ёсць маса ніш».

**18. Спажывецкія перавагі.** Спажывец бачыць нашу прадукцыю інакш, чым мы. Яму абсалютна ўсё роўна, што мы думаем пра сваю арганізацыю або пра сваю прадукцыю; адзінае, што яго цікавіць: а што атрымае ён, спажывец? Таму нам трэба імкнуцца разумець, а што ж кліенты цэняць? Гэта могуць быць нематэрыяльныя перавагі, напрыклад, статус, адчуванне прыналежнасці да пэўнай супольнасці або «фактар камфортнасці». Пазней мы зможам рабіць акцэнт на гэтых спажывецкіх перавагах у сваіх маркетынгавых пасланнях.

**19. Цэнаўтварэнне.** Разумны маркетынг звычайна спрыяе росту цаны і даходаў. Гэтага можна дасягнуць, заняўшы лідарскія пазіцыі на нішавым рынку. Глыбокае разуменне пераваг, якія дае спажыўцу ваш прадукт у выпадку яго набыцця, таксама з'яўляецца падставай, каб прасіць за яго высокую цану.

**20. Маркетынг з'яўляецца агульным абавязкам.** Маркетынг зусім не абмяжоўваецца абавязкамі «аддзела маркетынгу». Функцыя маркетынгу – прывесці ўсю дзейнасць вашага бізнесу ў адпаведнасць са зменлівымі патрэбамі рынка. Таму ў маркетынгавую дзейнасць тым ці іншым чынам уцягнуты кожны член вашай каманды.

# Для нататкаў

# Аўтары:



Сівагракаў Алег,
эксперт па ўстойлівым развіцці
на мясцовым узроўні,
кандыдат эканамічных навук,
дацэнт (вёска Сасновая, Смалявіцкі раён),



Матрунчык Мікола,
эксперт па пермакультуры,
гаспадар уласнай вясковай эка-сяброўскай
гаспадаркі “Экафанія” (вёска Караліна,
Мінскі раён),



Кіслая Таццяна,
выкладчык кафедры бізнеса і кіравання
Інстіытута прадпрымальніцкай
дзейнасці (г. Мінск)



Нойманн Наталля,
эксперт па сацыяльнаму развіццю
грамадства, магістр, дацэнтка
(г. Зіген, Германія)

Распрацаваны ў межах
Школы-лабараторыі
“Вясковая самазанятасць на прынцыпах
устойлівага развіцця”
(адукацыйна-інфармацыйнага аўтарскага курсу
Алега Сівагракава, Міколы Матрунчыка
і Таццяны Кіслай, 2023 – 2024 гг.)